

Уладзіслаў
Рубанаў

# Не аднойчы забіты

УЛАДЗІСЛАЎ
РУБАНАЎ

# НЕ АДНОЙЧЫ ЗАБІТЫ



УЛАДЗІСЛАЎ
РУБАНАЎ

# НЕ АДНОЙЧЫ ЗАБІТЫ

Раман
у 2-х частках

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1994

ББК 84(4Беи)6
Р 82
УДК 882.6-31

Р $\frac{8820600000-073}{\text{М } 302(03)-94}$ 19—94

ISBN 5-340-01432-0

© У. Я. Рубанаў, 1994
© Афармленне. Э. Э. Жакевіч, 1994

# Частка першая

Усякая гразь вымушае камень трэскацца.

*М. Рэрых*

**РАЗДЗЕЛ 1**

Чым глыбей чалавек апускаецца ў сваю душу, тым вышэй падымаецца ў сусвет.

Мне даўно, яшчэ ў часы бязлітаснага панавання сацыялістычнага рэалізму, хацелася напісаць твор, у якім перапляліся б рэальнасць і фантасмагорыя, дакументалістыка і выдумкі, сны і ява, думкі лагічныя і містычныя, поўныя абсурду і парадоксаў. Словам, меркавалася зусім вольная форма выяўлення. Зрэшты, па дзённіках, запісных кніжках, можа, пачынаючы з пачатку 70-х гадоў, у мяне раскіданы розныя задумкі такога плана. Але, мусіць, душа ды розум не выспелі для такой самааддачы, а хутчэй за ўсё, не давала жаданню ажыццявіцца грамадская атмасфера, у якой мы жылі,— атмасфера ідэалагічнага тэрору. Цяпер, здаецца, нарынуўся час, калі скінуты ланцугі ўсіх забарон.

Па кожнай сітуацыі я стварaў некалькі варыянтаў ейнага працягу і з гэтай прычыны перажываў не адзін, а шмат разоў і як бы прапускаў праз сябе не адно жыццё, але й тое, што ў мяне МАГЛО БЫЦЬ...

Ва ўсякім разе, я ведаю, што існую ў трох паралельных светах. Першы свет — фізічны — найбольш падуладны для ўсведамлення. Яго можна ўбачыць, памацаць, панюхаць, пачуць, паспрабаваць на смак. Дзеля гэтага ў чалавека і ёсць пяць органаў адчування. Яго не трэба мяняць. Ён такі павінен быць і будзе, незалежна ад нашых намаганняў.

Другі свет — гэта сны, створаныя думкамі і пачуц-

цямі. Ён больш дасканалы і гнуткі, сплятаецца з вобразаў і сімвалаў, сілкуецца энергіяй думак. Гэты свет абганяе ў часе і развіцці свет рэальны, зямное жыццё. Але ён непасрэдна звязаны з першым светам, бо думкі ідуць ад чалавека зямнога. У ім няма смерці: энергія думак, калі іх нават мала, не знікае; пасланая думкаю, яна існуе вечна, пераўтвараючы сабою, аказваючы ўплыў на зямное жыццё. Таму ў снах чалавек ніколі не гіне, не памірае, яго не забіваюць, хоць пагроз і страхаў, подступаў да смерці хапае. Але тут ужо вінавата зямное жыццё. А калі б была смерць — не было б сну.

І трэці свет — свет душ, альбо Вышэйшы Розум. Гэта — самая высокая ступень дасканаласці. Тут зусім не бывае страхаў, адмоўных эмоцый, адна лагода і паразуменне. Тут табе адкажуць, што з табою будзе, якім чынам твая душа трапіць сюды. Тут няма войнаў, смярцей, крыві, спрэчак. Душы не могуць сутыкацца, гэта ім нічога не дасць, бо яны не матэрыяльныя. У іх няма зброі ўмярцвяць сябе. Гэта самы багаты і цікавы свет, нягледзячы на вонкавую аднастайнасць і падобнасць. Колер душ белавата-туманны, наваколле блакітнае. Тут спакой, няма нават ветру, хоць душы свае абрысы мяняюць, але застаецца нязменнай іхная энергія. Яна і не змяншаецца і не папаўняецца.

У кожным свеце ўзрост чалавека можа быць розны. Скажам, я не аднойчы чуў (пра гэта мне казалі сталыя людзі на самым пачатку трэцяга дзесятка жыцця), што мой духоўны вопыт апярэджвае фізічны ўзрост. Гэтае назойлівае адчуванне не пакідае мяне і цяпер. У фізічным свеце рэчы (і сябе) можна бачыць толькі такімі, якія яны ёсць. У свеце сноў рэчы, з пункту погляду зямнога, уяўляюцца абсурднымі — у сэнсе колеру, прызначэння, магчымасцей. А на самай справе яны проста існуюць у іншым вымярэнні. Там ложак, на якім ты спіш, можа рухацца разам з табою, прычым з шалёнай хуткасцю, пранікаць скрозь сцяну. Я назваў бы гэты свет — светам творчасці. І зямному творцу ёсць тут чаму пазайздросціць і што ўзяць.

Выйсці на кантакт са светам душ да смерці чалавек можа праз якуюсьці ненармальнасць ці анамалію, створаную штучна альбо хваробаю. Можна слухаць Вышэйшы Розум, пытацца, толькі не дыктаваць і не

загадваць яму. Але калі надыдзе пара ягонай душы адляцець самой туды, назад яна ўжо не вяртаецца. У гэтым няма патрэбы. Як няма ў натуральнага развіцця ходу назад. Але яна мае сувязь з чалавекам зямным шляхам псіхаграфіі*.

Я-псіхограф — у далейшым проста Голас: «Не спяшайся — і табе адкрыецца тайна».

## РАЗДЗЕЛ 2

Жанчына Няміла, якая магла зрабіць з чалавекам што хочаш, але толькі кепскае, была незвычайна прыгожая. Мела каля сажня росту, была апранута ў строгія чорна-белыя строі да самай падлогі, з высокай падвічкаю на галаве. Чорныя валасы, бровы, вочы. Калі чалавеку рабілі зло і яго знішчалі, ён вінаваціў ва ўсім людзей, сярод якіх жыў, не ведаючы, што задумвалася гэта жанчынаю Нямілай. Яна існавала ў нябачнай форме, а набывала рэальныя абрысы адно тады, калі спускалася ў сутарэнне. Са столі выпадаў круг, ссоўваўся ўбок і вісеў непрымацаваны ў паветры. З люка стоячы выплывала жанчына Няміла. Круг заязджаў на месца.

Сутарэнне было доўгае і вузкае, як калідор, мела скляпеністую столь. Сцены з пліт залацістага металу былі голыя, але ў любое імгненне, па жаданні жанчыны Нямілы, на іх магла з'явіцца, бы на экране, выява чалавека, рэчка, лес, кватэра. Жаданне жанчыны Нямілы зыходзіла з ейных думак. Выканаўцамі волі былі плоскія, бы струкі спелага лубіну, істоты метровай вышыні. Яны былі шчыльна зацягнуты ў чорныя, пакрытыя белым мяккім пушком касцюмы. На месцы твару ў глыбокай адтуліне балбатаў, бы гарошына, язык. Гэтае балбатанне ўспрымала і разумела толькі жанчына Няміла. Але яно перакладалася і на чалавечую мову, паколькі жанчына Няміла з арміяй сваіх істот змагалася менавіта з людзьмі. Калі б не яна, усе грамадствы ўжо даўно ператварылі б зямлю ў рай. Не было б хвароб, войнаў і, можа, нават смярцей. Бо ўсе людзі былі б высокамаральнымі.

На кожнага чалавека жанчына Няміла скіроўвала

---

* Псіхаграфія, або аўтаматычнае пісьмо,— працэс атрымання сэнсавай інфармацыі міма волі чалавека.

сваю сілу рознай моцы. Сіла ўзрастала адпаведна значнасці чалавека. Прычым ягоная пасада ці становішча ў грамадстве не мелася наўвеце, а толькі духовая вага. Жанчына Няміла людзей высокай духовасці лічыла сваімі найпершымі ворагамі. Зло, як і дабро, імкнецца да дасканаласці. Сігналы пра такіх людзей з энергаінфармацыйнага поля зямлі ішлі да яе дзень і ноч. Яна фіксавала іх, аналізавала і, выбраўшы чарговую ахвяру, заплывала праз люк у сутарэнне. Дастаткова ёй было падумаць пра іх, як прыбягалі чорныя плоскія істоты.

Напрадвесні 88-га года жанчына Няміла выплыла з люка з хуткасцю крышачку большай, чым звычайна. Чорнае ў ёй яшчэ больш чарнела, белае бялела. Кантраст дасягнуў найвышэйшай, нясцерпнай для вачэй яркасці. Выпнуліся, а тады ад'ехалі ўбок дзверы ў сцяне, і з іх пасыпаліся, як мурашкі з нары, чорныя істоты. Перад жанчынаю Нямілай яны выстраіліся роўненька, бы пад лінейку, стаўшы шчыльна адна пры адной.

— Ёсць цікавы аб'ект,— сказала жанчына Няміла. Голас у яе быў нежывы, халодны, як з камп'ютэра, але выразны.— Чуйкевіч Канстанцін Рыгоравіч. Ён дасягнуў таго ўзроўню духовасці, якая пагражае нам. Вы можаце даць мне ўсемагчымыя звесткі пра яго?

Гарошыны ў адтулінах істот у адзін міг забалбаталі.

Размова:

— Хто ён такі?

— Пісьменнік.

— Узрост?

— Між трыццаццю і сарака гадамі.

— Дзе працуе?

— У часопісе «Ідэі перамагаюць».

— Гарэлку п'е?

— Здароўе дазваляе.

— Распуснічае?

— Жанчын любіць.

— Дакладней!

— Не чужаложствуе.

— З жонкаю добра жыве?

— Ёсць рознагалоссі.

— Дзеці?

— Два сыны.

— Партыйны?
— Член КПСС.
— КДБ займалася?
— Толькі ўскосна.
— Хобі?
— Хоча атрымаць вадзіцельскае пасведчанне.
— Досыць! Поле дзейнасці ёсць.— Жанчына Няміла насупіла бровы. Пад высокай, расшыранай кверху падвічкаю ў галаве ейнай заснавалі думкі. Яны спляліся ў дыскету, падобную на кавалачак ільнянога палатна. Верхняя частка ў кожнай істоты надзьмулася, як у жабы, да белага шарыка. Ім была перададзена праграма з галавы жанчыны Нямілы. Астатняе лёгка рабілася: яны шукалі на зямлі людзей, якія яе ажыццёвяць.

Істоты, як мышы-палёўкі, сыпанулі ў дзверы ў сцяне.

## РАЗДЗЕЛ 3

...Ён быў ціхамірны толькі тры дні пасля нараджэння. Ляжаў на ложку скручаны, спавіты, толькі вакенца для тварыка. Адно зрэдку незадаволена моршчыўся, крывіў роцік у той бок, дзе была ягоная маці. Яна сядзела пры ім на ложку. Калі ён сцішаўся, ёй здавалася, што сынок памёр. Яна давала яму цыцку, сунула доўгі смачок у вільготны роцік. Але сынок крахтаў, выпіхваў языком смачок. Парадзіха была маладая, звалі яе Маруся. Нарадзіла яна ў хаце свекрыві. Сюды прывёў яе Рыгор пасля таго, як вярнуўся з Сібіры, куды саслалі яго разам з бацькамі ў калектывізацыю. Там ён і завёў сваю першую сям'ю. Спачатку Маруся праз гэта пакутавала, засмучалася, адале памалу прызвычаілася. Лягчэй рабілася на душы: не яна разлучніца, не яна адбіла Рыгора ад першай жонкі, якую нават не бачыла і якая засталася дзесьці ў вёсцы пад Іркуцкам. Ён сам улёг за ёю. Яна была маладзейшая на дзесяць гадоў за яго, цнатлівая, нечапаная вясковая дзеўка. І ці ёй заглядацца на дарослага мужчыну? Але Рыгор быў настырлівы, асабліва пад чаркаю. Ведаў, што ў Глякоў няма ў хаце мужчыны. Стары Гляк памёр, а сын ягоны скруціўся невядома куды ў вайну. Ніхто не дасць адпору. Ён п'яны ламіўся ў дзверы. Калі яму не

адчынялі, выносіў з прабоямі. Дарываўся да Марусі, прыязна лыбіўся, юрліва заглядваў у вочы. Калі яны заставаліся адны, наравіў пацалаваць. Маруся раілася са старэйшай сястрою Даркаю, якая жыла ў Крычаве і час ад часу наязджала. «Ну што рабіць? — гадала Дарка, сумняваючыся і баючыся браць на сябе адказнасць.— Глядзі сама, не маленькая... Тута ніхто не параіць. У яго ж ёсць сям'я, дачка...» — «Ён жа не жывець з імі... Кажа, развёўся, усё па закане»,— шукала падпоркі свайму жаданню Маруся. «А хвароба яго ведае! Ды яшчэ з кулакоў, сёння тут, а заўтра зноў у Сібіры...» Бачыла Маруся: няма ў сястры цвёрдасці, вагаецца і яна. А знаць, Рыгор не такі ўжо і благі. «Глядзі сама... — паўтарала Дарка.— Каб яшчэ не гэтая гарэлка. Ён жа, бачыш, п'е...» Рыгор і праўда часцяком быў на падпітку. Але пасля вайны франтавікі жлукцілі як не ў сябе ды яшчэ куражыліся: «Мы за Расею кроў пралівалі!..» Валяліся пад плотам, каля буфетаў і чайных, на станцыях. Рыгор за сабою глядзеў, хадзіў у чыстай кашулі, памыты, паголены. Нягледзячы на скалечаную руку, да яго гарнуліся маладыя жанкі і дзеўкі. Дзіва што: мужчыну са свечкаю шукаць трэба. І Маруся згадзілася... Яна аддалася яму на палку ў хаце, калі маці ў полі жала жыта. Вопытны сэрцаеднік, Рыгор нашаптаў ёй такіх слоўцаў, што ў яе паплыло перад вачыма, і яна сама, здавалася, паплыла кудысь у нерэальнае жыццё, ці то ў сон, ці то ў смерць якую...

Так нарадзілася ў яе першае дзіця — сын. Яго назвалі незвычайным для вёскі імем — Канстанцін. Прыдумаў яго Рыгор. Сам чалавек своеасаблівы, з нетутэйшымі замашкамі, ён хацеў, каб імя ў сына было таксама нязвыклае. Па вёсках вандравала звычайна некалькі імёнаў: Коля, Саша, Толік, Міша...

На трэці дзень маленькі чалавечак узяў матчыну цыцку і адразу балюча сціснуў дзяснамі смачок. Маруся скрывілася ад болю, але сцярпела. Так упершыню дзіця заявіла, што прыйшло ў гэты свет змагацца. Яно было пылінкаю ў сусвеце. Але гэтая пылінка з'явілася і заняла сваё месца. Ці нарадзілася разам з гэтай пылінкаю яшчэ адна зорка на небе — невядома. А нітачка, якая звязвае чалавека з небам, працягнулася. Сусвет змяніўся. Немаўля пра гэта не магло ведаць. Не думала пра гэта і ягоная маці. Ні тады, як на-

раджалася сама, ні цяпер. Яна думала, як жыць, як выгадаваць сынка, усцерагчы яго ад хвароб, захаваць сябе і бацьку. Апораю ёй была ейная маці, Аксюта, пяцідзесяцігадовая кабета, якая сама нараджала адзінаццаць разоў. Але ў жывых засталося толькі чацвёра дзяцей: тры дачкі і сын. У пачатку 30-х гадоў голад касіў малых і старых. Цугам цягнуліся з Украіны людзі, пухлі і падалі проста на дарозе, паўз якую і трава, і лісце на дрэвах былі аб'едзены. Голад лютаваў, рабіў людзей звярамі, даводзіў да бясцямнасці і вар'яцтва. Іван Вірлак з таго канца вёскі забіў у лесе семнаццацігадовага сына, бо не было чым карміць сям'ю, а дарослы хлопец еў больш за астатніх. Ён вёз яго на калёсах, акрытага гунькаю. Хлопец быў рослы, босыя ногі тырчалі на паўметра. Людзі глядзелі ў вокны, хапаліся за галовы, бялелі, але не галасілі і не асуджалі Вірлака, злашча быў прыдуркаваты. Паелі катоў, сабак, бryндалі па лесе, шукалі птушыныя гнёзды. Варанячыя ці сарачыныя птушаняты былі самаю смачнаю і жаданаю ежаю. Мужчыны хадзілі з палатнянымі кайстрамі, з якіх капала птушыная кроў. Чорныя плямкі спрэс стракацелі ў пыле па вёсцы.

Маруся голаду не помніць. Ёй было ўсяго тры гадкі. Расказвала маці, як сушылі ліповае лісце, конскае шчаўе, жалуды, таўклі ў ступе і пяклі праснакі. Яны былі гаркавыя, сухія, перасядалі ў горле, але жывот напаўнялі. Страх, што раптам нічога не акажацца даць свайму дзіцяці, у Марусі жыў. Ён тады засеў у ёй, яшчэ няцямлівай. І пазней — у вайну і пасля вайны, калі збіралі па вясне леташнюю гнілую бульбу. Мабыць, падлівала ў сэрца страху і тое, што Рыгор «паліцічаскі», як пра яго казалі, а знаць, у любы момант можа загрымець, і шукай, лаві тады арыштанта.

Час ад часу прыходзіла Лісаветка, якая ба́біла — прымала роды. Рыгору яна даводзілася цёткаю. Прыносіла цёплы блінец, кавалак аржанога праснака. І Маруся, пажаваўшы іх разам, загортвала ў марлечку і давала Косціку ў рот суслу. Косцік прагна смактаў і, залюляны ў зыбцы, падвешанай да нізкай патрэсканай бэлькі, доўга спаў. Яна тады радавалася. Але гадаваць дзіця — не толькі радасці, а і гарчэча, і слёзы, і адчай. У Косціка то балеў жывоцік, і ён

тады крахтаў усю ноч, выгінаўся і пу́каў. То заляпіла рот «малочніца». То абсыпала ўсяго ва́ўкамі. Яна заварвала травы, якія прыносіла Лісаветка. Лілі адвар у шырокенькія асінавыя начоўкі з вадою і купалі Косціка. Ён рос, пераадольваючы немачы, быў вясёленькі, часта смяяўся.

Рыгор меней стаў выпіваць. Таптаўся каля сына, асабліва ўначы, калі сядзеў каля стала пры лямпе і пісаў школьныя планы. А Маруся тым часам спала. Ёй ужо здавалася, што мужык у яе надзейны, узяўся за розум, а за бацьку-кулака яму даравалі... Праз год і дзевяць месяцаў яна нарадзіла другога хлопчыка. Гэта быў чарнявенькі, смугленькі, рыхтык Рыгор, але больш маўклівы і ўпарты. Цэлы тыдзень не браў цыцкі, і Маруся падумала была, што ён павярэджаны. Але перажывала яна дарэмна. Аднаго разу ён так ухапіў яе за смачок, што яна войкнула, злякнула Косціка. Той падбег да яе, тузануў за спадніцу і спытаў: «Мама, кусь, вава?» — паказаў пальчыкам на свой адкрыты роцік. Быў кемлівы, шаляніца, з годзіка.

Так у неба працягнулася ад хаты, пасляваеннай, няўклюднай, нізенькай, як паграбня, яшчэ адна нітачка. Што было наканавана гэтым нітачкам, дзе яны заканчваліся — зноў-такі ніхто не ведаў. Не дадзена было ведаць. Вёска для сусвету калі не пылінка, то пясчынка, што таксама зусім мала, мізэрна для таго, каб пазнавацца.

Косцік адразу як бы падрос, і ўвагі дарослых да яго крута паменела. Ён гуляў пад сталом, пад лаўкаю, на двары, качаў кружочкі, якіх нарэзаў яму з бярвенца Рыгор, перасыпаў пясок, збіраў трэскі, паленцы, ладзіў буданчыкі. Баба Аксюта брала яго з сабою на агарод, несла ў поле. Там ён на радзюжцы ў цяньку пад снапамі, аблеплены мурашкамі, соладка спаў.

Можа, месяцы праз два Маруся ўжо несла ў поле і спавітага Глебачку. І другога сына Рыгор назваў нетутэйшым імем: Глеб. Сам хадзіў іх запісваць у сельсавет у Смародзічы. Дзень нараджэння Глеба запісаў правільна, а Косціка на два месяцы падмаладзіў. У радасці на ўсё, канечне, можна забыцца (два казакі!), але як-небудзь з ёю саўладаў бы, калі б не быў на «добрым газу». Сустрэў у Смародзічах свайго даваеннага сябра, Сашку Матузка. Той зацяг-

нуў яго да маці. Там яны апаражнілі трохлітровы слоік сівухі, а тады ўжо разам папляліся ў сельсавет. Старшыня адно і змог зразумець, што Чуйкевічаў Рыгор прыйшоў выпісваць сынам метрыкі.

Першая недарэчнасць напаткала ў жыцці зусім нявіннага маленькага чалавечка. Гэта, аднак, не замінала яму расці, утульна адчуваць сябе ў свеце.

**РАЗДЗЕЛ 4**

Выклік у Пракуратуру, быццам удар перуна, аглушыў. Так савецкі чалавек рэагуе на цікавасць да яго багіні Феміды. Яго рэдка выклікаюць, каб абараніць, амаль заўсёды — каб абвінаваціць.

Кастуся Чуйкевіча нечакана выклікалі ў Пракуратуру.

А дзень пачаўся як найлепей. З таго, што напаўняла яго энергіяй, бадзёрасцю, зрушвала з душы цяжар заклапочанасці, няўпэўненасці, страху... Што яшчэ? Незадаволенасці сабою, сваім ладам жыцця. Такой цудадзейнай магіяй валодалі эратычныя сны. І адзін з іх акурат прысніўся Чуйкевічу пад раніцу. Нібыта ён злавіў прыгожую чырванавата-залацістую рыбіну ў якойсьці засмечанай рачулцы, дзе, здаецца, малодшы брат Глеб цягаў драбязу, бліскучанькую, бы камсінкі. І — на гэтым жа беразе, дзе лавіў, трохі пазней лашчыў ён у самых інтымных месцейках маладую, з сакаўнымі кульшачкамі дзяўчыну-німфетку. Яна надзіва ахвотна аддавалася яму, нягледзячы, што побач стаяла... ейная сяброўка.

Разбудзіла яго кропля, якая гулка і важка дзюбала ў цынкавы брылёк падваконніка, быццам адмервала хаду часу. За шыбамі сіціў дождж.

Чуйкевіч крыху паляжаў у прыемным здранцвенні, слухаючы набрынялае радасцю сэрца, перабіраючы ў памяці салодкія моманты сну. Ён даражыў такімі снамі, бо яны апошнім часам сніліся рэдка. Часцей — цяжкія, страхатлівыя, з яскравай сімволікаю пагоні, бездапаможнасці.

Зберагаючы ў душы паследкі сну, Чуйкевіч лёгка падхапіўся з ложка. Ссунуў на бакі шторы. На вакне захлапатаў крыламі цагельна-чырвоны, з чорнымі плямамі матыль-крапіўнік. Скуль ён узяўся? Дзе знайшоў шчыліну для зімовай спячкі? Чуйкевіч вы-

пусціў матыля ў фортачку, і ён паляцеў нейк бокам, куляючыся, бы інвалід.

Жонка пайшла ўжо на працу, старэйшы сын Вася — у школу, а малодшы Арцём яшчэ спаў. Чуйкевіч з ахвотаю заняўся ранішняй мітуснёю. Самым клопатным у ёй было прамыванне носа. Як гэта робяць ёгі і дзеля чаго, ён вычытаў у «Советском спорте». Ён ведаў, што панацэі ад хвароб няма, ды ўсё роўна яму верылася ў карысць такой працэдуры: папярэджанне інфекцый, гаймарыту, выпадзення валасоў, блізарукасці ды іншых не такіх ужо бяскрыўдных немачаў.

Ён насыпаў у пластмасавы паўлітровы пудэлак з-пад шампуні чайную лыжачку солі, наліў летнай вады, пабоўтаў і нацягнуў звычайную соску. Нахіліўшыся над ваннай, уставіў соску ў наздру. З другой вада пацякла тонкім струменьчыкам.

Піў каву, якую густа заварваў, напяваў упадабаную ім песню Газманава:

Мои мысли — мои скакуны,
Словно искры, зажгут эту ночь.
Обгоняет безумие ветров хмельных
Эскадрон моих мыслей шальных!

Думкі ягоныя былі надзіва лёгкія і бязважкія, круціліся ў галаве бязглузда, як апалае лісце ў закутку.

Дождж сціх. На правадах, на якіх сушылі бялізну, густа віселі белавокія кроплі. Снег амаль увесь сагнала. Засталіся толькі ледзяшы, дзе была вада, ды пачарнелыя разбэрсаныя лапікі на нізінках — адно што назва снег. Паўз платы, дзе ідаць былі гусцейшыя чубкі, хваравіта, аж сінява зелянела леташняя абмарожаная трава. І сярод выпетранага, цвілога бадылля піжмы яна трывожна ўражвала.

Ступаючы на высокія грудкі, Чуйкевіч адчуваў падэшвамі ваўняную мяккасць гнілога подсцілу. Яму прыгадалася дзяцінства. Мо тады яны ўпершыню і заселі ў памяці, гэтыя бляклыя, але прыцягальныя сваёй веснавой непаўторнасцю малюнкі. Пасля зімы і снегу, які вяжа ногі, ісці было лёгка і радасна.

А на працы, у рэдакцыі часопіса «Ідэі перамагаюць», ужо навісалі хмары, налівaліся пагрозаю перуна.

Чуйкевічу ў кабінет пазваніў галоўны рэдактар і запрасіў зайсці. У голасе чуліся сухаватыя ноткі.

Чуйкевіч падумаў, што яго клічуць з прычыны чарговай скаргі. Адзін з сіндромаў псіхічнай хваробы грамадства — пісаць скаргі, ананімкі, даносы, паклёпы.

— Здароў! — Рэдактар устаў з-за стала і падаў руку. У яго было дзіўнае, паэтычнае прозвішча — Ямачка. Нягледзячы на свае без малога шэсцьдзесят, трымаўся малайцавата. Нават густая і зусім белая, як у Барбары Буш, шавялюра не старыла яго. Па-маладому бліскалі за шкельцамі акуляраў вочы. Нос, як ва ўсіх сівагаловых, меў бледна-ружовы колер.— Званілі з Пракуратуры, мілай. На цябе там заява ляжыць...

— Якая заява? — больш здзівіўся, чым спалохаўся Чуйкевіч: прывык да ўсякіх нечаканасцей. Няўжо праз паўстагоддзя адгукнулася чым-небудзь бацькава мінулае?

— Нейкая там аўтарка абвінавачвае цябе, быццам ты яе рукапіс прысвоіў.— Ямачка глядзеў з-за шкельцаў шчыра, без падазронасці.

— Ну, слава Богу! — выдыхнуў Чуйкевіч.— А то я быў падумаў...

— Я сказаў, лухта гэта, на цябе не падобна. Вось тэлефон, пазвані...— Ямачка аддаў квадрацік пруткай глянцавай паперы з лічбамі тэлефона і прозвішчам.

Чуйкевіча ўжо не здзіўлялі заявы, скаргі, пісьмы, але такога крутога абвінавачання яшчэ не было. Хто яго абрынуў, ён амаль не сумняваўся. Падзякаваў рэдактару і выйшаў. Хоць за што дзякаваць? А хоць бы за тое, што не пачаў чапляцца, падазраваць, урэшце, папракаць: дапрацаваўся, мілай. Начальнікі гэта ўмеюць. Ловяць любую дробязь, каб падцяць падняволънага на кручок. Але самы вялікі начальнік над чалавекам — сумленне. Ніхто не хоча гэтага разумець. У генах, ці што, сядзіць гэтае жаданне камусьці падпарадкоўвацца, кагосьці слухаць, чыёсьці заданне выконваць. Да пэўнай мяжы. А далей — не твой абшар. Далей дзейнічае іншая праслойка людзей. У кожнага як бы свой сацыяльны і палітычны пояс у грамадстве.

Добры настрой выпарыўся, бы кропля на гарачым пяску. У Чуйкевіча была такая паганая натура: ствараўся настрой цяжка і рэдка, псаваўся ад любой дробязі і часта. А тут, падобна, не дробязь. Тут пра-

мы замах на ягоную рэпутацыю, чалавечую годнасць.

«Яна кіруецца толькі сваімі эгаістычнымі разлікамі ці за ёю хтосьці стаіць?» — кляпала ў мазгах у Чуйкевіча пытанне.

Гэтая жанчына прынесла рукапіс месяцы два назад. Чуйкевіча яна ўразіла. Жанчынаю назваць яе можна было з нацяжкаю. Гэта была сама смерць — кашчавая, бледнатварая, зморшчаная, з выстылымі, вадзянымі вачыма. Калі ішла ад дзвярэй да яго, кульгала. З шырокіх кароткіх рукавоў сацінавай блузкі тырчалі сухія, вострыя, з'едзеныя нейрадэрмітам локці. Гэтае ўвасабленне смерці сядзела побач з ім на крэсле. Адчуваць такое суседства было вусцішнавата. Па несупыннай манеры размаўляць, без паўзаў, без жадання чуць суразмоўцу Чуйкевіч адразу дакеміў, што перад ім не зусім здаровы чалавек. Гартаючы рукапіс, там-сям між старонак знаходзіў сівыя валасіны.

Жанчына — ейнае прозвішча было Субач — хваліла свой твор, ні макулінкі не сумнявалася ў ягоных мастацкіх вартасцях. Гэтым, зрэшты, грашылі амаль усе аўтары, асабліва незнаёмыя. Апошнюю кропку ў сваёй самарэкламе жанчына паставіла тым, што сказала, быццам ведае Чуйкевічавага бацьку. Адкуль? Хіба таксама была сасланая ў Сібір? Ці яна яго з кімсьці блытала, а можа, гэта быў свядомы разлік. Чуйкевіч не стаў праясняць. Жанчына і так забрала ў яго шмат часу. А яму трэба жвавей чытаць ды здаваць у чэрвеньскі нумар аповесць знакамітага празаіка-лаўрэата.

— Тая старая... Субач, падала на нас заяву ў Пракуратуру,— вярнуўшыся ад рэдактара, сказаў Чуйкевіч літсупрацоўніцы Люшчэні. Гэта была невысокая ціхмяная бяздзетная жанчына. Яна зусім не ўмела пярэчыць і пляткарыць. Ужо за гэта ёй варта было ставіць помнік.

— Во-о-ой...— выдыхнула Люшчэня і з дзіваваннем глядзела на яго. Вывучала, як ён чуўся, ці патрэбна яму падтрымка. Нізка напушчаныя на лоб чорныя валасы надавалі ёй загадкавасці. У тым, што здзеялася, больш віны было ейнай, але расхлёбваць давядзецца яму, загадчыку аддзела. Калі шчыра, то і яе вінаваціць няма за што. Графы для роспісу аўтара, які забірае свой твор, у журнале ўліку рукапісаў

не было. Адно тады, як разгарэлася звадка з Субач, Чуйкевіч даў каманду такую графу завесці.

Супакоіўшы дыханне, Чуйкевіч патэлефанаваў у Пракуратуру. Адказаў жаночы голас — халодны, стрыманы, разбэшчаны ўладаю. Чуйкевіч адрэкамендаваўся. Стараўся прамаўляць упэўнена, цвёрда, але не ўдавалася.

— Так, паступіла тут на вас заява. Ёю займаецца Пётр Пятровіч, але ён зараз на судзе. Звaніце пасля шасці або заўтра гадзін у восем раніцы.

Дзень, а можа, яшчэ і ноч — тузанне ў ліпкіх цянётах няпэўнасці. Жыць у няпэўнасці Чуйкевічу заўсёды было пакутліва. Ён вельмі павольна астываў ад несправядлівасці. Нават самы дробны фальш, няшчырасць ці пахабінку ў чалавеку ён адчуваў паталагічна. А паколькі ўсе ў чымсьці фальшывілі, яму было цяжка з усімі ці, наадварот, ён быў цяжкі для ўсіх. Але што зробіш. «Шукай сродак аблегчыць сабе існаванне»,— кісла пасміхнуўся ён.

У дзесяць гадзін семінар у райкаме партыі. З непрыкаянасцю на душы выйшаў з рэдакцыі. Павярнуў на задворкі. Так было бліжэй. Праваруч стаялі старыя, яшчэ даваенныя будынкі. Вакол іх густа рос бэз з парэпанай белай карою. З левага боку такія будынкі ўжо зносілі. Вялікі абшар быў абгароджаны плотам. За ім раўлі жоўтыя, як балотныя сыраежкі, бульдозеры. У адным месцы плот так блізка падступаўся да сцяны будынка, што Чуйкевіч ледзьве пралез. Падумалася: стрэнься на такой сцяжынцы са злачынцам. Два дні горад гудзеў ад здарэння. З самай надзейнай турмы КДБ, якую звалі «амерыканка», збег небяспечны злачынец-забойца. Газеты друкавалі ягоны партрэт, апісвалі прыметы, звычкі. Самае каведнае было ў тым, што злачынец меў чорны пояс па каратэ, умеў падрабляцца пад калеку, вар'ята. Не цырымоніўся са сваёй ахвяраю. Яго доўга не маглі вылавіць. Злачынец працаваў у міліцыі, дэзарыентаваў следства, ведаў усе хады і выхады.

Чуйкевіч выбраўся з трушчобы і ўзышоў на пагорак. Убачыў: насустрач яму сунецца мужчына. О, вялікая сіла — падазронасць! Па прыметах, злачынец: невысокага росту, чарнявы, твар тузаецца ў нервовым ціку. Размінуўшыся, Чуйкевіч думаў: што рабіць? Прасачыць за ім, каб упэўніцца, імітуе ён ці не,

альбо адразу званіць у міліцыю? Логіка падказвала: наўрад ці будзе злачынец пасля такога дзёрзкага ўцёку гэтак вольна хадзіць па Мінску. Хутчэй за ўсё проста хворы чалавек.

Чуйкевіч каля ашчадкасы зрэзаў рог квартала і апынуўся перад райкамам — мажным белым чатырохпавярховікам з таямнічай глыбінёю квадратных вокнаў. Апошнім часам хадзіў туды без ахвоты, адно таму, што быў вышкалены Сістэмаю. Ён знарок, свядома не разбураў у сабе гэтай якасці. Хоць трэба яшчэ разабрацца: ці не адно і тое ж — дысцыпліна і страх. Страх раба, якога школа, універсітэт, праца запраграмавалі на безадказнае выкананне таго, што патрэбна партыі. А вось гэта цвёрда ведае: душу заўсёды трэба трымаць у лейцах, іначай не выжывеш. Але ці трэба душы лейцы? Пытанні, як кнопкі, востра ўплішчваліся ў свядомасць.

Збіралі сакратароў пярвічак у актавай зале на трэцім паверсе. Каля ўвахода за бліскучым доўгім сталом сядзела інструктар Малкава і запісвала прозвішчы тых, хто прыходзіў. Чуйкевіч размаўляў пабеларуску, і Малкава заўсёды не то са страхам, не то са здзіўленнем ускідвала на яго светлыя, папяровыя вочы.

Людзей у зале было небагата. Круцілі галовамі, чыталі газеты, знаёмыя перамаўляліся. Відаць было, іх мала цікавіць, што пачнуць чаўпці, на што настаўляць. Старое рухнула, новага не было. І Чуйкевіч пачаў сумнявацца ў тым, што лілося языкамі з трыбун і прэзідыумаў на без'языкіх прышэльцаў. Яго гэта закоўвала. А душа ж таксама павінна вольна дыхаць — не толькі грудзі. Так хацелася, але так не было НІКОЛІ. У чым прычына?

Першы сакратар Гракавалава была з супольнасці жанчын, якія Чуйкевічу не падабаліся сваімі мужчынскімі выхілкамі і нават знешнасцю. Рухі, голас, прычоска, адзенне — усё ў іх бязлікае, строгае, без загадкавасці, якую заўсёды нясе індывідуальнасць. Гракавалава вельмі турбавалася за сваю марку здавацца недасягальнай, адзіна правільнай. Гэта асаблівасць усіх партапаратчыкаў. Відаць, цяля нельга вінаваціць, што яно нарадзілася ад каровы. Але часы памяняліся, і адносіны да партыйцаў у людзей сталі інакшыя. З'явіліся новыя плыні, рухі, якія рабілі

нападкі на кампартыю. Не саромеліся ў выбары слоў і ацэнак. І нават мецілі на ейнае месца і роль у грамадстве, што покуль не ўяўлялася нават у смелай фантастыцы. Апаратчыкі з усіх сіл супрацiўляліся. Не грэбавалі хлуснёй, падтасоўкаю фактаў. Толькі б збэсціць няпрошаных палітычных працiўнікаў. Але, бачыў Чуйкевіч, мажлівасці ўжо не тыя. Іхная моц засталася там, у мінулым, дзе існавала неабмежаваная ўлада, татальнае паслушэнства і падняволенне.

Галава Гракавалавай вынырнула над трыбунаю. Другі сакратар, малады ружовашчокі хлопец, учорашні камсамольскі пабягушнік, пастукаў па графіне тоўстым чырвоным алоўкам. У зале пацішэла. Чуйкевіч засяродзіўся на сакратару, як бы мімаходзь выняў з дыпламата ручку і нататнік. Тое-сёе, каб не забыцца, запісваў. Гракавалава павяла гаворку пра лютаўскі Пленум ЦК КПСС. На ім абмяркоўвалася ідэалагічнае забеспячэнне ПЕРАБУДОВЫ. Колькі бетону, цяжару ў кожным слове!.. Цяпер маскоўскае водгулле дакацілася да раёнаў. У заклікі Чуйкевіч ужо слаба верыў. Ягоны скепсіс меў пад сабою грунт. Фармалізм, адарванасць ад рэалій жыцця проста фантанавалі з гэтых заклікаў. Гракавалава раіла правесці партсходкі ў пярвічках. Правесці дзеля «птушачкі» сходку можна. А толку з яе? Божа, гэта ён сумняваецца ў карысці партыйнай сходкі!.. Чуйкевіч, што з табою зрабілася?

Ён вяртаўся з райкама ў задуменні. Відавочна пацяплела. Снег зганяла проста на вачах. За дзень ад сонца пасушэлі пагоркі, застракацелі белымі лысінамі. А нанач падмарожвала, кволы лядок хліпаў на вадзе. Да раніцы ён стане падобны на шкло матавай лямпачкі, толькі спадыспаду не гладзенькі, а заінеланатапыраны, як белы ворс.

## РАЗДЗЕЛ 5

Проста жах, якая была ў краіне заслона праўды! Была. Няўжо і будзе? Здаецца, мала-памалу заслона прыпадымаецца. Чуйкевіч прачытаў у газеце, што амаль чатыры ваенныя гады саркафаг з целам Леніна знаходзіўся ў Цюмені, трымаўся ў найстражэйшым сакрэце.

## РАЗДЗЕЛ 6

Чуйкевіч патэлефанаваў у Пракуратуру. Той самы халодны жаночы голас сказаў, што Пятра Пятровіча няма. Чуйкевіч ледзьве не вылаяўся. Непатрэбная, лішняя вярэда. «Трэба глыкнуць і на ўсё забыцца»,— з адчаем падумаў ён.

Дома гарэлкі не было. Ён пад'ехаў да вінна-гарэлачнага магазіна. Каля яго, як зазвычай, стаяў вялізны натоўп. Менавіта натоўп, а не чарга. Хвост чаргі Чуйкевіч ледзьве надыбаў. Маляваная фіфа сказала, што яна апошняя. Стаяць было пакутліва. Чарга пасоўвалася так марудна, што чарапаха для яе была б недасягальнай рэкардсменкаю. У дзверы лезлі і лезлі нахабнікі і п'янтосы — наркатычная ачмурэласць не дазваляла ім цярпець ні хвілі. Перад самым ганкам Чуйкевіч дастаў з задняй кішэні партманет і адлічыў грошы на дзве бутэлькі, права на якія даваў яму талон — вялікае параджэнне магутных розумаў ПЕРАБУДОВЫ. Партманет зноў засунуў у кішэнь.

Ён ужо наблізіўся да ўвахода, калі ў дзверы ламанула хеўра чалавек з дзесяці. Іхныя спітыя морды, агрэсіўна-бяздумныя позіркі прыструнілі чаргу, і ніхто не асмеліўся іх прысароміць. Пад час штурхатні Чуйкевіч і не ўгледзеў, як між ім і фіфаю ўшчаміўся ў чаргу круглагаловы плячысты дэбіл, выпучваў, бы парваны конь, чырвоныя ў бялках вочы, каб бакавым зрокам сачыць за Чуйкевічам. Фіфа абурылася. «Бог з ім, няхай стаіць»,— падумаў Чуйкевіч. Разумеў, што ўшчуваць такога і бескарысна, і небяспечна.

Як толькі дэбіл наблізіўся да прылаўка, да яго сталі праціскацца то адзін, то другі з хеўры. Сунулі грошы, раілі, колькі бутэлек браць. Гэта і без таго ў цесным праходзе стварала таўханіну, цiскатню. Людзі прашываліся праз яе, губляючы гузікі, ірвучы адзенне. Дэбіл узяў пару пляшак гарэлкі і не спяшаўся адыходзіць. Ці то пералічваў рэшту, ці то чакаў, покуль яшчэ хтосьці з хаўруснікаў перадасць яму грошы.

Чуйкевіч тым часам заплаціў за гарэлку. Засунуў бутэлькі ў дыпламат і зашчоўкнуў. Яго здушылі з усіх бакоў.

— Прабірайцеся,— прахрыпеў ён дэбілу. Той крыху падаўся — на яго напіралі ад выхада. Чуйке-

віч апынуўся ў шчыльным кальцы. Яго штурхалі ў жывот, у бакі, у спіну. Ледзьве прарваўся да дзвярэй. І тут на іх наваліліся, яны прычыніліся, не даючы Чуйкевічу выйсці. У гэты момант яго асабліва моцна і дружна кухталявалі. Дзверы крута раззяпіліся — і яго выпхнулі на ганак. У радасці ад перамогі і волі ён, яшчэ не цямячы, машынальна хапіўся рукою за задні кішэнь і — абмёр: партманета не замацаў. Сутаргава лапаў па азадку, па кішэнях плашча («Мо забыў і не туды сунуў?») — новенькага, чорнага, бліскучага партманета не было. Адчуў, як зашумела ў галаве. Кудысьці пачала адплываць рэчаіснасць, як бы змывалася з вачэй. Такое ўражанне, што ён у сне. У непрыемным сне. Вось зараз прачнецца і з палёгкаю ўздыхне: як жа добра, што гэта сон.

З дзвярэй вываліла хеўра. І ён зразумеў, што ўсё адбылося напраўду. Яго аблапошылі, выцягнулі грошы. Немалую суму. Ліхаманкава перабіраў у памяці, што яшчэ было ў партманеце. Візітоўкі з ягоным прозвішчам, тэлефонамі — рэдакцыйным і хатнім, квіток на рамонт гадзінніка, дзе ўказаны адрас. Божа!.. Грошай ужо не было шкада. Свядомасць крычала, што самая жудасная страта — гэтыя візітоўкі і квіток. Розум яшчэ не ў стане быў праясніць, чаму менавіта яны. Шок быў моцны і нечаканы. Аглушыў як даўбешкаю.

Чуйкевіч на нягнуткіх нагах падступіўся да хеўры.

— Хлопцы, у мяне толькі што спёрлі партманет, дапамажыце знайсці,— звярнуўся ён малітоўным голасам, каб паказаць, што нікога не вінаваціць.

— А пры чом здзеся мы? — азваўся п'янаваты хлопец з нямытымі патламі, ці не самы малодшы.

— Вы там, у магазіне, былі... Можа, бачылі? — Чуйкевіч гаварыў і адчуваў, што ягоны зварот па дапамогу бязглузды і безнадзейны.— Грошы няхай забіраюць, там дакументы...

— Ну ідзі, паглядзі...— абыякава параіў хлопец, па-піжонску ўцягваючы ў плечы патлатую галаву.

— Куды? — не зразумеў Чуйкевіч.

— Ну, туды...— паказаў на дзверы.

Залезці туды, да прылаўка, скрозь раз'юшаны натоўп, бачыў Чуйкевіч, не ўдасца. Ды і сэнсу няма.

Хто табе верне партманет, калі наўмысна яго выцягнуў.

— Дзе там яго знойдзеш! Мужыкі, ну дапамажыце...— маліў Чуйкевіч, бачачы, як шушушкаецца хеўра, скоса зіркае ў ягоны бок. «Яны могуць і пырнуць!..— спалохаўся ён.— Ці пабіць... І ніхто не рыпнецца мяне абараняць». Адступіўся далей ад хеўры. Але той п'яны смаркач прысунуўся да яго. Дыхаючы едкім перагарам, раптам міралюбна спытаў:

— Ты колькі можаш выпіць? Адну? А я тры! І на кожны дзень трэба.

Пару чалавек з хеўры, з безнадзейна спітымі, дэгенерацкімі мордамі, паперліся зноў у дзверы. Перад імі надзіва лёгка натоўп расступіўся. Неўзабаве яны вынеслі па бярэмю бутэлек. Да іх падышоў даволі прыстойнага выгляду дзяцюк. У «варонцы», чорных туфлях на тоненькай платформе, белыя шкарпэткі бліскалі з-пад калашын клятчастых штаноў, як голыя косткі.

«Хутка пусцілі ў ход мае грошыкі»,— падумаў Чуйкевіч. Сціснуў ад крыўды і бяссілля зубы. На шэрай каструбаватай сцяне вялізнага ваеннага універмага віселі два абшарпаныя тэлефоны-аўтаматы. Можа, пазваніць у міліцыю? Ага, будуць яны чакаць, покуль прыедзе міліцыя. Як бы счытаўшы ягоныя думкі, хеўра ўмомант разбрылася ў розныя бакі. Дзяцюк у «варонцы» сеў у барвовыя «Жыгулі», што стаялі блізка на дарозе, і пакаціў. Мабыць, дзесьці на кватэры яго чакае шлюха. Яны вып'юць і лягуць з ёю ў ложак. А ты, дурань, стой, апляваны, раздаўлены. Куды ісці? Усё-такі, можа, заявіць у міліцыю? Заяву там возьмуць. А што далей? Хто будзе шукаць гэтых кішэннікаў, калі столькі забойцаў, гвалтаўнікоў, рабаўнікоў гуляе на волі. Злачыннасць расцвіла буйным цветам. Мутным патокам заліла вуліцы, рэстараны, пад'езды. «Сінія» аб'явілі сябе паважанымі людзьмі. Ні створаныя аддзелы па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, ні «аманаўцы» з гумавымі палкамі на поясе не маглі даць ім рады. Людзі жылі, баючыся за сваё жыццё. Прыстойна апранутаму хоць не выходзь на вуліцу.

Нават калі ўявіць, што злодзеяў зловяць, бадзяцца на ўсе гэтыя допыты, вочныя стаўкі, суды Чуйкевіч бы не змог. Яны знервавалі б яго нашчэнт, знясі-

лелі маральна, бо там трэба быць як бы ў ролі прасіцеля.

Грошы, якія ўкралі, ён нёс жонцы. Яна збіралася на выхадныя ехаць да бацькоў у райцэнтр. Там на «таўкучцы» хацела тое-сёе сабе і дзецям купіць. Чуйкевіч быў супроць іменна такіх пакупак, шкадаваў на іх грошай. І вось Бог усё ўбачыў і пакараў яго. Значыцца, ён не меў рацыі ў сваёй нязгодзе з жонкаю. Колькі ён будзе цярпець ад сваёй непахіснай упэўненасці, што ні ў чым не памыляецца?

У сейфе ў Чуйкевіча ляжала яшчэ ладная сума. І ён у напаўцямным стане паехаў у рэдакцыю. Рашуча адчыніў дзверы кабінета, паказваючы Люшчэні, што спяшаецца. Адамкнуў сейф, узяў пачак дзесяцірублёвак і, не сказаўшы ні слова, выйшаў.

Два магутнейшыя стрэсы глушанулі па галаве. Нервы былі напятыя, аж звінелі. Здавалася, лопнуць ім не давала ўсяго танюсенькая павуцінка. Гэтая павуцінка не адпускала ягоную свядомасць за мяжу, за якой пачынаецца разбурэнне.

А міма беглі ашалелыя людзі, захаканыя, спацелыя... Яны беглі, хоць за імі ніхто не гнаўся. Стаяў ціхі вечар. Слаба чулася ззімавалае цьмяна-ружовае сонца. Каля броўкі тратуара бялеўся цвёрды снег. Асфальт быў сухі, шэры, толькі трэшчыны мокрыя і чорныя, як вужы.

Чуйкевіч падняў каўнер плашча.

Жанчына ў белым халаце і пуховай хусце, з чырвоным абветраным тварам і бэзавымі губамі прадавала агуркі — чыстыя бліскуча-зялёныя таўкачыкі са звялым банцікам жаўтацвету са святлейшага канца.

Чуйкевіч купіў два агуркі.

Жонка сустрэла яго каля парога. Здзіўлена спытала, што з ім. Пад вокам у яе была радзімка ў форме кроплі — як застылая чорная сляза. Калі жонка моргала, здавалася, што сляза капае, а на яе месца набягае яшчэ адна.

Чуйкевіч думаў, што знешнім выглядам ён не выявіць сябе. Лічыў, усё ў ім ранейшае, без змяненняў. Аказваецца, здарэнне налажыла на яго адбітак. Мусіць, на вочы, на паводзіны, рухі.

Ён адказаў, што ўсё о'кэй. І аддаў пачак грошай жонцы, пажартаваўшы:

— Добрая ты ў мяне жонка, ды каб яшчэ чужая.

Яна недаверліва, нейк без ахвоты ўзяла. Нязвыкла ёй было, што ён без просьбаў і напамінкаў так расшчодрыўся. І тады, калі ён выняў з дыпламата і паставіў на стол дзве бутэлькі, яна нават не падумала яго дакараць. Чаму б і самой ёй не выпіць перад выхаднымі? Не святуння ж яна. Жывы чалавек, і жанчына яшчэ не мёртвая.

Чуйкевіч амаль не п'янеў. Ён не весялеў, і яго не цягнула на размовы. Стан ягоны сапраўды быў дзіўны. Ён ведаў прычыну гэткіх сваіх паводзін. Але жонцы пра яе не казаў. Не хацеў папрокаў. Калі не адразу, то пасля яна абавязкова прыгадвала ўсе ягоныя правінкі. Зрэшты, ён нічым не розніўся ад яе і ад астатніх людзей. А дарма. Бо ведаў жа закон: не даказаўшы сабе — не даказвай іншым; даказаўшы сабе, няма сэнсу даказваць іншым. Але была, мабыць, сіла мацнейшая за яго. Мы шмат што разумеем у спакоі і забываем яго ў спрэчках.

Сядзеў за сталом. З сумам тупіўся ў цёмны акіян вакна. Бачыў на вуліцы адно ліхтары ды рознакалёрныя прамакутнікі святла ў бясконцасці цемры. Думкі цяжкія, якіясьці забранзавелыя. Нават не хочацца запісваць у дзённік.

З жонкаю яны дапілі гарэлку. Ён саставіў бутэльку па звычцы на падлогу за ножку стала: каб не бачылі дзеці.

## РАЗДЗЕЛ 7

Заснуў хутка. Спаў моцна і, калі прачнуўся, вакно ледзьве шарэла вузенькаю палоскаю між цёмна-барвовых штор. На дварэ яшчэ не было чуваць прыбіральшчыцы, маладой дзяўчыны, якая звычайна падмятала, грэбла, ляскала восілкаю вядра. Па халаднаватай вусцішнасці, што адчувалася ў грудзях пад лыжачкаю, зразумеў, што заснуць зноў яму не ўдасца. Уключыў насценны свяцільнік, тузануўшы за шнурок. Ляжаў, гледзячы ў столь на цёмныя кружкі — ад гумавых стрэл-прысосак, што пускалі з дзіцячага пісталета Арцём і Вася. Ніякай злосці за гэтае свавольства на сыноў не было. Не да гэтага. Абурала несправядлівасць: за што ён пакутуе? Паклёп, а цяпер яшчэ і крадзеж... Ну, няхай бы напраўду штосьці ўчыніў, у нечым правініўся. Чаму ён павінен цярпець

невінаваты? Урэшце, што гэта за грамадства, у якім чалавек пакутуе без віны? А колькі помніцца, усе ягоныя перажыванні былі ад чыёйсьці несправядлівасці. У кожным разе, так яму здавалася.

Пабольвала галава, чуваць было, як штурхалася ў скронях кроў.

У восем гадзін Чуйкевіч набраў нумар тэлефона Пракуратуры. Голас у трубцы азваўся мужчынскі.

— Пётр Пятровіч? — І Чуйкевіч назваў сябе.

— Можаце а дзесятай гадзіне пад'ехаць? — спытаў Пётр Пятровіч.

— У мяне ў дзесяць семінар у райкаме партыі. Можа, пасля?

Пра райкам Чуйкевіч сказаў свядома. Няхай ведае гэты праваахоўнік, што ён, Чуйкевіч, чалавек не выпадковы, звязаны з саліднай установаю. І тут недаверу ніякага не можа быць.

— Не. Я буду заняты. Толькі цяпер.

Мабыць, упершыню Чуйкевіч адчуў такую непахіснасць, няўступчывасць. І адразу ўразумеў, з кім, якімі органамі мае справу. Што ж, нічога іншага не заставалася рабіць, як званіць інструктару Малкавай і казаць, што не зможа быць на семінары. Канкрэтнай прычыны Чуйкевіч не назваў, але намякнуў, што не па якіхсьці палітычных матывах яго запрашаюць у Пракуратуру. І, здаецца, трывогі ў Малкавай не выклікаў. Што за рабская псіхалогія — не здацца кепскім? Так, чалавек — раб, ён не можа адчуваць сябе вольна, бо не ўсё яму дазволена. Дазволіць усё — гэта значыцца, не толькі не прызнаваць грамадскіх нормаў, але і даць волю цёмным інстынктам. У такім разе ты — ужо не чалавек.

Голас: «Не раб — не чалавек».

Едучы ў тралейбусе, тужліва глядзеў на вуліцу. У светлым небе над царквою гарэлі тры залатыя крыжы. Два вышэйшыя і адзін, пасярод, ніжэйшы.

Пракуратура месцілася ў нехлямяжым, зашарпаным мураваным будынку. Калі ішоў па калідоры, маснічыны пад нагамі рыпелі, як косці шкілета. У цьмянае, запыленае знадворку шкло біўся руды матыль з блакітнымі «вочкамі» на крылах. «І тут матыль?..» — здзівіўся Чуйкевіч. Усе фортачкі былі зачыненыя. На іх чарнелі гумавыя п'яўкі сігналізацыі. Не вельмі шануе ўлада свае праваахоўныя органы,

падумаў Чуйкевіч, прыгадаўшы, што райкамы, гаркамы, абкамы, не кажучы ўжо пра ЦК, маюць шыкоўныя сучасныя будыніны. Дзіва што: адпаведна будынку і важнасць ды патрэбнасць тых людзей, якія ў ім сядзяць. Марку партапаратчыкі трымаць умелі. Калі на пачатку сваёй працы Чуйкевіч дазволіў сабе жартачкі ў райкаме, сакратар па ідэалогіі, былая дырэктар школы, строга абарвала яго: «Вы дзе знаходзіцеся, Чуйкевіч? Гэта ж вам райком партыі, а не...» Яна не сказала, што «а не...», уклаўшы ўсю сілу сваёй перакананасці ў «райком партыі». А сапраўды: што такое райкам партыі? Не Богам жа выдзелены прыстанак. Крамольныя думкі няпрошана лезлі да яго.

Чуйкевіч пільна прыглядаўся да чорных прамакутнічкаў на дзвярах. У канцы калідора на абабітых рудым дэрмацінам дзвярах прачытаў: ПРАКУРОР. А справа былі яшчэ адны дзверы, за якімі сядзелі ягоныя памочнікі. Якраз яны і былі патрэбны Чуйкевічу. Думаючы, стукаць ці не, ён адчыніў іх. Па левую руку наводдалі за масіўным сталом, заваленым пірамідамі папер, сядзела жанчына. А проста перад ім — мужчына і... Субач. «Дык і яна тут!» — мільганула ў Чуйкевіча ў галаве. Ён зусім не чакаў сустрэць тут свайго істца.

— Пачакайце на калідоры,— сказаў яму Пётр Пятровіч. Гэта, без сумнення, быў ён. Падняўшы акуляры, праараў Чуйкевіча зачаравана-гіпнатычным позіркам знізу даверху і ўпіўся ў вочы. І лысая галава, і рукі ягоныя нерухома застылі. Ён адразу хацеў вызначыць, хто перад ім: злачынец, прайдзісвет, несумленны тып ці проста абылганы, няшчасны чалавек. Чуйкевіч не ведаў, кім ён здаўся памочніку пракурора.

— Дык я...— паказаў ён на Субач,— па гэтай справе.

— Усё роўна выйдзіце.

Яму адразу паказвалі, што ён тут нулік без палачкі. Дыктуюць яму, а не ён. Чуйкевіч выйшаў. На калідоры два ветэраны голасна гаманілі штосьці пра пенсію.

Стоячы каля вакна, глядзеў на шпака, які скуб пад плотам леташнюю сухую траву. На душы было паскудліва. З-за дзвярэй чуўся прарэзліва-пісклявы го-

лас Субач, далятaлі абрыўкі фраз: «Вы прачытайце... не, не верце... вы нічога не разумееце...» Пабачыўшы Чуйкевіча, яна відочна ажывілася.

«Толькі ж ці трэба гэтак націскаць і выклікаць сумненні ў таварыша памочніка пракурора?» — горка ўсміхнуўся Чуйкевіч.

Шпак наскуб поўную дзюбу травы і пырхнуў да раскірэчанай яблыні, над якою на жэрдцы сіратліва чарнела шпакоўня. Старая, з патрэсканай стрэшкаю, пазелянелай бакавінаю. Але шпака гэта не палохала і ён ладзіў у ёй гняздо. Спадзяваўся на мірнае жыццё.

Дзякуючы шпаку, Чуйкевіч забыўся і пра тое, дзе ён знаходзіцца, і пра свае нягоды. Кволыя шпаковыя крыльцы перанеслі яго ў маленства.

## РАЗДЗЕЛ 8

Кастусёк сядзеў пад хлявом і глядзеў на шпакоўню — да яе падляталі шпакі. Шпакоўня была новая. Ён зрабіў яе два дні назад са старых аполкаў і павесіў на ліпу. Шпакі прыляцелі рана, дзесьці ў самым пачатку сакавіка. Яшчэ ўсюды ляжаў снег, брудны, крупчасты. З-пад яго на дарогу выцякала рудая ад конскага гною вада. Толькі на полі ды на пагоне высунуліся чорныя гарбячкі, здалёку падобныя на шпакоў. Кастусёк перажываў, што шпакам цяжка шукаць сабе ежу. Яны і праўда сядзелі якіясьці паніклыя, надзьмутыя, як пакрыўджаныя, тоненька, вугнява пасвісталі.

Але дзесьці к жаночаму дню разгулялася сонца. Снег вачавідкі пачаў асядаць, забулькала весялей вада — і там-сям у спадзінах засінелі лужыны. З раніцы над сядзібамі вісела мяккая смуга, якая лашчыла не толькі вочы, але, здавалася, і душу. Кастусёк любіў такія раніцы. Ен забываўся тады на крыўды і няўдачы. Яму хацелася, расчуленаму да слёз, любіць усю зямлю, абдымаць і цалаваць маці, брацiка, бабулю Аксюту. І вёску сваю ён любіў бясконца, яе пачарнелыя на вясну хаты з мокрымі, як заплаканымі, вокнамі любіў, хоць і пахла на вуліцы прэллю і гноем. Але скульсьці з глыбіні зямлі прабіваўся і тонкі, ледзьве ўлоўны, нейкі саладкаваты водар чагосьці вельмі хвалюючага і жыццядайнага. У такія хвіліны яму здавалася, што любы хворы чалавек імг-

ненна ачуняў бы, калі б толькі глынуў гэтага водару. Зіма — гэта ангіны, кашлі, грыпы, насмаркі, а вясновае сонейка ўсякую немач адганяе за трыдзевяць зямель.

Чамусьці ягоная шпакоўня не вельмі падабалася шпакам. Спікіруе каторы да яе, з асцярогаю загляне ў дзюрку, ускочыць на стрэшку — і ходу. Здаралася, каторы залазіў і ўсярэдзіну, але тут жа вылятаў. Кастусёк не разумеў, у чым прычына. Як рабіў шпакоўню, думаў, яна самая лепшая і прыгожая ў свеце. Хіба параўнаеш са шпакоўняю, якую павесіў на клёне каля хаты дзед Аўтух. Яна ў яго якаясьці доўгая, з негабляваных дошак, з аднаскатнаю стрэшкаю; і пад лятком няма «лавачкі», каб садзіцца, проста да бакавіны прыбіта палачка — як быццам шпакам не садзіцца трэба, а барабаніць. А Кастуськова — сапраўдны церамок! Але шпакі чамусьці біліся за шпакоўню дзеда Аўтуха. Там іх сядзела каля дзесятка. Яны не закрывалі дзюбаў, спявалі заўзята, ажно ўстрэсвалі крыльцамі, на горле тапыршчылася пер'е. Калі на клён апускаўся чарговы залётнік, шпак-гаспадар вопрамеццю кідаўся ў шпакоўню і, высунуўшы жоўтую, як запалка, дзюбу, спяваў.

Кастуську было крыўдна, што шпакі абмінаюць ягоную шпакоўню. Здаецца, і памеры захаваў, і лятох адгладзіў рашпілем, і дзюркі ўсе заканапаціў пакуллем. Што, можа, месца, ліпа ім не падабаецца? У гэта мала верылася. Што ж тады? Часам Кастуську здавалася, што чалавек толькі дзеля таго і жыве, каб усяму шукаць апраўданні. Ён сядзеў, засмучаны пад хлявом, і ўсякія, благія і добрыя, думкі гняздзіліся ў ягонай галаве. І ўсё праз гэтую шпакоўню. Зрабіў добрую справу, але дарэмна, выходзіць, ад яе ніякай карысці. Не, тут штосьці не тое, трэба разбірацца. Кастусёк не патрабаваў ад шпакоў ніякай аддзякі за тое, што зрабіў ім дабро, але чаму яны не маюць ад яго карысці. Гэты маленькі, дробязны ўчынак абудзіў у ім такія думкі, быццам ён накарміў на зямлі ўсіх галодных. Пачуцці заўсёды аднакавыя, толькі мяняецца іх сіла, думаў ён. І любое маленькае пачуццё, яно кіруе чалавекам гэтак жа, як і вялікае. У гэтым, яму здавалася, і ёсць адгадка, чаму кожны чалавек — ч а л а в е к, дарослы ён альбо дзіця, вялікі начальнік ці звычайны калгаснік. Кастусёк апраўдвае

маленькае зло — і ўсе сокі ягонага страху і рызыкі, усе пачуцці ідуць па тых жа канальцах, па якіх бы яны ішлі, калі б ён апраўдваў самае жахлівае на зямлі зло — забойства. На гэтых просценькіх птушыных праблемах ён вучыўся розніць дабро і зло, матывы таго і другога. Навошта эксперыментаваць на людзях, калі высакародней гэта зрабіць на істотах несвядомых (а ці несвядомых?). І ён наважыўся на... злачынства. «Заткну ляток у шпакоўні дзеда Аўтуха, і шпакі пераляцяць на маю шпакоўню». Кастусёк выразаў таўставатае паленца, прыкруціў да яго сярэдзіны адзін канец алюмініевага дроту, а другі — да вялікай гайкі. Дачакаўся цемнаты, хуценька перамахнуў праз агароджу, спрытна, бы кот, узляцеў на клён і апусціў канец з гайкаю ў шпакоўню — паленца засланіла ляток... Божа, рукі і ногі ягоныя звяла сутарга, сталі драўляныя, перасохла ў роце, а сэрца бухала ў грудзях, як кувалда.

Уначы Кастуську сніліся кашмары. Чорная бадлівая карова па полі ганяе людзей. Ён хаваецца ў яму. Нібыта з маці. Карова падбягае. Ён думае: ці ўбачыць? Яна стаіць і качае лупаватымі фіялетавымі вачыма. Маці сказала раніцаю, што ён кідаўся ў ложку, стагнаў, падхопліваўся. А што канкрэтна снілася — успомніць не мог. Як заўсёды, выйшаў на агарод, і позірк ягоны адразу стрэльнуў на шпакоўню дзеда Аўтуха. Дзіва дзіўнае: там як ні ў чым не бывала сядзеў шпак і, бы на здзек, ледзьве не разрываўся ад спеву. Каля Кастуськовай шпакоўні было па-ранейшаму ціха.

«Ну, чаму, чаму ты не ляціш на ліпу? — пытаўся ён ў шпака, які сядзеў на клёне.— Ты ж усё роўна ў сваёй не можаш жыць...» Шпак быў няўмольны, а тыя, што прыляталі на Кастуськову, таксама не заседжваліся — скок-пырх і ў паветра.

Заўзяты спеў шпака дзеда Аўтуха прыцягваў іншых шпакоў. Яны апускаліся на клён, ды як толькі каторы падскокваў да шпакоўні, гаспадар кідаўся да лятка. Тачыўся ў шпакоўню, але не пралазіў. Кастуську было шкада і шпака, і самога сябе. Усё роўна не хочуць весціся ў ягонай шпакоўні птушкі, дык няхай хоць бы шпакоўні дзеда Аўтуха парадаваліся. Чым больш ён думаў, тым больш ягоны ўчынак здаваўся яму самай вялікай недарэчнасцю ў свеце. Ён

проста дзівіўся, як стукнула яму ў галаву такая дурнота.

Кастусёк ледзьве дачакаўся вечара. Цемнатою, абдзіраючы рукі і ногі, жывот, ускараскаўся на клён, выцягнуў са шпакоўні затычку.

Мусіць, з удзячнасці шпакі ўсё-такі занялі Кастуськову шпакоўню. Тыя, што позна вярнуліся з выраю і выбару ў якіх ужо не было. Перш з'явіўся на ліпе надзьмуты зеленавата-чорны самец; затым сваім рэдкім спевам ён завабіў рабенькую даўганосую самачку. І ўжо ў той жа дзень яны пачалі раз-пораз спускацца на зямлю, ірваць з-пад плота сухую леташнюю траву і насіць у шпакоўню.

Потым Кастусёк пабачыў іх сямейныя гульні: самачка падлятала да ганарлівага самца, садзілася блізка, упрыцірку — яны абодва трапяталі крыльцамі, і нарэшце самец з якімсьці пранізлівым цвірганнем адлятаў убок, садзіўся на частаколіну ці на зямлю, а самачка атрэпвалася, прыгладжвала пер'е на спіне.

Тыдні праз два каля шпакоўні стала ціха. З чырвоных тугіх пупышак на ліпе пачалі выкручвацца кутасікі клейкіх лісточкаў, зазелянела трава, перш асцярожна, лапікамі, а тады заліла ўвесь пагон роўным чыстым колерам. Кастусёк зразумеў, што шпакі селі на яйкі. Як і зразумеў ён, а можа, толькі адчуў сваёй неакрэплай дзіцячай душою: насіллем не прынясеш шчасця.

## РАЗДЗЕЛ 9

Адчыніліся дзверы, і выйшла Субач. Не паварочваючы галавы, сівая, з бляклымі выцвілымі вачыма, яна пракульгікала міма Чуйкевіча. Мочку вуха, бы гумавую, адцягвала і целяпалася завушніца з сіняга лазурыту.

Яму стала шкада яе. У свае немаладыя гады, без святасці ў душы, без боязі перад Богам, яна распачала з ім гэтую несумленную валтузню. За што, дзеля чаго? Не знайшоўшы адказу, Чуйкевіч упершыню падумаў, што ёю хтосьці кіруе, за ейнай спінаю стаяць варожыя яму людзі. Зло, яно хаваецца толькі да пары да часу, як кіпцюры ў тыгра ў мяккіх падушачках.

Мабыць, Пётр Пятровіч не чакаў, што Чуйкевіч

адразу ж зойдзе. Ён сядзеў, усунуўшы галаву ў вялізны (такіх вялікіх Чуйкевіч яшчэ не бачыў) сейф. Лысіна нізка выпалала патыліцу. Заставаўся толькі вузенькі перашыек рэдзенькіх валасоў каля самага каўняра. На маленькім куцанькім носіку акуляры кепска трымаліся, спаўзалі, і ён раз-пораз падпіхваў іх пальцам уверх.

Пачуўшы крокі, сутаргава прыкрыў дзверцы, зноў глянуўшы паўзверх акуляраў на Чуйкевіча пранізліва-падазрона. Запрасіў сесці. Чуйкевіч не без грэблівасці апусціўся на крэсла, на якім толькі што сядзела Субач. Ды не будзеш жа ігнараваць ветлівасцю гаспадара кабінета.

— Знаёмыя?

— Дзіва што.

— Вось піша, што не друкуюць яе.

— Колькі соцень такіх... ды куды лепшых аўтараў, мы не друкуем. Усіх не надрукуеш.

— Аўтары атакуюць? — спытаў Пётр Пятровіч нечакана міралюбна, ледзьве не ліслівым голасам. Чуйкевіч здзівіўся, як хутка і ўмела ён мяняе інтанацыю.

— Такі іхны лёс,— адказаў Чуйкевіч, надаючы голасу спакой і ўпэўненасць. Але — толькі ці адчуваў гэта Пётр Пятровіч? — голас здраджваў, выдаваў хваляванне.— Ідуць на ўсё, як то кажуць, выкарыстоўваюць любыя сродкі, каб надрукавацца.

Чуйкевіч расказаў пра цяжкасці, з якімі сутыкаецца на працы. Пётр Пятровіч слухаў яго ўважліва, але з недаверам. «А ці маюць гэтыя людзі тут увогуле права быць даверлівымі?» — падумаў Чуйкевіч. Узяў увагу, што і жанчына, даўганосая, з пафарбаванымі рыжымі валасамі, за сталом злева глядзіць на яго. Вачыма яна як быццам штосьці прасіла ці хацела спытаць. Гэтыя немаладыя праваахоўнікі, мабыць, упершыню сутыкнуліся з такою справаю.

— Як складваліся адносіны з Субач? — Пётр Пятровіч скіроўваў аповед Чуйкевіча да канкрэтнасці. Давялося выкладваць усё. Як не згадзілася яна з адмоўнай рэцэнзіяй на ейны рукапіс. Часта звоніла і казала, што гэта змова яўрэяў супроць яе (скульсьці былі ў яе звесткі, што рэцэнзент — нібыта яўрэй, які замаскаваўся, змяніўшы прозвішча). Ён ставіўся да яе са спачуваннем, тактоўна і вытрымана. Яна не

сунімалася. Перайшла на падхалімаж і несусветную пахвальбу ягоных твораў. Яшчэ казала, што ведае ягонага бацьку — разумны мужчына! Зразумеўшы, што і гэтым не ўзяла — ён непахісна стаіць на сваім,— перанесла агонь крытыкі на яго. І тут выплыла ейнае дамаганне — быццам ёй не вярнулі другі экземпляр.

Яна паскардзілася ў камітэт па друку. Адтуль заявіўся чыноўнік — ружоватвары жыццярадасны ветэран, навёў у Люшчэні даведкі. Роспісу, што аўтарка забрала рукапіс, не было, толькі паметка літсупрацоўніцы «Рукапіс вернуты аўтару» і дата: 9.XI.87 г. Чыноўнік застаўся задаволены. Чуйкевіч думаў, што Субач пасля гэтага адчэпіцца. Ды дзе там! Зноў пачала званіць і патрабаваць, каб ёй вярнулі другі экземпляр. «Ведаеце што,— казала яна таямнічым голасам,— у мяне знаёмы ў міліцыі... Ён дакажа, што вы прысвоілі мой рукапіс». Чуйкевіч слухаў старую спакойна, не падазраючы пра ейную хваравітую кругню ў галаве, пра хцівасць намераў.

Аднаго разу яго паклікалі ў калідор, на лесвічную пляцоўку. Там стаяла Субач і з ёю пажылы мужчына з планкаю ўзнагарод, якая прыкрывала прапаліну на лацкане пінжака. Субач адышла ўбок, а мужчына сказаў яму, як здалося, шчыра і так, быццам не першы раз бачыць Чуйкевіча, а ведае сто гадоў: «Скажу вам, яна хворая жанчына... Дапамажыце ёй. Давайце забудзем пра другі экземпляр, толькі надрукуйце яе рэч... Можна без ганарару». Чуйкевічу не хацелася крыўдзіць пажылога чалавека, ва ўзросце ягонага бацькі, ды вымаганне абурыла яго. Ён сказаў цвёрда, але ціхім голасам: «Па-першае, з другім экземплярам — гэта выдумка, калі не сказаць мацней. Па-другое, пры ўсёй прыхільнасці да аўтара гэткую слабую рэч мы не можам надрукаваць хоць з ганарарам, хоць без ганарару».

Яны яшчэ доўга спрачаліся. З кожнай хвіляю трацілі цярплівасць. Нарэшце падышла Субач і сказала, што яна заявіць у следчыя органы. І зноў Чуйкевіч выслухаў гэта абыякава, як намер запалохаць яго. Можа, праз паўгадзіны выпадкова ён убачыў, што пажылая пара выкулілася з кабінета галоўнага рэдактара. Каб Ямачка не аказаўся аблытаным хлуснёю, Чуйкевіч зайшоў да яго. «Ат, што яна, што

ён!» — махнуў рукою Ямачка, не жадаючы ўдавацца ў падрабязнасці.

Пра гэта распавёў Пятру Пятровічу Чуйкевіч. Распавёў грунтоўна, упэўнены ў сваёй праўдзе. І тут Пётр Пятровіч з іезуіцкай ухмылачкаю выцягнуў з прыскрынка стала аркуш. Гэта была заява Субач. Чуйкевіч гідзіўся браць яе ў рукі і чытаць.

— Пачытайце, пачытайце...— памуліў вуснамі Пётр Пятровіч і падпіхнуў з носіка акуляры.— Яна, між іншым, патрабавала зарэгістраваць сваю заяву у журнале нумар адзін і ўзбудзіць крымінальную справу па артыкуле 108.

Чуйкевічу нічога не сказаў журнал пад нумарам адзін, як і артыкул 108, але ён адчуў, што гэта самы страшны журнал і не меней страшны артыкул. І ўпамянуў іх Пётр Пятровіч, магчыма, з мэтаю застрашвання. А можа, паказваў сваю лаяльнасць.

Чуйкевіч скіраваў безуважны позірк на паперу — і раптам ягоныя валасы, адчуў, пачалі шорхнуць як ад марозу. Субач абвінавачвала яго ў... плагіяце*.

— Гнюсная хлусня! — сказаў Чуйкевіч і адсунуў заяву, не дачытаўшы яе.— Або трызненне... прабачце, але не мая справа ставіць дыягназы.

— Зрэшты, трэба будзе пацікавіцца ў псіхадыспансеры, ці стаіць яна на ўліку.— Пётр Пятровіч адчыніў сейф, дастаў адтуль ягоную перадапошнюю (чаму не апошнюю?) кнігу, нумар «Ідэі перамагаюць» і нумар тоўстага рускага часопіса, у якім была надрукавана ў перакладзе ягоная аповесць; ксеракопію вокладкі «Ідэі перамагаюць» з партрэтамі лаўрэатаў года; тоўстую папку з яе, ужо вядомай Чуйкевічу пэцканінаю, і тоненькую, цэлафанавую, з выяваю Крамля. Што было ў ёй, Пётр Пятровіч покуль не стаў паказваць. Але што б там ні было, Чуйкевіч ужо адчуваў сябе абражаным. Абразлівы гэты выклік, сама пастаноўка пытання, гэтае подленькае падсоўванне ўлік. І ён не ўстаў і не ляпнуў дзвярыма адно

* Плагіят (ад лац. plagiatus — выкрадзены) — выдача чужога твора за свой або выкарыстанне ў сваёй працы чужога твора без спасылкі на аўтара (ТСБМ у 5-ці тамах. Мінск. Галоўная рэдакцыя Беларускай савецкай энцыклапедыі. 1980). У СССР прадугледжана крымінальная адказнасць за такое парушэнне аўтарскіх правоў.

таму, што быў не зусім кепска выхаваны ды не хацеў сеяць у душы яшчэ большую няпэўнасць. Сказаў Пятру Пятровічу, што не можа каменціраваць тое, чаго няма. Нават калі ісці найпрасцейшым лагічным шляхам: аповесць ён напісаў у 84-м годзе і аддаў у часопіс, а Субач прынесла сваю графаманію ў 87-м, хоць у заяве нахлусіла, што ў 86-м. Чаму нахлусіла? Хацела апярэдзіць час выхаду ягонай аповесці ў часопісе? І гэта не ягоная, а менавіта ейная метода «творчасці» — плагіят. Чуйкевіч паказаў Пятру Пятровічу рэцэнзію, якую прадбачліва захапіў з сабою. Там указвалася, што Субач багата якія старонкі бессаромна паспісвала з мемуараў военачальнікаў. Вось адкуль узнікла вар'яцкая ідэя вінаваціць у цяжкім граху іншага!

Пётр Пятровіч папрасіў, каб Чуйкевіч прынёс выпіску з журнала рэгістрацыі, засведчаную пячаткай. Ішлі па калідоры ўпобачкі. Пётр Пятровіч кудысьці спяшаўся. На развітанне сказаў, што, калі яго пасля абеду не будзе, пакінуць выпіску ў канцылярыі.

Чуйкевіч зрабіў выпіску неадкладна. Яму хацелася як хутчэй адкараскацца ад гэтага бруду, змыць і забыцца на яго. Ямачка, нічога не пытаючыся, падпісаў паперыну, а бухгалтарка, хукнуўшы, дбайна прыляпіла пячатку. Чуйкевіч зноў паджгаў у Пракуратуру.

Пятра Пятровіча не было. І ён занёс выпіску ў канцылярыю, аддаў яе напамаджанай, з пакамечаным тварам маладзіцы, вочы якой двума фантанамі вылівалі сум.

Нібыта браўся вясёлым, але ў якісьці момант на Чуйкевіча зрынаўся адчай. Нямілы быў свет. Не пакідалі, навязліва сядзелі ў мазгах думкі пра гэты паклёп на яго, пра выкраданне партманета. І не столькі пра страту, колькі пра наступствы. Ён успомніў, што ў партманеце яшчэ была квітанцыя на падпіску на Уладзіміра Караткевіча, у якой таксама ўказаны адрас. Вось, калі ласка, вам, рабаўнікі, адрас багатага чалавека: не кожны носіць у кішэні сотнямі грошы. Дый ягоныя рэгаліі на візітоўцы прайдзісвету шмат маглі сказаць. Хто дасць гарантыю, што рабаўнікі не пакарыстаюцца гэтым? Цяпер пра такія факты багата пісалі газеты. У яго два сыны, ходзяць у школу. Могуць залучыць кагосьці з іх, каб шантажыраваць і вы-

магаць. А за дзяцей ён пойдзе на ўсё. Мо пазваніць знаёмаму генералу міліцыі, параіцца? Але покуль рана, толькі здасца падазроным.

Не хацелася ехаць дахаты, быць у кватэры аднаму. Перадусім ухваліўшы жончыну задуму адведаць на выхадныя бацькоў, Чуйкевіч ужо шкадаваў, што гэтая паездка выпала акурат цяпер, у трывожны, няздатны момант. Каб выпрабаваць чалавека на трываласць, лёс пасылае яму ўсякія цяжкасці. Часам яны неверагодна спалучаюцца, і чалавек не вытрымлівае... Страчвае розум альбо заканчвае жыццё самагубствам. Не кожны ў наступ на страх і безвыходнасць зможа кінуць мужнасць і волю. «Чалавек павінен устаяць супраць зла!» — вось табе, пісьменнік, лозунг на ўсе вякі.

Нядаўна яму нават прычаўплося ў сне. Яны з жонкаю між рэек. І цягнік набліжаецца — не паспеюць адбегчы. Кладуцца і прыціскаюцца да зямлі як ніжэй. Грукаціць над імі цягнік — як быццам бяжыць уздыблены час. І думае Чуйкевіч: толькі падніміі ледзьледзь галаву — знясе як порхаўку. Яму здаецца, што цягнік ідзе бясконца доўга, як бы ў тунелі ўжо, і адчувае, што не вытрымае, звар'яцее. І тут — святло, прастор, збавенне...

На ўсякі выпадак Чуйкевіч адчыніў паштовую скрынку: можа, укінулі партманет з паперамі. Дзе там! Што яны, кішэннікі, дурныя пакідаць адбіткі пальцаў. Наіўняк ты, Чуйкевіч!

Кватэра здалася халоднай, няўтульнай, быццам з яе даўно выветрыўся жылы дух. Чуйкевіч садзіўся чытаць газеты, глядзець тэлевізар, але не ўспрымаў ні тое, што чытаў, ні тое, што бачыў. Аказваецца, ёсць у ім штосьці мацнейшае за розум. Розум загадвае, але нічога не можа зрабіць з тым «штосьці». Яно бярэ верх і дыктуе ўмовы, свае думкі. Думкі, якіх ён баяўся і не хацеў, каб яны былі. Ён ставіў запруды іхнай плыні, але гэтыя запруды лёгка, як пясок, разбураліся. Думкі плылі міжволі... Цікава, яны нараджаюцца толькі ў табе і з цябе ці без тых людзей, пра каго думаеш, іх бы не было?

Голас: «Думкалініі цягнуцца ў космас».

## РАЗДЗЕЛ 10

...Аднаго разу Кастусёк прачнуўся ў цёмнай хаце Гукнуў маці, бабулю — цішыня. Яго апанаваў страх. Адзін ды ў цемры. Можа, гэта ён не ў хаце, а дзесьці пад зямлёю ці ў якой пячоры. Ён скаціўся з палка на падлогу, кінуўся да дзвярэй. Дрыготкімі рукамі намацаў клямку, націснуў на язычок, штурхануў ад сябе дзверы — яны не адчыняліся. «Замкнутыя!..» Аб'інелы язычок студзіў вялікі палец, ён памярцвеў, як памярцвела і ўсё Кастуськова нутро.

Ён намацаў у качарэжніку вілкі і на сутаргавых нагах падбег да вакна. Тыцнуў імі — зазвінела шкло.

Голы, у трусах і зрэбнай кашульцы, ён выскачыў у вакно з хаты на снег. Стаяла ноч. Над Кастуськом было зорнае неба, таямнічае, зеленаватае, недасяжнае. Цемра выштурхнула Кастуська на мароз, у гэтае мярэжлівае святло. Ён не ўсведамляў, што за страху нагнала на яго цемра. Што ў ёй небяспечнага — здані, злодзеі, цыганы, міліцыянер? Менавіта імі палохалі дарослыя дзяцей і яго. Увогуле ён не разумеў, чаму павінен кагосьці баяцца. Нават маці і бабулю Аксюту, якія маглі адсцябаць матузамі, джыгнуць дубчыкам. Хто яму і дзеля чаго перадаў гэты страх? Няўжо ўсё толькі праз тое, што ў яго няма бацькі? Скуль было ведаць яму, горкаму дзіцяці, што страх гэты перадаўся яму генетычна ў спадчыну ад бацькі. Той страх, які пры Сталіне назвалі дысцыплінаю. І ад маці — страх голаду, жывёльны страх выжывання.

Кастусёк стаяў прыціснуты да сцяны. Яго калаціла ад неўсвядомленага страху і холаду. Ён пераступаў з нагі на нагу і чуў, як рыпіць снег.

Дзе ж падзеліся бабуля і маці? Яны замкнулі яго і кудысьці пайшлі... Ці гэтак жа нечакана зніклі, як бацька? А Глебік дзе? Здаецца, каб дзверы былі незапёртыя, ён не адчуваў бы такога страху і, можа, ужо ў сенцах супакоіўся б. Ён быў бы ўпэўнены, што пры небяспецы можна вырвацца.

У Кастуська дубелі ногі, густа пакалвалі, быццам за скуру чапляліся шышкі дзядоўніку. Ён адчуваў, як холад і страх выціскаюць з ягонага цела душу, вось яна ўжо над ім, і ён бачыць сябе з неба маленькім сінім камячком...

«Бойся замкнутай прасторы!» — прагрукатаў

чыйсьці Голас. Ён сказаў Кастуську: «Ты маленькі, духова чысты хлопчык, Кастусь. Ты ні ў чым і ні перад кім не вінаваты. Але я штурхну цябе ў самую бузу чалавечых заган і пакажу табе ўсё хараство, што ёсць у свеце. Ты ўбачыш тое, што табе і не снілася. Ты не зразумееш таго, што ўбачыш. Ты ўвогуле не павінен разумець дарослых. Ты яшчэ зусім малы, табе толькі восем гадкоў. Хоць ты і сур'ёзны хлапец, але забавы ў цябе дзіцячыя. Ты не павінен пераскокваць дзіцячы ўзрост. Наадварот, ты павінен яго расцягнуць. Твае розум і сэрца будуць цягам усяго жыцця вяртаць цябе ў дзяцінства. Калі будуць рушыцца сцены твайго розуму, застанецца адно самая ніжэйшая частка — падмурак, закладзены ў дзяцінстве. Гэты падмурак вытрывае пэўны час, які — я называць табе не буду, і на ім ты пабудуеш новы палац розуму, больш дасканалы і ўстойлівы пад землятрусам нягод і людзінай подласці. Гэты палац яшчэ доўгі час будзе пуставаць.

Ты марыш стаць дарослым. Ты, Кастусь, памыляешся. Гэтае тваё імкненне — першая істотная памылка ў жыцці. Калі станеш дарослым, будзеш не адзін раз жадаць вярнуцца ў свет дзяцінства. Але толькі памяццю будзеш вяртацца ў яго ды перад сном, каб заснуць, у цяжкія хвіліны.

Насычай сваю памяць малюнкамі прыроды. Ты кажаш, нецікава глядзець на лес, на неба, на снег, на траву, на ваду і на кусты? Гэта залежыць ад тваіх розуму і сэрца.

У лесе ты ўбачыш вавёрку.
На снезе — след.
У траве — кузурку.
На вадзе — жабу.
У кусце — птушынае гняздзечка.
Гэта — НАТУРА.

Усё гэта ёсць дзеля цябе. Яно жывое, як і ты. Яно не хоча няволі, як і ты. Яно баіцца замкнутай прасторы, як і ты. Не верыш? Вядома, ты не верыш, інакш не рабіў бы тое, што задумаў. Не ты сам, гэта д'ябал наштурхнуў цябе лавіць у сіло сінічак. Я ўсё бачу і ведаю, бо я вельмі высока і вельмі блізка.

Ты адарваў пад страхою хлява апошні аполак, рассунуў і так рэдкія сцяблы кукурузы, каб не замятала ў сянніцу снег. Ад гэтага аполка ты адрэзаў

пілою пядзі на дзве плашку. Малаток, цвік ты ўзяў з бацькавай сталярскай скрыні, запалкі ў пячурцы. Самае складанае для цябе — конскі волас. Ты пачынаеш думаць, як яго дастаць. Гэтае «як» усё жыццё будзе ўсплываць у тваёй галаве. «Як» дабіцца чагосьці і «як» знайсці выйсце? Ты зразумееў, што «як» патрабуе ад цябе гвалту над сабою, чорных кропляў на светлае поле душы. Надыдзе час — і душа твая счарнее. Гэта ёсць жыццё.

Не бойся пераадольваць сорам, Кастусь!»

**РАЗДЗЕЛ 11**

Маруся з маці насілі Глебачку ў шэпты да Лісаветкі. Начамі ён румзаў і не спаў. Пасля таго, як выпудзілі дзядзькі ў шынялях, што прыйшлі па Рыгора. Яны моцна грукалі ботамі, імі адчынялі дзверы.

## ЗАМОВА АД КРЫКСЫ

Першым разам, добрым часам. Госпаду Богу памалюся, матцы прачыстай пакланюся. Матка божая, святая, стань, стань жа мне на помач, рабу божаму, младзенцу, крыксы гаварыцці. Зора-зараніцы, красныя дзявіцы, вазьміце вы крыксы-начніцы — і бацькавы, і матчыны, і дзявоцкія, і парабацкія, і жаласныя, і карысныя, і ўсцешныя, і пасмешныя, і светавыя, і заравыя. І вам, зорачкі, на стаянне, а рабу божаму, младзенцу, на здароўе; вам, зорачкі, пасвяціці, а рабу божаму, младзенцу, паспаці.

Даў Бог, што Маруся з маці вярнуліся на мінуту раней. Гэтай мінуты было б даволі, каб Кастусёк акалеў канчаткова.

**РАЗДЗЕЛ 12**

Кастусёк узяў нажніцы і адвячоркам падаўся да стайняў. Ён нічога яшчэ не рабіў, але ўжо палахліва азіраўся. Думкі больш наганяюць страху, чым учынкі.

Стайні былі ў вялізнай драўлянай будыніне — даўнейшым гумне. Ён ведаў, што ў адным вакне няма

шыбкі, з яго заўсёды пёрла пахкая густая пара, два верхнія вянцы над ім аб'інелыя. Ён меркаваў улезці ў гэтае вакно, балазе сумёт яго панізіў да росту.

З боку сасонніку, адкуль калісь набягалі і ваўкі, ён падкраўся да стайняў. Прысеўшы пад вакенцам, прыслухаўся. Цішыня, толькі форскаюць за сцяною коні, стукаюць капытамі ў жэрдкі. Вёрткім тхаром ён прашмыгнуў у стайні і замёр, каб агледзецца, абвыклі ў цемры вочы.

Праз вокны з процілеглых сцен цадзіўся морак. У стайнях было цёпла, як у лазні. Востра патыхала конскім потам і сцулямі.

Вочы ягоныя ўжо разнілі цёмныя жывыя сілуэты. Здавалася, усе коні павярнулі галовы да яго і стрыглі вушамі. Ён забаяўся, што яны прымуць яго за воўка і заржуць на ўсе стайні. Ён выпрастаўся, каб яны бачылі, што гэта чалавек, а ім ягоная постаць і не патрэбна была: яны выдатна чулі ноздрамі.

Кастусёк не ведаў покуль, што ў стайнях ужо ёсць адзін чалавек. Конюх, якога дражнілі Бунда. Ён быў нетутэйшы, прыблытаўся скульсьці ў суседнія Смародзічы. Там жыў у прымах. Кастусёк бачыў не адзін раз яго: белы зморшчаны твар і сінія размаляваныя рукі — «як у вязёнках».

А калі вочы асвоіліся і Кастусёк глянуў у кут — ногі ў яго падкасіліся. На варотцах загона стаяў Бунда, а задам да яго Найда — кабыла светла-папяловай масці, якая гады два невядома скуль прыбілася ў калгасны табун. Загон быў вузенькі, у ім зачынялі звычайна неаб'езджанага жарабка. Бунда быў без штаноў, ногі белыя, як папера, свяціліся ў паўзмроку. Ён то прыціскаўся да Найды, то адхіляўся, адштурхоўваючыся рукамі ад шырокага, як дзве ступы, крыжа.

У Кастуська застукала ў грудзях сэрца, ён баяўся, што яно разарвецца, не вытрымае таго, што ўбачыў.

Кастусёк убачыў тое, што ніколі не бачыў і пра што ніколі не думаў. Ён не разумеў таго, што ўбачыў, але быў стрэсены жудасцю, неправўдзівасцю ўбачанага.

Гарачыя абцугі ўхапілі ягоныя мазгі, патрымалі над агнём, акурат кавалак зялеза ў горане, і, перавярнуўшы, паклалі зноў у чэрап на ранейшае месца. Цяпер яны думалі інакш. І душа была ўжо не тая.

Кастусёк ластаўкаю вылецеў у вакно. Сасоннікам, полем, набіраючы ў катанкі снегу, палупасіў дахаты.

Пяць дзён ён сядзеў на печы і няўмелым плугам дзіцячага розуму араў непадатлівы дзірван дарослых таямніц.

## РАЗДЗЕЛ 13

Пётр Пятровіч тузануў ручку сейфа, ці не забыўся замкнуць, і, прыціснуўшы локцем папку, выйшаў з кабінета. Жаласна рыпалі пад нагамі масніцы. Пад гэтую музыку ён вываліў сваё паўнаватае цела на ганак. Невысокі кусцік бэзу абпырскаўся кволай зеленню разбубелых пупышак. Дыхаў вільгаццю падагрэты за дзень чарназём абоч дарожкі.

Пётр Пятровіч сам сабе пасміхаўся, раз-пораз хітаў галавою. Цікавая справа трапіла яму на стол, надзвычай цікавая. Старая карга, якаясьці графаманка, абвінавачвала пісьменніка, загадчыка аддзела саліднага часопіса ў плагіяце. З самага пачатку ён, лічы, не верыў ніводнаму ейнаму слову. А калі ён пабачыў «вінаватага», не сумняваўся ні на макулінку.

Але Пётр Пятровіч належаў да ліку тых юрыстаў, якія кіруюцца не юрыдычнай ісцінай, а собскімі амбіцыямі і маральнымі перамогамі. Ён лічыў, што кожны чалавек — маральны злачынец і патрабуе псіхалагічнага пакарання гэтак жа, як і крымінальны забойца. Таемна, нікому не прызнаючыся, ён ганарыўся, што яму дадзена права караць такіх маральных злачынцаў. Адзін з іх і быў пісьменнік Кастусь Чуйкевіч. Справа ягоная была загадзя а д к а з н а́ я, але ён не збіраўся яе закрываць. Вельмі лёгка, любата адна весці справу, у зыходзе якой з першага моманту не сумняваешся. А ўпэўненасць у рабоце — далёка не апошняя рэч. І менавіта яе ацэніць шэф, пракурор, калі ён пакладзе перад ім з бляскам расследаваную справу, першую ў іхнай практыцы. Дый сам адказчык, адпакутаваўшы ні за што, па вартасці ацэніць ягоныя прафесійныя навыкі пасля пастановы. Так што ёсць сэнс расцягнуць асалоду.

Блазенская ўсмешка выплыла на вусны Пятру Пятровічу. Ён бадзёра падпіхнуў пальцам уверх акуляры.

## РАЗДЗЕЛ 14

Зазваніў тэлефон. У Чуйкевіча мільганула думка: падыходзіць ці не? Было яму непамысна. Прапусціў два гудкі і ўзяў трубку. І — жах! — маўчанне. Хтосьці слухаў ягоны голас. Ён вымавіў толькі адзін раз «алё» і таксама маўчаў. Здранцвелая рука выпусціла трубку. «Яны!..» Ну, канечне ж, яны. Ужо званяць, вывучаюць сітуацыю. Чуйкевіч адчуў, як мандраж скруціў ягонае цела. Собіла ж яму застацца аднаму! Што цяперака рабіць? Прыйдуць, падбяруць ключ да дзвярэй ці ўвогуле ўзламаюць іх. Яго саб'юць, звяжуць і выпатрабуюць усё, што цюкне ім у башку. Ды гэта быў яшчэ не самы горшы зыход.

Ён уявіў, што будзе, калі заловяць Васю ці Арцёма, зацягнуць да сябе на кватэру і адтуль па тэлефоне будуць вярэдзіць, даючы трубку сыну. Той будзе плакаць, прасіць, маліць: «Тата, выратуй мяне, дапамажы!..» Ад такой сцэны, адчуваў, у яго не вытрымае, разарвецца сэрца. Добра, што покуль сыны з'ехалі з Мінска. Хоць на гэтыя тры дні, калі мярзотнікі асабліва актыўна, па свежых слядах абмяркоўваюць свой гнюсны план.

Чуйкевіч, мякка ступаючы, падышоў да дзвярэй. Віселі яны на трох завесах, два замкі, ланцужок. Завесы хліпкія, добра налегчы — і дзверы схвіцнуць. Ён пачаў думаць, як умацаваць. Узбуджаная падкорка пасылала імпульсы з уражлівай яснасцю і вынаходлівасцю.

Чуйкевіч узяў з рассоўнай рамонтнай скрыні шэсць доўгіх шурупаў і ўкруціў па адным вышэй і ніжэй кожнай завесы. Цяпер як ні штурхай дзверы, яны не саскочаць. Хіба што можна вынесці разам з вушакамі. Каб шурупы не кідаліся ў вочы і не дапытвалася жонка, дзеля чаго ўкруціў, Чуйкевіч квэцнуў па іх белай фарбаю. Цяпер калі і згледзіш іх, то падумаеш, што яны тут патрэбныя.

Чуйкевіч узяў дзверы на ланцужок, прачыніў іх — шчыліна здалася шырокай. З калідора можна лёгка прасунуць руку і выняць з паза фіксатар ланцужка. Не паспееш чымсьці і здзюжыць па руцэ зламысніка. Выйсце знайшлося хутка. Ён перанёс металічны касячок з пазам далей ад края дзвярэй і прыкруціў. Гэтым

разам адчыненыя дзверы пакінулі зусім вузкую шчыліну — хіба што для пальцаў. Здаецца, з боку дзвярэй ён забарыкадзіраваўся. У вакно не палезуць: кватэра на трэцім паверсе. А калі б была на першым? Чуйкевіч не ўяўляў, як бы ён ратаваўся сам і ратаваў сям'ю.

Напятыя цяглiцы рук і ног памалу мякчэлі. Ён спакайнеў сам. Але ўсё роўна душу халадзіла непрыкаянасць. Падумаў, што дапамагла б чарка. Але яе не было. Пачаў пракручваць у галаве, дзе яе дастаць. Толькі не на вуліцы, не ў чарзе.

Зноў трывожна зазваніў тэлефон.

«Чорт! Не буду падымаць трубкі». Ён стаяў спружана-сцяты каля тэлефона. Глядзеў на яго, покуль пасля чатырох гудкоў ён змоўк. Тады пачаў сябе дакараць: дарэмна не ўзяў трубкі. Можа, хто са знаёмых, можа, якаясьці важная справа. Але страх перамагаў: а калі вось цяпер, насупроць ночы, яму прад'явяць ультыматум — што тады? Міліцыя такая ж абаронца, як і Пракуратура, дзе з яго здзекуюцца. Пляваць ім на тваe правы!

Ён снаўдаў па кватэры, як зацкаваны звер па клетцы, бы тыгр, якога бачыў калісь у звярынцы на старой Камароўцы. Тыгр тыцкаўся мордаю між тоўстых жалезных прутоў, шчэрыў жоўта-рудаватыя сколатыя зубы і не знаходзіў выхаду. Трывожнаю таямніцаю насоўвалася на Чуйкевіча ноч.

Запелянаную страхам свядомасць раптам узарваў тэлефонны званок. Колькі часу мінула пасля апошняга, ён не занатаваў у памяці. Хвіля, пяць, паўгадзіны, гадзіна? Гэта яму ўяўлялася важным. Самым небяспечным прамежкам часу ён чамусьці лічыў паўгадзіны. Калі яго «пасуць», то абавязкова будуць рабіць не бязладна, а прадумана, з жорсткай паслядоўнасцю, паклаўшы перад сабою гадзіннік. Не браць трубкі? Але і слухаць увесь вечар гэтыя званкі — вар'яцтва. Лепей адключыць тэлефон увогуле.

Чуйкевіч вырваў са сцяны чорны квадрацік штэпселя і асцярожна паклаў на трумо. Цяпер няхай звоняць: няма нікога, ніхто ў гэтай кватэры не жыве. І яму не будуць назаляць званкі. Ён зможа супакоіцца, возьмецца чытаць ці нават пісаць. Хоць увечары, ужо стомлены, ён пісаў толькі дзённік. Каб пісаць творы, патрэбна вялікая псіхічная сіла. Але цяпер усё

ў ягоным жыцці збаламуцілася, дык звыклы распарадак — таксама.

Голас: «Літаратура — гэта барацьба аднаго з усім светам».

Чуйкевіч узяў у аптэчцы серабрыстую пляйстрачку з таблеткамі экстракту валяр'яны. Вышчалукнуў два жоўтыя слізкія гузічкі і праглынуў. Адчуваў ныццё з левага боку грудзей, і кончыкі пальцаў былі халодныя, як ледзяныя. Гэтымі лядзяшыкамі ён разгарнуў на патрэбнай старонцы часопіс «Новый мир» з аповесцю Набокава «Защита Лужина», якую з тыдзень таму пачаў чытаць.

«Только в апреле, на пасхальных каникулах, наступил для Лужина тот неизбежный день, когда весь мир вдруг потух, как будто повернули выключатель, и только одно, посреди мрака, было ярко освещено, новорожденное чудо, блестящий островок, на котором обречена была сосредоточиться вся его жизнь...»

Стыль пісьма Набокава Чуйкевічу падабаўся. Пісьменнік — увогуле гэта не стыль, а ступень і глыбіня спачування чалавеку. А стыль — толькі сродак матэрыялізаваць гэтае спачуванне. Канечне, Набокаў — не гулявое чытанне, прымушае працаваць галаву і сэрца. Вось і зараз, прачытаўшы сказ, Чуйкевіч сваёй не вельмі чэпкай, прытупленай свядомасцю ўлавіў штосьці блізкае ўласнаму настрою. І для яго патух свет. Ён сапраўды ў змроку. Але дзе яму ўзяць «блестящий островок», на якім можна было б з прыемнасцю засяродзіцца?

Без тэлефона ён быў адсечаны ад жыццёвай прасторы, у якой, можа, існуе ці зараджаецца ў гэты момант тое, што акрапіла б радасцю ягоную душу, развінула яе, як дождж развінае жоўтыя пялёсткі змарнелага ад засухі дзівасілу. Як, аказваецца, цяжка адчуваць сябе нікому не патрэбным, загнаным у кут, ды яшчэ па дурноце, ад перасцярогі свядома на гэта ісці. Жыццё яшчэ ніколі так не падкошвала яго. Ніколі! Чаму свабода ў грамадстве, якая так нечака на ўсіх ап'яніла, не аблегчыла яму існавання?

Чытанне выкрасала іскру думання, раздзімала яе. Тэкст ужо не ўспрымаўся. Ён, заклаўшы між старонак расчоску, кінуў на канапу часопіс. Хвацка падышоў да тэлефона і падключыў яго. Няхай будзе што будзе! І здалося, зноў запульсавалі жыватворныя

артэрыі, хвалі інфармацыі паплылі да яго. Могуць пазваніць сябры, брат, бацькі, жонка, ейныя сяброўкі. Чуйкевіч заўсёды дзівіўся: не паспее жонка ад'ехаць, як сяброўкі пачыналі раз-пораз званіць. Голасам, поўным чакання і гуллівасці, прасілі да тэлефона Людмілу, хоць ведалі, што яе няма. І ён бачыў адзіную мэту іхных званкоў: праверыць яго на сімпатыю да іх. Бальшыня сяброўак былі разведзеныя ці кепска жылі з мужыкамі, і дзве-тры з іх Чуйкевічу падабаліся, але ён ні адной не даў нават намёку. І не таму, што вельмі кахаў жонку. Для сям'і важна не ўмець кахаць, а не навучыцца, мовячы па-руску, разлюбляць.

Толькі аднаго званка ён чакаў цяпер як Бога. Але... Але яна не пазвоніць, хоць і ведае ягоны тэлефон. Не пазвоніць, як ні пасылай ёй сігналы па энергаінфармацыйным полі. Гонар не дазволіць. Дый мала яны ведаюць адно аднаго, не дайшлі ва ўзаемнасцях да той мяжы, калі самалюбства саступае жаданням і пачуццям. А яна так патрэбна была б цяпер. Менавіта цяпер. Сваёй прысутнасцю ўраз разарвала б халодны ланцуг гнёткага, змрочнага думання і хваравітай засяроджанасці на балючых момантах.

Чуйкевіч выйшаў на балкон. На яго патыхнуў халадок з пахам зляжалай травы і свежай зямлі. Днямі цёткі з домакіраўніцтва ўскапалі каля дома клумбы — чарнелі ўнізе, як вялізныя вогнішчы. У цьмяным нізкім небе ледзьве зырчэлі зоркі. Чуйкевічу было шкада іх. Здавалася, што ім у гэтай каламуці таксама цесна і няўтульна, бязрадасна. Гледзячы на іх і спачуваючы ім, Чуйкевіч прасіў, каб яму пазваніла яна, дзяўчына з *прыўкрасным* імем — Вераніка. Пазваніла сёння. Ён не сумняваўся, што ў гэтае імгненне Вераніка думае пра яго. Менавіта ягоныя просьбы прымушаюць яе думаць. А вось пазваніць яны не прымусяць. Ён быў у гэтым перакананы. Такое вялікае шчасце не можа на яго зваліцца. Да людзей абяздоленых, пакрыўджаных, якіх, здавалася б, трэба шкадаваць, чамусьці ўзмацняецца жорсткасць.

А заўтра ён убачыць яе ў спартыўна-тэхнічным клубе, куды яны разам ходзяць вучыцца на вадзіцеляў. Абавязкова павінен убачыць.

Чуйкевіч паварушыўся. Сцюдзёна дакранулася да спіны кашуля. Зачапіўся за парог балкона, ледзьве не

зламаў палец,— у кватэры заверашчаў тэлефон. Няўжо Бог пачуў ягоную малітву? Кульгаючы да тэлефона, можа, разоў пяць уголас паўтарыў: «Не і не».

Званіў Цішкоў, сябра. Чуйкевіч ледзьве пазнаў ягоны голас, хоць ён нічым не змяніўся. Проста слых Чуйкевіча быў настроены на чужы, прапіта-пракураны, цынічны. Значыцца, Бог напалову здзейсніў ягоныя жаданні. Сяброўка, апроч размоў, яшчэ на тое-сёе здатная. Але ў Цішкова была перавага над звычайным сябрам. Ён заўсёды меў у запасе бутэльку. Ягоная жонка працавала адміністратарам рэстарана гасцініцы «Беларусь» і мела неабмежаваныя магчымасці. Праўда, гэта не ратавала сям'ю ад сварак.

— Чым займаешся? — глухавата-вясёлым голасам спытаў Цішкоў.

— Страдаю,— незвычайна ўзрадаваны, сказаў Чуйкевіч менавіта гэтае слова. У яго было мала сяброў. І ён не імкнуўся іх заводзіць. Чым больш сумленны чалавек, тым менш у яго сяброў, тым цяжэй іх улашчваць, трымаць каля сябе.

— А што такое, Костусь? — устрывожыўся Цішкоў. Ён вымаўляў ягонае імя з націскам на першым складзе.— Усё жахлівае ў свеце ад жанчын.

— Поўны завал. Аблажылі, як ваўка сцяжкамі. З усіх бакоў,— шчыра паскардзіўся Чуйкевіч. Хоць у свае беды амаль ніколі нікога не пасвячаў. Марная справа шукаць спачуванне ў таго, хто сам варты яго.

— Прыязджай да мяне. Зробім па сто грамаў, насмажым свежага карпа.

Чуйкевіч доўга не думаў. І так зразумела: гэта – выратаванне. Ён хуценька сабраўся, апрануў плашч, узяў дыпламат і выкуліўся з кватэры. Да вуліцы, цемры ён прывык стоячы на балконе. Цяпер толькі пільна ўзіраўся ў людзей, што пнуліся насустрач. Калі здалёку заўважаў мужчынскую кампанію, абыходзіў яе. Яму здавалася, што да яго прычэпяцца. На лобе ў яго напісана, ці што, што яго можна абрабаваць, збіць, пакрыўдзіць. У той жа чарзе па гарэлку багата стаяла людзей, а выбралі чамусьці менавіта яго. І на гэта ўсё паказвала, калі ён, пасля ўжо здарэння, пракручваў у памяці дэталі. Дзіўна, што ён чэпка фіксаваў іх, але не аналізаваў, не ведаў, што і які намысел за імі стаіць. Яшчэ на падыходзе да

магазіна ён узяў увагу, што непадалёку, каля вугла ваеннага універмага, таптаўся хлопец у акулярах і пільна зырыўся ў бок чаргі (гэта быў іхны псіхолаг-наводчык). Секануў і па Чуйкевічу позіркам. Тады быццам зрабіў знак вялікім пальцам, і акурат перад Чуйкевічам праслізнула ў чаргу — невядома, скуль і ўзялася,— чарнявая зграбная фіфа з касметычнай торбачкаю пад пахай. У яе быў маленькі кругленькі роцік — як пятка маліны, толькі што знятай са стрыжанька. Адразу ж за ім прыстроіўся цыбаты хлопец, у штроксах і скураным курціку. І фіфа, і хлопец увесь час дзіўна сябе паводзілі: стаялі наструнена, з засяроджанымі вачыма, якія быццам глядзелі прама, а заўважалі, здавалася, што робіцца з таго боку, дзе тырчаў Чуйкевіч. Праз нейкі час Чуйкевіч убачыў, як міма чаргі прасунуўся на добрым падпітку шарамыга, які пасля навалу хеўры і апынуўся перад ім. Якраз у момант гэтага навалу завішчала малінавым роцікам фіфа, гледзячы на яго, Чуйкевіча: «Мужчыны, што вы церпіце, куды яны лезуць?!.» Ніхто з чаргі не пікнуў, ведаючы, што звязвацца з гэтай, як яе назвалі, «групай захвату», вельмі рызыкоўна. А Чуйкевіч сказаў: «Няхай бяруць». Цяпер ён разумее, што на тым прамежку іх афера не ўдалася. Ён абяззброіў іх сваёй рахманасцю. А калі б абурыўся? Яны тут жа заштурхалі б яго, абвінавацілі, што ён першы палез, ударыў, зняважыў, і, заціснуўшы, нахабна вырвалі б партманет ды яшчэ накідалі б кухталёў. Абарончы рэфлекс выратаваў яго. Цяпер, заднім розумам, ён разумее, што дарэмна яшчэ ў чарзе выняў партманет, паказаўшы ім, дзе ляжаць грошы і колькі іх. Ну, а далей, ужо ў калідорчыку перад прылаўкам, іхныя дзеянні самі сабою зразумелыя, нахабныя і дзёрзкія.

## РАЗДЗЕЛ 15

Тралейбусы ішлі адзін за адным. Чуйкевічу патрэбны быў трыццаць сёмы. Паводле закону подласці, яго доўга не будзе. Гэта на самай справе так ці толькі нашае ўспрыманне? Чуйкевіч не ведаў. Хвіль дваццаць чакаў тралейбуса. Думаў не пра Цішкова, да якога ехаў, а пра Вераніку. Трэба заўтра ісці на заняткі і абавязкова ўбачыць яе. Яна павінна сагрэць яго. Тым цяплом, якое ёсць толькі ў жанчыны

і ў той, якая падабаецца. Дарэмна Цішкоў гневаецца на прыгожую палову чалавецтва.

Ён забыўся, на якім паверсе жыве Цішкоў, на пятым ці шостым. Якраз у ліфце з ім ехала дзяўчынка гадоў дзесяці. Ён спытаў, на якім паверсе патрэбная яму кватэра. Дзяўчынка спалохана зіркнула на яго, збянтэжылася. Ліфт тым часам спыніўся на пятым паверсе. Не дачакаўшыся адказу, Чуйкевіч выйшаў і... памыліўся. Цішкоўская кватэра была паверхам вышэй. Ён пачаў падымацца па прыступках. Затойваў дыханне: тхлінныя пахі пад'езда шыбалі ў нос. Цьмяны плафон са слоем пылу ледзьве не ў палец высвечваў на сценах накрэсленыя пульвелізатарам-шыпучкаю фашысцкую свастыку, зоркі, пяці- і шасцікутныя, словы з лацінскіх літар, чытаць якія Чуйкевіч не стаў, ведаючы, што гэта ці то імёны куміраў з амерыканскіх баевікоў Сільвестра Сталоне, Арнольда Шварцэнегера, ці то модных спявачак і спевакоў кшталтам Мадонны, Сандры, Майкла Джэксана...

Цішкоў адчыніў дзверы. Ён быў высокага росту, з рыжай барадою, у акулярах. Лысы чэрап быў гладкі, бліскучы і руды, як каштан. Абрадаваўся госцю, усміхнуўся сваёй сціплай усмешкаю, якая больш выбівалася праз вочы і шчокі, чым праз вусны.

Цішкоў жыў у невялікай двухпакаёвай кватэры. У зале над канапаю вісеў в'етнамскі дыван. У куце разросся фікус, пад якім стаяў японскі тэлевізар «Соні». Крэслы былі акуратна засланыя ўзорыстымі зялёнымі накідкамі. Дзверы ў другі пакой з наклееным эстонскім календаром — выяваю напаўголай дзяўчыны — былі прачынены. Адтуль чуліся нястрымныя звонкія галасы. Мабыць, весяліліся гаспадаровыя дочкі з сяброўкамі. Ім было пра што пагаманіць за глухімі дзвярыма.

Цішкоў запрасіў Чуйкевіча на кухню. Тут было багата стаячых і вісячых «слупкоў», тумбачак і шафак. Вакно завешвалі з двух бакоў ружовыя парцьеры ў дробную клетачку. За няроўнасцямі парцьераў угадваліся на падваконніку вазоны з кветкамі.

Цішкоў дастаў з халадзільніка і паставіў на стол «Пшанічную» у сямісотграмовай бутэльцы светлазялёнага шкла. Чуйкевічу не падабалася піць з бутэлек такога колеру, у якім бачылася штосьці высты-

лае нежывое, як выпаленая саляркаю ці бензінам трава. Цяпер ён не зважаў на гэта. І не расказваў Цішкову, ад чаго ў яго брыдка на душы. Чакаў, покуль віп'юць. Хоць да апошняга часу пазбягаў п'янак як мог, цешачы сябе толькі думкаю, што ў крайніх выпадках ён можа выпіць.

На пліце ў шырокай чыгуннай патэльні смажылася рыба, выпускаючы з-пад вечка пару. Цішкоў, палажыўшы на пустую фаерку відэлец, прынёс з буфета талеркі, блакітныя чаркі-стограмовікі, нарэзаў хлеб. Падняў вечка, хвацка перавярнуў рыбу. На патыліцы ў яго на мяжы аблысення і валасоў сядзела ружовая, як журавіна, бародаўка. Ён быў рады, што запрасіў Чуйкевіча. Яны пазнаёміліся гадоў пяць таму ў Доме творчасці «Цяля на вяроўцы», куды прыехалі святкаваць Новы год. Перадусім зблізіліся іхныя жонкі, а праз іх — яны. Цішкоў быў зяцем адной пісьменніцы. Яна і ўзяла яму пуцёўку ў пісьменніцкі дом. Пасля сустрэчы на танцах яны апынуліся ў адным застоллі. Так быў пакладзены пачатак сябраванню.

Чуйкевіч выпіў адну чарку. Затым, не закусіўшы, другую. Цяпер, як і заўжды, ён піў без асалоды. Ягоныя смакавыя рэцэптары ніяк не маглі прызвычаіцца да гарэлкі. Не піў, а цадзіў праз зубы. Ён моршчыўся і шэрхла на руках скура, калі бачыў, як Цішкоў адным махам выліваў чарку ў рот. Хоць таксама не лічыўся вялікім пітком. Калі б гэтак паспрабаваў Чуйкевіч, без сумнення, гарэлка палілася б назад.

Многім не падабалася, канечне, Костусь, калі цябе, маладога, паставілі загадчыкам аддзела,— вывеў рэзюме Цішкоў, калі Чуйкевіч, ужо з хмелем у галаве, распавёў яму пра свае балячкі.— Да цешчы прыходзіла адна пісьменніца, якой ты аповесць завярнуў, дык так ужо палівала на цябе...

— Думаеш, Субач — маленькая пешка ў чыёйсьці гульні? Чуйкевіч хацеў, каб іменна так было. Тады ў дзеяннях Субач праглядваўся хоць якісьці сэнс. Болей за ўсё ён баяўся нелагічнасці ва ўчынках людзей. Супроць яе ён не знаходзіў зброі.

Не сумнявайся! Успомні, як пачалі секчы цябе ў літаратурных выданнях, калі ты сеў на гэтую пасаду Няздары зайздрослівыя ад нямогласці сваёй. І ў іх шакаліная злосць не толькі на таго, хто творча

вышэйшы за іх, а і на таго, хто проста больш за іх напісаў.

Што было, тое было. Чуйкевіч ажно дзівіўся, скуль браліся гэтыя крытыканы. У газетах, часопісах, на секцыях, сходах у Се́дале пісьменнікаў яго бэсцілі за тэмы, за мову, за характары. Чуйкевічу здавалася, і гэта было дзівам: бэсцяць менавіта за тое, што з'яўляецца ягонымі «моцнымі бакамі» ў творчасці. Так калісь казаў яму адзін таленавіты пісьменнік: «У цябе моцныя бакі — мова і характары. Націскай на свае моцныя бакі». Ён і сам думаў, што Субач — кашчавая рука зламыснікаў.

— Але тут ужо размова ідзе не пра густ, а пра звычайнае шальмаванне. За гэта трэба адказваць па законе! — Цішкоў прыметна сп'янеў. У голасе прабівалася катэгарычнасць, якая ўласцівая двум тыпам людзей: несумленным цынікам і пакутнікам з багатым унутраным вопытам.— Падавай на Субач заяву ў суд. Я як журналіст буду прысутнічаць на судзе. Распішу так, Костусь, што стане кепска і гэтай старой, і гэтаму ейнаму следчаму!

— Ат, з нашым правасуддзем...— безнадзейна махнуў рукою Чуйкевіч. Але пасля сябравай падтрымкі ён адчуў, як памацнеў ягоны дух. Добра мець надзейных сяброў. А лепш шчырага аднаго. Хоць бы дзеля таго, каб падмацаваў упэўненасць: калі ёсць у табе каштоўнасць, чагосьці вартая, то застацца ў літаратуры можна толькі пры адной умове — даць менавіта свой злепак часу, нягледзячы ні на што.

Апошні раз яны выпілі за тое, што патрэбны адзін аднаму. Абодва былі п'яныя.

— Скажы: ты мне сябар ці не сябар? — моцна сціскаючы Цішкову плячо, чапляўся Чуйкевіч.

— Мы, здаецца, толькі што кляліся... — Цішкоў моргаў вачыма і цёр жылістымі пальцамі бліскучую лысіну.

— Дай мне тады з сабою бутэльку добрага каньяку.— Чуйкевіч палез у сподняю кішэню па грошы.

— З сабою — не. А тут хоць да раніцы сядзець будзем. Жонка сёння ноч на вахце.

— Шчыра кажучы, я не для сябе. Заўтра стрэлка з жанчынаю... О!

— Дурань! — сказаў Цішкоў і, трымаючыся за сцяну, пагробся ў залу. Прынёс цёмную бутэльку

каньяку. Засунуў яе Чуйкевічу ў дыпламат.— Уцякай ад жанчыны, кажу табе. Дзе яны, там круціцца д'ябал...

Была позняя ноч.

Абняўшыся, яны стаялі на краі дарогі. Махалі рукамі кожнай легкавушцы. Ніхто не рызыкаваў спыняцца. Мала цяпер было смельчакоў браць цёмнай гадзінаю двух п'яных мужчын.

## РАЗДЗЕЛ 16

У сутарэнне са скляпеністай столі апусцілася жанчына Няміла. Да яе пад'ехала пругкае, абітае чорным ядвабам крэсла на маленькіх белых колцах і з высокай спінкаю. Жанчына Няміла села. Спінка паднялася да плячэй. Усё знікла, засталася ў паветры адна прыгожая галава.

З дзвярэй сцяны выбеглі і выстраіліся роўным шыхтам струкападобныя істоты.

— Ну як? — спытала галава жанчыны Нямілы.

— План ажыццяўляецца! — забалбаталі гарошыны ў адтулінах істот.

— Што канкрэтна?

— Кампраметацыя. Курс на фізічнае знішчэнне. Алкаголь. Развал сям'і.

— Тэрмін?

— Роўна год.

— Пакажыце аб'ект.

Залацістыя пліты на сцяне заззялі, сплавіліся, утварыўшы выпуклы, рухомы, бы гіганцкая вадзяная кропля, экран. На ім праявіўся маленькі пакойчык — з кніжнай паліцаю, сталом і канапаю. На канапе паверх пледа ляжаў нераздзеты малады мужчына. Правая рука бездапаможна адкінута, навісае над слоікам з вадою, левая заламаная пад галаву. У мужчыны прадаўгаваты твар, ільняныя валасы, якія амаль не кантрастуюць з бледным лобам. З прыадкрытага рота чуецца моцны храп.

— Ён храпе? — спытала жанчына Няміла.

— Толькі п'яны.

— Часта п'е?

— Рэдка.

— Прымусьце яго піць!

Экран патух. На белым твары жанчыны Нямілы засвяцілася штучная, бліскучая, як фольга, усмешка.

## РАЗДЗЕЛ 17

Як толькі ён сеў за стол сярод незнаёмых яму дзецюкоў і ўбачыў ЯЕ перад сабою са спіны, адразу падумаў, што яны наладзяць узаемаадносіны. Праўдзівей, наладзіць ён, а яна не будзе супроць. Яго ўразілі найперш валасы — каб пачалося знаёмства з жанчынаю, штосьці ў ёй павінна прывабіць,— цёмныя, вохкія, са здаровым бляскам, які ніколі не бывае ў тых жанчын, што нішчаць сваю прыродную прыгажосць усякай хіміяй. Калі яна паварочвала направа ці налева галаву, ён бачыў ейныя шчокі, чыстую, арэхавага колеру скуру на іх, прамы невялікі носік.

Не паспеў Чуйкевіч асвойтацца, як выкладчык выклікаў яго да дошкі. Папрасіў расталкаваць прынцып дзеяння крывашыпна-шатуннага механізма. Чуйкевіч хацеў сказаць, што ён першыя заняткі прапусціў, дый увогуле не ведаў, што трэба рыхтавацца, як у школе, але падумаў, наўрад ці перакана е сваімі доказамі выкладчыка — таджыка па нацыянальнасці.

Шчыра кажучы, Чуйкевіч не чакаў такога павароту. Думалася, пасля ўчорашняга знаёмства Адаш Хатанавіч, ці проста — Хатаныч, будзе яму спрыяць. Чуйкевіч паспеў толькі на апошнюю гадзіну. Было відаць, што ўлаштаваўся ён сюды па вялікім блаце. Без усякай чаргі і запісалі яго лішнім чалавекам у групе. Усе курсанты пайшлі дахаты, а ён застаўся.

Хатаныч сядзеў за сталом. Гэта быў сталага веку мужчына, смуглатвары, з сівізною ў валасах, гармонікам маршчын на лобе. У пабляклых вачах гняздзілася застарэлая стома.

Чуйкевіч падышоў да яго.

— Адаш Хатанавіч, начальнік СТК Ілля Нічыпаравіч Мочкін сказаў мне афоміцца ў вашую групу. Як гэта рабіць?

Хатаныч акінуў яго працяглым позіркам напаўадкрытых, бы ў чарапахі, вачэй, абыякава прамовіў:

— Сядыся за стол...— Узяў з прыскрынка пачак «Арбіты», запалкі. Чуйкевіч міжволі заўважыў яшчэ ў прыскрынку патрончык з валідолам.

Хатаныч няспешна прыпаліў цыгарэту, пусціў гус-

ты клуб дыму. Падпёр левай рукою шчаку. Сядзеў, курыў, паныла гледзячы перад сабою ў адну кропку.

«Што за ліха! — абурыўся Чуйкевіч.— Ён што, не разумее рускай мовы?» Не ведаў, што рабіць. Чакаў, з наўмыснай цікаўнасцю разглядваючы стэнды рассечаных дэталяў і вузлоў аўтамабіля.

— Бэры ручка,— сказаў нарэшце Хатаныч. Доўга шукаў на стале якіясьці паперы. Даў некалькі цвёрдых разлінееных аркушыкаў Чуйкевічу.— Запалняй, што там напісан.

Чуйкевіч настрачыў заяву, запоўніў графы ў анкеце, даў абяцанне не парушаць тэхнікі бяспекі. Вярнуў паперы Хатанычу на стол. Той нават не дакрануўся да іх. Дыміў цыгарэтаю, як паравоз. Чуйкевіч не ўмеў паводзіць сябе ў такіх сітуацыях. Але ведаў, што іншыя тое-сёе робяць.

Ён расшпіліў дыпламат, выняў адтуль кнігу Булгакава ў бела-блакітнай, перламутравага адцення вокладцы. Засунуў між старонак сваю візітоўку, каб тырчаў кончык. І ён тырчаў, быццам язычок. Хатаныч якраз скручваў у трубачку шыкоўны, яркі партрэт Лікі Ялінскай. Мусіць, яго пакінуў хтосьці з курсантаў. Чуйкевіч працягнуў кнігу:

— Вось, калі ласка, дэфіцытная кніга. За ёю ганяюцца... Булгакаў.

— Хто?

— Булгакаў. «Майстар і Маргарыта».

— Булкакаў? — У Хатаныча замест «г» прагучала «к». Ён павёў жоўта-чырвонымі ў бялках вачыма.— Эта дыпламатам каторы быў?

Па шчырасці, Чуйкевіч і сам не ведаў: быў дыпламатам Міхаіл Булгакаў ці не. І, крыху стушаваўшыся, на ўсякі выпадак сказаў «так».

— Крашо, пачэтаю...— Хатаныч узяў кнігу, плюнуў на жоўтыя, бы жалуды, кончыкі пальцаў, пагартаў.— Пачэтаю ў водпуску...— Лена кінуў кнігу ў прыскрынак стала.

— Ну, усё тады,— сказаў Чуйкевіч і падаў Хатанычу руку.

З дзіўным адчуваннем выйшаў з кабінета. Адна палова душы, як шар, ірвалася ўгару, на другую цісну ў цяжар. Разумей усё і ўсіх — і ты будзеш ненавідзець свет. Як жа ты, Чуйкевіч, умудрыўся прыйсці да такой высновы?

І вось — калі ласка. Ні з таго ні з сяго Адаш Хатанавіч выклікаў яго да дошкі. Чуйкевіч трохі са школы помніў вузлы рухавіка, ведаў збольшага, што для чаго і як дзейнічае, але куды рухаецца пэўная дэталь, на што цісне — забі, не ведаў. Сорамна было адчуваць, што ты выстаўлены на пасмешышча і кпіны. Праўда, ніхто з курсантаў не смяяўся. Кожны з іх мог апынуцца на ягоным месцы. І пра тое, што за ім сочыць дзяўчына, якая прыглянулася, у тую хвілю, дзякуй Богу, не думалася. Чуйкевіч штосьці спрабаваў сачыніць, выкруціцца з падмогаю логікі, але толькі мямліў, нясмела і няўмела прамаўляў.

— Чьто далжон здэлаць вадыцель, кагда навстрэчю яму едэт машына з сінім праблiскавым маячком? — ці то каб выручыць, ці хутчэй каб яшчэ больш прынізіць, строгім голасам спытаў Хатаныч.

Чуйкевіч бездапаможна глянуў на клас: «Няўжо яны ўсё гэта ведаюць?»

— Звярнуць...

— Сэдай, двойка! — ледзьве не крыкнуў Хатаныч.— Прэняць права і астанавіцца!

Чуйкевіч сеў, як абліты варам.

— Які ён грубіян,— раптам павярнулася да яго дзяўчына і ўсміхнулася карымі выразлівымі вачыма. Чуйкевіч не паспеў нават зрэагаваць на ейную падтрымку. Толькі вочы, ейныя прыязныя вочы стаялі перад ім як вакенцы ў таемны свет.

Хатаныч ці то пачуў, што яна сказала, ці выпадкова напрактыкаваным вокам вылавіў тую, што няздатная на запабяганне, выгукнуў:

— Косава! К доска.

Дзяўчына блытана штосьці тлумачыла яму пра карбюратар, тыцкала ўказкаю ў плакат-схему.

— Косава, што вы трызніце? — зноў сарваўся на крык, як і з Чуйкевічам, Хатаныч.

— А хто вам даў права крычаць? — з годнасцю, без жаночай вісклівасці адпарыравала Косава.— Вы на кухні ў сябе крычыце.

— Садытэсь, двойка! — ужо трохі памякчэлым голасам, але з ранейшай пыхаю асадзіў яе Хатаныч. Гэтым ён, мусіць, браў пад абцас курсантаў, астуджваў галовы асабліва амбіцыйных ды блатных і паказваў, што ваджэнне — штукенцыя сур'ёзная і смешачкамі тут не адбаярышся.

— Чарговая ахвяра,— прашаптаў Чуйкевіч.— Не перажывайце.

Косава сядзела моўчкі. Адно нацягвала на шыю каўнер бэжавага світэра грубой вязкі, туліла галаву ў вузкія плечы, і валасы тады закрывалі яе ўсю, лажыліся Чуйкевічу на стол, дыхалі, як жывыя. Ён глядзеў на бліскучыя пруткія валасінкі, аж карцела да іх дакрануцца.

Міжволі, выходзячы з СТК, яны апынуліся разам на вуліцы. Перакінуліся нязначнымі словамі, як заўсёды ў такіх выпадках ды ў сапсаваным настроі, і разышліся ў розныя бакі. Бадай, да самага прыпынку Чуйкевіч нёс у галаве думкі пра дзяўчыну, адале забыўся на яе. Засмучала тое, што генерал міліцыі не дапаможа яму лёгка атрымаць правы, як дапамог уладкавацца на вучобу.

Можа, заняткаў праз двое Чуйкевіч правёў Косаву (яе звалі Вераніка) да прыпынку. У раздзявальні яна — каб чуў ён? — усклікнула: «Ой, на вуліцы дождж, а я парасона не ўзяла!» Чуйкевічу не зусім былі чужыя джэнтльменскія замашкі, і ён, маючы парасон, прапанаваў свае паслугі.

Яны выйшлі з СТК. Дождж кляваў бліскучыя морды лужын.

Парасон дваіх не засланяў ад дажджу, і Чуйкевіч трымаў яго над Веранікаю. Яна міжволі хінулася да яго. Браць пад ручку не асмельвалася. Ды Чуйкевіча ўсё роўна хвалявала ейная даверлівасць. Ён мужна выстаўляў пад кроплі дажджу правае плячо.

— Вы намокнеце,— паспачувала яна.

— Затое хоць вы будзеце сухая, а так — абое,— сказаў Чуйкевіч вясёлым голасам. Гэтая ягоная самаахвярнасць не магла не палесціць ёй. Трэба быць ці зусім дурной, ці безнадзейна закамплексаванай жанчынаю, каб у такіх варунках захоўваць якіясьці правілы паводзін з чужым мужчынам.

Яны збольшага пазнаёміліся. Вераніка была замужам, мела дачку, якая гадуецца ў маці ў Валгаградзе. Сама музыкантша, муж — вайсковец, служыць у Глыбокім, раз у два тыдні наязджае. У іх у Мінску двухпакаёвая кватэра, і Вераніка нікуды не хоча ехаць. Горад ёй падабаецца, «нават лепей, чым Валгаград». Пра сябе Чуйкевіч сказаў скупа. Маўляў, таксама сямейны і таксама «творчы чалавек». Пры

знаёмствах ён заўсёды саромеўся прызнавацца, што ён пісьменнік. А сярод тых, хто ўжо ведаў яго, унутрана ганарыўся сваім дарам. Шкада, канечне, што дадатак «беларускі» багата кім успрымаўся іранічна, як паблажка, указанне на непаўнавартасць.

Тады ж Чуйкевіч крутнуў сабе на вус: добра, што ў Веранікі ёсць кватэра, лічы, жыве адна. Не сказаць, што ім кіравалі вялікія донжуанскія намеры. Адносіны з жанчынамі ў яго складваліся няпроста, марудна і, зазвычай, далёка не заходзілі. Заміналі дзве акалічнасці, нават тры. Ён не мог легкадумна ставіцца нават да дробязі. Па-другое, не ўмеў быць відочна непрыстойным, а прыстойненькаму, чысценькаму ды сумленнаму з жанчынамі няма чаго рабіць. І, патрэцяе, ведаючы, што жаніцца з жанчынаю не зможа, не хацеў яе крыўдзіць; у такім выпадку разводзься, забірай тую частку пачуццяў, што прызначана жонцы, і цалкам аддавайся каханцы. Але каханне ў сям'і не патрэбна. Гэта — зло для яе. Калі муж і жонка кахаюць адно аднаго, яны хутка развядуцца. У закаханых вельмі тонкія, надта хваравітыя ўзаемнасці і патрабаванні. Вынесці іх у працяглым часе немажліва.

Ён нават не сумняваўся, што і з Веранікаю раман хутка скончыцца.

Якога стагоддзя сон? Прыснілася, што кожны мужчына можа мець апроч жонкі хатнюю гаспадыню і, не таячыся, быць у сужыцці з ёю.

## РАЗДЗЕЛ 18

З ДЗЁННІКА:

У «Правде» справаздача аб сустрэчы М. С. Гарбачова з кіраўнікамі творчых саюзаў, часопісаў, газет. Перад XIX партканферэнцыяй. Пераломны гэта будзе момант — партыйная канферэнцыя. Грамадства зайшло ў тупік. Чаму?

Шмат чутак пра Афганістан — 15 мая пачнецца вывад нашых войск. Восем гадоў рабілі тайну, а грымела сапраўдная вайна. З крывёю, гвалтам, разбурэннямі, жорсткасцю, здрадаю.

Вярнулася ў прыроду зіма. Халодны вецер нагнаў на неба валавяна-ліловых хмар. З іх пасыпаўся снег, калючы, жорсткі. Пабяліў, быццам соллю, ужо адрос-

лую траўку. Лапкі ў галубоў, што абселі люк водаканалізацыйнага калодзежа,з ружовых перафарбаваліся ў бурачковыя.

## РАЗДЗЕЛ 19

Вераніка вярнулася дахаты з неверагодным адчуваннем прысутнасці каля сябе чалавека. Быццам стаіць побач хтосьці і трымае яе пад ручку. Яна чуе ягонае дыханне, голас... Толькі што яна развіталася з курсантам, сябрам па няшчасці. Яго звалі Кастусь Чуйкевіч. Штосьці ў ім было такое, чаго яна ніколі раней не заўважала ў мужчынах. Ён валодаў як бы магіяй і прыцягальнасці, і адштурхоўвання адначасна. У кожным разе прымушаў пра сябе думаць.

Вераніка пакінула ў парозе мокрыя туфлі, глянула на сябе ў люстра на сцяне ў вітальні. Якаясьці яна незразумелая самой сабе.

З усёй бытавой мітусні яна любіла толькі адно — вязанне. І на адзіноце яно заўсёды яе выручала. Садзілася вязаць — і думкі ўсе, нават непрыемныя, ураз адляталі. Сёння яе чамусьці да клубка нітак не цягнула, хоць меркавала давязаць Дзіянцы цёплыя штонікі. І вінаваты быў менавіта ён, Кастусь Чуйкевіч.

У яе быў прыстойны муж, але іх мала што звязвала. Плоць, фізіялогія, розум — усё гэта ў яго на месцы, але ў іх не было шчырых духовых дачыненняў. Ягоная душа была закрыта непраглряднымі шлюзамі. Што за імі творыцца і бурліць, яна не ведала. Сама ж была перад ім наросхрыст, уся навідавоку. З такім перакосам ім абаім было цяжка жыць, а яшчэ цяжэй усведамляць, што шалі іхных душ ніколі не ўраўнаважацца.

## РАЗДЗЕЛ 20

Прачнуўшыся, Чуйкевіч успомніў, што сёння субота і што яму трэба на заняткі. Узяў з крэслакруцёлкі, якое стаяла побач з канапаю, чорны квадрацік кварцавага гадзінніка. Скрозь сіціва штор ледзьве цадзілася святло. Доўга круціў гадзіннік, углядаючыся ў стрэлкі, покуль дапяў, што завадная

галоўка павінна быць справа. Святла не ўключаў: не хацеў дарэшты прачынацца. Можа, яшчэ рана, і ён трохі перакархне. Хоць не, заўважыў, што апошнія два гады пачаў прачынацца па-старэчы рана. І як ні сіліўся зноўку заснуць, мазгі ці якіясьці цэнтры там былі ўключаны. Але сон усё-такі прымроіўся. Куча яблыкаў — двух густых колераў. Чорныя і чырвоныя. Ён выбірае менавіта чорныя і смачна ўгрызаецца ў іх. Яны сакаўныя, моцныя, крамяныя. Дзеці просяць у яго іх, чорныя яблыкі, а ён не дае, кажа: бярыце чырвоныя.

Сны яму сніліся часта,і не заўсёды было жаданне іх аналізаваць.

На грудзі быццам хтосьці ўзваліў цяжкі жорсткі валун.

Павярнуўся з ложка, узяў слоік з крамнёўкаю, які ўчора — дзіва! — прадбачліва паставіў. Зрабіў некалькі прагных глыткоў. Адваліўся на падушку, адчуўшы, як з вуснаў на шыю прыемным круглым халадком скацілася кропелька вады. Гэтая жывінка крышку падвесяліла: яму выразна запахла крыніцаю ў лесе...

Перабраў у памяці ўчорашняе: ці не дадалося якіхсьці новых гісторый? Хопіць, можа, покуль не прыбілася якаясь немач. А дыпламат? Ці прынёс дыпламат? Сутаргава падхапіўся і падыбаў у вітальню, дзе заўсёды на крэсле пакідаў яго. Дыпламат быў на месцы. Адчыніў — усё як мае быць: бутэлька каньяку. Вось такое з ім час ад часу бывае: калі на добрым падпітку дабіраецца, усё здаецца нармальным. Пасля сну такія-сякія дэталі выпадалі. Альбо цьмяна помніліся. Альбо зблытваліся з ранейшымі.

Узяў бутэльку — прыемная рудавата-жоўтая наклейка і такога ж колеру вадкасць. Чым не цудадзейныя лекі? Чатыры зорачкі на паперцы, падобнай на маладзічок, і пад вінаграднаю гронкаю на наклейцы. Прачытаў: «Госагропром ДаАССР. Крепость 41 %. Сахар 1,5 %. Вместимость 0,5 л. Изготовлен из коньячных спиртов 4-летней выдержки. Цена со стоимостью посуды...» Ат, не разабраць. Ці то наўмысна, ці выпадкова лічба рублёў была здзёрта, добра чыталася толькі «80 коп».

Малайчына Цішкоў — выручыў!

Калі б не заняткі і калі б не ягоная дамова суст-

рэцца з Веранікаю, ён, мажліва, адкаркаваў бы зараз бутэльку і палячыўся б. Адале расцягнуў бы, як кажуць, асалоду.

Ён паставіў бутэльку ў халадзільнік. Да звыклай ранішняй хадзі была апатыя. І ён толькі пачысціў зубы ды спаласнуў халоднай вадою твар, ракавіны вушэй, адчуўшы, як у вантробы пабеглі ручайкі бадзёрасці.

Пайшоў на кухню.

## РАЗДЗЕЛ 21

Сярэдняя працягласць жыцця ў краіне вельмі нізкая. Для мужчын — шэсцьдзесят пяць гадоў. Жах! Чалавек, дацягнуўшы да пенсіі, складвае рукі. Не адпачыўшы, ідзе на той свет. Чалавек асуджаны, па сутнасці, на гібенне. Нічога не бачыць, не з'есць уволю і таго, што хоча. Дык гэта ж — шэсцьдзесят пяць — сярэдні паказчык. Значыцца, палова і да пенсіі не дажывае. А ўсё, без сумнення, у сацыяльных прычынах. І адна з іх — слабая медыцына.

Рэпрадуктар «Сож» стаяў на падваконніку між двух вазонаў. Чуйкевіч слухаў яго, п'ючы каву. Выступаў галоўны ўрач бальніцы. Прыемны, мяккі голас з алімпійскім спакоем вяшчаў пра тое, што ім, эскулапам, не пад сілу выявіць, чаму баліць галава ў жанчыны, якая страчвае прытомнасць і падае каля заводскага станка. Нават у міліцыю забралі на вуліцы як п'яную. А яна хісталася ад слабасці. Покуль вяліся толькі размовы: наша медыцына лепшая ў свеце, самая гуманная і перадавая. Якая ж яна лепшая, дзівіўся з несумленнасці афіцыёзу Чуйкевіч, калі ён, здаецца, не з апошніх людзей у грамадстве, не адчувае і не адчуваў, што медыкі стаяць на варце ягонага здароўя. Нават калі звяртаўся па дапамогу пад час хваробы, дактары нічога пэўнага не маглі сказаць, параіць. Гаварылі не больш, чым ён ведаў сам. Адзінае, што сам не мог,— выпісаць лекаў: не было пустых бланкаў з пячаткаю і не ведаў лацінскай мовы, аб чым заставалася толькі шкадаваць.

## РАЗДЗЕЛ 22

У суботу заняткі пачыналіся з адзінаццаці гадзін. Ужо ў тралейбусе Чуйкевіч схамянуўся: а раптам Вераніка сёння не прыйдзе? Мала які клопат знойдзецца ў жанчыны на выхадны дзень. Ды проста захоча схадзіць у кіно. Зрэшты, у кіно ці ў тэатр і ён мог бы звадзіць яе. Але толькі не сёння і не цяпер. Будзе зырыць на экран, а нічога не бачыць і не чуць — думаць пра сваё. Праз д'ябла якогасьці ён уступіўся на чорную паласу, якая цягнецца і цягнецца з-пад ног. І сны пайшлі, адзін за адным сімвалічныя. Паспявай прыгадваць.

Тыдні два назад прыснілася чорная ліса (але не чарнабурка!). Ідуць яны са стрыечнай сястрою па шашы — і раптам перабягае чорная ліса. Падскоквае і ўпіваецца сястры ці то ў брошку, ці то ў завушніцу. Ён так садануў лісе кулаком у лабаціну, што яна адляцела, як футбольны мяч. Чорная ліса... А пры чым тут стрыечная сястра? Праўда, яна жыве ў тым райцэнтрыку, дзе ён калісь працаваў у рэдакцыі газеты... Ах, ейны ж бацька, Міхалка-Проччым!..

Лепш нічога не ўспамінаць.

На шчасце, Вераніка на занятках была. Хвалюючыся, разбіты пасля ўчорашніх гасцей, запознена пашкадаваў, што забыўся раніцаю падэзадорыцца. Спытаў у яе, ці вольная яна сёння. Невядома, што прымусіла яе, гледзячы яму ў вочы, адказаць «так». Можа, собскае патаемнае жаданне зблізіцца, можа, сапраўды мела лішак часу. А хутчэй — проста ад спачування яму. Яна сказала, што надвечар пазвоніць.

Чуйкевіч чакаў вечара пакутліва і нацята, як струна. Раптам зноў будуць тыя таямнічыя званкі? Браўся чытаць «Защиту Лужина» — не чыталася. У галаве пляліся свае сюжэты.

Падышоў да вакна і ўнурыўся ў яго. Так ён адключаўся ад вярэдлівых думак. Няхай удзень, няхай увечары.

Дзіўна мянялася надвор'е. То порстка вырываліся з-за хмар густыя промні. То валіў снег, ажно цямнела ў пакоі. А потым ярка біла ў вочы святло: і ад сонца, і ад бялюткага покрыва на зямлі. Планіравалі, не хочучы садзіцца на снег, галубы. Нізка лятаді круга-

мі па двары, мінаючы голыя дрэвы, мачты ліхтароў, жалезныя буданы гаражоў. Дзесьці за аўтастанцыяй «Кульман» чадзіла чорным дымам высокая, пад неба, труба, быццам горад курыў люльку.

Вераніка прапанавала сустрэцца на прыпынку каля магазіна «Несцерка». Ён уссунуў туфлі на высокім абцасе. Хацеў выглядаць зграбным, увогуле спадабацца. Як толькі адчуеш, што камусь патрэбны, хтосьці жадае цябе, адразу становіцца лягчэй на душы. Не важна, а яшчэ і лепш, калі гэта чужы.

Вераніка, як у запаволеным кадры кіно, выплыла з тралейбуса ў новай джынсавай куртцы на белым штучным футры, чырвоных боціках. Пад пахаю трымала чорны бліскучы рыдыкюльчык. Не пашкадавала касметыкі. І вочы, і вейкі, і шчокі, і вусны — усё было яркае, але апрацаванае з тонкім густам. І Чуйкевіч ці не ўпершыню пасля знаёмства прыгадаў, што Вераніка музыкантша. Яна спынілася, чакаючы ад яго прапаноў.

Чуйкевіч і сам доўга думаў, як запрасіць Вераніку дахаты, каб не пакрыўдзіць. Спадзяваўся на ейны розум, на тую любоў да свабоды і незалежнасці, якая вызначае чалавека творчага. Факт ацэньваць можна па-рознаму, а ўспрымаецца ён адзіна правільна толькі ў пэўных варунках. Вераніка багата ўжо сказала тым, што згадзілася на сустрэчу з ім. Яна ведае, што робіць, і адказвае за свае ўчынкі. Ён — таксама. Ён сёння проста эгаіст. У яго на першым плане ён сам, ягонае адчуванне, пошук абароны, а не безразважны самаахвярны парыў дзеля жанчыны. Калі яна гэта разумее, то няхай даруе. Але ён упэўнены, што не разумее, інакш самалюбства не дазволіла б ёй пайсці на ўніжэнне. Яна, канечне ж, думае, што ёю захапляюцца, і таксама па-свойму мела рацыю. Сучасная жанчына апрасцілася, знікла чароўнасць і таямнічасць. Яна раскрылася, як борцікі касметычкі, і аказалася — там мала каштоўнасцей: танная памада, заліты вінам пачак цыгарэт і сцёртыя медзякі — узбуджальнікі мата. Вераніка, ён адразу адчуў, была не такая. І ён пацягнуўся да яе, лічы, несвядома.

## РАЗДЗЕЛ 23

Чуйкевіч вёў Вераніку напрасткі, дваровую сцежкаю, абсаджанай маладымі ружовакорымі ліпкамі, пупышкі якіх ужо зацяжаралі лістотаю.

— Вунь мой дом,— як толькі абагнулі вугал вялізнай жоўтай будыніны, у прастамоўі — «кітайскую сцяну», Чуйкевіч выпрастаў руку. Вераніка як бы стрыножылася, акурат ёй расхацелася далей ісці.— Мае будуць толькі паслязаўтра,— сказаў ён: падумаў, быццам Вераніку збянтэжыла, што яна не ведала канкрэтнага дня, калі прыедзе жонка. Яна аказалася натураю больш тонкай, чым ён меркаваў.

— Ты, калі ласка, ідзі далей адзін і скажы мне паверх і нумар кватэры,— сказала яна, не гледзячы яму ў вочы.

— Трэці, пяцьдзесят другі.— Ён ледзьве выкаўтнуў ад задаволенасці словы. Пайшоў, турбуючыся пра сваю паходку. Такую жанчыну, як Вераніка, можа адштурхнуць усё, любая дробязь.

Зайшоўшы ў кватэру, глянуў з вакна кухні ўніз: Вераніка ўпэўнена крочыла на цэментовым ходніку ў напрамку пад'езда. Ён разумеў, што яна яго засцерагае ад суседскіх плётак. І гэта радавала. Але адначасна і засмучала: схільнасць да такой канспірацыі проста так не з'яўляецца. І раўнівінка першы раз смыкнулася ў яго па грудзях.

Чуйкевіч дапамог Вераніцы распрануцца. Правёў яе ў залу і ўключыў тэлевізар. Даў часопісы «Советская женщина» — выйграў падпіску ў віктарыне на міжнароднай маскоўскай кніжнай выстаўцы-кірмашы, куды ездзіў летась у верасні. Сам паспяшаўся на кухню. Узяў з халадзільніка кавалак сыру, парэзаў на тонкія лустачкі, разлажыў на шырокую талерку. Туды ж паскрыляў лімон, сыпнуў на кожную дольку шчопаць цукру.

Мітусіўся, ажно самому было прыкра. І не столькі праз тое, што хацеў дагадзіць Вераніцы, колькі з-за брыдкаватай душэўнай неўраўнаважанасці і слабасці. Задаволены быў закуссю. А больш тым, што хутка яе зварганіў. Занёс талерку ў залу, паставіў на мініяцюрны круглы падносік-трыногу, які жонка прывезла з Польшчы. Выняў з буфета секцыі два хрустальныя кілішкі.

Вераніка малацікава гартала часопіс. Кароценькая скураная спадніца высока адкрывала ёй ногі ў чорных рэдкай вязі калготках з ланцужком шашачак на баку, якія толькі што ўвайшлі ў моду. І Чуйкевічу вельмі падабаліся на жанчынах. Здавалася, аддаў бы паўжыцця за зграбныя жаночыя ногі ў чорных калготках і туфлях на высокай шпільцы.

Яна зусім не камплексавала, сядзела смела, вольна. Яна не лучылася да тых жанчын, якія забіваюцца, бы мыш, у куточак і думаюць, што хтосьці хоча іх згвалціць. Сапраўдных жанчын не гвалтуюць, яны аддаюцца самі.

Пачуццёвы парыў Чуйкевіча раптам перапыніў дыктар у тэлевізары. Інфармацыя была цікавая. Аказваецца, група тэрарыстаў, якая захапіла самалёт «Іркуцк — Ленінград»,— гэта сям'я. Ды якая сям'я! Адзінаццаць чалавек. Маці — гераіня, сыны — музыкі, дачка цяжарная... І вось сын страляе маці ў галаву. Свет нішчыць сам сябе ненармальнасцю. Госпадзі, скуль бяруцца гэтыя жахі? Вакол адны жахі.

Гэтая вестка і Вераніку прыметна зажурыла. Мусіць, балюча па ёй сцебанула тое, што ансамбль «Серапіёнавы браты» яна крыху ведала. З ягонымі ўдзельнікамі, братамі Авечкінымі, пазнаёмілася на якімсьці песенным фестывалі ў Сочы. Яна колькі часу сядзела маўклівая і прыціхла-мройная. Чуйкевіч падумаў, што развеяцца ёй найлепш дапаможа чарка. Ён і сам даведзены смагаю ледзьве не да бясцямнасці. Не пытаючы ў Веранікі дазволу, выключыў тэлевізар. А заадно і святло. Пасля таго як запаліў тоўстую і жоўтую, бы кукуруза, стэарынавую свечку.

Чуйкевіч сеў на канапу побач з Веранікаю. Між імі быў толькі невялікі, на пядзю, прамежак. Наліў у кілішкі каньяку. У хрусталі ад свечкі ён бурштынава загарэўся цьмянавата-глыбокім агнём, які ўсярэдзіне акругляўся, бы жаўток.

— Калі ласка, Вераніка, за ўсё добрае,— ён падняў кілішак, аддаў яго Вераніцы. Узяў свой — калыхнуўся, вызубіўся хвалямі жаўток агню.— Удзячны табе, што згадзілася прыйсці да мяне.— Ведаў: трэба ацэньваць любы, нават маленечкі самаахвярны жаночы крок.

Вераніка заківала галавою, усміхнулася. Плаўна адвяла рукою валасы за спіну — з таго боку, дзе

сядзеў ён. Паднесла да вуснаў край кілішка, зрабіла два маленькія глыткі.

— М-мы... Які цудоўны каньяк! — Яна з ўдзячнасцю паглядзела яму ў вочы, як бы з прадчуваннем вялікай асалоды і ад каньяку, і ад сустрэчы.

Ён выпіў свой да дна. Не адчуў аніякага смаку. Хіба што ледзьве ўлоўны прысмак шакаладу. Пасля ўчорашняга такой дозы, каб рассмакаваць, яму было безнадзейна мала. Але што зробіш. Не будзеш жа пры жанчыне куляць стограмовікі. Ён не стаў стамляць Вераніку банальшчынай: маўляў, дзеля цябе, такой жанчыны, стараўся. А між іншага, жанчынам, каб мець поспех, якраз больш трэба казаць банальнае, чым свежае, арыгінальнае, мала ім зразумелае.

— Мне хораша з табою,— сказаў ён. Яна прамаўчала толькі таму, што прывучыла сябе не верыць хуткаспелым прызнанням.— Ты своеасаблівая жанчына...

— Прыемна гэта чуць! — какетліва варухнула капою валасоў за плячыма Вераніка. Яна паставіла кілішак, які залаціўся ад вільгаці, на паднос. Чуйкевіч, не чакаючы, тут жа напоўніў яго і свой каньяком. Ён спяшаўся злавіць кайф, спяшаўся давесці душу да таго стану, калі адчуе, як у ёй зацепліцца маленькая радасць, адале пачне расці, заганяючы і сціскаючы кудысьці ў куток вярэду. Вераніка і не падумала адмаўляцца. Таксама выпіла з ім. Узяла сегменцік лімона, зрабіла трубачкаю вусны і грацыёзна апусціла яго ў рот.

Ён ашалеў ад ейнай дасканаласці. Госпадзі, гэта ягонае выратаванне! Як жа своечасова яе Бог паслаў... А можа, гэта каханне? Чаму ён толькі адзін бок бярэ: яму цяжка, тужліва, а Вераніка падсалоджвае ягоную долю? Можа, патрэба ў каханні — гэта і ёсць проста патрэба ў псіхалагічнай абароне?

Толькі б не было таямнічага званка. Усё сапсуе. Здратуе свята сэрца. Ён схадзіў і адключыў тэлефон, глянуўшы на яго з агідаю.

Ці то ад пачуццяў да Веранікі, ці выяўляў сваю сілу каньяк — Чуйкевіч нарэшце ўлавіў, як пачынае лёгенька калыхацца ягоная свядомасць, скульсьці наплывае хваля цеплыні, праходзіць скрозь яго, як скрозь сіта — пачашчаюцца ўдары сэрца; хваля плыве далей, а тады вяртаецца, зноў накрывае яго ня-

бачным, бясплотным, але адчувальным, шапатліва-пругкім крылом. Чуйкевіч глянуў, ці матляецца язычок свечкі. Не, язычок, праменькі, востранькі, з сіняй нітачкаю дыму, быў падобны на ячменны каласок з адзіным высокім вусікам.

Чуйкевіч абняў Вераніку, зарыў свой твар у гушчыню ейных валасоў за плячыма. Яны пахлі тонкім, далікатным водарам французскіх духоў «Мажы нуар». Яна нічога не сказала, не паварушылася, і ён колькісь часу ўпіваўся марознай свежасцю маладой жанчыны. На большае не хапіла ні сіл, ні нахабства.

Яны яшчэ выпілі. Чуваць было, як у кватэры паверхам ніжэй плакала дзіця.

— Ты нейкі маўклівы,— сказала Вераніка.— Цябе штосьці турбуе?

Чуйкевіч сапраўды пасля першага адліву пачуцця раскіс. Энергія зышла з яго, як паветра з праколатага шара. Яснасць думак у галаве не падмацоўвала духовага пачування. У целе раптам знікла бадзёрасць.

— Турбуе шмат што. Трэба выпіць і на ўсё забыцца,— сказаў ён, паказваючы, што заклапочанасць, роздум для сучаснага мужчыны — звычайная справа.

— Я столькі не п'ю.

— Тады я, з твайго дазволу, адзін вып'ю.— Ён разумеў, што гарачыцца, што непрыстойна піць аднаму, але ішоў на гэта свядома. Хацеў — дзеля яе ж! — прывесці сябе ў нармалёвы стан. Але стрэс ён перажыў апошнім часам такі моцны, што ўраўнаважыцца было не проста. І ў той час не мог быць няшчырым, крывадушнічаць. Паказваць сябе ў ласкавым святле, прыцінаючы свае эгаістычныя жаданні.

Кульнуўшы зухаватым, нязвыклым для сябе рухам кілішак, ён устаў з канапы. Падышоў да электрафона, утапіў крайнюю левую кнопку — на панелі загарэлася чырвонае вочка, загулі дзве чорныя калонкі акустычнай сістэмы. Падняў празрыстае пластмасавае вечка і пацягнуў на сябе рычажок — іголка плаўна апусцілася на кружэлку, якую ён загадзя паставіў. Пачуўся пругкі перастук — і ўслед ірвануў рэзкавата-надрыўны голас Аляксандра Градскага:

Моя печаль застыла неподвижно
Я жду напрасно не придет никто

Чуйкевіч запрасіў Вераніку на танец. Ён прыхінуў

яе да сябе лёгкую, амаль нячутную ў руках. Кончыкі ейных валасоў казыталі яму твар. Ён крануўся вуснамі ейнай шыі скрозь абручык завушніцы, абвіты залатою змейкаю.

Таньчылі яны павольна, але зубок свечкі варушыўся так, быццам да яго прасачыўся скразнячок. Чуйкевіч прытуліўся шчакою да Веранічынай шчакі — яна была гарачая.

Мои глаза разлучены с твоими
Они утратили доверие и свет,—

спяваў Градскі быццам пра яго, Чуйкевіча. Для яго таксама пахіснуўся свет. І вось гэтая нячутная ў руках, амаль бесцялесная дзяўчына, як ні дзіўна, стала яму апораю. Пачуццё да яе хоць на міг падняло яму перабітыя злыбедамі крылы радасці.

Плыла музыка, варушылася полымя свечкі, рухалася пара, ганяючы па сценах загадкавыя міражы са святла і ценю...

— Я таксама люблю Поль Элюара,— сказала Вераніка, калі яны скончылі таньчыць і селі на канапу.

— Ягоная паэзія тугі адпавядае майму цяперашняму стану,— прызнаўся Чуйкевіч. Ён яшчэ адчуваў на вуснах дотык да пяшчотнай скуры Веранічынай рукі.

— Ты не дагаворваеш, і гэта мне не зусім падабаецца,— папракнула яго Вераніка.

— А навошта яшчэ і на цябе наганяць самоту,— сказаў Чуйкевіч.

— Зразумела. Ты не верыш, што я магу ўзяць частку гэтай самоты сабе ў сэрца?

Гэта быў выклік. Ці намёк на пачуцці? У любым выпадку Чуйкевічу было няёмка. Вымушае дзяўчыну да адвагі. Ён спытаў, ці можа яна яшчэ кроплю выпіць. Яна ўсміхнулася — паярчэлі агеньчыкі ў вачах.

Калі яны выпілі, ён расказаў ёй пра свае няшчасці, апусціўшы толькі падрабязнасці, якія па няведанні можна было двухсэнсова зразумець. А яму гэтага не хацелася. Між людзьмі хапае падазронасці і так. Вераніка шчыра паспачувала і зажурылася.

— Ну вось, што я казаў,— падхапіў Чуйкевіч.

— У мяне муж не проста вайсковец, ён афіцэр КДБ,— пасля роздуму сказала Вераніка.

Чуйкевіч аніяк не чакаў такога прызнання. Само сабою вырвалася:

— Праўда?
— Відаць, мне не варта было прызнавацца?
— Чаму ж.

Шчыра кажучы, Чуйкевічу было над чым паразважаць. Па-першае, з чыёй жонкаю ён звязаўся. Па-другое, мажліва, і сапраўды гэты таварыш адным махам можа адсекчы ўсе ягоныя праблемы. Толькі як пазнаёміцца і з чаго пачаць? Ён ліхаманкава думаў. Ужо злаваў на Вераніку: навошта сказала, хто ейны муж. Цяпер трэба нейк карэкціраваць адносіны і да яе самой. Балазе хоць яны не зайшлі далёка. Усе, канечне, жывыя людзі. Але хто ведае, якую задачу перад ёю ставіць муж. Урэшце, хто яна сама? Мала, што кажа, быццам музыкантша. Людзі гэтага ведамства назваць сябе могуць кім хочаш, чортам лысым, д'яблам, іншапланецянінам, толькі не тым, хто яны ёсць у сапраўднасці. Такая спецыфіка, што зробіш.

«Гэта называецца — зноў уліп»,— з горыччу канстатаваў у чарговы раз Чуйкевіч. Што за навала на яго? Якім бокам павярнулася зорка, пад якою нарадзіўся, куды падзеўся анёл-ахоўнік?

Вераніка ледзь-ледзь паварушылася.

— Я слухаю.

— Покуль не трэба ніякай дапамогі, Вераніка. Я ж ні ў чым не вінаваты... Можа, абыдзецца. Калі можаш, пабудзь са мною сёння як даўжэй. Я цябе правяду...

Яна згадзілася, але ён не вельмі быў рады. Ніяк не чакаў такой канцоўкі. Свядомасць ягоная раздваілася. Прыкравата было ад таго, што Вераніка адразу не сказала ўсёй праўды пра мужа. Вайсковец — гэта адно, а кадэбіст — зусім другое. І, можа, у яе заданне праверыць адносіны яго, Чуйкевіча, да сённяшніх супярэчліва-заблытаных працэсаў. Усё-такі ён, па існуючых мерках, нацыяналіст.

Сядзеў як аглушаны. Туга выскубвала з перакуленага стажка сэрца боль і непрыемныя пачуцці.

## РАЗДЗЕЛ 24

У гэтую ноч яму звярэдзіўся сон. Ён з братам Глебам, афіцэрам, на агародзе са стрэльбаю. На ліпе сядзіць чорная, бы галка, толькі чарнейшая,

птушка. Ён прыцэльваецца і страляе ў яе. Шрот ляціць нейк павольна, дасягае яе і раніць. Птушка куляецца... Ён бяжыць да яе. Але яна не даецца, даволі шустра то адбягае, то адлятае. І так ганяецца за ёю, пруткай і няўлоўнай, дзівячыся, што яна не сцякае крывёю і не слабее. А брат стаіць і плача-плача...

## РАЗДЗЕЛ 25

...Кастусёк быў шчаслівы, бо меў брата Глебачку, маці і бабулю Аксюту. І нешчаслівы, бо ў яго не было дзеда. Адзін дзед, Васіль, памёр у вайну. А другі, Арцём, страшна сказаць, засіліўся. На бярозе ў лесе дзесьці ў далёкай Сібіры. Кастусёк не раз чуў гэта ад маці і бабулі. Яны, расказваючы пра Кастуськовага бацьку, прыгадвалі і дзеда Арцёма. Хвалілі яго: не піў, не курыў, быў гаспадарлівы, багаты... нейкі кулак. Кастусёк не разумеў: як гэта — «кулак»? Моцны — як кулак? Круціў, разглядаючы, свой кулак. Хіба праз гэты вось кулак, нават калі ён моцны, як зялеза, выслалі дзеда Арцёма за свет? І бацьку іхнага, Кастуськовага і Глебачкава, зноў туды запёрлі. Нібыта з-за дзядзькі Міхалкі-Проччыма...

Гэта паставіла Кастуська ў незвычайныя варункі ў свеце. Ён быў нешчаслівы больш, чым шчаслівы. Вельмі рана адчуў, што змагацца за сябе павінен сам. Абараніць яго няма каму. Жанчыны не абароняць. На Глебачку таксама спадзёўка невялікая. Ён меншы за Кастуська, худзенькі і ростам не выйшаў. Да таго ж брата на лета забірала да сябе ў горад цётка Дарка. Сваіх дзяцей яна не мела, жыла толькі з мужам, дзядзькам Колем, які працаваў на нейкай там мудрагелістай машыне, якую называлі дрызіна. Гэтае невядомае Кастуську слова хвалявала яго, часам выкрасала неадольнае жаданне пабачыць тую звяругу дрызіну і пракаціцца на ёй. Увогуле хацелася пабыць у вялікім горадзе. Папраўдзе, Кастусёк толькі два разы быў у райцэнтры, які маці называла Слаўгарадам, а бабуля Аксюта — Прапошаскам. І ездзіў ён туды зусім не па вясёлай прычыне. Першы раз з маці — вырываць зуб, другі з бабуляю — да маці ў бальніцу. Што ён там мог убачыць? Доўгую пакручастую вуліцу, абапал якой стаялі драўляныя, бы ў вёсцы,

дамы і некалькі мураваных, пафарбаваных у жоўтае будынкаў. Палутаркі з дашчанымі бартамі і квадратнымі кабінкамі ды маленькія аўтобусікі з тупымі, як у бычка мыза, перадкамі. Іх ён сотні разоў бачыў на шашы, куды насіў з маці прадаваць першыя суніцы або лісічкі. Цераз шашу ганялі кароў на луг, хадзілі ў лес у грыбы і ягады. Сонечным спякотным днём прыемна было ступіць босай нагою на разагрэты мяккі, бы мох, асфальт. Падэшвы, прывыклыя да шорсткай паверхні зямлі, адчувалі незразумелую радасць і трывогу. Часам здавалася, быццам душа па гэтай цёплай чорнай стужцы нясецца ў неспазнаную, таямнічую далячынь. Кастуська ўвесь час цягнула на невядомае. Ён па драбніцы адкрываў вакол сябе свет. Прачнуўшыся ўранні, і хвілі не мог пабыць, каб штосьці не пабачыць, не пачуць, не памацаць. На зямлі, у паветры, на дрэве і ў траве. У глыбіню, шырыню і ў вышыню свет быў бясконцы, як і думкі з яго-най маленькай галавы.

Аднаго разу маці сказала яму, што яны паедуць у Крычаў. Радасць і трывога на душы ў Кастуська памацнелі.

Маці, бабуля Аксюта і ён схадзілі ў лес, набралі кашолку чарніц. Кастусёк здзіўляў дарослых тым, што хутка браў ягады, хоць і, не будучы ляўшою, зрываў іх левай рукою. Праўда, гэтым разам ягоны збор не назавеш удалым. Думкі пра вялікі горад завалодалі ім, і ён засяроджваўся на мроях, а не на ягадах.

Пасля абеду Кастусёк пераадзеўся ў чыстую кашулю і кароткія штонікі з дзвюма шлейкамі, якія, перакрыжоўваючыся на спіне, зашпільваліся на гузікі спераду. Не вельмі любіў Кастусёк гэтыя штаны з кароткімі, не дастаюць да каленяў, калашынкамі, але цяпер вымушаны быў мірыцца. Ён увогуле зразумеў: колькі ні настырайся з дарослымі, паставіць на сваім удаецца рэдка. Крыўдна, балюча, але ты слабы, не пераможаш. Таму цярпі, закусвай вусны, выцірай рукавом слёзы, душыся імі і чакай свайго часу.

Яны пайшлі з маці на шашу. Да яе было з вярсту. Дарога вяла міма кладоў і па сасонніку. У гэты сасоннік Кастусёк хадзіў глядзець на дзятлаў і вавёрак.

Паўз шашу стаялі слупы тэлефоннай лініі. Права-

ды гудзелі, як чмялі каля патрывожанага гнязда. На ніжнім сядзела пліска і патрэсвала даўгенькім хвастом.

**РАЗДЗЕЛ 26**

Шаша была не вельмі шырокая. Фіялетавай стужкаю слалася між пясчаных жоўтых паяскоў, хавалася, абарваўшыся за мостам праз канаву. Шаша мела назву «варшаўка». Яна з Масквы ішла на Варшаву. Гэта была шаша-помнік. Яе адкрылі ў 1851 годзе. За чатыры гады насыпалі тысячу вёрстаў дарожнага палатна. Тады яшчэ не было аўтамабіляў. Ездзілі на конях, якіх запрагалі ў сані, павозкі, брычкі, карэты, дыліжансы. Скрозь пры самай шашы стаялі станцыйныя дамы старой архітэктуры. Тут спадарожныя адпачывалі, мянялі коней. Два такія дамы Кастусёк бачыў. Адзін у Слаўгарадзе — гэта была аўтастанцыя. Другі — у Сакалоўцы — у вёсцы, што каля саменькай шашы.

**РАЗДЗЕЛ 27**

Іх падабраў стары абшарпаны «МАЗ», на якім усё зялезнае трэслася і грымела. У кабіне было горача і пыльна. Шафёр, малады хлопец з доўгай, як у бусла, шыяй і вялікім гарляком, насвістваў «Кацюшу». Кастусёк сачыў, як у яго выцягваюцца смаўжом вусны. Калі надакучыла — а надакучыла хутка,— пачаў круціць галавою па баках, узірацца ўперад. Сосны абапал шашы насоўваліся з неймавернай хуткасцю і, здавалася, валіліся на машыну...

Праехалі Сакалоўку — не самую вёску, да якой было вярсты дзве ўбок, а моцную мураваную будыніну, крытую чорным ліставым зялезам, якая стаяла паралельна шашы. Вокны ў ёй былі ўверсе скругленыя, з узорыстымі пераплётамі заміж ліштваў.

— Тут бацькава радня жыве... пасёстра яго,— сказала маці Кастуську.

— У станцыйным доме? — спытаў шафёр. Цікаўны дзядзька!

— Ну, але... У нас кажуць чамусьці — на паштовай станцыі.

Кастусёк натапырыў вушы: што гэта за станцыйны

дом, паштовая станцыя? Ён глянуў у задняе вакенца кабіны, але будыніну засланілі густыя кусты бэзу і каліны, высокія клёны. Убачыў толькі цагляную сцяну і шырокую зялезную браму з вострымі спічакамі.

— Даўно жывуць?

— Даўно. Яны дарожнікі... Жывуць прыпяваючы, вольніца, з'ежа скаціне... На адну сям'ю такая даміна. І хлеў у іх, і кладоўка тамака, і склеп... Сена дармавое — увесь лізерт выкошваюць.

— Даўней умелі жыць,— згадзіўся шафёр і пачухаў кулаком кончык носа.— А цяпер Хрушчоў усё круціць-перакручвае. У кукурузу етую ўбіўся...

Маці прамаўчала. Здалося: недаверліва-спалохана глянула на шафёра.

Мала ад'ехалі, а Кастусёк ужо багата ўведаў. Радаваўся, калі пераязджалі рэчку, белую ад гарлачыкаў. Вялікіх рэчак, як Сож, не было, а маленькія, лічы, канавы, трапляліся часта. Адзін раз з правага боку адкрылася люстраная роўнядзь вялікага возера. На беразе стаялі хлапчукі і вудзілі рыбу. Кастусёк пазайздросціў ім. Шафёр, мусіць, ужо зразумеў, што вязе дапытлівага хлапца, і нечакана пасля доўгай маўчанкі сказаў:

— Глядзі, арол, зараз будзе з твайго боку гармата на пастаменце... Гэта самі немцы па загадзе самога Гудэрыяна паставілі яе нашаму салдату, які адстрэльваўся да апошняга снарада.

Кастусёк адразу заганарыўся такім нашым салдатам. Толькі аднаго не мог уцяміць: чаму гэта немцы, якія хацелі нас заваяваць, раптам узялі ды раздобрыліся? Выпытваць у чужога не стаў — пасаромеўся. Увогуле быў сарамлівы. Гэта прымушала яго шмат думаць і да ўсяго даходзіць самому.

Шафёр збавіў хуткасць. Кастусёк прыліп да запыленага шкла. Сапраўдную гармату ён убачыў упершыню. З дулам, шчытом, на гумавых, бы ў машыны, колах. Здзівіўся, што каля яе не было ні салдатаў, ні людзей. Толькі раслі белагрудыя гусценькія бярозкі.

— Ета ўжо Крычаў? — як бы не паверыла маці. І была радая, што хутка даехалі.

## РАЗДЗЕЛ 28

Учора па беларускім тэлебачанні і сёння ў «Звяздзе» прайшла інфармацыя-навіна, што з дваццаць дзевятага красавіка галоўным трэнерам мінскага «Дынама» зноў прызначаны Эдуард Малафееў. Балельшчыкі закрычаць «ура» ад захаплення. Разам з імі будзе лямантаваць і Чуйкевіч, які хоць і не дацягваў да футбольнага фаната, але і не быў да гэтай гульні абыякавы.

Чуйкевіча проста дзівіла ягонае адчуванне. Ехаў у трамваі на стадыён, на матч мінчан з «Жальгірысам» з Вільні, і ні з таго ні з сяго раптам успомніў мужычка, які, п'яны, дзён колькі назад запаў яму ў вока. Глянуў у вакно на тратуар: ідзе той мужычок — маленькая галоўка, сухія, быццам запыленыя ў млыне, валасы, пукатыя яблыкі вачэй. Што гэта — тэлепатыя, біятокі? Чаму іменна ў гэты момант успомніўся мужычок, калі трамвай наблізіўся да яго? Сіла і дакладнасць ягонай інтуіцыі часам уражвалі настолькі, што Чуйкевіч звязваў іх з якойсьці азнакай ці, прынамсі, незвычайнай здольнасцю.

Халаднаваты дзень. Усчынаецца дождж. Вецер калашмаціць маладыя кволыя лісцікі на чарнакорых ад мокрасці ліпках. Няма на душы радасці, асабліва калі глядзіш на пустыя вуліцы, на рэдкіх людзей без прыўзнятасці, святочнасці на тварах. Якаясьці ўсеагульная разгубленасць.

Адзінае свята — футбол і тое мала радуе.

## РАЗДЗЕЛ 29

Пасля таго як Чуйкевіч замацаваў дзверы, не давала спакою думка, што рабіць далей. Трэба абрэзаць усе каналы выхаду на яго. Раней гэта не пасеяла б у ім такой панічнай трывогі. Цяпер злачынцы сталі не тыя. Нахабства іх не мае супынення. Ім далі вольніцу. Нідзе не працуюць і не судзяць за лайдацтва. Для замазкі вачэй запісваюцца ў які-небудзь кааператыў. У рэстаран заходзіць небяспечна — і там «паважаныя людзі». Пра які парадак можа ісці гамонка? Хто ў гэтым вінаваты? Звычайна ў грамадстве ўсіх сабак вешаюць на першую асобу. Думай, Міхаіл Сяргеевіч, думай!

Голас: «Паніка — гэта геніяльная празорлівасць і прадчуванне бяды, якія даюцца натурам глыбокім і тонкім».

У Чуйкевіча разыгралася, бы полымя ад ветру, фантазія. У яго была нечуваная здольнасць фантазіраваць. Ён уяўляў неверагодную сітуацыю — і бачыў яркую карціну з дзеючымі асобамі, сцэнамі, фіналам, быццам усё гэта ўжо адбылося з ІМ. А можа, і адбылося? Можа, час бяжыць не ў будучыню, а з будучыні ў мінулае. Таму і герояў ягоных твораў амаль заўсёды цалкам пераносілі на асобу аўтара. Адзін крытык, што займеў права, дзякуючы пасадзе, на бязгрэшнасць ісціны, так і напісаў пра аповесць «Следчы»: «Уражанне, быццам аўтар сам усё жыццё рабіў следчым». Мусіць, гэта зусім не кепская якасць для пісьменніка.

Чуйкевічу часцей і часцей пачалі прыходзіць думкі пра Бога. Ён не ведаў, у якой форме, але сувязь з небам у зямлі, у кожнага чалавека існуе. І тое праўда, што неба ўплывае на нас. Нашы рухі, словы, міміка фіксуюцца ў сусвеце, у наасферы, паводле Вярнадскага. Яны як бы высцілаюць нам дарогу ў жыццё.

Бог карае мярзотнікаў — гэта зразумела. А чаму пакараны ён, Чуйкевіч? Ці, можа, гэтак жа недаўмявае і кожны з мярзотнікаў? Альбо яшчэ горш: ён сам не хто іншы, як мярзотнік, толькі іншай закваскі, чым забойца, рабаўнік?

Чуйкевіч адчуваў, што ягоны тэлефон ужо служыць вырадкам. Званкі, званкі... І маўчанне. Ён амаль не падымаў трубкі: няма дома. Але калі падымаў, трубка злавесна маўчала. Так дома, так і на працы. Хто яго слухаў? Адзін працэнт сумневу: можа, не яго, можа, хтосьці хацеў пачуць жончын ці сынаў голас. На працы зычны мужчынскі бас адзін раз спытаў: «Канстанцін?» Чуйкевіч «алёкнуў» лішні раз, і трубку кінулі. Менавіта Канстанціна спытаў бас, запінаючыся на літарах «нс» і «нц». Што за таямнічы званок? Няўжо сапраўды «пасуць» яго: калі, дзе, хто дома? Каб, вывучыўшы сітуацыю, пачаць шантажыраваць, вымагаць?

Фантазія фантазіяй, але й логіка амаль не падводзіла Чуйкевіча. А тут на кожным кроку тэлебачанне, газеты і нават рукапісы, якія ён чытаў, на-

гадваюць пра забойствы, рабаванні, насілле. Акурат якаясьці нябачная, але прысутная побач рука знарок падсоўвае гэтую інфармацыю, на якой глыбока заклінаецца розум. І на душу абвальваецца прыкры сваёй вязкасцю цяжар. Асабліва трывожна за дзяцей. Падонкі на ўсё здатныя. І, падобна, не адчэпяцца. Гэтага не адмаўляў і ягоны даўнішні сябар Мякота, з якім днямі сустракаўся. Яны разам вучыліся ва універсітэце. Пасля той з пасады намесніка рэдактара раённай газеты паступіў у школу КДБ. Служыў у Мінску, у Туркменіі, у Маскве, апошняе месца — Грузія. Прыехаў адтуль экзаменаваць курсантаў мінскай школы КДБ і пазваніў Чуйкевічу, каб заглянуў да яго ў гасцініцу «Беларусь».

Мякота выцягнуў з чамадана новенькія пагоны падпалкоўніка — толькі што атрымаў, нават не паспеў прышыць. І за сустрэчу, і за гэтыя пагоны яны ўзялі чарку: Мякота навёз экзатычных грузінскіх каньякоў і вінаў. Чуйкевіч потай ганарыўся такім сяброўствам. У якісьці момант адкрытасці спытаў пра апальнага генерала Калугіна, адале расказаў і пра сябе. Генерала Мякота назваў здраднікам. Ад падонкаў, сказаў, можна чакаць самых дзёрзкіх выхілкаў, нават забойства. Усё залежыць ад таго, якая «сфера ўплыву» ў гэтай банды.

Чуйкевіч Мякоту верыў, хоць і быў той не зусім падобны на сябе ранейшага. То якісьці мітуслівы, неразважлівы, павярхоўны ў меркаваннях. То адрынуты, заклапочаны, са студзенымі да бліскучых палосачак вачыма. А вонкава ці не залішне распаўнелы, цельпукаваты для сваёй прафесіі. Хоць хто ведае: можа, на дадзены час яму і трэба такім быць.

Гэта мільганула ў свядомасці ў Чуйкевіча як бы між іншага. А праз нейкія пару дзён ён скрупулёзна, па макулінцы, як следчы, перабіраў дэталі іх сустрэчы, паводзін і выгляду Мякоты. З Грузіі прыляцела чорным груганом тэлеграма: МЕКОТА ПОГИБ ТЧК. Нібыта выкінуўся з вакна сваёй кватэры, з дзевятага паверха. Апроч версіі аб самазабойстве намацвалася кампетэнтнымі органамі і другая: помста грузінскіх баевікоў, гвалтоўнае забойства.

Сябрава смерць патрэсла Чуйкевіча. Ледзьве не дабіла. Дзве ночы ён не спаў. У вачах мільтусіўся прыемна-тлуставаты, лагодны Мякотаў твар, блакіт-

ныя, у балеснай павалоцы вочы. І нечакана ўвесь гэты тлум яснотаю абліў сон, які можна было б занесці ў шэраг эратычных, калі б не адзін незвычайны момант. Яны з Мякотам адначасна цешацца маладой паэткаю, якую апошнім годам паднялі на «ўра». Мякота валодае верхняй паловай тулава, а ён, Чуйкевіч, ніжняй... Самы запаветны куточак ён адчувае пальцамі — той прагны, падрыхтаваны і бессаромна адкрыты... Абсурд якісьці!

Калі самазабойства, то што прымусіла маладога мужчыну, з такой магутнай апораю, якую давала прыналежнасць да малапранікальнага кадэбісцкага клана, ісці на гэты крок? Зрэшты, падобным чынам расквітаўся з жыццём ужо не адзін чалавек з вядомых яму людзей, нават ягоны дзед Арцём. Калі хтосьці співаецца, тады зразумела. Але пытанне: чаму співаецца? Ад немажлівасці ажыццявіць свае задумы? Ад непрыняцця законаў грамадства, супольнасці людзей, з якімі жыве, працуе? Алкагалізм — гэта і ёсць дабравольны выбар павольнага суіцыду, як мовяць прафесіяналы. Цяміць гэта той, хто п'е, альбо не? Што мацней, сіла алкаголю ці разуменне шкоды, якую ён прыносіць?

Але сярод самагубцаў багата і непітушчых. Што іх штурхае? Што падбіла таго ж дзеда Арцёма, які не піў і не курыў? Мэта ажыццёўлена, і навошта гібець на гэтай запаскуджанай зямлі? Ды хто можа змераць мяжу магчымасцей, інтэлекту — сам чалавек, акружэнне, невядомая злая сіла? Хто, які сучасны Настрадамус паставіць на стол сасуд, у якім ляжыць цыдулка: ты, імярэк, вычарпаў сябе дарэшты? Няма такога вяршыцеля. А тым болей што людзі заўсёды захапляюцца прыстойнымі серадзнякамі, асобы неардынарныя — не ў пашане пры любым грамадскім ладзе. Вох жа, чаго толькі не прыблюзніцца бяссоннай ноччу!

Можа, паслухаем самога самазабойцу? Насланнё? Нельга? Можна! У адной з газет Чуйкевіч прачытаў інтэрв'ю з чалавекам, які падрыхтаваў сябе да смерці і пасля сустрэчы з журналістам звёў рахунак з жыццём.

Пытанне: «А хіба не варты рэдкія чалавечыя радасці таго, каб цягнуць лямку жыцця, пераносіць ягоныя пошласці? Чаму за іх не заплаціць цярплі-

васцю? Бо цудоўнае ж адно толькі чаканне чалавека чалавекам!»

Адказ: «Павінен расчараваць. Тут слепата і заблуджэнне ў элементарным, відавочным. Запомні: чалавек чалавека не чакае, не ўмее чакаць! Здольнасць гэтая памірае ў зародкавым стане, як з дзяцінствам памірае сувязь з Богам. Калі нават у кагосьці ёсць чалавек, які кажа: «Ах, як я чакаю цябе!» — то гэта чысцейшай вады хлусня, самападман. Гэтае чаканне зводзіцца звычайна да абразлівых, ганебных для чалавечай прыроды дробязей. Чакаюць, каб ты прынёс бульбы з гароднiннага магазіна, вынес смецце, чакаюць будучага партнёра па сумесным пражыванні і г. д. І больш нічога. Без сумнення, нічога ад вас другі чалавек не чакае і чакаць не здольны. Як нам не абрыдне хлусіць самім сабе, што мы — не адзінокія! Азірніся вакол: дзяўчаты, жанчыны, мужчыны, нават падлеткі толькі тым і заклапочаны, каб выглядаць неадзінокімі. Сутаргава лепяцца да кампаній, ад якіх нудзіць, сутаргава кідаюцца ў выпадковае замуства альбо жаніцьбу. Мы адзінокія, кожны з нас — першапачаткова, генетычна! І трэба гэта прызнаць, а не крывіць душою. Захаваць фармальнасці жыцця, быту — ці не ў гэтым камедыя ўсіх чалавечых старанняў? Які сэнс у гэтай мітусні? Ніякай азлобленасці ў мяне няма, толькі шкадаванне. Я жадаю вам усім шчасліва заставацца. Калі зможаце».

Бяда ў адзіноцтве чалавека, сцвярджае гэты самазабойца. Чуйкевіч якраз у адзіноцтве трагедыі не бачыў. Можа, наадварот: адзінота прыносіла яму шчасце, патаемныя хвілі пранікнення ў душу, спробы разгадаць яе. Гэта тады, калі ён утаймоўваў, адрынаў ад сябе ўсе згрызоты, клопаты і заставаўся сам-насам менавіта з «чыстай» адзінотаю. Такая мажлівасць, на жаль, надаралася рэдка, у чым і была ўся бяда. А калі твой стан іншы, то, канечне, вакол павінны быць людзі. Цяпер вось, прыкладам, пра якую адзіноту можа ісці гамонка? Ды яе не вылавіш, як слізкага ўюна ў вадзе.

Чуйкевіч званіў і туды, і сюды, ледзьве ўведаў, як зняць з гарадской даведачнай нумар тэлефона. А як выкасаваць адрас, пэўнасці не дабіўся. Ён імкнуў

абмежаваць кола людзей, якія захочуць па прозвішчы даведацца ягоны адрас і нумар тэлефона. Скажам, візітоўка не кожнаму трапіць. Па п'яні злачынцы іх згубяць, гэтыя візітоўкі. Праміне якісьці час, покуль будуць у алкагольным ачмурэнні, покуль будзе хапаць грошай, а тады спахопяцца. Ды ці мала што!

Чуйкевіч сеў за машынку і адстукаў заяву:

Начальніку Мінскай гарадской тэлефоннай сеткі ад Чуйкевіча Кастуся Рыгоравіча

ЗАЯВА.

Прашу мой нумар тэлефона з гарадскога даведніка зняць і на даведачную не даваць у сувязі з турботамі ад назойлівых званкоў.

13 красавіка 1988 года. *Чуйкевіч.*

Чорт, акурат нешчаслівая лічба! Сунуў заяву ў дыпламат. А ці забралі яны з майстэрні гадзіннік? Сёння серада, павінны працаваць, хоць цяпер мала дзе захоўвалі распарадак дня. Вольніца!

Чуйкевіч выйшаў на вуліцу. Душа ажно знибела ад заклапочанасці. Балазе хоць дзянёк выдаўся. Калі б не ягонае змрочнае пачуванне, як бы ён радаваўся: і цёпламу сонейку з бязвоблачнага неба; і роўнаму разліву травы, якая напаўзае, нарастае з бакоў на цэментовы ходнік; і адмыслова выразаным, яшчэ складзеным у гармонік лісцям каштаноў; і пацерцы галубоў, што расселіся на краі дахоўкі вышэзнага дома... Ды ці мала ў чым знойдзе асалоду чалавек, у якога настрой слаўны?

Гадзіннікавая майстэрня была на Ленінскім праспекце. Прыпынак Чуйкевіч праехаў на тралейбусе, а далей патупаў пехам. Насустрач выдыгаў высокі негр з сівымі валасамі, падобнымі на лішайнік, якім абрастаюць грудкі ў сасонніку. Чуйкевіч здзівіўся: ці бываюць увогуле ў неграў сівыя валасы? Але прыгадаў Нэльсана Мандэлу...

Трымаючы навідавоку пашпарт, Чуйкевіч доўга ўталкоўваў непамерна растаўсцеламу чарнавокаму гадзіншчыку, што да чаго.

Нарэшце той моўчкі леным, як у маржа, рухам падсунуў цела да зацягнутага чорным аксамітам стэнда, на якім блішчэла безліч гадзіннікаў. Ледзьве

вышукаў патрэбны. (У Чуйкевіча было ўжо захалану ла сэрца: «Забралі?..»). Даў паперку і прадыктаваў: «Пішыце: забраны па пашпарту... нумар... серыя.. Дата. Росціс».

«Дурныя яны засвечвацца»,— саступіўшы з высокіх пашчэрбленых усходцаў майстэрні, пакпіў з сябе Чуйкевіч. Так яно: ці варта ім рызыкаваць з-за якогасьці дапатопнага гадзінніка і пакідаць на квітку адбіткі пальцаў? А па-другое, можа, небарака заявіў у міліцыю, і ў майстэрні ўжо затаілася засада. У «Падпісныя выданні» па том Караткевіча яны і пагатоў не сунуцца.

Ён не заўважыў, як параўняўся з прыпынкам — вялікай белай літараю «Т» на слупе, акаймаванай сінімі металёвымі вугалкамі. Часта ў задуменні наваколля для яго не існавала. Ён лунаў у таямнічым мікракосме сваёй душы. Гарадская тэлефонная сетка месцілася ў доме па вуліцы Харкаўскай. Той раён Чуйкевіч крыху ведаў: калісь, жывучы на старой кватэры, тады-сяды хадзіў у кінатэатр «Сучаснік» на фільмы.

У тралейбусе было цесна, і ён захваляваўся, каб і тут не пачаў хтосьці шныпарыць па кішэнях. Яго так прыціснулі да дзяўчыны, што ён адчуваў чашачкамі каленяў цеплыню ейных ног, якая разлівала па і без таго вялым целе млявасць.

За столікам каля дзвярэй дома сядзеў дужы стары ў светла-шэрым гарнітуры і фуражцы з жоўтым аколышам. У яго былі пышныя сівыя вусы, гладкія, бы мучны блін, шчокі, а нос спярэшчаны маршчынамі, быццам яго парэзалі. Стары ў дом Чуйкевіча не пусціў, але заяву ўзяў: «Куды трэба, перадам. Толькі... на вашай беларускай мове наўрад ці прымуць заяву».

Чуйкевіч усё-такі вахцёру даверыўся. Ведаў, людзі старой закваскі — добрыя выканаўцы. Станоўчая рыса сталінскай эпохі. Але абурыла тое, што любы кручок абгароджвае сябе сцяною непрыступнасці: мова, бачыце, не тая. А якая павінна быць у суверэннай дзяржаве? Няўжо за дзесяткі гадоў не здаволіліся экзекутары народных святыняў?

Распалены злосцю, Чуйкевіч не заўважыў, як уступіўся ў глыбокую каляіну з гліняна-мутнай вадою. Калі не шанцуе, то не шанцуе доўга.

## РАЗДЗЕЛ 30

Маятнік часу раптоўна забарахліў і з натужным скрыпам адлічыў тыдзень. Чуйкевіч, набраўшы 09, спытаў кватэрны тэлефон Чуйкевіча Кастуся Рыгоравіча. Глухаваты дзявочы галасок прамармытаў: «Абанент закрыт!» Разам з палёгкаю («Усё-ткі знялі, не паглядзелі на беларускую мову!») Чуйкевіч адчуў, што гэтым самым ён як бы надаваў сабе значнасці. Але, мусіць, пустое ўсё гэта, і заходы свае ён робіць ад бяссілля ды ачмурэласці. Бадай, не шкодзіла б яму крыху атупець эмацыянальна, падурнець, ці што. Іначай гэтая брытвенная абвостранасць скосіць яго напавал. Праўда, адзін фанабэрысты малады эскулап нейк за столікам у кавярні сказаў яму: «Толькі дэбілы не аналізуюць свой душэўны стан».

Чуйкевіч, можа, у соты раз нагадаў Арцёму і Васю, што не трэба незнаёмаму адчыняць дзвярэй, кім бы ён ні назваўся: сантэхнікам, тэлемайстрам, міліцыянерам, бацькавым сябрам. На вуліцы ні пад якімі ўпросамі не згаджацца з некім ісці ў пад'езд, за вугал, садзіцца ў машыну. Не браць ад чужога марожанае, цукеркі ці штосьці іншае, бо можа быць атручана.

Заглянуў на кухню: там была жонка. Ейны стан мякка аблягаў светла-зеленаваты пакістанскі халат. На галаве лёгкая капронавая хусцінка натапырылася тупымі рожкамі бігудзі. Жонцы ён давяраўся рэдка па адной простай прычыне. Яна разносіла ягоныя сакрэты па сяброўках. А ў сям'і, як і ў дзяржавы, павінны быць свае таямніцы. Дзяржаву ахоўвае служба бяспекі. Сям'я — самая маленькая дзяржава — таксама падстаўлена пад удары разбуральных сіл. Адзіны ахоўны шчыт ад іх — язык за зубамі. Яго трэба трымаць там нават калі няма зубоў. Хто не трымае, той сам капае сям'і магілу.

— Я вымушаны табе, Людміла, сказаць пра адзін вельмі непрыемны факт.

Жонка ўгнула галаву, закрыўшы вейкамі чорную слязу-радзімку. Мусіць, падумала, што вінаватая менавіта яна. Як у кожнай жанчыны, мала задаволенай жыццём і мужам, у яе хапала грахоў перад сям'ёю.

— Слухаю.

— У пятніцу... калі ад'язджала да маці... помніш? Ты недарэмна пыталася тады ў мяне, што здарылася.

Дык вось, зладзюганы выцягнулі ў мяне партманет з грашыма. Але грошы — ерунда. Там былі мае каардынаты. Адрас, тэлефон і ўсё такое. Ты ведаеш, які цяпер злачынны свет. Не выключана і тут, што яны паспрабуюць раскруціць свае гнюсныя намеры. І здаецца, пачалі ўжо...

Жонка, якая моўчкі слухала, накінулася на яго з абвінавачаннямі. Абазвала расцяпаю, няўдаліцай. Ка́пала і ка́пала ў яе пад вокам чорная слязіна. Ён, можа, і быўварты гэткіх слоў. І наўрад ці ёсць яму апраўданне. Хіба што адно: ён не меў права глядзець на людзей вакол сябе як на злачынцаў. А цяпер пэўна бачыць, што іх усюды хапае. А там, дзе гарэлка, і пагатоў. І ён фіксаваў, прымячаў падазроныя моманты ў паводзінах хеўры. Ды ўсё да канца зразумелася толькі пасля здарэння.

— Абражай мяне колькі ўлезе, ты гэта ўмееш,— вінавата, з неўласцівай яму пакораю сказаў Чуйкевіч. Ён і раней змагаўся не з самою жонкаю, а з несправядлівасцю, якая за ёй стаяла.— Але я павінен быў цябе і дзяцей папярэдзіць. Калі што, адразу зарыентуешся.

Прызнаўшыся жонцы, ён адчуў палёгку, быццам частку сваёй адказнасці перадаў ёй. Яму ўжо абрыдла клібніць адно і тое. Жонка непасрэдна не магла і не хацела яго падтрымаць. Але ўскосна ейная падтрымка сэнсавалася ў тым, што яна безуважна ставілася да любога казусу. І гэтая ейная легкадумнасць крыху адваёўвала пазіцыі ў ягонай адказнасці, і ён ужо сам спакайней глядзеў на рэчы. Дзякуй і за гэта!

Яму трэба было менавіта супакоіць сваю душу. Багата выпала на яе здзеку. Спадзёўка на Вераніку, на каханне да чужой жанчыны, такое магічнае, усёмагутнае, нечакана рассыпалася. Ды яшчэ загусціла трывогу. І чамусьці ён не сумняваўся, што яго яшчэ чакаюць крутыя вілюжыны выпрабаванняў.

## РАЗДЗЕЛ 31

Людміла адно кінула на мужа позірк і па ягоным спалатнелым твары, вырачана-разгубленых вачах зразумела: штосьці стрэслася. Але ведала, ён не прызнаецца, як ні дапытвайся. Нават гарэлка, якую ён прынёс, не развяжа яму язык. Кастусь змя-

ніўся, раней такім з ёю не быў. А чаму? Ейныя адносіны да яго, лічыла, не горшыя і не лепшыя, чым ён заслугоўваў.

Толькі цяпер вось, нарэшце, прызнаўся. Сапраўды, выпадак не радавы. Але і не такі страшны, як здаецца Кастусю. Ён, ейны муж, увогуле бачыць свет крыху перакошаным. Калі яна папракала яго, што ён не ўмее жыць, не спекулюе і не зарабляе ні ў якіх сумесных прадпрыемствах ці каапературах, куды кінуліся дзялкі і праныры, ён адказваў: «Камусьці трэба і дзярмо вазіць». Ёй гэта не падабалася, бо ён меў на ўвазе не сябе, а якраз гэтых таўстасумаў, праўдзівей, нягодныя сродкі, якімі яны нажываюцца. У ейным разуменні, муж — гэта прылада працы з вечным рухавіком, які заводзіцца без намаганняў адным жончыным загадам. Кастусь такой прыладаю не быў. І галоўнае, у яго не было нават імкнення стаць ёю, і гэта яе раздражняла. Наўпярок, з кожным днём ён больш і больш прыносіў у сям'ю праблем. Зачасціў нечакана з выпіўкамі. Але ці нечакана? Чула, бацька ягоны быў не промах. Дык таму ж перажыванняў хапіла: калектывізацыя, вайна, раненне, высылка...

Цана Кастусю, як мужу, у ейных вачах падала. Хоць сама яна нідзе толкам не магла працаваць; яе адусюль выганялі, звальнялі, скарачалі. Таму і не ацэньвала, не магла ацаніць заслуг свайго мужа.

Людміла, упіраючыся каленам у адламаныя дзверцы тумбы, мыла талерку. Калі падымала яе да сушылкі, яна выкаўзнулася з рук.

— Ах каб цябе!..

У яе стала ледзьве не абавязковасцю біць посуд, асабліва калі мыла яго чымсьці ўзнерваваная. Талерак дык зусім засталося мала, а жаночага шчасця яшчэ менш. Яна маргнула вачыма, і светлая сляза скацілася разам з чорнаю.

## РАЗДЗЕЛ 32

Перад сном Чуйкевіч узяў у рукі «Беларускі праваслаўны малітоўнік». Гэтую кніжачку светла-блакітнага, мала не вадзяністага колеру яму нечакана падараваў малады літсупрацоўнік аддзела навукі і мастацтва Валянцін Скронь. Ён пісаў вершы, нядаўна пераехаў у Мінск з Нароўлі. Чуйкевічу кні-

жачка спадабалася. Гартаў — і быццам далучаўся да якойсьці магіі, таемнасці.

Стаў тварам да кута, дзе вісеў папяровы абразок-плакацік, прысвечаны 1000-годдзю хрышчэння Русі.

## МАЛІТВА СУПРОЦЬ ЗЛОГА

Уваскрэсьне Бог, і рассыплюцца ворагі Ягоныя, і ўцякуць усе, хто ненавідзіць Яго, ад аблічча Ягонага. Як разыходзіцца дым, так няхай зьнікнуць яны, як тае воск перад агнём, так няхай д'яблы зьгінуць перад тымі, хто любіць Бога, хто ахінае сябе знакам крыжа і весялосьці кажа: Радуйся, найсьвяцейшы й жыцьцятворчы Крыж Госпадаў! Ты праганяеш д'яблаў сілаю на табе ўкрыжаванага Госпада нашага Ісуса Хрыста, Які ў пекла зыйшоў і сілу д'ябла адолеў і дараваў нам Цябе, Крыж Свой пачэсны, на збаўленьне ад усякага супраціўніка. О, найсьвяцейшы і жыцьцятворчы Крыж Госпадаў! Памагай мне са сьвятою Уладарнай Дзеваю Багародзіцай і з усімі сьвятымі навекі. Амін.

Адчытаўшы малітву, Чуйкевіч перахрысціўся, але не машынальна, а думаючы, у якім парадку і куды падносіць стуленыя шчопцем пальцы. У яго не было ўмення маліцца. Да Бога ён пачаў звяртацца зусім нядаўна, як і мільёны ягоных суграмадзян. І ніякай боязі ў яго не было. Цяпер ніхто не га́ніў за веру, за шанаванне рэлігіі і ейных святаў. Не пагражаў звальненнем з пасады, выключэннем з партыі за хрышчэнне дзяцей. А калісь партапаратчыкі бралі ў цэрквах, у касцёлах спісы бацькоў, якія хрысцілі дзяцей. І калі сярод іх выяўлялі камуніста — сурова каралі.

Чуйкевіч не праціўіўся, калі цешча хрысціла ягоных сыноў. Праўда, імёны ім ён даў сам — у гонар сваіх дзядоў. Ён не бачыў у хрышчэнні злачынства ці чагосьці ганебнага. Яшчэ тады, дванаццаць гадоў назад. Што ён, мікраскапічная клетачка ў касмічным арганізме, супроць тысячагадовай завядзёнкі? Нават тады-сяды шкадаваў, што ўвесь час быў адлучаны ад царквы, не ведаў да яе дарогі. Толькі раз, ці не ў трохгадовым узросце, яго вадзіла бабуля Аксюта ў царкву ў Крычаве. Запомнілася, як поп у залацістай нерухомай расе даў яму з маленькай, бы шапка жолу-

да, лыжачкі «кашкі». Гэтая «кашка» і цяпер салодзіць яму рот, пераносіць у невядомы, рамантычна-далёкі, нязвыклы свет.

## РАЗДЗЕЛ 33

Каб пабываць у гэтым свеце яшчэ раз, Чуйкевіч, гасцюючы ў цешчы на польскі Вялікдзень, пакіраваў да касцёла. Быў канец красавіка, халоднага і сырога. Уначы выпаў снег, а раніцаю яго перамяшалі машыны і людзі з граззю. Калатуша ліпла да чаравікаў, як цеста.

Касцёл ён выбраў не лепшы. Драўляная будыніна, доўгая і высокая. Каля яе стаяла процьма легкавушак. Пры ўваходзе туліўся спінаю да сцяны васкований ватвары, з нерухомымі пустымі вачыма жабрак. На локці ён трымаў зашмальцаваную кайстру. Чуйкевіч кінуў у яе жменю медзякоў. Выцер ногі аб жалезныя спружыністыя шоргалкі і ступіў усярэдзіну.

На падлозе ляжалі саматканыя вузкія ходнікі — такія калісь слалі ў вясковых хатах. Будыніна звужалася да амбона, дзе гарэла шмат электрычных лямпачак заміж свечак, што вельмі здзівіла Чуйкевіча. У бэлькі ўпіраліся абчасаныя з чатырох бакоў слупы. Вузенькія вакенцы пад самай столлю кідалі на белы шоўк харугваў бляклае святло. Гірлянды з зялёнага сушанага, падбеленага пылам лісця злёгку пакалыхваліся.

Чуйкевіч паўглядаўся ў партрэты пакорна-ціхмяных апосталаў на сценах. Пазней убачыў, што людзі сюды не проста заходзяць. Яны мачаюць у місу з вадою рукі, хрысцяцца ўсёй пяцярнёю і цалуюць прыбітага да самага блізкага ад дзвярэй слупа Ісуса Хрыста. Найбольш у ногі, гучна, з прыцмокам. Чуйкевіч спахапіўся: «Можа, і мне гэтаксама трэба было зрабіць?» Раптам ён парушыў якісьці важны рытуал і яго выганяць адсюль як бязбожніка. Можа, тут ёсць адмысловы назіральнік.

Скаваны, здранцвелы, ён уважліва выслухаў набажэнства і ціхенька выслізнуў з касцёла. Дзіва дзіўнае, яму здавалася, што душа ягоная пачысцела і паяснела. Яму ласкавей глядзелася на неба, дрэвы, дамы, брудную калатушу пад нагамі. Гэты стан свой ён добранька запомніў.

А нядаўна Чуйкевіч схадзіў у Екацярынінскую царкву на Нямізе і паставіў свечку за свайго сябра Мякоту.

## РАЗДЗЕЛ 34

І цяпер, пасля малітвы, Чуйкевіч адчуў штосьці блізкае. Толькі прасачылася пачуццё лёгкага сораму. Сталы чалавек, усё жыццё атэіст, выхаваны на матэрыялізме камуніст, і раптам моліцца. А тут, мабыць, няма чаго саромецца. Ён прыгадаў, што нават такія асобы, як прэзідэнт ЗША, увесь час наведваюць царкву. Не здурнелі ж яны. Проста Чуйкевіч вырас у грамадстве, у якім партыя прысвоіла сабе манаполію на чалавечую душу. Раней пра гэта не думаў, а цяпер не думаць не мог. Атэізмам забівалі не толькі веру ў Бога, але і ўсякую веру, апроч веры адной — веры ў камунізм. І дзеля сваёй мэты правільна рабілі, бо калі ўжо дзве веры, то частка людзей у адзін бок пойдзе, частка — у другі.

Зберагаючы ў душы супакаенне, улагоджанасць, Чуйкевіч лёг у белы прамакутнік канапы.

## РАЗДЗЕЛ 35

...І сніцца яму СОН. З-за павароту на высокім абрыве выходзіць да рэчкі (хтосьці, здаецца, пайшоў уперадзе). Рэчка вузенькая, зарослая аерам, але не палезеш жа абуты. Другі бераг балоцісты, дыхае дрыгва сінімі бурбалкамі. Глядзіць: крыху далей мосцік. Радасная думка: «Выратаванне!» Набліжаецца — на беразе раскіданы дробныя залатыя і срэбныя рэчы: ланцужкі, кулоны, брошкі, проста каменьчыкі... Ён збірае і думае: вось будуць грошы, разбагацею, куплю жонцы футру. Перабраўся цераз мосцік на той бок, і раптам з'яўляецца не то бабуля, не то дзяўчынка. Кажа: «Я ведзьма і цябе загублю». Ён капырзнуў яе нагою. Яна шчубоўкнула ў ваду, пайшла на дно, бліскаючы, як залатая блешня. Потым усплыла — і зноў за ім. Чуйкевіч недаўмявае: няўжо гэтая жоўтая няўдаліца можа яго загубіць? Далей не помніць, што і каму даказваў. Толькі чуў, як з магутных дубоў, што раслі пад гарою ў канцы лугу, ляцела: «Не тое... Не тое... Не тое...»

## РАЗДЗЕЛ 36

Спатканне, танцы на кватэры пасялілі ў Вераніку неспакой. У яе не праходзіла адчуванне, што ў Кастуся не патрэба казаць кампліменты ёй, а проста разуменне, што жанчыне трэба лесціць. Што гэта? З ейнага боку няўменне іх выклікаць ці ягоная няздольнасць безаглядна, шчыра захапляцца ёю? Такую няздольнасць яна асуджала ў мужу. А ёй хацелася, каб мужчынская душа прагіналася, як клавішы пад пальцамі. Не заўсёды, а час ад часу адчуваць, што мужчыну, які побач, яна можа прынізіць. Без прыніжэння яна не зведвала сексуальнай задаволенасці. А без сексуальнай задаволенасці не бывае і ніякай задаволенасці.

Дарэмна прызналася, што ў яе муж — кадэбіст. Але ж надта хацела дапамагчы Кастусю. Ён загадкавы мужчына. Ён якісьці недасяжны. У яго вялікае, цёплае сэрца, ды гэта яму на шкоду. Відочна, ён крэпенька ўліп. Як жа яна не падумала, што да арганізацыі, дзе працуе муж, у людзей недавер.

Хоць было позна, Вераніка пазваніла маці ў Валгаград. Хацела ведаць пра дачку. Якраз тое, што яны разлучаны і яна, маці, жыве адна, спаўна карыстаючыся вольніцаю, таксама нервавала. І каб нервовасці не наклаліся, адну, якую мажліва, трэба абавязкова паслабіць.

Маці, голасам дбайнай бабулі, сказала, што з Дзіянкаю ўсё добра. Іначай яна і не магла сказаць, падумала Вераніка; нават калі б Дзіянка захварэла, наўрад ці прызналася б. Надта клапацілася пра здароўе дачкі.

У пакоях і на кухні гуляла якаясьці панылая пустата. Вераніка ўзяла пухнаты клубок зялёных ніток, пранізаны тонкімі нікеляванымі пруткамі, села на канапу.

Блёсткі, што коўзаліся па прутках, нагадвалі ёй агеньчыкі на свечках, пад якія яны таньчылі з Кастусём у ягонай кватэры.

## РАЗДЗЕЛ 37

Праз месяц з пачатку заняткаў на ўрок прыйшоў дзяцюк. Ён меў доўгае тулава і кароткія тоўстыя ногі, як амаль кожны мужчына, што вырас

у вёсцы. Быў апрануты ў сінюю балонневую куртку, на галаве чорная трусіная шапка. Не вітаючыся, сеў як гаспадар за стол побач з Хатанычам. Зняў шапку і важнецкім позіркам абвёў клас. Увогуле выгляд меў напышлівы. Такія людзі Чуйкевічу не падабаліся за сваю прымітыўнасць. Але тут зразумеў, што гэты дзяцюк тое-сёе з сябе ўяўляе.

На перапынку да яго пачалі падыходзіць курсанты, пытацца, адчуўшы ягоную значнасць, хто ды чаго. Дзяцюк не зважаў на чаплянні, пыжыўся, штосьці нібыта выглядаючы ў глыбіні класа. Нарэшце ўсе зразумелі, што перад імі інструктар па ваджэнні, прозвішча ягонае — Доўнар.

Доўнар выцягнуў са сподняй кішэні складзены ў чатыры столкі аркуш паперы з празрыстай плямаю тлушчу на рагу, разгладзіў яго далонню. Пачаў называць прозвішчы. Таго, хто адгукаўся, доўга і прыдзірліва вывучаў. Мусіць, запамінаў. У лік ягоных выбраннікаў трапіў і Чуйкевіч. Быў і не рады, і не засмучаны. За напускной пыхлівасцю ён бачыў у інструктару простую натуру вясковага хлопца, якога хваля міграцыі выкінула на бераг сталіцы. З такім можна паразумецца. Гэта не якісьці гарадскі барыга. Доўнар сказаў, што гаражы СТК у Баравой. Градам пасыпаліся пытанні, дзе гэтая Баравая. Аказалася, далёка, ажно за Мінскам, за Кальцавой дарогаю.

Чуйкевіч пра гэтую дарогу не раз чуў, але не ведаў, дзе яна. Косава таксама не ведала. Ім уталкавалі тыя, хто ведаў. Трэба ехаць на вуліцу Каліноўскага, да штучнага возера. А там пехатою міма дзіцячага садка праз лясок.

— Праз лясок — гэта добра,— сказаў Чуйкевіч Косавай. Яму востра не хапала лучнасці з прыродаю, з лесам, травою, дрэвамі. Ён быў дзіця прыроды, хоць і горад, можа, на якоесьці дзіва, не вельмі адштурхоўваў яго.

## РАЗДЗЕЛ 38

### З ДЗЁННІКА:

Колькі іх пазасела ў савецкіх і партыйных органах — чэрствых бюракратаў, тупых, абмежаваных людзей, проста хамаў!

Учора, як член прафкама, хадзіў у выканкам са спісам чаргавікоў на кватэру і пабачыў аднаго з такіх. Адрузлы ад гарэлкі твар, пра які кажуць — просіць цагліны, развязная паходка, грубы голас. Двух слоў звязаць не ўмее, не тое што пагутарыць па-чалавечы з наведнікам. І гэткі тыпус вырашае лёсы людзей: «Ні-ізя!»

Як цывілізацыя нішчыць прыроду, так хамы — грамадства.

## РАЗДЗЕЛ 39

Першае ваджэнне Чуйкевічу прыпала на пятніцу. З раніцы. Быў задаволены — акурат творчы дзень. Загадзя разведаў маршрут, якім найлепш ехаць да вуліцы Каліноўскага ад ягонага дома. Туды ішоў семдзесят шосты аўтобус. Ноч перад пятніцаю была неспакойная. Як заўсёды напярэдадні, калі чакалася штосьці новае ці адказная справа. Не лепшы быў, канечне, настрой, каб садзіцца за руль. Але што зробіш. Не пад нас падладжваецца жыццё, а мы падладжваемся пад жыццё.

Раніца была ціхая. Вісеў касмыляваты туманок з дамешкам дыму. Зямля, як бы затоеная перад магутным выкідам зелені, выпусціла ў разведку нахабнавата-едкія, бледнатварыя каліўцы крапівы. Галасна чырыкалі вераб'і ў вішанніку, што паланіў счарнелую старую хату. Голуб-самец на вільчыку натапырана буркаваў каля прыгладжанай мітуслівай галубіхі.

Чуйкевіч, здаецца, адтайваў душою, нараджалася кволае адчуванне радасці, незразумелая міласць да ўсяго жывога. Ён мог паднесці кветкі любой стрэчнай жанчыне, усміхнуцца ёй, даць дзіцяці цукерку альбо цацку.

Уступіўшы ў лес, ён на самым ускрайку спыніўся. Ціха шумелі сосны, як зялёныя хвалі хадзілі бухматыя галіны. Можа, якую птушачку ці нават вавёрку пашанцуе ўбачыць? Не пашанцавала. На кусце ядлоўцу правісла белая, ацяжэлая ад кропелек расы павуціна. Улавіў тонкі духмяны пах. Праваруч, метраў за пяць ад яго, вясеннілася невысокая вербалозіна. Жоўтая ад цвету, як чыстая пастрыжаная з зімы авечачка. Ён падышоў да яе. Пухлявыя коцікі, бы

цівіняткі квактуху, абселі кожную галінку. А лісцікі — маленькія, бліскучыя язычкі.

Чуйкевіч правёў далонню над вербалозінаю, баючыся дакрануцца, хоць вельмі карцела. Чорны з белым плюшавым паяском чмель рупліва дундзеў у жоўтай ваце коцікаў.

Стаяў, не помніць колькі. Схамянуўся: трэба ісці, можа спазніцца. У шыгаллі бялелася сцежка, спадала за пагоркам. Ён пагробся па ёй. Насустрач бег мужчына ў адзідасаўскім спартыўным касцюме, белых красоўках, расчырванелы, з засяроджаным тварам: мусіць, прыслухоўваўся да сэрца.

А ці слухаем мы сэрца? Ці часта слухаем?

З высокага абрыву Чуйкевіч убачыў шашу. Яна і ёсць Кальцавая дарога. Па ёй ішлі-стагналі цяжкія, гружаныя машыны. Ён перасёк шашу — за ёю стаяў шчыльнай стромкай сцяною ельнік.

Сярод елак было змрочна і глухавата. Густы, вытканы ігліцаю дыван прагінаўся пад нагамі, як воск.

— Кры-кры-кры-кры!..— нечакана пачулася знеткуль, і Чуйкевіч утарапеў на месцы. Да шэрага яловага ствала прыляпілася вялікая чорная птушка. Падперлася пруткім хвастом і часта-часта застукала жоўтай дзюбаю. На галаве, бы вугалёк, мільгала чырвоная плямка. Гэта быў чорны дзяцел ці, як інакш яго называюць, жаўна.

Сцежка разрукавілася на некалькі — чыстых, акурат мурашыныя хады, з якіх знесена кожная шыпулька. І Чуйкевіч разгубіўся: па якой ісці? Рушыў наўздагад і хутка вынырнуў на абшар. Гэта і была Баравая. Каля белацаглянага прыземістага будынка выструніўся шыхт гаражоў. Доўнар быў ужо там, галёкаў на двары. Каля прахадной Чуйкевіч убачыў двух сваіх курсантаў і абрадаваўся. Заўсёды вальней сябе адчуваў у новых варунках з кімсьці знаёмым. Тут жа круцілася з паўдзесятка адной масці — пегіх — сабак.

Садзіцца за руль першы раз было боязна. Доўнар валаводзіў, паказваў, што заняты. Перабіраў паперкі ў сваёй цэлафанавай папачцы. І як тут было не ўспомніць Чуйкевічу пагудку, што да інструктараў пачынаць падступацца трэба з бутэлькаю. Тады нечаму можа навучыць. А так толькі званне, што вучыўся ездзіць. Дасць табе машыну — рабі з ёю, што хочаш.

Кружляй па пляцоўцы на першай перадачы. Здаецца, да гэтага ішло.

Дзесьці толькі пад абед Чуйкевіч сеў за руль старых, пашарпаных «Жыгулёў», на кузаве якіх тырчаў трохкутнік з чырвонай літарай «У». Дзе перадача, газ, тормаз, счапленне, ён ведаў. Перад гэтым асвойваў рычагі ў кабінеце на катапульце-імітатары, падобным на цацачную машыну. На такіх катаюцца дзеці ў парку Чалюскінцаў. Завялася машына лёгка, з паўабарота. Чуйкевіч пачаў гарачкава ўспамінаць, што рабіць далей.

— Ну, што сядзіш? Стартуй! — адарваўся ад сваіх папераў Доўнар, які сядзеў спераду побач.— Здымай з ручніка.

Чуйкевіч узяўся за рычаг між сядзеннямі, націснуў вялікім пальцам на кнопку, апусціў рычаг. Утапіў счапленне, рушыў пераключальнік перадач уперад. Адпускаючы счапленне, забыў даць газу — машына захліпнулася.

— Што ты робіш, мудак, маць тваю за нагу?! — закрычаў Доўнар.— Газу лупі!

За другім разам машына кранулася.

— Глядзі на дарогу, тут ямы,— папярэдзіў Доўнар.— Уключай другую перадачу.

Чуйкевіч пацягнуў грушу пераключальніка на сябе — «у кішэнь», як раілі спяцы,— паслабіў правую на белым злізаным пятачку акселератара. «Жыгулі» рванулі, здалося, вылецелі з-пад яго, Чуйкевіча, а ён павіс у паветры.

— Плаўней газку давай,— падказаў Доўнар ужо спакайнейшым голасам.

Хвіль праз дваццаць калывання па ціхай лясной дарозе Чуйкевіч увапрэў. Кашуля прыліпла да майкі, майка да цела.

— На першы раз хопіць,— сказаў Доўнар.— Чацвёрка.

Нягледзячы на высокую адзнаку, задаволенасці Чуйкевіч не адчуваў. Не было ў яго прагі да язды, увогуле да машыны, таго натхнення, з якім чалавек робіць жаданую справу. Чуйкевіч лічыў: эпоха тэхнікі скончылася, наступіла эпоха псіхалогіі. Пасля — немінуча дэградацыя, развал, магчыма, і пагібель цывілізацыі. Ён і на вучобу пайшоў не па закліку сэрца. А праз тое, што людзі куплялі «колы», і цяпер

ужо не толькі дзеля прэстыжу. Лічылася выгадным укласці грошы ў штосьці саліднае, у лецішча, у машыну ці хоць бы ў тэлевізар альбо халадзільнік. Да таго ж, жонка ўжо мела вадзіцельскае пасведчанне. А даць машыну ў рукі толькі жанчыне — трэба загадзя класціся ў труну. Людміла ўжо тым, што вучылася на вадзіцеля, добра патурзала яму нервы. Прыходзіла позна, прапахлая дымам і гарэлкаю. Аднаго разу ледзьве дабралася да ложка. Раздзелася ў бясцямнасці дагала і рухнула. Ён не раўнаваў і не абмяжоўваў ейнай свабоды: дарослы чалавек сам у адказе за собскія ўчынкі.

Косава казала, што ў іх ёсць машына — прэстыжная «дзевятка». Ездзіць муж па Глыбокім. Цяпер хоча навучыцца яна. Падобна, што мужа хутка перавядуць кудысьці ў Джэзказганскую вобласць. Тады машына, мажліва, застанецца ў Мінску пры ёй. Якая сучасная жанчына не марыць з вакна легкавіка памахаць ручкаю юрліваму лавеласу! Самая дамашняя, самая цнатлівая, самая скаваная жанчына таемна пялегуе надзею, што яна, апроч мужа, яшчэ камусьці патрэбна.

Сумны Чуйкевіч брыў да лесу. Апынуўшыся сярод дрэў, зноўку пачаў прыглядацца. Не здаволіў прагі любавацца прыродаю. З леташняй ігліцы выбіліся кругленькія, велічынёю з кнопку, лісцікі заечай капусты. У іхнай вёсцы яе называлі кісліца. Чуйкевіч сашчыкнуў адну, пажаваў — сапраўды кіслая. Кіслая, як усё ягонае жыццё.

На прыпынку, гледзячы на цьмяны бляск возера скрозь лёгкі туманок, ён успомніў, што ў гэтым раёне жыве Цішкоў. Можна было б з ім выпіць, паслухаць, як ён, дужы, бэсціць слабы пол, звальвае на яго ўсе беды. Але — часта пачаў выпіваць. Штосьці незразумелае цягне да чаркі, як быццам толькі ў ёй ратаванне. Можа, заглянуць? Сорамна надакучваць. Парадаваўся за сябе, як дзіця: яшчэ не страціў сумлення.

## РАЗДЗЕЛ 40

Да вечара было далёка. Пісаць у такім стане ён не мог. Трэба чакаць, покуль супакоіцца ўскаламучаны ставок душы: сціхнуць хвалі, асядзе глей,

прасветліцца вада... Калі чорныя сілы дадуць перадышку і ў гэты прамежак уздымуцца светлыя. Але калі гэта будзе? І ці будзе ўвогуле?

Чуйкевіч як бы міжволі завярнуў у невялікую кавярню — «На рог» (стаяла на рагу вуліц). Там прадавалася кава, салаты, сокі, бліны-налíснікі з чорнымі кружкамі падпалін і спіртное на разліў. Усё па рэстаранным цане. На шкляной вітрыне выстраіліся шыхтам, як салдаты, цэтлікі. Чуйкевіч прабег па іх позіркам. Напароўся на слова «Кагор». Чырвонае дэсертнае віно, шаснаццаць градусаў, і цукру столькі ж працэнтаў... Нездарма яго мянуюць царкоўнае. А ці ёсць увогуле лепшае за царкоўнае?

Заказаў «дзве па дзвесце» — дзве шклянкі па дзвесце грамаў. Як бы на дваіх. Сеў за столік да дзяўчыны, якая піла каву, трымаючы паліваны керамічны кубачак дзвюма рукамі. Столік быў засланы белым абрусам, густа расквечаным барвовымі кружкамі — слядамі ад шклянак. Выгляд у дзяўчыны быў маркотны. Выпіўшы першую шклянку, Чуйкевіч абмовіўся да дзяўчыны. Ейны твар разняволіўся, у вачах загарэліся глыбокія кропачкі. Значыцца, ён не такі страхотны, як часам сабе здаваўся, не насцярожыў дзяўчыны. Яна сказала, што студэнтка філфака педінстытута, завуць яе Ала. Нечакана таксама загаварыла на беларускай мове. Праз гэта ейны тварык стаў яшчэ вабнейшы. Асабліва ўражвалі бровы, чорныя выгнутыя сярпочкі, і вусны — невялікія, але з правільнымі цвёрдымі лініямі. На тэмы абстракцый пад кайфам Чуйкевіч умеў разважаць. У гэтым быў ягоны і плюс, і мінус. Плюс у тым, што ён здаваўся цікавым суразмоўцаю, а мінус — у лепшым выпадку яго, «шчырага беларуса», можна было палічыць за дзівака.

Размова, як амаль заўсёды, выкіравала на вызначэнне шчасця, і Чуйкевіч сказаў простую, можа, трывіяльную фразу: «Шчасце — унутры чалавека, калі яму прыемна і спакойна на душы». Ала пасля гэтых слоў спытала, хто ён.

Чуйкевіч даў ёй сваю візітоўку. Яна павадзіла па ёй вачыма, якія ад здзіўлення пашырэлі, і схавала ў маленькі вішнёвы рыдыкюльчык, які дагэтуль трымала пад сталом на каленях. Рады, што, можа, калісьці яму пазвоніць гэтая юная прывабная асоба, Чуйкевіч правёў дзяўчыну да прыпынку.

Кожная ягоная сустрэча з жанчынаю не была пустая і легкадумная, якую можна было тут жа забыць. Ён хацеў яе напоўніць калі не пачуццямі, то сэнсам, які адмятаў раўнадушша. Жанчына адразу не забывалася. Яна пакідала ў душы нейкую зарубку, а ў сэрцы займала свой куточак, які жыў, крывавіў сумам ад расстання, і яму хацелася новай сустрэчы. Але калі гэтай сустрэчы доўга не было, сум у сэрцы і боль у душы заплывалі ад чакання новай жанчыны.

За шклом латка спакушалі позірк выявы голых млявых жанчын на вокладках экзатычных кніг.

Вокны ў кватэры не свяціліся. Значыцца, жонка затрымалася на працы, на кандытарскай фабрыцы, куды апошнім часам уладкавалася, хлопцы пабеглі ў камп'ютэрную. Балазе блізка, у домакіраўніцтве. Якаясьці новая кароста на дзяцей — камп'ютэры, відзікі... Вядома, трэба. Але што там паказваюць? Секс, насілле, жахі — і такі бульдозер дратуе чыстае поле дзіцячай душы, пакідаючы сляды хворасцей і жорсткасці.

Грэла ўсяродку маленькае цяпельца нядаўняга знаёмства ды яшчэ футбол, які будзе трансліравацца па тэлевізары. Гэтае відовішча стала для яго таксама наркотыкам. А на цяперашні час і паратункам. Ва ўсякай любові, да чаго б ні было,— паратунак.

Адчыніў паштовую скрынку. З газет выпаў напалам складзены аркуш. «Пісьмо ў шчасце!» Цяпер паспрабуй сказаць, што няма энергаінфармацыйнага поля. Толькі што ён за столікам разважаў пра гэтую няўлоўную птушку — шчасце.

Раней яму падабалася заходзіць у кватэру, калі ў ёй нікога не было. Тады ён нязмушана, як хацелася, пераапранаўся, прыводзіў сябе ў парадак, спакойна рыхтаваў вячэру. Цяпер бачыць тупое цемрыва вокнаў на трэцім паверсе без панылаcці не мог.

Адчыніў дзверы павольна, адразу заглянуўшы за іх: ці засланіў кагосьці ў кутку пад адзеннем? Хоць і ўсвядомлены (што не даводзіла да канчатковага адчаю), страх прымушаў яго рабіць гэта. Ён вычытаў у адным дэтэктыве, дый не раз бачыў у кіно, як менавіта з-за дзвярэй злачынец наносіў удар гаспадару, які зайшоў. Разуўся, усунуў ногі ў пантофлі. Да футбола было каля чвэрткі гадзіны.

## РАЗДЗЕЛ 41

Паглядзець футбол яму не ўдалося. Дзесьці каля дзесяці хвіляў на дзевятую раптам пазваніў Пётр Пятровіч. Чуйкевіча здзівіла, чаму так позна і чаму менавіта дахаты. Пачаў пра якіясьці копіі, туманна гэтак, няпэўна-расплывіста: «Я прасіў...» Што ён прасіў — копію рэцэнзіі? — Чуйкевіч так і не дапяў. (Рэцэнзію ж яму прынесла сама Субач). І яе нібыта трэба яму аддаць. Ну дык, калі ласка, разбірайцеся. А пры чым тут ён, Чуйкевіч? Ледзьве ўтаймоўваў сябе, каб не выбухнуць.

— А чаму вы не сказалі, не пракансультавалі, не праяснілі, шаноўны Пётр Пятровіч?..

Зразумела, чаму. Проста мэты не ставілася такой. Ён, аказваецца, ужо з'ездзіў у рускі часопіс (погалас!) і ўзяў даведку, калі Чуйкевіч здаваў аповесць. І толькі цяпер прызнаўся Чуйкевічу, што Субач чапляецца і да апошняй кнігі. Якая няшчырасць! Праўда, поўнай шчырасці наўрад ці варта было чакаць. Для адных людзей шчырасць — мяжа бязглуздасці, для другіх — мяжа сумленнасці. Але працэнт шчырасці павінен быць у к о ж н а г а. Без працэнта шчырасці Чуйкевіч людзей не любіў. Не мог! Тады ж, у Пракуратуры, прамаўчаў, хоць Чуйкевіч два разы яму нагадаў, што яна менавіта гэтую кнігу знеслаўляе. А Пётр Пятровіч утаіў, сабака, бо кніга выйшла пазней, чым прынесла рукапіс Субач. А раптам усё стыкуецца? Божа, якая некампетэнтнасць, прымітывізм у выдавецкай дзейнасці, у творчасці! Дзе логіка юрыста, следчага? Ці гэта сапраўды і заўсёды ім трэба даказваць, што ты не вярблюд, тое, што відавочнае, ляжыць, здаецца, на паверхні нават дзіцячага разумення. Можа, і так. Звычайна даказваецца дробная праўдачка, вялікая існуе самавіта, сцвярджаючы сябе тым, што яна *ёсць.* Але ў Чуйкевіча больш і больш мацнела ўпэўненасць: за гэтаю Субач, ейнай хцівай нахабнасцю стаіць якаясьці сіла. Хтосьці надта ўжо хоча яго збэсціць, абліць памыямі, навекі прышпіліць ярлык несумленнага. Іначай цяжка ўявіць, што без усякіх прычын,пры яўнай алагічнасці, абсурдзе з такою помпаю раздзімалася справа. Чуйкевіч зноў успомніў, што Субач тады, як «апрацоўвала» яго, гразілася, быццам у яе ў міліцыі якісьці сваяк. Можа, ён?

Ад усіх гэтых корпанняў Чуйкевіч страціў цярплівасць. І ён са злосцю сказаў Пятру Пятровічу, што цкаванне і шантаж доўжацца, быццам у якасці падазронага яму абрыдла, вось чаму ён падае ў суд на Субач за паклёп, а ў заяве будзе менавацца і ён, Пётр Пятровіч.

— А пры чым тут я? — спатыкнуўся голас у Пятра Пятровіча.

— Вы не прымаеце ніякіх захадаў, каб абараніць мае правы і маю асобу!

Пётр Пятровіч на момант задумаўся. А з далейшага ягонага балаболення Чуйкевіч зразумеў, што Пётр Пятровіч як быццам і за яго, адказчыка, але намеру спыніць «капа́нне» покуль не мае. Так і сказаў: «Расследаванне не скончыў».

— Дык колькі я магу жыць у неспакоі?

— А што вы так турбуецеся? — з'едліва хмыкнуў Пётр Пятровіч.

— Прабачце, гэта ў вас работа, а ў мяне, можа, выклік у Пракуратуру. (Успомніў інтэрв'ю гісторыка Роя Мядзведзева, дзе ён кажа, што ў яго былі чатыры выклікі ў Пракуратуру).

— Крымінальную справу, на якой настойвае істец, узбуджаць не буду,— абнадзеіў Пётр Пятровіч.

— Ну, то дзякуй, дзякуй, дарагі Пётр Пятровіч! — адказаў з ухмылкаю Чуйкевіч.

— Вы не іранізуйце.

Разумей: а то я магу ўсё што хочаш зрабіць і як хочаш павярнуць. Што праўда, то праўда: і могуць, і ўмеюць.

Чуйкевіч зняможана асеў у крэсла. Глянуў на сябе ў люстра трумо. Выгляд ягоны быў варты жалю. Твар зблажэлы, вочы дзікія. Калматасцю і амаль дзіцячай мяккасцю валасоў як бы вылезла вонкі кволасць і зламанасць ягонай душы.

Спачас да ўсёй гэтай мітрэнгі ён паставіўся не зусім сур'ёзна, як яна таго і заслугоўвала. Цяперака бачыў: трэба з кімсьці раіцца і падаваць у суд. Канца гэтай валтузні не відаць. Дзіва што: і той ейны суддзя-цель — ці хто ён? — кандыдат навук, сказаў Пётр Пятровіч як бы мімаходзь, «правёў таксама расследаванне». Кандыдаты, кандыдаты... Якія кандыдаты, тым яны й заняты, раптам падумалася Чуйкевічу

ў рыфму. І ён усміхнуўся ў люстра. Усмешка выціснулася горкая, як сок з шалупінкі лімона.

Чым гэтую гарчэчу разбавіць? Вераніку з ейным мужам сюды ўцягваць не хацелася, калі шчыра — проста боязна. Цішкоў ірвецца на дапамогу. Але ўвекавечваць гэты бруд артыкулам у газеце? Бацькам не скажаш, перажыванняў ім сваіх хапае. Быў бы брат бліжэй, можа б, ён штосьці параіў. Застаецца адно — бутэлька? Таксама не лепшы абаронца ў такіх сітуацыях. Правакацыйны абаронца. Розумам Чуйкевіч гэта ўсведамляў. Душа патрабавала забыцця, бясцямнасці. Яна, загавелая, магла толькі ў такім стане адпачываць. А цяпер, мусіць, і ў такім не зможа. Калі б яшчэ не гэтыя таямнічыя званкі...

«А можа, калі пісьменніку няма з кім змагацца, яму нецікава жыць? — усумніўся Чуйкевіч.— Нават такога ўрада няма, які цярпеў бы апазіцыю творчых людзей».

## РАЗДЗЕЛ 42

Прапаўзла слізкім дажджавым чарвяком пакутлівая ноч. Галава была цяжкая, бы налітая заміж мазгоў парафінам. Не вырАтавала і густа звараная кава. Выплывалі і выплывалі пытанні, як бурбалкі з дна возера, дзе жыруе карась.

Патэлефанаваў Пятру Пятровічу:

— Прабачце, а што яна вам сказала на тое, што няправільна ўказала ў заяве дату здачы свайго опуса?

— Пасля таго разу я не выклікаў яе,— адказаў той незадаволеным голасам.

— Дазвольце яшчэ пытанне. Калі вы пераканаецеся ў ейнай хлусні, вы падасце на яе ў суд?

— Не маю права.

Ну ці ёсць годнасць у людзей? Цябе, праваахоўніка, лічаць за дурня, водзяць за нос, і ты згаджаешся з гэтым. Не можаш абараніць нават сябе, не тое што іншага. А як бы паводзіў сябе гэты следчы, калі б выявілася, што Чуйкевіч рукапіс здаў пазней, чым Субач прынесла свой? Быў бы для ягонай жалезнай логікі грунт даказаць, што Чуйкевіч спісаў? Мусіць, быў бы. Хоць тая ж логіка наводзіла і на іншае: такія-сякія супадзенні Субач і ейныя памагатыя маглі стварыць наўмысна. Узяць з паліцы ягоныя

кнігі, вырваць з іх цытаты і ўдрукаваць у старонкі опуса. І калі гэтыя супадзенні ёсць, яна так і зрабіла, дачакаўшыся выхаду апошняй кнігі. І, выявіўшы такую падробку, Пётр Пятровіч заяўляе, што не мае права пакараць Субач. Дык, што, калі і забойца, каб адвесці ад сябе падазрэнне, агаворыць кагосьці, а расследаванне выявіць, хто сапраўдны забойца, і яго, забойцу, не прыцягнуць да адказнасці? Ну так жа, выходзіць.

З брыдзенькім асадкам у душы Чуйкевіч паехаў у рэдакцыю часопіса «Ідэі перамагаюць». Але якое б чарноцце не поўніла ягоных грудзей, ён ніколі не плакаўся, што яму кепска. Нікому ты не патрэбны са сваімі балячкамі. Ніхто шчыра табе не паспачувае, толькі парадуецца. А калі ў цябе няма дабраты, можаш паміраць — грамадства ад гэтага нічога не страціць. Але з кім яно тады застанецца? Тыя, што сябе лічаць нармальнымі, годнымі людзьмі, усе такія. Толькі хворы, дзівак альбо якісьці юродзівы здольны засмуціцца ад чужога болю без чакання адплаты.

Пастукала ў дзверы і ўляцела да яго ў кабінет інструктар райкама Малкава. У чорнай сукенцы, з перабінтаванай нагою. Упэўнена павіталася.

Чуйкевіч хацеў штосьці сказаць пра забінтаваную нагу, але ў жанчыны гэта такая частка цела, якая заўсёды наводзіць на вулічныя намёкі. Таму прамаўчаў. Але прызнаўся, што яго цягаюць у Пракуратуру.

— А што ўсё-ткі такое, Кастусь Рыгоравіч?

Малкава відочна думала, што гэта праз якіясьці ейныя пралікі ў выхаванні й ідэалагічнай рабоце. Чуйкевіч хуценька ўлагодзіў яе. Малкава з палёгкаю ўздыхнула. Нават параіла:

— Трэба пракансультавацца з кімсьці з юрыстаў, як паводзіць сябе ў падобных установах... Мы ж вельмі цёмныя ў прававых пытаннях.

Ейныя словы навялі на Чуйкевіча яшчэ большую паруху. Ён успомніў свой першы візіт у Пракуратуру. Пётр Пятровіч запісваў за ім, і калі дайшло да сужыцеля Субач, Чуйкевіч назваў яго проста «пажылы мужчына». Пётр Пятровіч тут жа сказаў, што ведае, хто гэта, ягонае прозвішча Мазурчык і запісаў у пратакол, быццам прозвішча называе Чуйкевіч. Але не прызнаўся, што «даследаванне» гэтага Мазурчыка ляжыць у ягоным сейфе. Чуйкевіч, чытаючы прата-

кол і падпісваючы кожную старонку, звярнуў увагу Пятра Пятровіча, што не ведае, ці Мазурчык «пажылога мужчыны» прозвішча. Той супакоіў: «Нічога, нічога...» Ага, «нічога»... у вас любое «нічога» можа ўсю справу перавярнуць. Хто ведае, што трымаеш ты ў галаве, затаіў за шкельцамі акуляраў у ліслівенькіх вачах. Можа, якраз падвох якісьці ў гэтым і хаваецца.

Як жа цяпер шкадаваў Чуйкевіч, што не ўпісаў сваёй рукою: «Прозвішча пажылога мужчыны не ведаю». І момант быў, калі Пётр Пятровіч папрасіў у канцы пратакола зрабіць прыпіску: «З маіх слоў запісана правільна».

Малкава, бач, болей асцярожная. Хоць, канечне, смешна тут пра штосьці кепскае думаць. Але ўся гісторыя краіны даказвае, што злачынства інкрымінавалі невінаватым людзям. І тут ён зусім, ні на кропельку, не вінаваты, а вымушаны цярпець. Сам выклік, допыт, пратакол, недавер, апраўданні — страшэнна абразлівыя. Асабліва калі чалавек прыстойны, ва ўсякім разе, не самы горшы з людзей залганага грамадства.

Здавалася б, як думаў Чуйкевіч, лагічней было б спачатку дасканала разабрацца з заяўнікам, пераканацца ў ягонай праўдзе, а тады ўжо турбаваць адказчыка. Іначай мала каму што ў галаву ўзбрыдзе. Ды яшчэ законам не прадугледжваецца сустрэчнае ўзбуджэнне справы на істца, калі і выявіцца, што ён паклёпнічае, агаворвае, хлусіць. Гэта відочны юрыдычны казус. Хоць, можа, ён і зыходзіць з прэзумпцыі невінаватасці. Чхаць на такую прэзумпцыю, якая дазваляе знеслаўляць сумленнага чалавека, а несумленнага пакідаць у спакоі і радасці помсты. І каб гэты камфорт яму забяспечыць, трацяцца дзяржаўныя грошы.

Чуйкевіч падзякаваў Малкавай за параду. Яна аддала яму стос бюлетэняў па выбарах дэлегатаў на XIX партканферэнцыю. Ён яшчэ раз падзякаваў на развітанне. Забінтаваная нага мільганула ў вачах ластаўкаю.

Доўга нурыўся тужліва ў вакно. Шчодра, не шкадуючы энергіі, смаліла сонца. Ягонае святло, адбіваючыся ад бляшаных дахаў, рэзала вочы. Ажно выступілі на вачах слёзы. Люшчэня можа падумаць,

што ён плача. Выйшаў з кабінета. Пашкадаваў, што не навучыўся курыць: мусіць, удаўся ў дзеда Арцёма. Лепей увогуле некуды сысці. Цяжар на сэрцы яму здымала рэчка, быццам змывала яго сваёй вадою. І ён пасунуўся да Свіслачы. Мяккія ружовыя пялёсткі з кветак каштаноў высцілалі патрэсканы асфальт.

Рэчка ў гэтым месцы, куды прыйшоў Чуйкевіч, рабіла круты залом, падобны на сагнутую ў локці руку. Сцяною стаялі высокія гладкастволыя таполі. Галінне пачыналася на вышыні двухпавярховага дома. Яно скідвала пух. Гэты пух выбельваў зямлю, павісаў на сухіх жоўтых былках лебяды і тонкіх лазовых пруціках, падаў на ваду. За ім чародкаю гналіся маленькія, бы вучнёўскае пяро, рыбкі, зацята плёскалі хвосцікамі. Белымі шматамі плыла ад мосціка, дзе шумеў вадаспад, пена. На тым беразе рыбак у штармоўцы, доўгіх хімзасцерагальных ботах махаў вудаю. Было чуваць, як лёска напята разразае паветра.

І праз вочы, і праз вушы ўлівалася ў душу слабым струменьчыкам замілаванне. Чуйкевіч востра адчуваў, што яму трэба адпачыць, забыцца на ўсю дурноту, у нечыстотах якой не па сваёй волі бултыхаецца. Узяць водпуск і з'ехаць кудысьці менавіта на прыроду, у цішыню, у травы, у птушыныя спевы, у журчанне вады на перакатах рэчкі ці ў ручаях. А куды паехаць? Да бацькоў у вёску — абавязкова. Але там, у радыяцыі, з малымі доўга быць нельга. Значыцца, трохі пабудзе ў Доме творчасці, трохі ў вёсцы...

Чуйкевіч крыху павесялеў.

## РАЗДЗЕЛ 43

Калі ён вярнуўся ў рэдакцыю, Люшчэня сказала, што тэлефанаваў Пётр Пятровіч і прасіў прыйсці іх дваіх — тых, хто прысутнічаў, калі Субач забірала рукапіс. Дзякуй Богу, што не адзін на адзін ён вяртаў пляткарцы рукапіс. Старшы літсупрацоўнік Агурэчнікаў, які пісаў пасля рэцэнзіі заключэнне, быў у адпачынку. Мусіць, радуецца, што на яго покуль не пліхнулі пырскі гэтай блытана-цёмнай справы.

Пайшлі ў Пракуратуру ўдваіх з Люшчэняю. На

ейным твары цьмела задуменнасць. Чуйкевіч штучна падвясельваў і сябе, і яе.

Ён аддаў Пятру Пятровічу заяўку Субач, падпісаную ёй асабіста, з указанай датаю здачы рукапісу.

— Можаце быць свабодным,— кіўнуў Пётр Пятровіч Чуйкевічу — здалося, зняважліва.

Свабодным быць добра, канечне. Але дзе яна, свабода? Усе ведамствы, установы, інстытуты, якія існуюць у дзяржаве, задуманы менавіта дзеля таго, каб абмяжоўваць свабоду грамадзян, каб павялічваць іхнюю залежнасць. Маленькая залежнасць — і ты ўжо не можаш менавацць сябе свабодным. Адна даведка аб складзе сям'і, якую тады-сяды даводзіцца браць у домакіраўніцтве, нашчэнт разбурае чалавечую свабоду. Свабодны чалавек можа быць толькі ад самога сябе; ён можа давесці сябе да такога стану, калі не будзе вярэдзіць сябе. Астатні ж, вонкавы, свет ніколі не дасць яму свабоды, заўсёды будзе браць яго ў абдоймішчы — моцныя ці слабыя, значэння не мае.

Чуйкевіч, паніклы ад цяжкіх думак, вярнуўся ў рэдакцыю. Чытаць аповесць знакамітага празаіка не хацелася. Узяў шкляны збанок з вадою, паліў кветкі. Вазоны стаялі на ягоным сейфе, нізкім століку, віселі на прымацаваных да сцен рагацінах. Ён рэдку палівау у кабінеце кветкі сам. Звычайна іх палівала прыбіральшчыца, цётка Васюта, шызатварая таўстамясіца з чорнымі курлыжкамі варыкозу на лытках і з неймавернай дабратою ў маленькіх сініх вачах. Чуйкевіча відочна цягнуў жывы свет. Зафіксаваўшы гэтую думку каля рэчкі, ён не мог цалкам ад яе адкараскацца нават у Пракуратуры. І цяпер над ёю засяроджваўся, гледзячы, як вада, пускаючы пыльныя бурбалкі, пранікае з сіпеннем у тугі чарназём вазонаў.

«Страчу́ заяву на водпуск...»

Ён напісаў заяву і панёс яе галоўнаму рэдактару.

— Што там у цябе, мілай, з Пракуратурай? — спытаў Ямачка. Дастаў зялёную расчоску і ўбіў зубцы ў шчыльную сівізну валасоў.

— Канца краю не відаць,— паскардзіўся Чуйкевіч.

— Праўда? А што там яны? — Ямачка пакінуў расчоску ў валасах. Бы лісціна зачапілася.

— Валаводзяць. Точацца, як чэрві.

— О, вобраз! Прадаеш? — Ямачка заліўся наў-

мысна бадзёрым смехам. Паказваў, што яшчэ мае здароўе.— Плюй на ўсё, мілай, і не думай! Павер майму вопыту: ні за што ў гэтым свеце не варта перажываць. Перажыванне нічагусенькі не мяняе вакол, а толькі ў самім сабе, мілай, у сваім здароўі... Ныркі кепска працуюць.

Чуйкевіч непрыкаяна сланяўся па сваім кабінеце, калі да яго заглянуў знаёмы супрацоўнік рэдакцыі тонкага грамадска-палітычнага часопіса — пажылы яўрэй з цёмнымі квадратамі акуляраў на твары.

— Кажуць, Косця, у цябе штампік ёсць?

— Ёсць.

— Прастаў мне, а то з восемдзесят другога года... з месяца смерці Брэжнева не адзначаны партбілет.

— Калі ласка. Сядайце.— Чуйкевіч адамкнуў сейф, узяў штампік. Разгарнуў білет.— Сапраўды, тут на цэлую гадзіну працы.

Можна было толькі дзівіцца, як чалавек ухітрыўся столькі часу пранасіць не праштампаваны партбілет. Мусіць, нікуды не прад'яўляў яго, не выклікалі ў ЦК, абкам, а то ўраз адхапіў бы суровую вымову ці зусім з партыі выключылі б. На той час гэта быў бы крыж на журналісцкай кар'еры, а цяпер радаваўся б, ходзячы ў змагарах з таталітарнай сістэмай.

Чуйкевіч дачакаўся Люшчэню. Яна вярнулася зусім не засмучаная. Падобна, яе толькі пацешыў гэты выклік. Канечне, яе не зачапіў паток таго бруду, які выплеснула на яго Субач. Дый глыбіня абурэння подласцю ў кожнага розная, яна залежыць ад асабістай няздольнасці на гэтую подласць. Люшчэня, заікаючыся, расказала, што і яе дапытаў Пётр Пятровіч, даў падпісаць пратакол на кожнай старонцы. Усё — як у сапраўдным дэтэктыве. Проста дзіва якоесьці. Няўжо гэтаму звышадмысловаму пінкертону Пятру Пятровічу няма чым займацца? Столькі вакол злачынстваў, парушэнняў, хулігання! Пра гэта са страхам гаворыць народ. А Чуйкевіч сам пацярпеў. Дзе міліцыя, КДБ, Пракуратура, урэшце, вайскоўцы? Як скрозь зямлю праваліліся. Акурат іх зліквідавалі. Рэдка дзе ў асветленым, людным месцы ўбачыш пару насцярожана-разгубленых міліцыянтаў з брусочкам рацыі пры боку і дубінкаю.

Дзіва што гэтая ПРАЦЭДУРА расследавання муціла кроў Чуйкевічу, абурала відочнай фальсіфіка-

цыяй, прытоптвала як лісціну. І думкі лезлі чорныя, назойлівыя, непатрэбныя. Ён не мог іх адрынуць. І на адпачынак ягоны ляжа змрочны водцень гэтага шальмавання, будзе забіваць у зародку парасткі творчага натхнення. Ён жа не так і шмат напісаў, усяго тры зборнікі аповесцей і апавяданняў. А калі ўявіць, што душа — гэта кавалак тканіны, то пісьменніку трэба як мага болей адрэзаць ад яго, каб з кожнай нітачкі напрасці старонак на кнігу. Што і казаць, жыццё атручана, душа забіта. Забіта злой несправядлівасцю, людской подласцю, і ты павінен апраўдвацца, даказваць, што ты ні пры чым. А на цябе глядзяць як на злачынца ці, у лепшым выпадку, як на нячысціка («Дыму без агню не бывае»). Кожны чалавек — патэнцыяльны злачынец? Ну так, калі невінаватага можна зрабіць злачынцам, ворагам народа, забойцам. І рабілі. Ды яшчэ як! І раней, пры Сталіне, і цяпер. Узяць хоць бы нядаўнюю «віцебскую справу». Невінаватага Мікалая Ц. расстралялі як гвалтаўніка. Хіба не ў гэтым трагізм чалавечага існавання: за праўду трэба змагацца, яе адстойваць? Бо мярзота, нечысць усякая імкне пусціць карані менавіта ў сумленнасць. Тады ёй радасна жыць, тады яна са смакам грызе плады асалоды. Гэтая нечысць тонка ўгадвае, дзе і на кім можна пажывіцца.

Чуйкевіч не ўяўляў, як ён будзе жыць, калі за гэты час да адпачынку Пётр Пятровіч не дасць канчатковага адказу, калі не перапыняцца злавесныя званкі. З другога боку, зняважанаму, абуранаму, узятаму на прыцэл, яму не хацелася даравацъ зламыснікам. Адважыцца, сатнуць зубы і рушыць у наступ, як раіць Цішкоў. У нейкія хвілі ён ужо быў гатовы да гэтага. Але ўнутраны голас, ці то выручаючы, ці здраджваючы, напамінаў яму пра высакароднасць: на зло не заўсёды такім жа чынам трэба адказваць (гэта з вядомага), хоць СПРАВЯДЛІВАЯ АДПЛАТА ГЭТА НЕ ЁСЦЬ ЗЛО. Смяротная кара за наўмыснае забойства — больш чым гуманізм.

## РАЗДЗЕЛ 44

Кожны дзень прыносіў новыя жахі. Ад іх людзі пакрысе вар'яцелі. На вочы і на зямліста-шэрыя, мала не шызыя твары наплывала нежывая заду-

меннасць. Чуйкевіч гэта бачыў у тралейбусах і аўтобусах, на вуліцах. Прыдумаўся нават загаловак для твора: «Задуменныя твары». Гэтая хваравітая шэрань твараў выклікала ў яго шкадобу, і па ёй, здаецца, ён пазнаў бы савецкага чалавека нават на Марсе.

Аказваецца, выбух вагонаў у Арзамасе павінен быў адбыцца на дзве хвілі раней, каля ядзерных шахтаў. І толькі нашае бязладдзе выратавала: цягнік запазніўся акурат на гэтыя дзве хвілі. Версія камітэта дзяржбяспекі не выключала, што гэты выбух — дыверсія.

## РАЗДЗЕЛ 45

Чуйкевіч не дасядзеў да канца дня. Развітаўся раней. Гэтым разам мінуў прыпынак. Яснотце дня асвяжала душу. Травень апрануў дрэвы і распрануў жанчын. Чуйкевіч меў слабасць акурат гэтай парою, калі пасля зімовай змярцвеласці прырода даходзіць да шаленства, назіраць за жанчынамі. Ён піў асалоду з прыемных жаночых твараў. Лёгкае адзенне, аголеныя рукі і ногі, млява-ліпучыя позіркі таемна хвалявалі яго. Ён доўга мог ісці за жанчынаю, якая прыглянулася яму, дзівавацца на паходку, валасы, рух цела пад сукенкаю; грэшны, уяўляў яе голую, халаднавата-аксамітную, расцвеленую, і нават сябе з ёю ў ложку. Нейк навязалася яму думка, і цяпер яна выкрасала водгук, што жанчына — гэта ўяўленне (ты малюеш яе ўяўленнем і ўсё, што трэба, адчуваеш без фізічнай блізкасці). Падказаць бы яе манахам.

Чуйкевіч выбраў з натоўпу дзяўчыну ў ружовай шчыльнай імпартовай сукні — кароткай настолькі, наколькі дазвалялі намеры і прыстойнасць ейнай уладальніцы; на плячах ляжалі абрэзаныя паўкругам цёмныя валасы. Гледзячы на яе, ішоў следам. Свядома хвалюючыся, адганяў надакучліва-непрыемнае думанне, што завалодала ім, здавалася, навечна. На яго, аблытанага павуцінаю такой засяроджанай адрынутасці ад свету, ледзьве не наехала таксоўка, якая выскачыла з высокай аркі панельнага дома; вадзіцель пагразіў вялікім, як бохан, вясковым кулаком. І Чуйкевіч, на бяду сваю, успомніў яшчэ пра адну непрыемнасць, якая, мусіць, таксама ціснe з

падсвядомасці на псіхіку: заваліў экзамен па ваджэнні. Правілы дарожнага руху (ПДД — у гаворцы рускамоўных курсантаў) на апараце «Вятка» адлускаў як арэхі. Пытанне — націск на кнопку: адказ. І так дзесяць з дзесяці разоў у «яблычка». А ваджэнне... Сеў побач строгі дыстрафічна схуднелы капітан-гаішнік з экзаменацыйнай карткаю на каленях — і нага здранцвела... «Што вы робіце?» — са страхам спытаў капітан, калі «жыгулёнак»-дарабок затузаўся, як на спружынах. Дарэмна не паслухаўся Доўнара, які папярэджваў: «Чуйкевіч, не садзіся — не здасі». Цяпер трэба дадаткова наездзіць дзесяць гадзін і рабіць чарговую спробу пераздаць.

Няўжо давядзецца пасля адпачынку? Не хацелася б. Лішні клопат будзе вісець. І ці возьмецца ён тады пісаць, як нацэльваецца? Наўрад. А гэта яшчэ адно звяно ў ланцуг духовай закаванасці. Самае жахлівае для чалавека, а для творцы пагібельнае — садзіць душу за краты. Каля сямі дзесяткаў гадоў савецкаму чалавеку дэкляравалі, што ён не раб, а на справе акурат і рабілі з яго раба. Ён, Чуйкевіч, думаў напраўду, што рабы дзесьці за кардонам, у далёкіх краінах, але не ў СССР. Скуль ён мог ведаць, што тамака за мяжою творыцца? На здымках у газетах то на лаўцы беспрытульны спіць, то корпаецца ў сметніцы сагнутая ў крук бабулька з кійком... Паспрабуй здагадайся, як унутрана пачуваецца такі чалавек-пустэльнік.

Дзяўчына адкінула валасы. Чуйкевіч зірнуў на каўнер: на згібе цёмная брудная палоска. Ягоны позірк імгненна скруціўся ў зямлю: рассыпалася на радыеактыўны пыл прыгажосць.

Г о л а с: «Пішы, зняўшы ўсе механізмы самаўтаймавання».

Чуйкевіч прыйшоў дадому і, папіўшы чаю, сеў на канапу чытаць аповесць Набокава. Нават эротыка не захапіла яго цалкам. Ён шпульнуў часопіс на крэсла. Той разгарнуўся, натапырыўся вожыкам, як жывыя варушыліся старонкі — салют набокаўскім думкам.

Не, усё-ткі таксама нельга прызнаць за норму ягонае перажыванне праз тое, у чым зусім, ні на ёту, няма віны. Ён што, блазнюк які альбо хтосьці кіруе ім? Мабыць, ягоная падсвядомасць настолькі тонкі апарат, што адчувае нават чыесьці імпульсы і рэагуе

на іх. Вось толькі чые? Ён прыгадаў адзін з незвычайных сноў. Яму раптам адкрылася магутная і глыбозная прастора неба. Адчуванне чагосьці страхатліва-навальнічнага. З цёмнай бездані спускаюцца на зямлю адна за адною трыма радамі светлыя перавернутыя «талеркі». У вышыні маленькія, а чым бліжэй да зямлі, тым большыя. Гэта і рупары чыйгосьці голасу, і хвалі думак адначасна.

Чуйкевіч не вытрымаў і пазваніў у Пракуратуру. Мелася шостая гадзіна дня. Пётр Пятровіч быў яшчэ на працы. Чуйкевіч ужо ўсёк: і рана, і позна ён там. Значыцца, клопатаў хапае, а ён валаводзіцца ні з чым. Выходзіць, ім таксама хтосьці кіруе, вымушае займацца менавіта справаю Чуйкевіча?

— Пётр Пятровіч, я хутка іду ў адпачынак, ці буду я вам патрэбны ў бліжэйшы час? — І тут жа дакор сабе: «Чаму неабыякавы, чаму не ігнарую ўсю гэтую цяганіну, д'ябал мяне вазьмі?..»

— Расследаванне я скончыў, вазьмуся пісаць пастанову, але Субач покуль я нічога не даводзіў,— адказаў той лагаднейшым, чым звычайна, голасам.

— Калі яна яшчэ нейк павініцца, я дарую ёй. А калі будзе зноў даказваць неіснуючае, я падам на яе ў суд за паклёп. І ўжо дамоўлена з журналістам, што ён напіша пра гэтыя ганенні на мяне.

Пётр Пятровіч затоена-ўважліва слухаў.

— Калі яна будзе настойваць, можна стварыць экспертызу,— зняцяйкі аглавушыў ён.

Госпадзі Божа мой! Як тут не хапацца за галаву. Экспертыза — гэта ж новы рой плётак. Няўжо і ён, юрыст, не разумее простай рэчы: калі штосьці, нейкі сказ ці выраз, і супадае, то гэта менавіта Субач падтасавала. Ягоныя ж творы былі выдадзены, не кажучы ўжо пра напісанне, раней, чым яна прынесла сваю лухту. Вось з чаго хоць бы зыходзіў, хацелася закрычаць Чуйкевічу ў трубку. У гэтую ненавісную трубку, словы з якой так непатрэбна перакройвалі яму жыццё.

## РАЗДЗЕЛ 46

Чалавек свабодны толькі на адзіноце. І ўсё роўна не да канца, а ў той меры, у якой яго ўжо сапсавала СІСТЭМА.

Нарэшце пачаўся вывад нашых войск з Афганістана. Будзе працягвацца дзесяць месяцаў. За першыя тры палову кантынгенту мяркуецца вывесці. А колькі гэта? Нідзе ніколі не была названа лічба, а тэрмін «абмежаваны кантынгент» ні пра што не гаворыць. Зразумела і так, што ўсе войскі не ўвядзеш.

Чуйкевіч не сумняваўся: прыйдзе час, калі будзе названа і гэтая колькасць, і колькасць ахвяр. Ці патрэбны былі гэтыя ахвяры, зноў-такі выявіцца, асабліва калі пачне кіраваць кааліцыйны ўрад. Вельмі верагодна, што ахвяры былі марныя, зусім непатрэбныя. Як толькі савецкага войска там не будзе, усё стане на сваё месца. Кампартыя страціць уладу. Народ яе не падтрымае, бо яна дазволіла на сваёй зямлі вайну. Нельга ўкараніць у народ чужароднае — у якой бы ўпакоўцы яно ні прапаноўвалася. Асяроддзе выштурхвае з сябе, знішчае тое, што нясе яму згубу.

## РАЗДЗЕЛ 47

Апошнія дні званкоў з Пракуратуры не было. А можа, проста Пётр Пятровіч не лучаў на Чуйкевіча, які цалкам быў заняты ваджэннем. У кожным разе, Чуйкевіч быў задаволены. Ён і ў адпачынак хацеў пайсці, нічога больш не чуючы, не ведаючы, не бачачы. Здаць бы гэты экзамен па ваджэнні — і гуд бай!

Начальнік СТК Ілля Нічыпаравіч Мочкін, адстаўнік, упарціўся, не даваў даведкі, што Чуйкевіч дадаткова ад'ездзіў дзесятак гадзін. Тлумачыў, што гэта не так проста: графік распісаны ў інструктараў да канца лета, бензін выдзелены толькі на абавязковыя заняткі. З дня ў дзень Мочкін казаў Чуйкевічу: прыйдзі заўтра. Тыповы салдафон: выгляд, мысленне, звычкі, манера размаўляць. Іменна гэткі тып каціраваўся ў наменклатуры на не вельмі тлумных і адказных пасадах. Праўда, калі выявілася, што яны землякі, Мочкін палагоднеў. Ды ўсё роўна не пазбавіўся ўнутранай патрэбы паздзекавацца, насміхнуцца. Такі чалавечы род: кожнаму карціць патаптацца па прыстойнасці.

Чуйкевіч ішоў на чарговую сустрэчу з Мочкіным. Злева ад тратуара млелі сцішаныя елкі. Цёмныя, жорсткія, запыленыя, і толькі самыя кончыкі, што

паспелі ўжо адрасці,— бледна-зялёныя, кволыя. Сцісні пальцамі — не ўколешся. Ён увесь час абколваўся аб людскую чэрствасць.

Чарга людзей па карамель у кульках уцякала з горада за далягляд, дзе падымалася трывожнае зарава.

Мочкін разгарнуў на стале карту радыяцыйнай забруджанасці, паказаў тоўстым, бы малочная бутэлька, абрубкам пальца, у якіх мясцінах нарадзіўся. Яны, як і Чуйкевічавы, былі таксама заштрыхаваныя ў клетачку. Чуйкевіч хоць гэтым хацеў выпрасіць спагаду: маўляў, яны абодва пакутнікі.

— Ты мне не хітруй, пісацель! — Мочкін пляснуў ёмкай караткапальцай, як у льва, далонню па карце.— Вось ты пісацель... м-гы, пісацель... Што я ад цябе буду мець, калі дам табе даведку?

— Падпішу вам сваю кніжку...— Чуйкевіч выціснуў словы праз сілу, ведаючы, якая цана ягонай кнізе ў абывателя.

— На беларускай мове? — Мочкін размаўляў гучна, адрывіста, як усё роўна аддаваў каманды. У яго былі вялікія белыя вушы з тонкімі ліловымі жылкамі, дзіўна розніліся ад цямнявага твару.— Забыўся ўжо гэтую мову, а калісьці беларускую школу канчаў... Гамон вашай мове, не жыць ёй! На ёй добра толькі лаяцца. Ты мне што-небудзь з дэфіцытнага, магёш?

— «Тры мушкецёры», напрыклад...

— Атос, Партос, Араміс і д'Артан'ян? — відочна дэманструючы перад ім свае пазнанні (відаць, з кіно), зноў пляснуў па стале Мочкін.— Гані!

Ён націснуў пальцам-бутэлькаю кнопку на сваім стале. Увайшоў высокі, сухарлявы мужчына з сівымі бровамі на ўчарнелым твары.

— Фёдаравіч, зрабі гэтаму пісацелю... ён пісацель, панімаеш...— грозна глянуў на Чуйкевіча,— даведку,— аддаў загад мужчыну.

Чуйкевіч з мужчынам (гэта быў намеснік Мочкіна) паехалі на Баравую. Мужчына доўга хадзіў ад інструктара да інструктара, покуль нарэшце ўгаварыў аднаго, чорнага, таўсматага, са склычанай барадою і набрынялымі крывёю вачыма, утачыць у графік Чуйкевіча. Выпісалі даведку. Было прыкра і балюча назіраць за ўвіханнямі Фёдаравіча. Ён не адчуваў сябе гаспадаром, як Мочкін, запабягаў, прасіў. Яго,

відаць, паважалі, але не баяліся. Ён не меў улады звальняць, паніжаць у пасадзе, караць, зразаць прэміі. Чуйкевіч, спачуваючы чалавеку, думаў, што не павінен развітацца з ім, не аддзякаваўшы. Як, чым? Грошай ён не возьме. Кнігі ў яго з сабою таксама не было — ні сваёй, ні дэфіцытнай. Вось каб бутэлька... Але дзе яе ўзяць? Запрасіць у рэстаран, праставіць? Чуйкевіч прапанаваў гэты варыянт Фёдаравічу. Той доўга чухаў патыліцу, з надрывам уздыхнуў і згадзіўся.

Яны, прыехаўшы ў горад, завіталі ў бар «Прамень». Чуйкевіч быў тут колькі разоў — з сябрамі, братам, суседам,— але даўнавата. Не хацеў сюды заходзіць. Гэты бар акупіравала якаясьці банда рэкецiраў ці крымінальнікаў. Аднаго разу яны з Цішковым сталі сведкамі іх сутычкі між сабою. Ляцелі крэслы, бутэлькі, перакульваліся сталы са стравамі.

І цяпер тут за двума ссунутымі столікамі ў акружэнні яркіх, бы веснавыя кветкі, дзявуль з квадратнымі вуснамі сядзелі стрыжаныя плечавені ў скураных кароткіх курціках. Пілі шампанскае, каньякі. У вялікай талерцы высілася піраміда бутэрбродаў з аранжавай ікрою. Падбор, вядома, не з тых кішэннікаў, якія аблапошылі Чуйкевіча. Гэтыя мянуюць сябе «паважанымі людзьмі».

Чуйкевіч адразу адчуў прыгнечанасць. На гіпсавай столі ён убачыў глыбокую баразёнку — відаць, ад ножкі крэсла, якім махаліся ў той бойцы. Спехам яны выпілі па сто пяцьдзесят грамаў «Белага бусла», пракаўтнулі па мясной салаце і суха, хаваючы вочы, развіталіся.

«Дай Бог здароўя добраму чалавеку!» — пажадаў Чуйкевіч, гледзячы ўслед высокай рахманай постаці Фёдаравіча. Ад суму яму хацелася яшчэ выпіць. Зноў «На рог» смакаваць царкоўнае віно?

За Чуйкевічам увязаўся хударэбры, мусіць, бяздомны сабака з аблезлай рудой поўсцю. Брыў, вяла апусціўшы хвост, скулёмчаны сухімі шышкамі дзядоў. Спыняўся Чуйкевіч — спыняўся і сабака, глядзеў журботнымі разумнымі вачыма. Што яго прывабіла ў Чуйкевічу? Постаць ці, можа, пах былога гаспадара? Ці сабака чуе чалавека, які яго не ўдарыць, не замахнецца на яго, нават не тупне злосна нагою?

«Здэхля ты брат, здэхля...» — Чуйкевіч пашкада-

ваў, што ў яго няма з сабою нічога са з'ежы, чым можна было б пачаставаць сабаку. Да сабак ён меў даўнюю, яшчэ дзіцячую цягу. Калісь у яго быў сабака Амур. Выгадаваў яго з двухтыднёвага шчанючка. Браў на ноч з сабою ў ложак, паіў з соскі малаком, прыбіраў за ім. Зімою вадзіў у лес, вучыў разблытваць сляды. Праз два гады Амура не стала. Яго забіла на шашы машынаю. Гэта было ўвосень. Яны капалі бульбу. Прыехалі з лугу касцы (касілі атаву), і Адам Пудрык, конюх, сказаў, што бачыў пад лізертам забітага Амура. Кастусь усхапіўся на веласіпед і паляцеў на шашу. Амур ляжаў на пясчаным акрайку шашы, зубы вышчараныя, на баку лапікамі здзёртая шкура, пераламаная задняя нага. Кастусь капаў ямку і плакаў. Плакаў шчыра і горка, як па чалавеку.

Чуйкевіч, азірнуўшыся на сабаку, падышоў да харчовага ларка і купіў ватрушку. Даў яе сабаку, а тады сеў на тралейбус. Але неўзабаве выйшаў. Хацелася пабыць на адзіноце. Проста паблытацца па горадзе. Заглянуў у «Антыквар». Не дзеля таго каб штосьці купіць, хоць і тое-сёе купіў бы, калі б меў вялікія грошы, а дзеля таго каб палюбавацца на цікавыя, экзатычныя даўнішнія рэчы.

За прылаўкам стаялі аднакава прыгожыя і аднакава абыякавыя да пакупнікоў тры дзяўчыны, сапсаваныя і стомленыя ўвагаю.

Адразу кінуўся ў вочы вялізны чорнага дрэва насценны гадзіннік з жоўтым і круглым, як поўнік, маятнікам. Маятнік вісеў нерухома — здавалася, і час спыніўся.

## РАЗДЗЕЛ 48

Дні падаўжэлі — хутка, бы атожылкі на каштанах. Дахаты можна было не спяшацца. Цямнела позна. І на сходках народ цішэй сябе паводзіў. Яны цяпер не так часта праводзіліся, і ад гэтага ўсім было добра. Начальнікі баяліся сходак, што падначаленыя могуць крытыкнуць, пасеяць смуту, падначаленыя — што начальнік перад усімі ўкажа на недахопы, прысароміць.

Чуйкевіч прызначыў чарговую партсходку на шаснаццаць гадзін. Парадак дня: комплексная сістэма

якасці працы. Пасля дэбатаў выступіў Ямачка. Прапанаваў Чуйкевічу, як партыйнаму лідэру, пераводзіць аддзел на гаспадарчы падрад: «Бяры карэктара, тэхрэда, машыністку і дзейнічай».

Народ не вельмі ахвотна адгукаецца на новае. Дый, падобна, няма сэнсу мяняць звыклую, адшліфаваную жыццём структуру. Зноў — дзеля «птушачкі», зноў імітацыя, абы паказаць начальству, што ідзе ПЕРАБУДОВА. Як і ў часы застою, калі ўсе задумкі праз кароткі час ляцелі дагары.

Трэба слухаць просты люд, нізы. Яны робяць, цягнуць лямку, таму і ведаюць, што горш, а што лепш.

**РАЗДЗЕЛ 49**

Чуйкевіч пазваніў знаёмаму генералу і сказаў, што даведку мае.

— Добра,— быццам абрадаваўся той,— я навяду масты і табе пазваню.

Сябраванне Чуйкевіча з генералам цягнулася з часоў «раёнкі». Праўда, генерал тады быў усяго падпалкоўнікам. Іх адначасна прыслалі ў раённы гарадок на Міншчыне: аднаго — начальнікам міліцыі, другога — літсупрацоўнікам рэдакцыі. На першым часе разам жылі ў гасцініцы, хадзілі ў сталоўку на сняданак і вячэру. Аднойчы нават затрымалі п'янага бузацёра, які ламіўся ў нумар да жанчын, грукаў нагою ў дзверы, ажно дрыжэла ўся гасцініца. Начальнік міліцыі быў у трыко, і бузацёр, адпіхваючы яго, усё дапытваўся: «Хто ты такі? Адыдзі, фраер, а то завалю!..» Дзіўна было Чуйкевічу, што Міхаіл Антонавіч не прызнаваўся, хто ён, казаў «якая табе розніца», чым падвяргаў сябе небяспецы. У гэтым Чуйкевіч асабліва ўпэўніўся, калі, трымаючы бузацёра, прыпятым да сценкі (Міхаіл Антонавіч пабег выклікаць па тэлефоне дзяжурны нарад міліцыі), убачыў у таго на руцэ ніжэй локця злавесную татуіроўку — змяя з каронаю на галаве абвіла кінжал,— якая азначала, што ейны ўладальнік аўтарытэт сярод крымінальнікаў і не жадае нават у будучым спыняць сваю злачынную дзейнасць. Як цяпер Чуйкевіч думае, «аўтарытэт» проста не захацеў з імі, дробнымі сошкамі, звязвацца, каб не рабіць чарговай ходкі ў зону.

Упярэдадзень Чуйкевіч з'ездзіў да гарадской ДАІ, дзе здавалі ваджэнне. На пляцоўцы, густа ўтыканай чорна-белымі, як нага зебры, указальнікамі паваротаў і «васьмёрак», тоўпілася з сотню чалавек. Каля зялёнай будачкі з закратаваным вакенцам ён вылавіў мужчыну, які вёў запіс на чаргу. Той разгарнуў растрэпаны блакітны вучнёўскі сшытак: апошні нумар — 469. «Запішыце мяне»,— папрасіў Чуйкевіч, разумеючы, што дачакацца сваёй чаргі шанцаў няма. Патаптаўся хвіль пятнаццаць, пабачыў, як двое маладых хлопцаў вылезлі засмучаныя з «жыгулёнка», плюнуў і пасігаў з пляцоўкі.

Генерал пазваніў праз два дні.

— Канстанцін, ідзі да намесніка начальніка ДАІ. Калі нікога ў яго не будзе, скажы яму, што ты ад Субач. Далей ён скажа табе, што рабіць,— бадзёра адчаканіў і паклаў трубку.

Генералы, як ніхто ў службовай іерархіі, не любяць ставіць сябе на адну нагу з ніжэйшым па чыне. Чуйкевіч ледзьве ўлавіў сэнс таго, што пачуў. А калі пачаў даходзіць да існасці, раптам адчуў, што яму робіцца млосна, плыве, як дым, у вачах паветра...

Можа, яму прычулася? Ад каго, сказаць, прыйшоў? Чуйкевіч пакруціў галавою, стрэсваючы насланнё. Памяць, здаецца, дакладна зафіксавала, як умела ў такіх выпадках: ад Субач. Ад якога ці якой Субач? Вось гэта інтрыжка перад адпачынкам! Усё можна было ўявіць, усяго чакаць, але каб ісці на аферу ад імя ягонага нядобразычліўца — такога і ў самым неверагодным сне не прысніцца.

Чуйкевіч крыху суняў сябе і набраў нумар генералавага тэлефона.

— Міхаіл Антонавіч, прабачце, я зразумеў, што мне трэба ад імя Субач прыйсці... Хто гэта такі ці такая?

— А думаеш, я ведаю, Канстанцін.

— У сувязі з гэтым прозвішчам у мяне ёсць цікавая інфармацыя, якую я хацеў бы давесці да вас,— разумеючы, што тэма не для тэлефоннай размовы, Чуйкевіч напрасіўся прыехаць да яго на працу. Генерал павініўся, што зараз, у гэтую хвілю няма пры ім ягонай службовай машыны, каб прысласць, ды Чуйкевіч супакоіў: не бяды.

Ён зняў з пліты чайнік — збіраўся піць чай; пачыс-

ціў туфлі, прыхапіў дыпламат і выкуліўся з кватэры. Да генерала дабірацца было нязручна. Трэба круціцца, рабіць перасядкі. Лепш выпадала ехаць на таксоўцы. Самы блізкі прыпынак каля Камароўскага рынку.

Чарга на таксі была невялікая. Яму падсунуўся прыватнік — нядаўна пафарбаваная ў мышасты колер гарбатая «Волга» старой маркі. Д'ябал з ёю, што тут выбіраць.

Хоць генералава «ведамства вядомае», вадзіцель доўга не мог знайсці. То пераязджаў, то не даязджаў, то зварочваў не туды. І гэта раздражняла Чуйкевіча. Лепей бы дачакаўся дзяржаўную таксоўку. Ужо даўно сядзеў бы ў генерала. Нарэшце зусім нечакана ўпёрліся ў бэжавы цагляны будынак. Чуйкевіч сунуў вадзіцелю пяцёрку, выцісну́ў скрозь зубы «дзякуй» і вылез з «Волгі».

## РАЗДЗЕЛ 50

Вартавы, маленькі тоўсценькі міліцыянерык з бруднымі сяржанцкімі лычкамі і рэдзенькімі аўсянымі вусікамі, пераступіў яму дарогу:

— Вам куды?

— Да Міхаіла Антонавіча.

Міліцыянерык сігнуў крок назад, здзівіўшы сваім даверам. Але і Чуйкевіч наўмысна назваў генерала не па пасадзе, не па званні і нават не па прозвішчы, а менавіта па імю і па бацьку. Паказваў тым самым, якія ў іх панібрацкія адносіны.

Генерал, высокі, сівагаловы, з вялікімі залысінамі, маладымі светла-яснымі вачыма, шырокім жэстам запрасіў Чуйкевіча садзіцца. Уключыў тэлевізар «Панасонік», сказаў сакратарцы з прыёмнай, каб зварыла каву. Сеў насупроць Чуйкевіча, а не на сваё скуранае крэсла. Спытаў увогуле пра жыццё-быццё. Тады як бы між іншага пацікавіўся, што хацеў яму паведаміць Чуйкевіч.

Чуйкевіч слухаў генерала ўпаўвуха, адказваў абы-як. Цяпер жа ад напружанасці мала не скурчыўся, палажыў на стол рукі — у яго былі крывыя, вузлаватыя доўгія пальцы з вузкімі пазногцямі. У дзяцінстве, помніцца, быў незадаволены сваімі рукамі. Хацеў, каб яны былі шырокія, цяжкія, з тоўстымі, бы

калодачкі, пальцамі. І толькі дарослы — нядаўна — зразумеў, што іншыя ў яго т а к о г а рукі і быць не павінны. Іншыя рукі — іншы ён, а значыцца, не ЁН, а значыцца, і без гэтых думак. І, можа, зусім без думак. Бо, як-ніяк, выглядзеў у кніжачцы па хірамантыі, што ягоная рука належыць ці то да філасофскай, ці то да духоўнай.

Гледзячы на генерала, на ягоныя рухі, чуючы ўпэўнены голас, Чуйкевіч разумеў, што таго цяжка чымсьці здзівіць. Не хацелася здацца і самому баязлівым хлапчуком, наіўным, недаверлівым. Доўга не рашаўся выціснуць з сябе слова.

Сакратарка (генерал назваў яе ласкава — Лідок) прынесла на плоскай талерцы два кубачкі кавы. Паставіла на стол. Яна ішла плаўна, ледзь-ледзь пахітваючыся целам, як сытая рыбіна. Толькі цяпер Чуйкевіч міжволі ацаніў ейную зграбнасць, спрыт манекеншчыцы ва ўменні паварочвацца, ставіць нагу, трымаць рукі, не прыціскаючы да стану локцікаў, нахіляць галаву, усміхацца. На верхняй губе ў яе была глыбокенькая прадаўгаватая ямачка, усцеленая мякенькім эратычным пушком.

Генерал узяў кубачак, пабоўтаў у ім белай пластыкавай лыжачкаю, крэкнуў:

— Мне ўжо і кавы нельга выпіць — сэрца бухае. Хутка і на жанчын перастану глядзець...

Шчырасць Чуйкевічу спадабалася, і ён каратка распавёў генералу гісторыю з Субач. Той абурыўся, паслаў у паветра мацюк, спытаў, у якім раёне яна жыве. У адным ён мае знаёмага суддзю, і калі яна адтуль, яе можна правучыць. Але Чуйкевіч не ведаў ейнага адраса. (Зрэшты, мог бы і ведаць — на заяўцы яна пісала). Генерал нахіліўся, націснуў адну са шматлікіх кнопак на самым высокім селектары.

— Слухаю! — пачуўся голас.

— Дайце мне дадзеныя на Субач...— глянуў на Чуйкевіча, той падказаў імя і па бацьку: — Зінаіда Сяргееўна.

Секунд праз сорак звесткі былі атрыманы.

— Не, на жаль, не ў тым раёне,— пашкадаваў генерал. Далей дакладнымі фармулёўкамі выклаў два меркаванні. Можа, той Субач і сын ейны, але нічога не ведае аб распачатай мацерай крутні. І, можа, гэта выпадковае супадзенне прозвішчаў.

Усё-такі, прызнаўся Чуйкевіч, яму не хочацца рызыкаваць: а раптам яго задумалі злавіць на непрыстойнасці (ворагаў хапае!), страціўшы надзею скампраметаваць абвінавачваннем у плагіяце. Генерал, чалавек вопытны і асцярожны, хоць і вельмі сумняваўся, не выключаў гэткага варыянта.

— У нас усё могуць,— сказаў ён, мусіць, не думаючы ў гэтую хвілю, што ён і ёсць адзін з тых, хто «ўсё можа».

Чуйкевіч падзякаваў генералу за каву. Той маўчаў чамусьці так доўга, што можна было выкурыць цыгарэту.

— Вось што, Канстанцін,— генерал нарэшце выпрастаўся ва ўвесь магутны рост,— дай ты мне сваю экзаменацыйную картачку і пасведчанне аб навучанні ў СТК. Так будзе надзейней.

Чуйкевіч вельмі пашкадаваў, што не ўзяў іх з сабою. А думка такая дома была мільганула. Ён часта цярпеў, што не слухаўся ўнутранага голасу.

— Не страшна. Я пазней падашлю машыну, і ты перадасі.

Генерал уражваў Чуйкевіча дзелавітасцю, кемлівасцю, тым, што выйсце знаходзіў хутка і ўпэўнена. Міжволі ў Чуйкевіча палепшаў настрой. Нават якаясьці бязглуздая ўсмешка выбівалася з ягоных вуснаў. Не так часта сустракаліся на жыццёвай дарозе людзі, перад якімі адчуваў сваю мізэрнасць і бездапаможнасць, а сябе — мізэрнай кузуркаю.

Генерал правёў Чуйкевіча да дзвярэй. Лідок за сталом не зварухнулася, чытала замежны каляровы часопіс, ці не шведскі «Rapport». Ён усё роўна сказаў ёй «да пабачэння». Упершыню ён адчуў, што ў яго ёсць абарона. Яму хацелася ажно спяваць. Здавалася, жыццё пераніцавалася. Можа, на гэтым абарвецца чорная паласа, далей пацягнецца светлая, як палатно. Праявілася ў вачах з дзяцінства: разасланыя на выгане палотны — бель, быццам снег. Паехаць бы з такім самаадчуваннем ў «Цяля на вяроўцы», пасля ў вёску. Гэта вельмі важна — перад адпачынкам адкараскацца ад усіх клопатаў, болек, згрызот. Пакінуць іх за мяжою, а самому перайсці ў дзяржаву дабраты, спагадлівасці, цяпла, паразумеласці.

## РАЗДЗЕЛ 51

Увечар Чуйкевіч запісаў у ДЗЁННІКУ:

Усе намаганні чалавека зводзяцца да аднаго: скампраметаваць, зламаць, падмяць пад сябе іншага, падобнага на сябе. Робіцца гэта вельмі проста, на грунце зусім бяскрыўдных, разавых фактаў. Выпіў — шый, што п'яніца. А ці так гэта? Убачылі пад ручку (ці побач) з жанчынаю — значыцца, бабнік. І нікому няма справы, што ты з сястрою. За нестандартнасць думак, шчырыя незакамплексаваныя паводзіны могуць назваць вар'ятам (прыгадайма дэсідэнтаў)... І гэтак далей і да таго падобнае.

Адсюль — бачыце: ЁН лепшы, ЁН асуджае, ЁН дае адмоўную ацэнку.

Выбачайце, але я не маю патрэбы ў вашай, панедабрадзею, высакароднасці: вучыце жыць і пісаць (калі пра пісьменніка) сябе.

## РАЗДЗЕЛ 52

Пад скляпеністай столлю ў сутарэнні фасфарысцыравалі лямпы незямнога святла. Вочы звычайнага чалавека ад яго асляплі б. Жанчына Няміла нават не прыжмурылася. Але знік ейны стан: засталіся плечы з галавою і ніжняя частка строяў.

Перад ёю стаяў шыхт струкападобных істот.

— Як справа з кампраметацыяй?

— Магчымасці ў Пятра Пятровіча вычэрпваюцца! — забалбаталі гарошыны.

— Трэба яшчэ пацягнуць. Выклічце Пятра Пятровіча.

З тых дзвярэй, адкуль высыпалі істоты, выйшаў Пётр Пятровіч. Спыніўся за спінамі істот. Дзве істоты зліліся з суседнімі,і заміж чатырох стала дзве. Пётр Пятровіч ступіў тры крокі. Ён быў бязмоўны як рыба. Працягнуў да жанчыны Нямілы дзве рукі. Далоні ўздрыгвалі. На адну ляглі акуляры ў залатой аправе, на другую — японскі электронны гадзіннік. Пётр Пятровіч зняў з куцанькага носіка свае залапаныя акулярыкі і начапіў залатыя.

## РАЗДЗЕЛ 53

Прыкацiўся па худасочна-хваравiтай траве першы дзень лета. Вясны сёлета, лiчы, не было. Той вясны, якую любiў Чуйкевiч,— з цiхiмi туманнымi ранкамi, мяккiм сонцам у павалоцы, радасным пераклiкам шпакоў у шатах апранутых сакавiтай лiстотаю дрэў. І на душы не чулася веснавой цеплынi. Усё заканамерна, як мае быць. Без узаемнасцi з прыродаю чалавек не жыве.

Закончыўся вiзiт Рэйгана ў Савецкi Саюз. Да позняй ночы Чуйкевiч глядзеў па тэлевiзары прэс-канферэнцыю Гарбачова i Рэйгана. І ўражанне ад амерыканскага Прэзiдэнта было зусiм не тое, што склалася з прэсы, калi той аб'явiў Савецкi Саюз «iмперыяй зла».

Прапаганда мусiруе «Тэзiсы ЦК КПСС да XIX Усесаюзнай партканферэнцыi». У тэорыi, здаецца, усё добра. Як будзе на практыцы. Дасюль разыходжаннi былi велiчэзныя. І любы дакумент мала мяняў жыццё людзей.

Рэдакцыi часопiса «Ідэi перамагаюць» не давалi чынна працаваць. Пачалiся вылучэннi кандыдатаў у дэлегаты на партканферэнцыю. Той жа манер, тыя ж фармальнасцi, што i раней былi ў падобных мерапрыемствах. Значыцца, i мiзэр спадзяванняў на сур'ёзныя перамены ў грамадстве, небывалы энтузiязм якога аплятаўся хмелем апатыi i расчаравання. ПЕРАБУДОВА не давала бачнай рахубы. Выключэннем была хiба што галоснасць. Людзям адкрылiся вочы на сталiнскiя рэпрэсii. І ў Чуйкевiча паволi ачышчалiся мазгi. Мiльёны ахвяр! Дзед ягоны Арцём, дый бацька таксама. Хто адкажа за ўвесь дэспатызм, здзек, турмы, гулагi? Самiх кiраўнiкоў, апроч Кагановiча, ужо няма ў жывых. Дый колькi б чалавек нi панесла пакаранне, усё роўна не аплоцiш пралiтых слёз i крывi.

Бадай, за ўсё адкажа сама СІСТЭМА, сацыялiзм.

## РАЗДЗЕЛ 54

Жонка ягонай творчасцi не спрыяла. У яго была глыбокая душа, а ў яе блiзарукiя вочы, якiя не маглi ўбачыць дна, дзе напластоўвалiся ягоныя дум-

кі. Ёй было пляваць на тое, што яму наканавана пісаць. А каб пісаць, край патрэбны адзінота, зацішак, спакой. У кожным разе, для той засяроджанасці, з якою Чуйкевіч вадзіў пяром, Дом творчасці «Цяля на вяроўцы» ў ягоных варунках уяўляўся самым утульным месцейкам. Калі ехаць туды аднаму. Чуйкевіч жа выбраўся з малодшым сынам. І не шкадаваў. Стан ягоны цяпер быў такі, што заставацца аднаму не пажадана. Увечар будзе да каго абазвацца. Талент — гэта наравісты конь: чым ён большы, тым цяжэй яго закілзаць і падступіцца да яго. А з Арцёмам ён увогуле адчуваў паразумеласць. Нейк само сабою складвалася, што ягоныя бацькоўскія сімпатыі ўсё часцей пераходзілі да Арцёма. Не, абодва сыны былі яму аднакава родныя і дарагія, але штосьці між ім і Васем нацягвала вяровачку непрымальнасці, непрыязі ці нават варагавасці. Падрастаючы, старэйшы сын станавіўся як бы супернікам яму. Мужчынскім супернікам. І адносіны між імі браліся як між мужчынамі-супернікамі, і толькі адсюль натуральна вынікалі пачуцці адзін да аднаго. І ў гэтай натуры нельга было нічога змяніць, бо ўсё дыктавала падсвядомасць. Дзякуй Богу, Чуйкевіч гэта разумеў, і сынаў эгаізм, несумленнасць, няшчырасць да яго, бацькі, дзеля абароны маці, не прымаючы ўнутрана, апраўдваў. А апраўданне — гэта заўсёды дараванне.

## РАЗДЗЕЛ 55

Дом творчасці стаяў у лесе. Яго абступалі хвоі, сярод якіх пракідаліся гонкія яліны і бярозы. Зусім непадалёку булькатала рэчачка пад назваю Іслач — калісь самая чыстая на Беларусі. У ёй вадзілася стронга. Пару гадоў назад Чуйкевіч яшчэ бачыў яе. Тарпедкаю яна вышмыгнула з-пад чорнага, як вугаль, карча, замёрла над залаціста-жоўтай намыўнай пяску — цёмна-бурая спінка, па баках, усеяных чырвонымі і жоўтымі кружочкамі, бэзавая палоска, насцярожаныя пярэстыя плаўнікі. Рэчачку абселі кусты ракітніку, вербалозу і вольхі, перавітыя гірляндамі хмелю з жоўта-белаватымі шышачкамі. Імклівая вада вымывала карэнні, расчэсвала іх па цячэнні. У завоінах круціліся віркі, тут можна было злавіць на вуду акунька ці тоўстагаловага бычка. Рыбакоў пры-

ваблівала яшчэ і сажалка на далёкім краі лугавіны, у ёй жылі карасі. Над сажалкаю навісалі старыя дуплістыя вольхі з парэпанымі крамяністымі камлямі. Лісце з іх падала ў ваду, гніючы, фарбавала яе ў фіялетава-чорны колер. Такога ж колеру былі і карасі — цялёпістыя, маларухомыя парасяты. Праўда, браліся яны рэдка: ежы ім хапала сваёй, звыклай. А Чуйкевічу нічога іншага, апроч клёву, і не трэба было. Асалоду ён чэрпаў ад самой мажлівасці вудзіць, ад клёву — тузання паплаўка. Дзеля гэтага ён і ўзяў з сабою складзенае бамбукавае вудзільна.

Аўтобус «Мінск — Валожын» спыніўся, і яны з Арцёмам выйшлі. У Чуйкевіча целяпалася на плячы туга напакаваная брызентавая торба. Сын, трымаючы ў адной руцэ вуду, узяў Чуйкевіча другой за руку. Паўз дарожку высокая трава белазуба ўсміхалася рамонкамі. Фыркалі ў паветры празрыстыя стракозы. Іх саміх не было відаць, а толькі цені, якія бегалі па шэрым палатне дарогі. Пры ўваходзе на абнесены загародаю абшар красаваўся драўляны цемнаватавасковы церамок. Сын прыпыніўся, чытаючы на ім словы: «Дом творчасці пісьменнікаў «Цяля на вяроўцы». Яму ўсё было тут цікава: прыехаў першы раз.

Адміністратар, маленькі чарнабрывы дзядзечка, выдаў ім ключ у пакой № 22. Чуйкевіч спазнаў першую радасць: вакно выходзіла на лес — на той бок, дзе рэчка. Галоўны корпус меў форму квадрата, з прыкассю на сучасную мудрагелістасць, заблытанасцю калідораў, і не ўсе пакоі ўдала ляпіліся. Удалымі лічыліся акурат тыя, што глядзелі на рэчку.

На абед у сталоўку сабраліся ўсе, хто з'ехаўся ў Дом творчасці. Багата было дзяцей, незнаёмых, пісьменнікаў менш, але Чуйкевіч усіх іх ведаў. Да яго падышоў адзін, па прозвішчы Сінькевіч. Ён быў пад чаркаю. Павіншаваў Чуйкевіча з прыбыццём.

— Хто гэта? — спытаў Арцём, калі Сінькевіч, па-сяброўску абняўшы незнаёмага мужчыну за плечы, адышоў.

— Пісьменнік,— адказаў Чуйкевіч.

— Як і ты?

— Ну так.

Хоць Сінькевіча не любілі за п'янства, Чуйкевічу ён падабаўся, ва ўсякім разе, не выклікаў непрыязі.

Зрэдзьчасу яны перазвоньваліся, абодва любілі футбол. Чуйкевіч у душы абрадаваўся, што і тут будзе з кім перакінуцца словам. Толькі дарэмна спадзяваўся. Сінькевіч і ягоны сябар увесь час былі п'яныя: хадзілі за два кіламетры ў Ракаў, цягалі торбамі віно.

**РАЗДЗЕЛ 56**

Пазней Чуйкевіч ЗАПІСАЎ:

«І вось — адчынены балкон. Слухаю, як заліваюцца лясныя канькі на макаўках ялін, ценькаюць сініцы, цыльгікае дзяцел. На пісьмовым стале ў вазачцы з чырвонага шкла кветкі — рамонкі і фіялетавыя званкі. Дрэвы ў самай зеляніне — елкі, дубкі, арабіны. Сосны — як васковыя свечкі. Гэта мая стыхія, у такім асяроддзі раствараецца, знаходзіць суладдзе і жыве мая душа. Трэба ўзяцца і пісаць раман пра лёс гаротнага беларуса. Лепшых часоў чакаць няма чаго. Праца, рэдакцыйныя турботы, асабліва непрадбачныя, як цяжба ў Пракуратуры, інцыдэнт з партманетам, з'ядаюць усю маю энергію. Гэта, можа, нават мая трагедыя як мастака, што я не твару, не пішу, аддаю сябе мітусні і мітрэнзе. Але хто карміў бы мяне, маіх дзяцей, жонку ў адваротным выпадку? Талент у нас не шануецца, ён нікому не патрэбны, пра яго ніхто не думае. А чаму б не рабіць так: выявіўся талент (не толькі мастацкі) — адразу яму ўсе ўмовы, сродкі: працуй! Ад таленту найбольшая карысць, калі ён будзе займацца сваім, дарэшты выкладацца на творчасць. Ды дзе нашай краіне да культуры, духоўнасці, калі яна не можа забяспечыць сваім грамадзянам фізіялагічнага існавання (харч, дах над галавою і г. д.). У нас чалавек пакладае сябе на элементарнае — на тое, каб выжыць, г. зн. апусціўся да жывёльных інстынктаў: урваць мяса і схавацца (мецць) у нары. Цяпер няма ніякага пакланення таленту, у яго ніхто не закахаецца, ніхто з пабочных не напіша ўспаміну, як гэта было ў XIX стагоддзі. Адсюль — збядненне духоўнага багажу нацыі: талент не фіксуецца ў часе, у гісторыі, у людской памяці. Ён бліснуў, як метэарыт, і патух, не запаліўшы на вякі паходні ў сэрцах людзей. Гэта — бяда, ад гэтага тужліва. Нічога іншага не застаецца, як суцяшаць сябе думкаю (сваёю ж: мо дзеля апраўдання?): талент —

гэта не аб'ём, гэта — тайна; мастак, зразуметы адразу і цалкам пры жыцці, не нясе ў сабе тайны чалавечай душы.

Бяздарнасць глядзіць на свет вачыма зла.

Пакінутая думка — гэта бессмяротнасць. Яе трэба занатоўваць пяром на паперу.

У чалавека ёсць два шляхі абессмяроціць сябе: мастацтва і дабрата. Першы падуладны нямногім, другі — усім.

Для паперы самая вялікая небяспека — пажар, для думання — нудота.

Моц думкі не залежыць ад фізічнай моцы чалавека, можа, нават наадварот. Праз яе выходзіць энергія душы. Фізічная энергія кудысьці знікае, энергія думкі лунае вакол. Гэтая энергія перадаецца другім, уздзейнічае на другіх.

Лёгка быць смелым і сумленным, калі пад нагамі не твая зямля, калі за спінаю няма радзімы».

## РАЗДЗЕЛ 57

Чуйкевіч знаходзіў збавенне каля рэчкі і сажалкі. Мала-памалу выцясняліся з думак сталічныя непрыемнасці. Яшчэ дзень-два, і ён сядзе за пісьмовы стол. Гэткі стан, мусіць, быў пікам ягонага шчасця. Прывыклі людзі да гэтага слова «шчасце», няхай яно не будзе чужое і Чуйкевічу. Хоць пастаяннага сэнсу яно не мае. Аднаго разу яго Чуйкевіч «пад мухаю» спрабаваў тлумачыць студэнтцы. Дарэчы, як яна? Не званіла покуль. Відаць, і не пазвоніць. Цяжка вытрымаць нагрузку нават ад важданіны з людзьмі абавязковымі, ад якіх нікуды не ўцячы. Дзе ўжо там цябе хопіць на выпадковых?

Млеў, дрыжэў паветрам сонечны дзень. Смаўжы ўначы пакінулі на бетонных ходніках бліскучыя, бы слюда, стужачкі. Самі пахаваліся ў траве і кустах. Промні прасвечвалі рэчачку да дна нават у глыбокіх мясцінах — відаць былі чорныя круглячкі, сапрэлае лісце, абраслыя цінаю галінкі, падобныя на каралы. Лугавіна разлілася жоўтым мёдам дзьмухаўцоў. На спуску з гары, у ляшчынніку, Чуйкевіч сарваў лілова-ружовую медуніцу; яна тырчала ў яго з нагруднай кішэнькі. Рознакалёрная, як ордэнская планка. Арцём размахваў вудзільнам, ссякаючы кволыя шыйкі

дзьмухаўцоў. Чуйкевіч пацягнуў яго за плячо на сцежку. Сцежка, бы стужка, паўтарала звівы Іслачы, метра за паўтара ад краю абрыўчыка.

На тым баку рэчкі, на пясчанай, быццам насыпанай з манкі выдме, гуляла дзятва з блізкага піянерлагера «Акцябронак». Дзве растаўсцелыя выхавацелькі ляжалі на пяску, як ласіцы, а чарнамазы хударлявы хлапчук махаў над імі кашулькаю — адганяў мух і сляпнёў.

Сажалка драмала пад шчыльнай бліскуча-гладкаю дзяружкаю раскі. Там-сям у ёй чарнелі вакенцы. У гэтыя вакенцы і закідвалі вуду.

Завостранай палачкаю Чуйкевіч адкапаў у глёўкай чорнай зямлі з тузін вяртлявых бурых чарвячкоў. Начапіў аднаго на кручок і закінуў вуду ў самае шырокае вакенца. Арцём папрасіў вуду, і ён аддаў.

Каля берага ў вадзе было шмат чорных хвастатых жабак. Яны вылазілі на траву, грэліся, часта дыхаючы бакамі.

Пад вольхамі час ад часу хтосьці шабуршэў, плёскала вада. Чуйкевіч прыгледзеўся. Чорныя звяркі, велічынёю з пацука, скублі траву і ўплаў перапраўлялі яе ў раскарачаны лазовы куст. Чуйкевіч паказаў іх сыну.

— Як яны называюцца? — спытаў Арцём. Чуйкевіч дакладна не ведаў, але падумаў, што гэта, мабыць, андатры.

— Андатра...— адказаў ён.— Шапка ў мяне зімовая з яе, помніш?

Сонца смаліла да ачмурэння. Чуйкевіч пашкадаваў, што не пакрыў нічым галаву сабе і сыну. Хоць бы з газеціны зрабілі пілоткі. Дзесьці на гары ў соснах дзяркатa крычалі вароны — падобна, ужо выведзеныя, маладыя, яшчэ ў пянеўі заміж пер'я. Калісь, хлапчуком, Чуйкевіч лазіў па балоце і пароў варанячыя і сарачыныя гнёзды: помсціў за ўкрадзеных куранят. Не мог без дакору прыгадваць тыя часы і тыя ягоныя штучкі. З тугою, бясцямна гледзячы на ваду, Чуйкевіч, аднак, убачыў, як нырнуў рэзка паплавень.

— Цягні! — крыкнуў ён сыну. Той ірвануў на сябе вудзільна. Яно сагнулася, напялася, як цеціва, лёска.

«Ну й карась»,— падумаў Чуйкевіч і выхапіў у сына вуду.

Якое ж было іхнае здзіўленне, калі на кручку

заскакала па траве вялізная бела-зялёная жаба. Яна прарэзліва, ледзьве не дзіцячым голасам крумкала. Такой жабурыніны, з добрую мужчынскую далонь, бадай, Чуйкевіч у жыцці ніколі не бачыў. Жаба пярэднімі лапамі, як чалавек, зрывала з губы кручок, гарбацілася, заплюшчвала ад болю вочы — тоненькі залацісты абручык і шырокая круглая зрэнка.

Арцём баяўся да яе падыходзіць. Чуйкевіч смела ўзяў яе, вільготную, халодную, бы лядзяш, вызваліў ад кручка і кінуў у сажалку. Яна імгненна схавалася ў цёмнай, бы дзёгаць, вадзе.

— Цяпер яна напалохае ўсіх карасёў,— пажартаваў Чуйкевіч, і сын недаверліва паглядзеў на яго. Але ён аказаўся празорцам. Толькі аднаго карасіка-пятачка вылавілі яны да абеду. І таго выпусцілі назад у сажалку: няхай падрастае. Хто ведае, можа, вадзяныя істоты гэтак жа сігналяць між сабою пра небяспеку, як і людзі.

## РАЗДЗЕЛ 58

Ужо на гары, каля самай «крэпасці», Чуйкевіч пачуў крыкі. Тады ўбачыў: з асабняка-катэджа, трымаючыся за грудзі накладзенымі адна на адну рукамі, нейк няўпэўнена ступае мужчына. За ім бягуць два ці тры чалавекі. У мужчыны на белай тэнісцы расплываецца цёмная пляма, шырэе, як хмарка, што набліжаецца. «Кроў?..» — жахнуўся Чуйкевіч.

— «Хуткую»! «Хуткую» выклікайце! — лямантавала тоўстая невысокая кабетка, якая трымала мужчыну пад локаць. У яе былі круглыя і жоўтыя, як жалуды, вочы.

Мужчына, збялелы, рухнуў перад самымі дзвярыма галоўнага корпуса.

«Што з ім?..» — не разумеў Чуйкевіч, не могучы адказаць на гэтае пытанне і сыну.

Пасля праяснілася ўсё са слоў відавочцаў. Да мужчыны, які сядзеў у катэджы перад камінам, падышлі Сінькевіч і ягоны сябар. Як заўсёды, абодва п’яныя, а праўдзівей, ужо ачмурэлыя ад таннага віна-чарніла. «Ах ты сіянісцкая сука!» — вылаяўся Сінькевічаў сябар і ўсадзіў у грудзі мужчыну скальпель. Нечаканасцю гэта не было. Сінькевіч з сябрам увесь

час спрачаліся з мужчынам, чапляліся да яго, зневажалі. Мужчына меў неславянскі твар, быў ужо на пенсіі, але яшчэ працаваў на якімсьці заводзе ў Мінску. Рана аказалася смяротнаю: скальпель перацяў лёгачную артэрыю. Ужо мёртвага, мужчыну забрала «хуткая дапамога», а Сінькевіча з сябрам (як выявілася, таксама пісьменнік, з Расіі) — жоўты міліцэйскі «уазік».

Трагедыя зноўку выбіла Чуйкевіча з каляіны. Дух смерці запоўніў увесь дом, лунаў у фае, сталоўцы, калідорах і нават у пакоі. Прынамсі, Чуйкевіч яго адчуваў. Мільтусілася, стаяла ў вачах цёмна-барвовая пляма на белай тэнісцы, якая расплываецца, шырэе, бы там разліваецца таматны сок. Смерць, а злашча неверагодная, не ўкладвалася ў ягоную свядомасць. Прывучыць да яе, да ейнай непазбежнасці ў ягоным узросце было цяжка. У становішчы пажылога чалавека, як ні ўяўляй, пабыць маладому не дадзена.

Арцём усё дапытваўся, за што забілі «дзядулю». Чуйкевіч не мог нічога сказаць, адно вінаваціў п'яных дзядзькоў. Ён разумеў, што п'янства — зло, «самавольнае вар'яцтва» (Сенека) і што лепей яму самому назаўжды адмовіцца ад алкаголю. І цяжкасці для яго тут не было: піць яго не цягнула ніколі. Нават грэбліва крывіўся, прыгадваючы смак гарэлкі ці віна, не кажучы пра самагар. Але душа патрабавала адпачынку, вызвалення ад шлаку эмоцый. І гэта праўда: яна магла адпачыць толькі ў бясцямным забыцці. Чуйкевіч спадзяваўся, што нястрачаныя розум і воля не дадуць яму прапасці, скаціцца на дно невылазнай ямы. Ды ён не ведаў, што і гэтую нітачку ўжо закусіла зубамі невядомая яму сіла.

Псіхалагічнае поле гармоніі, з такою натужнасцю створанае, забойствам чалавека было ўзварушана. Чуйкевіч адчуў гэта па непрыкаянасці і трывозе, якія ўраз узялі яго ў абладу. Рыбалка, лес, чытанне ўяўляліся непатрэбнымі, а творчасць — немагчымай.

## РАЗДЗЕЛ 59

Устаў сярод ночы. Падступіўся да вакна і доўга глядзеў на лес. У шатах соснаў гарэлі неонавыя ліхтары. Як светлякі ў траве. Толькі што пры-

сніўся сон — русалкі ў Іслачы. Вылезлі на пясчаную выдму. Адна белая як смерць, падобная на маладую артыстку Б. з тэатра імя Янкі Купалы.

Неадольна пацягнула блукаць па начным лесе. Гадзіны з дзве назад прашаптаў цёплы імжысты дождж. Чуйкевіч трымаўся бетоннай сцежкі, каб не расяніць ног. На ёй сядзела шмат жаб. Яны мякказапаволена скакалі з-пад ног. Чуваць было, як шамацела трава, калі яны падалі. З сасны капнула кропля.

Выйшаў на абрыў лугавіны — Матка Боская! — залітая ўся блакітным марывам. Туман. Такога высокага Чуйкевіч яшчэ не бачыў. Стаіць сцяною, нароўні з соснамі, што растуць на далёкім краі лугавіны. Унізе пад гарою валавяна бліскае рака, журчыць. Абазвалася якаясьці начная птушачка:

— Цо-цо-цо-тыр-р-р! Цо-цо-цо-тыр-р-р!

Што за яна? Такой песні Чуйкевіч ніколі не чуў. А гукі знаёмыя. Ну, канечне ж, яны нагадваюць друкаванне на пішучай машынцы. А можа, мірсціцца яму ад суму па творчасці?

Над травою пад ліхтаром танцуе безліч маленькіх светлых, бы вата, матылькоў. Адзін сеў на абшыўку курткі. Дзіўная назва ў гэтага матылька — мядзведзіца кая. Зусім не стасуецца.

Зноў ураўнаважыцца льга было толькі ў новым месцы. Не дабыўшы да канца тэрміну, Чуйкевіч пакінуў гэтае «Цяля на вяроўцы». Бачыць штодня на асфальтавай дарожцы, на ганку нязмытую закарэлую кроў, якая пасля дажджу расцякалася па ручайках, было звыш ягоных сіл. Такія крывавыя змейкі тачылі ўледзянелы двор, калі свежавалі япрука, мылі яго, абсмаленага, цёплай вадою. Асацыяцыя нясмачнасцю прайшлася па грудзях, ажно пагусінілася скура.

Яго чакала вёска. Не з'ездзіць туды ён не мог. Перахварэла душа, прытупіўся боль, але ўвесь час жыла ў ім, не пакідала думка, што ён асірацеў, як і многія тысячы тых, чые мясціны выстудзіла чарнобыльская чума. Хто ведаў, што да вядомай медыцыне заразы напрыканцы XX стагоддзя дадасца яшчэ адна — радыяцыя. Не перадаецца яна бацылай, але ад таго не менш небяспечная і каведная. Не толькі выкошвае людзей, але й робіць квёлай будучыню — расхіствае, крышыць непарушную, Боскай міласцю акладзеную рамку генафонду беларусаў.

## РАЗДЗЕЛ 60

У якісьці момант Пятру Пятровічу здалося, што Чуйкевіч залішне нервуецца. Чалавек ён, канечне, творчы, з тонкай псіхікай, але калі зусім не вінаваты, дык чаму так ужо тузацца. Ну, справа зацягнулася — і што з гэтага? Жыві, працуй спакойна і чакай рашэння.

Пётр Пятровіч, жук вопытны, ведаў адзін спосаб, які дапамагаў беспамылкова выявіць вінаватага. Чалавек вінаваты да канца, аж да самага прысуду, не страчвае шанцу стаць патрэбным следчаму, у чымсьці нават паспрыяць. Пётр Пятровіч ужо ўсёк, што перад ім чалавек з багатым творчым і рэдактарскім навыкам, які мае мажлівасць друкаваць у часопісе чужыя рэчы. Што, калі яму падсунуць сваё апавяданнейка? Увайсці, так сказаць, у хаўрус. Калісьці ва універсітэце на юрфаку Пётр Пятровіч быў членам рэдкалегіі насценнай газеты «Страж закону» і крэмзаў такія-сякія зацемкі. Калі Чуйкевіч хоць крыху вінаваты, ён абавязкова прапануе яму надрукавацца ў часопісе.

Пётр Пятровіч націснуў кнопку свяцільніка. На рудую адпаліраваную локцямі паверхню стала лёг лапік святла. У гэты лапік ён палажыў аркуш паперы і ўзяў ручку.

Гадзіны праз дзве з-пад ягонага пяра вылецелі тры аркушы, спісаныя крывымі дробненькімі, падобнымі на мурашак, літарамі. У іх апавядалася пра тое, як малады дзяцюк ажаніўся з сямідзесяцігадовай старой, каб займець права на ейную жылплошчу. Урэшце, дайшло да суда. Пётр Пятровіч вёў гэтую справу, добра яе ведаў, і напісалася яму лёгка. Перачытаў — гладка, складна! Не горш, чым у гэтых «пясьменнікаў». А для прынады яшчэ як прыдасца. У пастцы абы прыманка была, дзеля паху.

Пётр Пятровіч пацёр знямелыя пальцы. Да хрусту. Да болю.

## РАЗДЗЕЛ 61

Перапыніўшы знаёмства з героямі рамана, я хачу з дапамогаю фантазіі і чутага пабыць у свеце сваіх продкаў. Папіць вады з крыніцы наколькі жаданай, настолькі і недаступнай мне. Такое адчуванне

перажывае, мабыць, кожны: душа і розум імкнуць не толькі ў будучыню, у якой табе жыць, але і назад, дзе зараджалася тваё «Я» яшчэ далёка да твайго з'яўлення на свет, знеткуль з кудзелі касмічнага матэрыялу высмыкнулася нітачка твайго роду. Яна, відаць, бясконцая ў глыбіню, як тое дзяленне атама, таму я даверуся адно памяці сваёй вёскі.

## РАЗДЗЕЛ 62

Вёска, дзе нарадзіўся Чуйкевіч, мела некалькі назоваў. Можа, не ўсе зафіксаваныя ў папяровых кандуітах розных часоў, але ён чуў з вуснаў сваіх землякоў: і Самадумка, і Малінаўка, і Таўкачоўка, і, нарэшце, Аляксандраўка. Нічога ў свеце выпадковага няма, усё звязана-перавязана. І назовы не так сабе, ад няма чаго рабіць альбо ад прыхамаці аднаго чалавека, з'яўляліся.

Адлічэнне сваё вёска пачынае дзесьці з 1905 года. Яна ўзнікла на зусім новым месцы — на балоце. Год узнікнення таксама не выпадковы. Першая рэвалюцыя ўскалыхнула царскі ўрад, прымусіла задумацца, чаму бунтуюць сяляне ў вёсцы, рабочыя ў горадзе; як падняць ураджайнасць, наладзіць мануфактуру... На гэтым пагрозлівым зараве народнага абурэння кволаю сярнічкаю адным жнівеньскім днём успыхнула на правым беразе Сажа, за чатыры вярсты ад «варшаўкі», вёска Судзілоўшчына.

Ніхто не ведаў, чаму загарэлася вёска. Усе былі ў полі, на жніве. Калі падлеткі і мужчыны першыя прыбеглі, полымя жэрла ўжо палову хат. Шматдзённая спякота высушыла салому на стрэхах, частакол, бярвенні, і яны займаліся гарэць як порах. На бяду, ускінуўся вецер, ірваў уздоўж вуліцы — і агонь хлапякамі перакідваўся з адной страхі на другую. З цэбаркамі, дзежкамі, начоўкамі людзі паляцелі да Сажа; адтуль, абліваючыся вадою і потам, перліся на гару, у агаломшанасці не цямячы, што іхныя высілкі зусім марныя. Галасілі, апошнімі прыбегшы, кабеты, плакалі маленькія дзеці, грэбліся з калысак.

Можа, праз гадзіну-дзве на месцы вёскі дымілася вялізнае цяплішча. Вецер насіў у паветры іскры, чорнае, бы мухі, ахлоп'е згарэлай саломы. Шархотка шумелі зажаўцелыя бакі яблынь і грушын.

У небе плаўна кружылі буслы і вароны, між імі ўвішна, як бы знарок лавіруючы, мільгалі ластаўкі.

Што рабіць з вёскаю, думкі разбегліся. Адны казалі: заставацца на старым мейсцы, адбудоўвацца, другія з такой жа настойлівасцю даводзілі, што трэба пашукаць іншае мейсца, болей шчаслівае. Галоўны доказ першых быў — Сож: вада, рыба, луг... У другіх былі доказы не менш важкія: тут зямля неўрадлівая, супесі — дробная бульбачка, чэзлы колас... Спрачаліся доўга і ніяк не маглі паразумецца. Як заўсёды, пры такіх зацятых спрэчках апошняе слова давалі Мацвею Чуйкевічу — Кастусёваму прадзеду па бацькавай лініі. Захаваўся людскі погалас аж дасюль: што гэта быў мудрэц, чалавек нетаропкі, разважлівы. І ён выказаўся тады за новае мейсца. Мужчыны з дазволу пана Судзілоўскага пачалі яго шукаць.

Людзей заўсёды цягнула з глухамані да святла, бліжэй да выгод цывілізацыі (хоць якая тады была цывілізацыя?). Так абралі мейсца непадалёку ад «варшаўкі», на прамежку між Прапошаскам і Чэрыкавым, на правы бок, калі ехаць з Масквы ў Варшаву. Гэта была суцэльная глушэча: вольха, бяроза, елка, сасна, хмызняк. Мясцінамі зусім непралазная ад зараснікаў маліны, ажыны і хмелю. Хіба што адна канава-рачулка, пятляючы між куп'я, кустоўя і алешын, прабівалася скрозь яе. У канаве, выявілі, было процьма ўюноў, карасёў і нават шчупакоў — чорных, як галавешкі. «Вось вам і рыба,— сказаў Пахом Гляк.— Навошта той Сож...»

Нарэзалі надзелы на кожны род і пачалі раскарчоўку. Рыдлёўка, сякера, кірка, кол-падвага — вось тыя няхітрыя сялянскія прылады ў помач мазолістым рукам. Глушэча адступала, адганяючы ўглыб дробнае звяр'ё і птаства. Толькі мядзведзь — гаспадар над усімі — не захацеў здаваць сваіх уладанняў і паплаціўся за гэтае нахабства жыццём.

Напароўся на яго Хведар Вірлак ці па-вясковаму — Проччым. Пайшоў у маліннік па вялікай патрэбе — і раптам ляціць адтуль збялелы, з вырачанымі вачыма. Рот разяўлены, а слова прамовіць не можа. Дзіва што: услед за ім гэцае здаравенны буры мядзведзь. Дарма, што няўклюдны з выгляду, касалапы, а бяжыць лёгка, быццам яго спружыны падкідваюць. Вірлак зачапіўся аборамі за патарчаку, зарыўся но-

сам ў твань. Тут яго і нагнаў мядзведзь. Вірлак падхапіўся — за куст крушынніку, а мядзведзь за ім. Носяцца вакол куста, невядома, хто за кім ганяецца.

Добра, што мужчыны, з коллем ды сякерамі, падаспелі. Але ці змаглі б яны саўладаць з касалапым, калі б у Пахома Гляка не аказалася крамнёўка. Усадзіў ён дранкуліну мядзведзю ў карак, той дзіка зароў, устаў на заднія лапы і рушыў на талаку. Смялейшыя мужчыны коллем яму насутыч — звалілі, заклявалі сякерамі. Зважылі пасля — каля паўтоны туша пацягнула.

А небарака Вірлак са страху ўмлеў. Гады два слова не мог вымавіць, толькі лыпаў вачыма ды ікаў. Пасля аголтаўся, але ўсё роўна, казаў, у галаве шум, «мутна», быццам з пахмелля. Можа, праз гэта і дзеці ў ягоным родзе пайшлі прыдуркаватыя, абэлтусы.

Назву вёсцы далі Самадумка: самі надумаліся будаваць яе. Але ўсякай дзяржаве ніколі не падабалася самавольства народа. Яе правіцелям заўсёды здавалася, што яны лепш і ведаюць, і бачаць, і разумеюць. Мусіць, так і павінна быць: маса, калі ёй даць волю, разраджаецца бязладдзю, хаосам, злачынствамі, амаральнасцю. Магілёўскі губернатар загадаў змяніць назоў, угледзеўшы ў ім бунтарскі дух. Вось і пайшлі гаданні, пераборы прымет: багата маліны — значыцца, быць Малінаўцы.

Праз якісьці час малінаўскія майстры праславіліся на кірмашах хвацкімі таўкачамі. Чаму не засведчыць гэта? Адсюль — Таўкачоўка.

Надакучылі пану гэтыя частыя змены назоваў. Звярнуўся ён да губернатара: дазвольце ў гонар Аляксандраўскага палка, які вызначыўся ў бітве пад Лясною са шведамі, менаваць вёску Аляксандраўка.

Такім дайшло да сённяшніх дзён адно з паданняў, паводле якога назвалі Чуйкевічаву вёску.

## РАЗДЗЕЛ 63

Чуйкевіч прачнуўся ад зычнага мужчынскага голасу і доўга не мог уцяміць, дзе ён. Усё незнаёмае. Доўга лыпаў вачыма, покуль зразумеў, што ён у бацькоў у вёсцы.

З вакна лілася чыстая, бэзавая яснасць. Рванымі

шматкамі слаліся на падваконнік сонечныя блікі. Дзесьці клахатала курыца.

Чуйкевіч падумаў, што позна заспаўся, ужо даўно дзень. Але глянуў у вакно — слюдзяна льснілася цёмнае густое лісце каліны, лёгкае, блакітнае марыва касмылілася каля платоў і над вільготнаю з начы дарогаю — і зразумеў: на двары сама што раніца. Ціхая, глухаватая, а цяпер яшчэ і сіратлівая.

Па голасе пазнаў Адама Пудрыка — высокага мужчыну з набрынялымі верхнімі павекамі, няспелаюначым пушком на шчоках і рэдкімі белымі шчацінкамі над верхняй губою і на падбародку. Ён калісь першы паведаміў Кастусю пра забітага машынаю Амура.

«Усё тут — і конь, і акучнік,— бубнеў, як у жалезную трубу, Адамаў голас.— Пасля яшчэ Грышка Пруцікаў возьме...»

«А што, ён таксама не акучваў?» — спытала, нейк роблена здзівіўшыся, маці.

«Ну дзе ж ён паспее... На цэлы тыдзень да Юркі ў турму ездзіў... Пырнулі яго там».

«Даць пахмяліцца?» — Маці, чуваць, адчыняе дзверы ў веранду. Туды на лета перабазіравалі кухню: газавую пліту, суднік, балею для вады, дзежку з мяшэчкамі мукі, круп і цукру.

«Дай, калі ёсць»,— здалося, ураз памякчэў Адамаў голас. Яны саступілі ў веранду — падлога ў ёй ніжэй, чым у хаце,— было чуваць, як гупнулі ногі. Цяпер ужо далятае толькі глухое, як з-пад зямлі, Адамава бубненне. Можа, хвіляў праз пяць зноў рыпнулі хатнія дзверы, і на новай, ужо крамянай ноце, гучыць Адамаў бас:

«Бярыце каня на ўвесь дзень, не спяшайцеся...— І раптам: — Косця!»

Чуйкевіч ажно здрыгануўся. Адчыніліся дзверы ў чыстую палову хаты.

— Косця! А-а, ты тутака,— Адам заўважае на канапе Чуйкевіча.— Гэты ідал кусаецца, дык ты не бойся... Гыкні на яго, а калі што — па храпе. Во тады паслухае...— І ён, крыху прыгорбіўшыся, пайшоў з хаты.

Арцём, ссунуўшы ў ногі коўдру, спіць на ложку каля печы. Чуйкевічу не хочацца ўставаць з мяккай пасцелі. Даўно ён так соладка не спаў. Цела жадае

папесціцца, пацягнуцца. Але думкі ўжо там, на сядзібе, вакол каня і акучніка. Нават фраза ўначы прыблюзнілася, зусім незразумелая: «Зорка пакахала бульбіну». Дай Бог, канечне, зорцы пакахаць нашу беларускую бульбіначку.

Чуйкевіч пытае ў маці, што яму апрануць. Яна нейк сполашна спахопліваецца, мусіць, у дакоры на сябе, што забылася загадзя пашукаць яму адзенне. Хуценька дыбае да шафы, суха рыпяць дзверцы ў куточку каля самага нізу.

— Во бяры бацькаваараднае...— Маці з усмешкаю на твары выносіць вайсковую форму — штаны і кіцель. Вешае на спінку крэсла. Маці змянілася. Яна асела, апусціліся плечы, выгарбіўшы падушкаю спіну. У глыбокіх ямінах чорнай роспачы ўтапіліся вочы, колісь вялікія, жывыя, з аквамарынава-ясным высакародным бляскам.

— Гэта Глеб усё забяспечвае? — перапытвае Чуйкевіч, хоць і так ведае, што брат-афіцэр заваліў бацьку адзеннем. Маці радая, што не забываюць сыны. І малодшы, і старэйшы. Старэйшы во якраз дапаможа паакучыць бульбу. Бацька з'ехаў не ў пару ў шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай ажно за Бабруйск. Прыпякло яму: хапіла спіна, навалілася бяссонніца...

## РАЗДЗЕЛ 64

Акурат жа сённяшнім днём сорак сем гадоў назад пачалася вайна. Хто з дапамогаю войнаў вырашае праблемы — той вар'ят. Ёсць дыпламатыя. Іншая рэч, што далёка не кожны мае схільнасць слухаць гэтую дыпламатыю.

Розум заўсёды ваюе думкамі.

На фронт Рыгор Чуйкевіч папрасіўся сам — з Сібіры. І яму, спецперасяленцу, паверылі, мабілізавалі на фронт. Былі моманты, калі боль і крыўда за бацьку, за род, вырваны з карэннем з зямлі, штурхалі на здраду: кінуць свае акопы, перабегчы да немцаў і адпомсціць. Аднаго разу, уначы пад Ржэвам, ужо быў узяўся за халодны, звільжэлы ад расы насып, ды раптам зусім блізка здурэла закрычаў драч... Самлелі ногі, і Рыгор асунуўся ў акоп, чуючы, як на галаву, на плечы, за каўнер гарачымі струменьчыкамі пацёк шапаткі, бы жыта, пясок...

## РАЗДЗЕЛ 65

Чуйкевіч адзеўся, нахапок кусануў бліна з салам і выдыбнуў з хаты. Чорны конь, запрэжаны ў акучнік, стаяў прывязаны да частаколіны. Калі падышоў Чуйкевіч, ён нават не зварухнуўся. Не падобна, што натурлівы.

Да сядзібы конь таксама ішоў спакойна. І Чуйкевіч меў мажлівасць аглядаць наваколле. Дзіўна ўсё змянілася. Адразу за сядзібамі ўсчынаўся расцяроб. Колісь там было балота, поўнае духмяна-мядовай маліны. На ягоным месцы цяпер падняўся глухі, разбуялы хмызняк, прасветам бялелася нядаўна пракапаная прамой лініяй канава. Ды ссохлая, без лісця бяроза была падобна на абгладаныя косці. Над расцяробам высока ў небе плаўна кружылі, не махаючы крыламі, падобныя на крыжы два буслы. Цікава, дзе можа быць іхнае гняздо?

У баразне конь занатурыўся, біў у хамут, круціў галавою і скаліў жоўтыя моцныя, як падковы, зубы. Стаптаў некалькі каліў бульбы. Чуйкевіча разабрала злосць. Ён адвярнуў каня з бульбы і агрэў два разы пугаю па крупе — засталіся белыя пыльныя палоскі. Зноў скіраваў каня ў баразну. І той хуценька ды роўна затупаў між каліўя.

«Во лекі знайшоў! — узрадаваўся Чуйкевіч.— Добра, што Пудрык своечасова падказаў...»

Акучваць Чуйкевіч умеў. Гэта была не самая цяжкая праца з канём на зямлі. Куды цяжэй бульбу разганяць, калі капаюць. Плуг вылузваецца, бярэ то мелка — тады рэжа клубні, то глыбока — тады не цягне конь.

Чуйкевіч хутка стаміўся. Яскрава ўбачыў, як падкасіла яго жыццё. Пройдзе туды-назад, і рукі млеюць, трапечацца сэрца. Правы гумавы бот націраў пятку. Чуйкевіч разуўся. Прыемна было адчуваць босымі нагамі мяккую халаднаватую ліпкую зямлю. Садзіўся пад загарадзь, каля якой цвіла белавата-зялёнымі кветкамі ляскаўка. Адпачываў, павесіўшы на калені рукі. Цыкаталі ўстрывожана конікі. Адзін скочыў на былку метлюгу — яна сагнулася, і ён павіс спінкаю ўніз.

Прытупацеў з бабаю Арцём. Надзьмуўся як сыч за тое, што не пабудзілі яго. Чуйкевіч, каб развесяліць,

паказаў яму забаву. Адарваў, узяўшы за чубок, кветку ляскаўкі і ўдарыў аб далонь. Пачуўся сухі стрэл.

Цэлы дзень акучваў Чуйкевіч нейкія дваццаць пяць сотак. Упрэў і сам, і конь — стаў чорны, аж блішчэў, бы акрыты цэлафанам. З цьмяна-чарнічнай, шызаватай кудзелі хмар апусцілася сонца і пакацілася ўніз па вугляна-чырвоным полагу далягляду проста на лес.

Класціся спаць было яшчэ рана. Пасля вячэры Чуйкевіч выйшаў пасядзець на лавачцы — «на людзі». Вуліца была пустэльная, патыхнула нязвыклай, дзікай заняпаласцю. А колісь на ёй галёкала моладзь, пішчалі дзеці. Цяперака пішчаць і арудуюць у падполлі пацукі. Цэлае нашэсце раптам аб'явілася. А іх жа ніколі ў вёсцы не было. Маці сказала: «Так скрыгочуць пад мастом, ажно хістаецца веранда».

Пацукам нібыта спрыяе радыяцыя. Усё гіне, хірэе, толькі яны плодзяцца па-шалёнаму.

У чалавечы рост падняўся на падворышчы суседняй хаты дзядоўнік, асот і бур'ян. Яшчэ нядаўна тут жыў ягоны аднакласнік, сябар і цёзка па прозвішчы Жэнька Чуйкевіч. Пасля службы на марфлоце ён вярнуўся ў вёску, ажаніўся з дачкою Адама Пудрыка. Стаў за брыгадзіра, ды заеўся са старшынёю калгаса — і спісалі на трактар. Гаспадарлівы, трымаў ажно пяць кароў: збіраў грошы на «Жыгулі». Цесць пасвіў іх разам з калгаснымі. Латва! Паспрабуй адбыць улетку пяць радовак — заедзь, гарачыня... Сам тым часам цягаў на сваім «кіраўцы» ўсё, што валялася на дарозе. Лясіна дык лясіна, прывалок — парэзаў бензапілою, а дзеці як мурашкі па цурбаку знеслі пад паветку. Жонка, Анфіса,— каралева: высокая, зграбная, белыя валасы, бы кужаль, мяккія, да пояса. Ідзе — пацягвае ногі, як каза́чка. Працаўніца, як тут мовяць, «трудзяга», яшчэ пашукаць. Ягад вядро набраць у лесе — раз плюнуць.

Што і казаць, крэпенька прывязаўся да зямлі Жэнька. І род самы моцны ў вёсцы. А князь над ім ён, Жэнька. Адно гора — маці згарэла. Уначы ні з таго ні з сяго ўсхліпнуўся пажар...

І тут на́ табе — выбух на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Ратуючы сваіх траіх дзяцей, Жэнька з'ехаў кудысьці на Віцебшчыну, у калгас да хвалёнага старшыні.

У зараслях жаласна курняўкаў кот

Туга́ паласавала Чуйкевічу грудзі.

Нечакана з завулка вынырнуў дзядзька Міхалка-Проччым, мужык малодшай мацерынай сястры Зойкі. Загарэлы да чарнаты, у белым саламяным капелюшы.

— Здароў, плямяш! — Ён заўсёды са смакам вымаўляе гэтае слова. Сеў побач з Чуйкевічам. Засмаліў папяросіну. З асалодаю ўдыхнуўшы дыму, пачаў хваліцца, што ездзіў у санаторый: бясплатна, як пацярпелы ад радыяцыі. Ажно пад Маладзечна. Ехаў праз Мінск, ды забыўся Чуйкевічаў адрас. Хацеў заехаць. Прызнаўся, што там яму кабета падкруцілася — урач-селекцыянер. Дала нейк «дваццацьпятку», кажа, купляй што хочаш. Ну, што тут купіш? Купіў дзве бутэлькі «Сталічнай». Хадзілі па лесе, каля рэчкі: красачкі, матылькі, пясочак на водмелі...

— З'ехаў крыху раней,— вымавіў з гонарам.— Каб далёка не заходзіць... і проччым. А лячэння ніякага, толькі кактэйлі піў. Дык я, проччым, яшчэ лепшы кактэйль і дома вып'ю...

Дзядзька Міхалка, мабыць, ужо глыкнуў якогасьці чэмергесу. У вачах ягоных плавала млявасць.

Няпростыя былі стасункі ў Чуйкевіча з дзядзькам Міхалкам. У дзяцінстве нічога не разумеў, а цяпер ведаў і помніў багата чаго. Перадусім — даўнішнія спрэчкі бацькі і дзядзькі Міхалкі. Ім было, як кажуць, што дзяліць, што высняць. Проччымаў род быў з галоты, гультаяваты. У калектывізацыю ён узначальваў камбеды, раскулачваў. Выграблі засекі ды ачысцілі куфры і ў Чуйкевічаў. Знеслі ўсё ў калектыўны свіран. А пасля самі ж разрабавалі ды, каб сляды замесці, свіран спалілі. Хто спаліў? Вядома, кулакі. Так сям'я Чуйкевічаў у 29-м загудзела ў Сібір.

Помніцца, у якойсьці п'янцы дзядзька Міхалка крычаў у твар збянтэжанаму бацьку: «Хопіць! Ваш час скончыўся! Папілі нашай крыві!..» І настойліва хадзіла чутка, што менавіта па Міхалкавым даносе бацьку на пачатку 50-х зноў, «як ненадзейнага перасяленца», адправілі ў Сібір на перавыхаванне. Было, было...

Што і казаць, ужо тады яго, Кастуся Чуйкевіча,

задумалі зрабіць рабом — калі адабралі ў дзеда Арцёма зямлю, пазбавілі багацця, нажытага потам, і ён перастаў чуць сябе чалавекам. Мусіць жа, таму і засіліўся дзед на бярозе ў лесе. І дрэўца гэтае, роднае, беларускае, выбраў, пэўна, невыпадкова. Дзеля чаго яму было жыць, што абараняць, чым сябе ўслаўляць? Нават жа чмялі вунь як сябе абараняюць, калі выкасіш іхнае гняздо. Выкасіў, разбурыў — і разляцеліся чмелікі, тут жа гінуць. Дзед і сыноў, дачок прывучаў да зямлі, а пасля высылкі куды ім? Кожнай жывой істоце трэба мець штосьці СВАЁ. Гэта СВАЁ адпавядае менавіта ёй, як задумана прыродаю. Чалавека тым больш робіць гаспадаром, ачышчае ягоную душу толькі ўласнасць. Калі ёсць што страчваць, абдумаеш сто разоў кожны свой крок. Твая ўласнасць, твой падворак — гэта ёсць ТЫ. Няма іх — няма і цябе, ТЫ бязлікі, бы пясчынка, якая нялздольная супраціўляцца ні вадзе, ні ветру. Яе горне разам з суродзічкамі, куды захочацца вадзе і ветру. І людзей несла камуністычная стыхія ў зададзеным кірунку, выкошваючы ўласнікаў, бы траву, пакідаючы голь і чысціню, як на барабане.

І ўсё-такі, і ўсё-такі... Калі папраўдзе, непрыязі да дзядзькі Міхалкі Чуйкевіч не адчуваў. Падсвядомасць была чыстая, у ёй не сядзела болю за страчанае дзедам Арцёмам. А з дзядзькам Міхалкам, наадварот, было звязана шмат успамінаў, што прыпадалі акурат на тыя часы, калі бацька марнаваўся ў Сібіры. Больш таго, Кастусь нават спачуваў дзядзьку, ведаючы, што калісь у галадоўку стары Вірлак забіў свайго большага сына.

## РАЗДЗЕЛ 66

Дзядзька Міхалка быў заўзяты паляўнічы, меў сабаку Джульбарса. Кастусёк зайздросціў яму. Марыў сам і пра стрэльбу, і пра сабаку. А покуль толькі слухаў дзядзькавы росказні па вяртанні з лесу. Рэдка яму ўдавалася прыносіць здабычу. Часцей штосьці перашкаджала пацэліць у зайца, лісіцу альбо вавёрку.

«Каб табе хто зайца за куст прывязаў, тады б ты папаў»,— насміхалася з яго цётка Зойка. Яна часта зўбрыла яго за пустыя швэнданні па лесе.

Але аднаго разу дзядзька Міхалка прынёс-такі падраненага цецерука. Кастусёк якраз гуляў у іх у хаце са стрыечнай сястрою, сваёй равесніцай.

Дзядзька Міхалка апусціў цецерука на падлогу. Ногі ў яго былі звязаны белай стужачкаю. Цецярук чорны, як вугаль, з зеленаватым адлівам, спуджана тузаўся. На правым крыле ў яго зліплася пер'е, запяклася кроў, і яно бездапаможна матлялася.

Дзядзька расказваў, як падраніў цецерука:

— Прыцягаўся я, прочччым, і сеў на корч аддыхнуць. Ружжо між ног, смалю самакрутку. Раптам чую: лоп-лоп-лоп! З ялін пасыпаліся снег,ігліца і прочччым. Цецерукі! Селі на вяршаліны ялін. І адзін красавец акурат насупроць мяне, на самай макаўцы. Яшчэ не ўсеўся добра, ківаецца, і бачу ўжо, галаву на мяне крывіць: падазронае ўлавіў і прочччым. Хапіў я ружжо і, не цэлячыся, бахнуў... Цецярук мяк на зямлю. Я да яго, а ён падымаецца і ходу. Снег глыбокі, ён правальваецца і крыламі сабе памагае... адно, бачу, перабіта. «Э-э, шэльма, не ўцячэш ты ад мяне!..» — думаю. Ды ледва спаймаў халеру, пакуль не ўбіўся ў лоўж. Выцягнуў яго, дык ён давай кэрхаць, дзяўбацца і прочччым. Звязаў яму ногі шморкаю ды ў торбу.

Дзядзька Міхалка яўна задаволены ўпалянай здабычаю. Цецерука ён прынёс упершыню, усё былі зайцы ды вавёркі.

Кастусёк прысеў каля цецерука і ўважліва разглядаў яго. З першага зірку ён убачыўся яму чорным, а на самай справе ў яго было шмат і белага пер'я: на крылах, пад хвастом. Перабітае крыло распасцерлася, абвісла, і было відаць, што спадыспаду яно таксама белае. І гэтая бель была запэцкана крывёю. Кінуліся ў вочы дзве яркія пунсовыя палосачкі над вачыма — «бровы». Цецярук біўся на падлозе, перакідваўся з боку на бок, і Кастуську было шкада яго.

— Давайце развяжам яму ногі,— сказаў ён.

— Заб'ецца куды ў падпечча, што і не выцягнеш,— адразу адмёў Кастуськову прапанову дзядзька Міхалка. Ён сядзеў за сталом, рэзаў на дошчачцы сала і еў яго з хлебам і цыбуляю.

Кастусёк пагладзіў цецерука па спіне і, здаецца, пачуў, як заскрыпела пад ягонымі далонямі пер'е. Цецярук закідаўся яшчэ мацней, у яго адкрылася

дзюба, і з яе відаць быў вострь цемнаваты язычок, падобны на смажанае семка сланечніку. Кіпці шкрэбалі па падлозе.

Не пашанцавала небараку, думаў Кастусёк, гледзячы на цецерука, лятаў ты разам з сябрамі ў чарадзе, карміўся бярозавымі шыпушкамі, быў вольны і незалежны. А цяпер цябе падстрэлілі, звязалі табе ногі і прынеслі ў цесную змрочную хату. І ты, неразумны, бездапаможны, кідаешся, не цямячы, што з табою стала і што вырвацца адсюль табе ўжо ніяк не ўдасца. Плакала твая воля, твой высокі лес, твая сям'я, і ты супраціўляешся толькі ад бязглуздасці сваёй, ад дзікага стыхійнага страху перад чалавекам-зверам. Вочы ў цябе чорныя ад напоўненасці гэтым страхам, і сякуць яны, і колюць, і б'юць у душу, бы шраціны, што ўпіліся і ў тваё крыло ды цела. Чым, чым ён, Кастусёк, можа табе дапамагчы?

— А можа, пагадаваць яго трохі, зажывіць крыло? — звяртаецца ён яшчэ раз да дзядзькі Міхалкі.— Робяць жа гэтак з бусламі...

— А навошта? — усміхаецца дзядзька Міхалка так, быццам Кастусёк самае дурное і наіўнае ў свеце дзіця. Што яму тлумачыць, навошта — не захоча ён і блізка разумець Кастуська. Калі б яшчэ ён дарослы быў... Дарослыя хоць і спрачаюцца, але перамога бывае то за адным, то за другім. А дзеці, яны заўсёды вінаватыя, гавораць глупствы, а робяць і не так і не тое. Нябось самі як дзеці былі, дарослыя гэтыя, таксама плакалі ад болю і крыўд, а разумець цяпер не хочуць.

Сілы пакідалі цецерука, выцякалі разам з крывёю, што чорным, як вішнёвы сок, струменьчыкам пабегла па маснічыне, знайшла сабе шчыліну ў цёмнае халоднае падполле. Белая, з малінавай, бы ў капсулі, пасачкаю радужка апусцілася зверху на вока... Кастуську здалося, што цецярук памірае. Рука міжволі пацягнулася да яго, але толькі дакранулася — цецярук зноў забушаваў, затрапятаўся, бэрсаючы на падлозе чорную нітку крыві.

Дзядзька Міхалка дбайна абіраў цыбуліну ад шалупіння. Тады парэзаў яе на кольцы, браў адно і разам з хлебам ды салам кідаў у рот.

— Можа, яму хлеба даць? — Кастусёк, мабыць, ужо зусім здурнеў, бо ў дзядзькі раптам часцей за-

хадзілі шырокія пашчэнкі і пабеглі гуляць па шчоках жаўлакі.

— Гаўна яму дай! — сказаў дзядзька Міхалка, гучна чаўкаючы ротам.

А цецярук лапатаў і лапатаў на падлозе. На якісьці міг нават устаў на звязаных нагах, падтрымаўшы сябе здаровым крылом. Кастусёк убачыў, які ў яго цудоўны хвост — загнутыя літараю «Х» пёры. Ну проста райская птушка!

Цецярук слабеў, паміраў у Кастуська на вачах. Белая радужка апускалася ніжэй і ніжэй, аж покуль стала блакітнаватаю і закрыла вока.

— Гатовы? — Дзядзька Міхалка ўстаў з-за стала, на барадзе ў яго прыляпілася маленькая чырвоная шалупінка з цыбуліны.

— Памёр...— пацвердзіў Кастусёк нежывым голасам.

— Эх ты, мужчына! — ляпнуў яго цяжкой далонню па галаве.— Нюні распусціў, проччым... Важкі, халера яго! — Дзядзька Міхалка ўзяў за ногі цецерука — галава ў яго нейк слабка матлялася, акурат яна была на нітцы з нанізаным пер'ем.— Тлусты касач!.. Снегу сёлета нямнога, пракармёжу хапае.— Ён укінуў цецерука ў вялізную эмаліраваную місу.

Кастусёк ішоў дахаты, глядзеў пад ногі на снег, а ў вачах ягоных мярэжыўся чорны, як вугаль, цецярук, з перабітым крылом, з чырвонымі бровамі і падобным на літару «Х» хвастом...

## РАЗДЗЕЛ 67

Праз дзіркі ў частаколе, на які абапіраліся спінамі, насунулася цемра. На неба ўсплыў чысты круг месяца. Зусім нізка над галовамі віхлява праляцеў кажан, тоненька піснуў.

— Пара ў люлю,— сказаў Чуйкевіч.

У двары на лаве стаяла вядро з вадою. Чуйкевіч падышоў, каб папіць набгом. У вядры адлюстроўваўся месяц, трапіў акурат на дно — і здалося, гэта выхад у якуюсьці бязмерную прастору. Чуйкевіч ажно адхіснуўся.

Уначы яму сніліся авіялайнеры ў форме марскіх караблёў — тонкія, бліскучыя, як бы са свінцу, у цёмным небе. Зрабілі круг над вёскаю, павярнулі назад.

Якісьці прыўзнята-боскі малюнак, які не столькі трывожыў, колькі ўзвышаў.

Калі: было раней ці будзе пазней — што караблі плаваюць па паветры, як па вадзе?

Чуйкевіч, прачнуўшыся ўранні, пайшоў да светлага асінавага балотца, якое ў вёсцы называлі не асіннік, а ласіннік, бо колісь сюды забрыдалі грызці кару ласі. Соўгаўся басанож па воглай расянай мураўцы. Вырываў пучкамі фіялетава-жоўтыя кветкі зяберу, смактаў салодкі нектар. Непадалёку весела брыкала, навязаная на ланцугу, пярэстая цёлка-леташка на пяці нагах.

Маці, адчуваў, бачыла ягоную непрыкаянасць, але не разумела яе. Ён, шкадуючы, не прызнаваўся ёй, які чорны накіп асеў у ім, на ягонай унутранай абалонцы. Ён увогуле не любіў скардзіцца: аднойчы выказаная скарга, ведаў, вяртаецца балючымі колцамі напаміну ад многіх людзей.

Вярнуўшыся, нечакана (і для самога сябе) спытаў у маці:

— Мама, калі гэта згарэла Ганна Чуйкевіч?

Маці злякнулася.

— А што ета ты ні з таго ні з сяго?

— Ды так, успамінаў учора Жэньку...

— Ета ж гадок твой. Ну, шчытай... Ета ў тое лета, як ты з Крыму вярнуўся. Восемдзесят трэці год... Так і ёсць.

Чуйкевіч адчуў, як пахаладнеў лоб. А ў нататніку сон пра пажар гэты ў якім годзе запісаны? Трэба глянуць у Мінску, як прыедзе.

Дні не ішлі, а пнуліся пяткамі наперад.

Каб падсілкаваць цікавасць ды ад няма чаго рабіць, сабраўся з'ездзіць у Слаўгарад. Маці сказала, там абсталявалі японскую апаратуру «СИЧ». Правяраюць на ёй усіх, хто захоча.

— Арцём, паедзеш са мною? — спытаў у сына.

— Вядома, татачка! — узрадаваўся той.

На шашу ішлі не гасцінцам, а па сасонніку. Ужо заліловіўся чабарок і спляла залаціста-жоўтыя вяночкі рутвіца. Арцём зганяў з кветак матылькоў.

Прывучаны ў Мінску да чэргаў, Чуйкевіч здзівіўся, што каля дзвярэй лабараторыі не было ні аднаго чалавека. Ён зайшоў і спытаў, ці можна яму, мінчуку, праверыць сябе на радыяцыю.

— Калі ласка,— спакойна адказала сярэдніх гадоў медычка з чорнай нітачкаю вусікаў над верхняй губою.

Яна запісала ў журнал прозвішча. Змерала ягоны і Арцёмаў рост, зважыла.

Чуйкевіч сеў у крэсла. Медычка навяла на яго акуляр-праменьчык. Хвіль праз пяць, зрабіўшы падлікі, дала яму вузенькую пісульку: «СИЧ. 0,12 МККИ. 19.06.88». У сына доза аказалася на адну сотую меншая. Цікава: гэта яны ўжо прыехалі з мінскай заражанасцю альбо набралі дозу тут за тры дні? Падобна, што і ў Мінску разам з прадуктамі яны глытаюць радыенукліды. Хто іх там правярае, а калі правяраюць, то праўды ўсё роўна не гавораць.

У вёсцы, тым куце, дзе нарадзіўся, Чуйкевіч адчуваў сябе прыметна лепей, чым у Мінску. Нягледзячы ні на што. Чыстае паветра ці што іншае спрыяе? Народжаныя, зразумела, так-сяк пражывуць. А што будзе з ненароджанымі? Якія дзеці будуць у сённяшніх «радыенуклідных» дзяцей? Няма сумневу, генафонд беларусаў будзе хірэць. У непазбежнасць гэтай існасці розум адмаўляўся верыць.

Арцём, адчуўшы, што бацька хутка паедзе, не адставаў, усё дапытваўся:

— Тата, не пакінеш мяне тут?

Чуйкевіч, каб супакоіць малога, знаходзіў самы пераканаўчы доказ:

— Калі б і хацеў, дык з-за радыяцыі нельга.

Ён перажываў, што не пабачыў бацькі; журыўся яшчэ і за вёску — заняпалую, абяздоленую, прачасаную чарнобыльскімі вятрамі. Шкада было людзей, што заставаліся ў ёй жыць. Гэта пажылыя людзі, якіх больш палохала невядомасць і чужы край, чым якаясьці нябачная «радзіяцыя». Маладзейшыя з'ехалі, а яны змірыліся, згадзіліся, што паміраць будуць тут, дзе паміралі дзяды і прадзеды.

**РАЗДЗЕЛ 68**

Афганістан — гэта савецкі боль. Чуйкевіч перад ад'ездам з вёскі глядзеў па тэлевізары дакументальны фільм пра ўдоў і мацярок воінаў-інтэрнацыяналістаў і плакаў разам з гэтымі гаротнымі жанчынамі. Яны падабраліся як быццам знарок. Падоб-

ныя адна на адну — прыбітыя, пасівелыя, з апухлымі ад слёз вачыма. Добра, няхай хлопцы загінулі, выконваючы загад. Непазбежнасць. Але яшчэ мацней сціскалася ў Чуйкевіча сэрца, хацелася крычаць гвалтам, калі жанчыны расказвалі, як ставяцца да іх, няшчасных, тупагаловыя чыноўнікі ў гарадах і вёсках: «Я вашага сына туды не пасылаў». Ён разумеў тую зарана звялую малодку, якая казала, што ў Бога не верыць, але ходзіць у царкву — па міласэрнасць.

Чуйкевіча ў гэты вечар дабіў урывак пра лётчыка. Далі запіс жывых галасоў на стужку. Голас з зямлі: «Срочно оставляйте самолет! Срочно оставляйте самолет!..» А ў канцы немы крык лётчыка: «Прощайте, мужики!..» — І выбух. Стужка абарвалася. Вось такія перадсмяротныя моманты на Чуйкевіча моцна дзейнічалі: гэта ж рушыцца сусвет, наступае небыццё для цэлага жыцця. Жыццё кожнага — гэта планета са сваімі вачыма, вушамі, голасам, пачуццямі. Спыняецца жыццё — і спыняецца, перастае існаваць планета.

# Частка другая

> Вывучаць жыццё салаўя, папярэдне забіўшы яго, ці не ёсць гэта варварства?
>
> *М. Рэрых*

## РАЗДЗЕЛ 1

Пасля месячнага перапынку на працу Чуйкевіч ішоў у трывозе: што там? Думалася, за гэты час багата чаго памянялася. Можа, нават і ён ужо не на сваёй пасадзе. Сёлета адпачынак у яго быў незвычайны. Столькі ўсяго пакінуў перад ім! Не заглухла яно, дзесьці жыло, хліпала, крывавіла, чакала яго, каб упіцца ў сэрца, мазгі, душу, развярэдзіць іх. А можа, дзесьці за ababiтымі жалезам дзвярыма падрыхтаваны яму, як крутому злачынцу, сталёвыя, адпаліраваныя да бляску наручнікі.

Чуйкевіч адчыніў дзверы кабінета. Павітаўся і чакаў ад Люшчэні першых слоў. Акурат першыя будуць самыя важныя, самыя небяспечныя для яго. Нягледзячы на ранні час, кабінет залівала сонца, міма шторы клала на стол свой жоўты след.

Люшчэня павіншавала яго з вяртаннем і сказала, што неўзабаве, як ён пайшоў у адпачынак, заявіўся Пётр Пятровіч. Браў яшчэ копіі аўтарскай картачкі, гартаў журнал уліку. Выходзіць, не даверыўся яму, небяспечнаму злачынцу Чуйкевічу. А можа, што новае трымаў у сваім вялізазным сейфе Пётр Пятровіч і йдзе ў расследаванні, так бы мовіць, паэтапна?

Чуйкевіч надоўга задумаўся. Фінты Пятра Пятровіча відочна яго раздражнялі. Яны не ўкладваліся ў звычайную следчую логіку. Штосьці ім дадаткова кіравала. З НІЧОГА раздзімалася магутная справа, коўш якой заграбаў усё больш і больш людзей. Вось, калі ласка, ведайце, хто такі Чуйкевіч! Мала, што ўкраў рукапіс, дык яшчэ і выдаў яго за свой. Ату яго! Зганяйце на край свету як пракажонага?

Як пракажонага? Братцы, а можа, тут усё проста разгадваецца, га? Асёл ён са сваёй інтуіцыяй! Заява Субач — гэта адно зачэпка, каб завесці на яго справу, а тады раскруціць, сфабрыкаваць яе па сур'ёзным рахунку. Можа, у гэтым грамадскім сутонні ўжо ладзіцца, па прыкладу 37-га, новы механізм рэпрэсій? Таму й асцярожныя ўсе. Усё-ткі, як ні круці, частцы люду захацелася свабоды, незалежнасці, нацыянальнай самабытнасці. А ён, колькі сябе помніць, шчыра нёс, аберагаючы далонямі, свечачку сваёй беларускай самасвядомасці. Апошнім часам увогуле адкрыта выступаў супроць русіфікатарства, за вяртанне свайму народу таго, што яму даравана Богам, як любому іншаму народу. Вядома ж, ён кінуўся ў вока пільным захавальнікам грамадскага парадку.

Папраўдзе, гэткі паварот адразу натхніў яго. У такім выпадку ён згодны несці пакутніцкі крыж змагара — гэта святы абавязак кожнага сапраўднага інтэлігента.

Ён тут жа патэлефанаваў Пятру Пятровічу і спытаў, чым быў выкліканы ягоны візіт у рэдакцыю. Той адказаў, што Субач заявіла, быццам ён падрабіў ейную заяўку, і яна даўно пісала свае опусы.

— А вы што сказалі? — ужо дапытваў Чуйкевіч у ярасці.

Пётр Пятровіч, мусіць, адчуў ягоную раздражлівасць.

— Я не згадзіўся з ёю. Я сказаў: вы маглі пісаць і тады, калі Чуйкевічу было тры гады. Яна ажно ўскіпела. І мне нічога не заставалася рабіць, як параіць ёй абскардзіць маё рашэнне ў вышэйстаячы орган.

Вось так! Заміж таго каб была пакарана пляткарка, справу абсядае яшчэ адзін рой абывателей. Ніякія пчолы так не раяцца, як абывателі. Чуйкевіч не на жарт раззлаваўся:

— Прабачце, а вы больш нічога мне не шыеце?

— Покуль не,— аднасэнсова, але, здаецца, не цвёрда адказаў Пётр Пятровіч.

— У такім разе, сябры-таварышы, я падаю на Субач у суд за паклёп! — і ўціснуў трубку ў апарат.

Ад генерала Чуйкевіч ужо ведаў, што заяву трэба падаваць у суд таго раёна, у якім жыве адказчык. Па «09» даведаўся нумар тэлефона Савецкага нарсуда.

Цікавае супадзенне — с а в е ц к а г а: і месцазнаходжанне, і сутнасць.

— Пішыце заяву,— адказаў яму сонны дзявочы голас.

— Па якой форме?

— Пракансультуйцеся ў адвакатуры.

Блізка, на вуліцы Максіма Горкага, у доме, на якім прымацаваны барэльеф другога Максіма — Багдановіча, месцілася «Юрыскансультацыя».

Ідучы туды, Чуйкевіч спыніўся на хвілю каля барэльефа паэта:

---

«НА ГЭТЫМ МЕСЦЫ ЗНАХОДЗІЎСЯ ДОМ,
У ЯКІМ 9 СНЕЖНЯ (27 ЛІСТАПАДА) 1891 ГОДА
НАРАДЗІЎСЯ ВЫДАТНЫ БЕЛАРУСКІ ПАЭТ
МАКСІМ БАГДАНОВІЧ».

---

Зіркнуў на сквер пры тэатры оперы і балета: там між цёмных ствалоў клёнаў і ліп ледзьве ўгледзеў помнік Максіму Багдановічу. Акурат каля яго чыстым, светлым воблачкам завісла густалістая галінка клёна.

## РАЗДЗЕЛ 2

Чуйкевіч прысутнічаў, калі помнік адкрывалі. Адчуваў ён сябе радасна.

Гэта было на дзевяностыя ўгодкі паэта. Падалі рэдкія сняжынкі. Помнік стаяў пад белым пакрывалам, як пад снегам, у квадраце з чырвоных канатаў. Сатварыў яго скульптар Сяргей Вакар. Каля помніка выстраіліся дзяўчаткі ва ўсім белым, з гваздзікамі ў руках. Пры іх мітуслівыя, бы квактухі, выхавацелькі. Рэпарцёры з фотаапаратамі і кінакамерамі. Адзін папрасіў дзяўчатак: «Бяжыце на мяне. От як цудоўна зразумелі!..» Багата было вайскоўцаў, нават два генералы — у аднаго, кінулася ў вока Чуйкевічу, закасалася на чаравік калашына з лампасам. На жаўтабокім, як сініца, «газіку» былі ўстаноўлены гарластыя рупары: хор Шырмы спяваў «Зорку Венеру», «Маладыя гады». Яшчэ прыглянулася Чуйкевічу групка маладых, ярка нафарбаваных артыстачак: «Прапусціце жанчын наперад, мы маленькія». Мужчына ў футравай куртцы і шапцы-кубанцы, у акулярах з вя-

лікай рагавой аправай: «Мы таксама маленькія людзі ў параўнанні з ім»,— кіўнуў на помнік, прапускаючы артыстак наперад. Рэпарцёр пахваліў яго: «Во, бравыя хлопцы стаяць!»

Пад мажорныя гукі паэты Максім Танк і Пімен Панчанка знялі пакрывала з помніка. Адкрылася зроку журботная постаць Максіма-кніжніка...

## РАЗДЗЕЛ 3

Чуйкевіч, ураз адчуўшы мізэрнасць свайго клопату, быў да беражкоў напоўнены рашучасцю. Спусціўся ў падвальчык юрыскансультацыі. У кабінеце «Адвакатура» сядзелі дзве прыгожыя, набрынялыя дзёрзкаю маладою спакуслівасцю дзяўчыны. Адна з іх чысціла пілачкаю пазногці. Чуйкевіч ажно здзівіўся: такіх бы на рэкламу купальнікаў ці калготак у якісьці мадняцкі каталог, а не ў гэтую сухамяціцу-юрыспрудэнцыю. Яны ўсхвалявалі яго больш, чым сама патрэба, з якою прыйшоў.

Чуйкевіч блытана, утаймоўваючы дрыжыкі ў галасе, давёў дзяўчатам мэту свайго візіту. Яны прыдзірліва, з недаверам глядзелі на яго: нармальны ці, можа, хворы? Пра што ён кажа, пра які паклёп?

— Такога ў нашай практыцы яшчэ не было,— адказала светлавалосая, з яркімі вуснамі, падобная на каханку Сільвестра Сталоне Брыжыт Нільсан. Яны абедзве бралі з шафы запыленыя, высушаныя нерухомасцю томікі, гарталі іх. Але як пішацца заява ў суд на паклёпніка, так і не знайшлі. Ну й заканадаўства! За мяжою, мусіць, гэта самы ходкі артыкул — абарона сваіх правоў. А тут, наадварот, безліч артыкулаў, як чалавека ўнізіць, растаптаць, зняславіць.

— А вам абавязкова трэба? — спытала чарнявая, з какетлівым завітком валасоў на прыемна чыстым лобе.

— Далей нельга трываць,— з надрывам выдыхнуў Чуйкевіч: «Чортавы прастытуткі, ім лянота скласці заяву!»

— Тады перазваніце заўтра,— сказала бландзінка.— Нам трэба параіцца.

Назвала нумар тэлефона.

— Каго спытаць?

— Жаркову Вольгу Уладзіміраўну.

— Вы не сястра журналісткі Жарковай? — пацікавіўся Чуйкевіч. Ён вучыўся на факультэце журналістыкі з Жарковай, якая цяпер працавала ў адной з рэспубліканскіх газет.

Бландзінка заматляла галавою. Мусіць, падумала, што ён зараз пачне шукаць сувязі, прасіць дапамогі ці, яшчэ горш, садзеяння. Хто ведае, што ён за тып, якія ў яго намеры? Цяпер столькі развялося ўсякіх спрытнюг, мярзотнікаў, проста хворых людзей.

Час быў пасляабедзенны. Прыпарвала. Кулажыла ў небе.

Чуйкевіч адчуваў, як кропелькі поту казычуць крайнія куточкі вачэй. У крамцы «Фірменныя воды Лагідзе», што насупроць «Матрошкі», ён папрасіў газіроўкі з малінавым сіропам. П'ючы, жмурыўся ад дробненькіх пырскаў, што ляцелі са шклянкі на твар, прыемна асвяжалі.

Весела плыла перад вачыма маляўнічая даўжэзная вітрына з надпісамі, якія Чуйкевіч, ідучы па вуліцы, чытаў, быццам цягнуў тэлетайпную палоску паперы:

НАПІТКІ, КАНСЕРВЫ, КУЛІНАРЫЯ, СЕЛЯДЗЕЦ, РЫБА, ФАРШ, ПТУШКА, ПАЎФАБРЫКАТЫ, ЗАКУСЬ, КАФЕЙНАЯ, ТАРТЫ, ШАШЛЫКІ, ГАРАЧЫЯ БУТЭРБРОДЫ, РЫБНЫЯ СТРАВЫ, АБЕДЫ, КАКТЭЙЛІ, СОКІ, КАВА, МУСЫ, МАРОЖАНАЕ...

Няўжо калісьці і праўда ўсё было на прылаўку? Не верыцца. Скуль узяўся гэты Лагідзе са сваёй шыпучкаю?

...Грукатаў гром у аспіднай, шчыльнай цемры. Насоўвалася навальніца. Праз якуюсьці хвілю цемру раз за разам адкідвалі ад вакна ўспышкі бліскавіц.

Чуйкевіч, кладучыся спаць, выключыў святло акурат у той міг, калі блізка ўспыхнула маланка, і было ўражанне, што святло лямпачкі затрымалася ў пакоі.

З раніцы Чуйкевіч пазваніў у адвакатуру. Жаркова без эмоцый, звыкла, але так, быццам увесь час пра яго думала, прадыктавала:

— У нарсуд такога-та раёна... укажыце раён. Ісцец... Сваё прозвішча, імя, па бацьку. Адрас... Адказчык... Хто — таксама прозвішча, імя, імя па бацьку.

Адрас... Заява. На працягу такога-та перыяду... Што яна там з вамі рабіла? Раскажыце... На падставе выкладзенага згодна артыкула 7 ГК БССР... Прашу вынесці рашэнне аб абароне майго гонару і годнасці шляхам абвяржэння ганьбячых мяне звестак. Подпіс.

— Дзякуй вялікае! — Чуйкевіч паклаў трубку. Унурыўся ў аркуш, разбіраючы каракулі. Багата слоў скарачаў, некаторыя ўвогуле пазначыў толькі першымі літарамі. Сеў за стол, перапісаў дбайна заяву.

Ужо калі быў у рэдакцыі, пазваніў Пётр Пятровіч (Чуйкевіч не чакаў і не жадаў ягонага званка). Настойліва раіў покуль заняць «выжидательную позицию», не падаваць у суд на Субач. Чаму? Што яго бянтэжыць? Тое, што Чуйкевіч сказаў, быццам і ягонае прозвішча будзе называцца? Альбо штосьці яшчэ не саспела і трэба пацягнуць час?

Шчыра кажучы, рашучасць пасля таго, як напісаў заяву, з Чуйкевіча схлынула. Выпусціў пару, ачахла злосць. Хіба гэта сур'ёзны супернік — стары, нямоглы чалавек? Крыві папсаваў, канечне. Мусіць, на гэта і быў разлік — толькі на завязку. І яшчэ невядома, чым усё скончыцца.

## РАЗДЗЕЛ 4

Сутарэнне. Пахне водарам усемагчымых кветак, але саміх кветак не відаць. Жанчына Няміла выгляду кветак не пераносіла. Але трыццаць восем струкападобных істот прынеслі трыццаць восем букетаў дзеля іншай жанчыны. Яна і будзе іх бачыць.

З урачыстаю павольнасцю адчыніліся дзверы ў сцяне. Кульгаючы на левую нагу, у растаптаных жоўтых чаравіках з іх выйшла Субач.

У жанчыны Нямілы з правага боку знізу высекся прамы вугал да пояса. Яна прывітала Субач паветраным пацалункам. У той, аднак, запалымнелі незвычайна густым барвовым колерам зморшчаныя сухія вусны.

— Ты старая, а дзейнічаеш як маладая! — сказала жанчына Няміла.— Так яму, нацыяналісту, і трэба.

Чаравікі ў Субач зніклі, а на нагах заззялі шытыя золатам рускія боцікі.

## РАЗДЗЕЛ 5

Чуйкевіч як у ваду глядзеў. Праз пару дзён яму пазваніла Субач. Ейны халодны, нежыццёвы голас ён вылучыў бы сярод тысячы галасоў.

— Ваш Пётр Пятровіч — дробязь! — Яна па звычцы панесла на таго, хто адмаўляў ёй у спрыянні.— Ён нічога не разумее. Згаджайцеся, я прашу вас па-добраму! Мне шкада вашых дзяцей... Вамі займецца КДБ...— таемна прашаптала.

Чуйкевіч бразнуў на апарат трубку. Вось! Шантаж, пагрозы доўжацца. «Шкада дзяцей...» Ім пагражае непасрэдна ці тым, што яго запраторыць у вязніцу? Мала яму трывогі за дзяцей праз тых мярзотнікаў, што выцягнулі партманет. Афера выходзіла на новы віток. А была ўжо спадзёўка, што яна правалілася. Хіба гэтай старой няма чым займацца? Няўжо яна не мае ўнукаў? Мусіць, не мае. Гледзячы на чысты дзіцячы тварык, трымаючы нявіннае дзіця за цёплыя ручкі, не здолееш пайсці на подласць. Суд дзіцячых вачэй вышэйшы за суд Лінча.

Толькі цяпер, здаецца, ці не ўпершыню, Чуйкевіч пашкадаваў, што не даў згоды ў свой час супрацоўнічаць з КДБ.

Было гэта дзесьці каля сямі гадоў назад. Яму пазванілі. Незнаёмы мужчынскі голас спытаў:

— Константин Григорьевич? Очень приятно. Это беспокоит вас Иван Кириллович, сотрудник комитета госбезопасности. Вы с часок будете еще на работе?

— Буду.

— Можете подъехать в определенное время в одно место? Нужно переговорить по одному вопросу.— Ён рабіў націск на слове «одному» з такой інтанацыяй, якая адсякала ўсякія лішнія пытанні і сумневы.

— Магу.— Падумаў: «Паспрабуй скажы «не магу».

— Вы кончали университет. Геофак знаете? Ровно в семнадцать ноль-ноль я буду ждать вас в кабинете номер сто три.

Чуйкевіч ішоў на сустрэчу не без хвалявання. Абшар універсітэцкага гарадка змяніўся. Пастарэлі, парэпаліся карою і яшчэ больш раскірэчыліся нямецкія клёны. З іх акурат шчодра сыпаўся светлажоўценькі ліст, шчыльна не прылягаў да зямлі, а яр-

шыўся, калюча тапырыўся, падымаючыся кончыкамі вышэй пажухлай, абмяклай травы.

Мужчына ў кабінеце стаяў спінаю да вакна. У чорным касцюме, пры гальштуку, які разразаў белае поле кашулі. Ён павітаўся з Чуйкевічам, выйшаўшы насустрач, нячутнай цёплай рукою. Быў чысты, выпешчаны тварам, з роўненька, бы пад лінейку, падстрыжанымі валасамі на патыліцы.

— Сядайце,— раптам загаварыў па-беларуску і паказаў на крэсла каля стала, мусіць, загадзя падрыхтаванае. І сам сеў.— Як працуецца? Ямачка не ў адпачынку? — чамусьці спытаў ён. Мабыць, хацеў паказаць, што ведае рэдактара, а значыцца, чалавек ён свой, з ім можна не таіцца.

Чуйкевіч пры ўсім даверы не мог, вядома, пусціцца ў падрабязнасці, якіясьці прызнанні. Яны тут і не патрэбны, і не выключаюць небяспекі. Адно сказаў, што Ямачка толькі збіраецца ў адпачынак.

— Вы маглі б супрацоўнічаць з намі?

— З КДБ?

— Ну так,— прагугнявіў гаспадар кабінета.

— Штосьці мяне ў гэтай службе прыцягвае,— шчыра прызнаўся Чуйкевіч, усміхнуўшыся.— Мне падабаецца нябачная работа...

— Бачыце, як мы трапілі ў кропку! — лёгка адкінуў ад стала сваё тулава Іван Кірылавіч і ўзяўся аберуч за край стальніцы.— Час ад часу будзеце нас інфармаваць, як справы ў калектыве, што хто... Карацей, мы павінны валодаць сітуацыяй.— Ён падчапіў вялікімі пальцамі бэжавыя падцяжкі і выцягнуў іх з-пад пінжака.

— А вось гэта, Іван Кірылавіч, я акурат і не магу рабіць.— Чуйкевіч прыгадаў сваю працу ў «раёнцы». Тады гэтаксама кадэбіст проста на даверы, без усякіх клятваў, хацеў мець ад яго інфармацыю.

— Чаму? — Іван Кірылавіч адпусціў падцяжкі, і яны шлыкнулі пад крыссе пінжака.— Што вас бянтэжыць, Кастусь Рыгоравіч? — Упершыню ў кабінеце назваў Чуйкевіча па бацьку.— Пра вашу работу не даведаецца ніводная душа, і вы напішаце абяцанне — ні-ні...

— Я разумею... — Чуйкевіч не мог адкрыта сказаць, што ён перастане сябе паважаць, калі будзе, фактычна, даносіць, «стукаць» на сваіх таварышаў,

з якімі працуе, бывае, бярэ чарку, сядзіць на сходках.— Якія б высокія словы гэта ні былі, але я не змагу... а без гэтага не абыдзецца, нагаворваць на чалавека і глядзець яму ў вочы.

— Ёсць пытанне,— нечакана згадзіўся Іван Кірылавіч,— але гэты дыскамфорт мы кампенсіруем... і матэрыяльна, і не будзе, скажам, праблем з павышэннем, выданнем кніг і гэтак далей. Без нашага «дабро» не бывае ніводнага назначэння на больш-менш прыстойную пасаду.

— Наконт пасады я не супроць. І грошы мне не пашкодзілі б, але не за ГЭТА...— Чуйкевіч адчуў, аж да гарачыні ў шчоках, якуюсьці незразумелую віну перад гэтым выкшталцоным чалавекам у чорным касцюме. Быццам ён сваёй адмовай напляваў яму ў душу. Без віны вінаваты. Гэтае адчуванне было ўжо знаёмае яму, але такім выразным — ніколі.

— А вы падумайце, што страчваеце і што знаходзіце.— Ён відочна аддаваў перавагу таму, што Чуйкевіч знаходзіць. Але ж страчваў Чуйкевіч, як здавалася, непараўнальна большае і несуразмернае ні з чым — с у м л е н н е. Каб займацца такою дзейнасцю, факт, трэба забіваць сумленне ці, прынамсі, заганяць яго кудысьці ў цёмны, затхлы куточак. Тут жа відочная несумленнасць, хоць і ў імя нібыта сумленнай справы — патрыятычны абавязак перад радзімаю, абарона ейнай бяспекі. Хто супроць гэтага? Парадокс нейкі! Чуйкевіч адчуў, як разгубіўся, выпусціў нітку лагічнай паслядоўнасці ў сваіх доказах.

Іван Кірылавіч тым часам наступаў:

— Улічыце, што нам не проста было выйсці на вас з прапановаю, адкрываць карты. Мы спадзяваліся на ваш розум. А розум заўсёды павінен стаяць над пачуццямі. Нават у вас, пісьменнікаў. Розум — гэта быццё, а пачуцці — свядомасць. Што, паводле марксісцка-ленінскай тэорыі, першаснае? Вы ведаеце.

— Іван Кірылавіч, я і так хаджу з заняволенай душою. А тут увогуле яе трэба насіць дзесьці ў глыбокай патаемнай кішэні.

— Так, гэта наша служба.

— Але ж, на прыгоднасць да яе людзі праходзяць адбор, камісію, тэсты...

— Ну вы ж запрашаецеся не на кадравую работу,— не даваў яму апрастацца Іван Кірылавіч.

— Законы тыя ж. Я чалавек паслухмяны, а тут загадзя ведаю, што выконваць іх не змагу. Буду казаць адно і тое ж: «Усё нармальна».

Іван Кірылавіч доўга барабаніў пальцамі па стале — плямкі ад мяккіх пучак то з'яўляліся, то раставалі на лакіраванай паверхні.

— Значыцца, вы адмаўляецеся? — спытаў нарэшце, як бы застрашваючы строгасцю ў голасе.

— Так.

На вочы Івану Кірылавічу наплылі халодныя шкляныя лінзачкі.

— Улічыце, што гэтая адмова можа кепска сказацца на вас.

«Божа, і тут шантаж!..»

У такіх варунках у Чуйкевічавай душы часам уздыблівалася на безразважную круцізну далёка прыхаванае самалюбства.

— Я ведаю,— сказаў ён з падкрэсленай годнасцю.

— Даю вам два дні падумаць.— Іван Кірылавіч сфакусіраваў лінзачкі вачэй у самае сэрца Чуйкевічу.

Яны развіталіся. Больш Іван Кірылавіч на яго не выходзіў. Мусіць, далажыў вынікі гаворкі свайму начальніку, і той адмяніў далейшую апрацоўку.

Калі б тады згадзіўся, без сумнення, было б цяпер каму яго абараніць. Хуценька супакоілі б пракурораў і пракурорчыкаў.

## РАЗДЗЕЛ 6

Увечары сусед па пляцоўцы, той, з якім хадзілі неяк у «Прамень», запрасіў Чуйкевіча на баль: ягонай дачцэ стукнула васемнаццаць. Чуйкевіч доўга вагаўся, ці ісці. Няёмка адмаўляць чалавеку, супроць якога нічога не маеш.

У святліцы за сталом сядзела багата людзей. Тагосяго з іх Чуйкевіч ведаў. Адна жанчына, круглатварая, з сумнымі вачыма, была незнаёмая. Яна зусім мала піла, элегантна трымала відэлец і нож. Ейныя манеры Чуйкевічу спадабаліся. Вылучыўшы момант, ён падсеў да яе. Сусед шапнуў ёй, што ён «пясьменнік». Вымаўляў гэтае слова не без грэблівасці: працаваў у салідным апараце і казаў не раз, што там «пясьменнікаў за людзей не шчытаюць». Хто? Кіраўнік? Сярэдні персанал? Нізавы?

Жанчыну звалі Алёна. Пасля двух слоў дзеля знаёмства яна сказала, што Чуйкевіч ёй духова блізкі чалавек. Яна яму давярае і хоча паспавядацца.

З мужам яна развялася: лічыў яе дзівачкаю. (Дзівацтва ейнае было, заўважыў Чуйкевіч, у тонкай духовай арганізацыі). Жыве адна з дачкою на кватэры з агульнай кухняю. І вось нечакана на яе абвалілася гора (мусіць, Бог наўмысна іх звёў): калежанка па працы заявіла, што яна ўкрала ў той залатыя завушніцы. Паўгода ўжо яе дапытваюць, робяць вочныя стаўкі, запалохванні, пагрозы. Чуйкевічу пра гэта не трэба было расказваць, ён сам у ганебнай ролі падазронага.

— Я вас, Алёна, выдатна разумею,— сказаў ён і запрасіў яе выпіць сухога віна.

— Можа, у вас ёсць знаёмы пракурор ці суддзя? — з надзеяй гледзячы вялікімі сумнымі, як у хворага цяляці, вачыма, спытала Алёна.

— На жаль, няма. Я сам у такім становішчы...

Ён бачыў, што жанчына знясілена, прыбіта. Яна адкрытая ў сваёй безабароннасці, як закляклая восеньская лісціна. Як такую мог пакінуць муж? Мусіць, гэта разумеў і следчы. Нават ужо прапанаваў ёй: падкіньце істцу завушніцы,і канцы ў ваду. Чуйкевіч не раіў ёй гэтага рабіць:

— Невядома, як тады ўсё павернецца. Гэта яшчэ тыя кручкатворы. Зачэпяцца за факт, і пасля ўжо нічога не дакажаш.

Алёна падзякавала яму за параду, запісала на паперку нумар свайго тэлефона, каб ён не забываў яе, покуль яна выблытаецца з гэтай брыдкай гісторыі.

Чуйкевіч даўно заўважыў, што людзі хінуцца да яго, давяраюць, шукаюць падтрымку. Ён практычных захадаў ніякіх амаль не рабіў, бо не ягонае было гэта поле дзейнасці. Ён проста ўмеў быць у ролі духовага дарадчыка, ці што. Мог расставіць па палічках усе псіхалагічныя дробязі, вывесці іх з падсвядомасці. Тым самым падказваў чалавеку, што, як і дзе. Без гэтага, без усведамлення, скуль ідзе страх, чалавек не выкараскаецца з хваравітага стану, заб'е сябе псіхічна. Вялікая, можа, нават самая галоўная перамога чалавека над сабою — даць т л у м а ч э н н е сваім думкам, паводзінам, учынкам. «Чаму?» — адказаўшы на гэтае пытанне, чалавек ператорыць сваё жыццё з ня-

пэўнага, пранізанага трывогамі і страхам, у цікавае, змястоўнае, шчодрае на адкрыцці. Адказаць — значыцца выявіць свайго ворага. Выяўлены вораг — не такі небяспечны і каведны, як схаваны. Цяжар чалавечага жыцця ў тым, што палююць ворагі невядомыя, скрытныя, часам пад маскаю людзей, якім давяраеш, пра якіх кепска не думаеш. У іх прыцэл часцей трапляе чалавек, які сам не здольны ні на здраду, ні на подласць, ні на хлусню.

Самому сябе цяжка ацэньваць. І Чуйкевіч не мог цешыць сябе, што ён чысценькі ва ўсім. Але ў тым, што яго заганяюць у пастку варожыя сілы, ён не сумняваўся. Гэта не была атака за якісьці канкрэтны крок. Гэта была атака ўвогуле на яго. Можа, за мноства нейкіх правінак, якія ўжо заслугоўвалі пакарання. Можа, покуль не смерці, але пакарання.

Голас: «Няхай будзе і паходня, і любоў, і міг».

**РАЗДЗЕЛ 7**

Маці з дачкою забілі зяця. Пасеклі на кавалкі і выносілі ў чамаданах ранічкаю. Іх запыніў міліцыянер:

— Што несіцё?

— Свініну.

— Пакажыце.

Адчынілі чамадан: з яго выпала чалавечая кісць.

На судзе дакаралі сябе, што кепска ўпакавалі.

Пра гэты выпадак расказала Чуйкевічу за вячэраю жонка. Разам з плёткамі яна збірала па горадзе і канкрэтныя факты. Як у лесе збіраюць у кошык грыбы розных гатункаў: трапляюць і ядавітыя.

Сам жа Чуйкевіч уцякаў ад усякіх плётак, скандалаў і звадак, жорстка ацэньваючы гэтую сваю рысу як адзнаку бяздарнасці.

**РАЗДЗЕЛ 8**

Першы раз высыпалі з раніцы росы — матавыя, буйныя на шкле машын, на траве, на лісці, яны разлівалі ў паветры свежы, цвярозлівы халадок. Чуйкевіч, ідучы на працу ў рэдакцыю, прыгадаў прыснёнае — пра чалавека, ягоную паходку: «Адной нагой расу збівае, другою — людзей».

Думкі зіхатліва-расяным мастком перакінуліся да Веранікі. «Дарагая мая жанчына...» — ён дыхаў гэтымі словамі. Даўно з ёю не бачыліся. Заняткі ўжо скончыліся, толькі няўдачнікі даздавалі экзамены. У Чуйкевіча ў кішэні ляжала новенькае вадзіцельскае пасведчанне на права кіравання «транспартнымі сродкамі катэгорыі B». Вераніка таксама яго мела, прычым і ваджэнне здала з першага заходу. Ім было чаму парадавацца. Праўда, смуткам клалася на душу нечаканая смерць Хатаныча. Ён сканаў ад выліву крыві ў мазгі ў кабінеце за сталом. Шкада было таджыка, які памёр далёка ад роднай зямлі, і калі ягонае цела пахавалі тут, у Мінску, а ён не мае сям'і, то і не будзе каму прыйсці на магілку.

Пасля вялікіх сумневаў Чуйкевіч пазваніў Вераніцы і прызначыў спатканне. Ён не жыў і не мог жыць па законах Божых. Ён заблытаўся, праўдзівей, яго заблыталі. Ён быў грэшны, гэта разумеў і не хлусіў сам сабе. Зусім бязгрэшных вакол таксама не бачыў.

Увечары ішоў на кватэру да Веранікі без дакору, але не без трывогі: «А раптам неспадзявана заявіцца муж?» Цалкам давяраўся Вераніцы, ейнаму розуму. Яна рызыкавала больш. Калі ён прыводзіў яе да сябе, адказнасць была на ім.

Яны гадзіны дзве швэндаліся па вуліцах і нарэшце падышлі да ейнага дома. Гэта быў даўнейшы, яшчэ даваенны будынак з вузкімі высокімі вокнамі і маленькімі балкончыкамі, агароджанымі тоўстымі фігурнымі парапетамі.

У паветры разлівалася мяккая духата. На рэдзенькай ружовасці неба застылі цёмна-сінія хмары, па краях белаватыя, як абвязаныя стужкамі дыму. Сонечныя промні даходзілі толькі да ўскраіны горада і асвятлялі сонныя дахі дамоў. Ад асфальту падымаўся цяжкі, дурманлівы, як ад багуну, пах. Па газоне хадзіў адзінокі голуб, і было чуваць, як шуршэла пад ягонымі лапкамі сухая, скошаная трава.

«Гэта не лясная палянка, а горад»,— падумалася Чуйкевічу. Яму і праўда хацелася ўцячы куды-небудзь у незнаёмы пакойчык з ягонымі адметнымі пахамі, нечаканасцю выгляду сцен. Была ў Чуйкевіча такая асаблівасць — атрымліваць эстэтычную асалоду ад чужых кватэр. Кватэра — беспамылковая характарыстыка ейных гаспадароў.

Яны падняліся па шырокай лесвіцы на чацвёрты паверх. Вераніка спынілася перад масіўнымі зялёнымі дзвярыма. Гэта была ейная кватэра. Ужо ў вітальні — доўгай і шырокай — Чуйкевіч пачуў тонкі пах французскай парфумы. Здымаючы туфлі, ён бачыў сябе ў вялікае прамакутнае люстра.

— Сюды, калі ласка,— Вераніка пстрыкнула замком уваходных дзвярэй, паказала налева ў пакой.

Пад нагамі ў Чуйкевіча рыпеў качанамі капусты паркет — стары, рассохся. Рып вымушаў ставіць нагу асцярожна, быццам ён краўся. Пакой здаўся Чуйкевічу вялікаватым. За цёмна-барвовымі парцьерамі было вакно. Злева раскашавалася шырокая канапа з паднятаю спінкаю, насупроць стаяла чорнае бліскучае піяніна і падобны на мухамор чырвоны скураны пуфік на доўгай ножцы.

Чуйкевіч прысеў на канапу. Убачыў на сцяне невялікую паліцу, шчыльна застаўленую кнігамі, і карціну — якісьці старажытны замак з аблітымі золатам рэпінамі купалоў.

«Можна было б падпісаць ёй і сваю кнігу, але як паставіцца да гэтага ейны муж»,— падумаў Чуйкевіч.

— Гэта рэч, якая дапамагае мне час ад часу развейваць тугу,— Вераніка націснула на клавішу піяніна. Яна чуйна ўлавіла ці, прынамсі, наперад ведала, што найперш зацікавіць Чуйкевіча ў гэтым пакоі. А ён падумаў яшчэ і пра тое, што сваімі словамі яна апраўдвае яго прыход.

— Дапамажы тады і мне яе развеяць,— шчыра папрасіў Чуйкевіч, разумеючы, што робіць Вераніцы камплімент.

— Крыху пазней, добра? — Яна, бліснуўшы вачыма, манерна выйшла з пакоя. Ён чуў, як у вітальні суха шоргала па валасах расчоска. У яго забілася ў грудзях сэрца. Хвілі праз тры Вераніка зноў заглянула: — Прабач, што пакідаю аднаго... Тэлевізар я перацягнула ў спальню, а там такі, пардон, бардак, што мне сорамна...

І гэта ейная шчырасць, і напамін пра спальню яшчэ болей усхвалявалі Чуйкевіча. Ён сядзеў, рыхтуючы сябе да прыемных крайнасцей, уяўляючы, як будзе разгортвацца дзея. Ён быў далёка не юнак і зусім не бяскрыўднай маральнасці, і крамольныя думкі прыходзілі ў галаву міжволі. А думкі, зрэшты,

можа, і не прыходзяць, а счытваюцца свядомасцю з энергаінфармацыйнага поля.

Вераніка, ужо ў новым паветрана-лёгкім блакітным халаце, прынесла два высокія келіхі чырвонага густога віна.

— Я абяцала пачаставаць цябе добрым віном... іспанскае. Гуляем? Калі ласка.— Дала яму адзін келіх. Ён устаў. Тонка, трывожна-коратка дзынкнула шкло. Віно было вастраватае на смак, з гаркавінкаю. Адчувалася, што ў ім зусім мала цукру, адно натуральны сок.

— Боскі напой! — добра пацягнуўшы, пахваліў Чуйкевіч.

— Мужаў прэзент,— сказала Вераніка.— А ён у мяне густ мае.

Чуйкевічу не вельмі спадабалася, што Вераніка ўпамянула мужа. Але гэта лішні раз пацвярджала ейную шчырасць і дзіўную гнуткасць у дачыненнях.

Яны селі на канапу. Круглыя, з вострымі чашачкамі калені Вераніка даверліва пахіліла ў ягоны бок. Халат між гузікамі выгарбіўся, і Чуйкевіч міжволі ўбачыў у дзірку белую камбінашку і край матавай нагі. Вераніка глядзела на яго вялікімі прыцьмела-невыразнымі вачыма.

За парцьерамі гулі машыны, шумеў горад. А ў пакоі панавалі цішыня і спакой. Чуйкевіч млеў ад шчасця, прыкусваў губу, баючыся, што яна задрыжыць. І ён абрадаваўся, калі Вераніка, мусіць, адчуўшы ягоную збянтэжанасць, прапанавала:

— Я ў натхненні. Хочаш, сыграю табе?

— Буду ўдзячны,— вымавіў Чуйкевіч і чамусьці стуліў вочы. Калі расплюшчыў, Вераніка ўжо сядзела за піяніна. Грацыёзным узмахам тонкай белай рукі яна пераваліла сноп валасоў з грудзей на спіну. Кончыкі валасоў, якія падняліся, свяціліся, як напаленыя дабяла дроцікі. Экзатычны малюнак адкрыўся яму. Два аднакавыя абрысы жаночых станаў: адзін цёмны — валасы на галаве і шырока рассыпаныя па плячах, другі светлы — тонкая паясніца і плаўны крутаваты выгін клубоў. Яго ўразіла гэтае адкрыццё. І ён, здранцвелы, не з першых гукаў пачуў музыку. Ён мала цяміў у класічнай музыцы. Цяпер і яна захапіла яго. Вераніка сядзела трохі наўскасы. У ейнай паставе было штосьці магічнае. Увогуле Чуйкевічу падаба-

лася жанчына за піяніна ці раялем. Ім завалодалі чары гукаў, чуйных рук на чорна-белым полі клавішаў. Такое ўражанне, што Веранічыны пальцы ўраслі ў клавішы; што не клавішы, а самі пальцы, лёгкія, трапятлівыя, выпускаюць гукі. Ніякага напружання ў руках, толькі чараўніцтва — і танчэйшыя нюансы зліваюцца ў гукі, якія, здаецца, лунаюць, напаўняюць прастору ў пакойчыку.

Ён сачыў за Веранікаю з затоеным дыханнем. Не заўважыў, як выкаўзнуўся з рук на дыванок келіх. Натхненне было ў яе ў душы, а на твары — засяроджанасць.

«Калі ўсё на твары, мала што ў душы»,— нечакана пачуў ён Голас.

І вось ужо Чуйкевічу здаецца, што Веранічыны пальцы патанаюць у саміх гуках, лёгкае кратанне імі выбівае патрэбную мелодыю. На белых руках набрынялі, падняліся няроўныя, зломістыя жылкі. Пальцы падрыгваюць лёгка, як бы плаваюць. Засяроджанасць на твары змылася святлом адухоўленасці.

Чуйкевіч чамусьці падышоў да вакна і адсунуў парцьеру. З ваўняна-мяккага сіняга неба на захадзе глядзела барвянае вока сонца, і водбліскі ягоныя гралі на глянцавітай сцяне высокага дома насупроць.

Усё так: не на Месяцы ён, у рэальным свеце. І за піяніна не іншапланецянка, а Вераніка. На здранцвелых нагах ён наблізіўся да яе. Пяшчотна ўзяў за падбародак, правёў пальцамі па шыі, адчуўшы за аксамітнаю скураю пульсацыю крыві. Пацалаваў яе зверху ў галаву — у падняты фантанчык валасоў, скрозь які бялелася скура. Вераніка перапыніла ігру, падняла на яго глыбокія, напоўненыя агнём вочы.

— Вераніка, мілая, дзякуй...— прашаптаў ён, топячы свой позірк у гарачай глыбіні ейных вачэй.— Дзякуй...

— Табе дзякуй, што натхніў мяне,— сказала Вераніка дрыготкім голасам. І твар, і шыя ў яе былі празрыста-белыя. Яна ўстала. Узяла з піяніна келіх.

— Дзе твой?

— Ой, прабач, мог і разбіць,— спахапіўся Чуйкевіч. Падняў з падлогі келіх — на сценцы неахвотна расцякалася барвовая загуслая кропля.

— Мне не трэба шмат гаварыць, я бачу, што ты ацаніў мае сціплыя музычныя здольнасці,— сказала

Вераніка, калі яны выпілі віна.— На жаль, мой муж у гэтым сэнсе... — Яна не дагаварыла, даўшы зразумець, што мужа ейнага мала цікавіць музыка. І так яно было. Чуйкевіч не сумняваўся, хоць ведаў, што ўсе жанчыны без выключэння, якія ідуць на здраду, ганьбяць сваіх мужоў.

— У мяне паталагічная цяга да прыгажосці,— не могучы ўтаймаваць хвалявання ў грудзях, сказаў Чуйкевіч.— Я ўпіваюся ёю, чэрпаю з яе энергію. Вось ты сваёй ігрою зарадзіла мяне надоўга. Дзякуй табе!

Веранікі спадабаліся ягоныя словы. Яна міластрымана ўсміхнулася. Ад ейнай усмешкі, вільготных, у віне вуснаў, што таілі ў сабе спакусу, млявасць і знямогу, якім няма замены ў жаночай прыцягальнасці, у Чуйкевіча зашумела ў галаве. Быццам ён зайшоў у ціхі лес, а тады пацягнуў верхам свежы густы вецер. У бясцямнасці ад шчасця, парыве палкасці лёгка лопнулі путы прыстойнасці, якія аплята́лі ягоную душу. Чуйкевіч павольна прасунуў руку Веранікі за галаву, павярнуў ейны твар да сябе. Вінавата ўсміхнуўшыся, ён прыпаў да ейных вуснаў. Адразу адчуў іх вільготнае жаданае цяпло, сустрэчнае прыцягальнае пасмактванне. Яна пакорліва адкінула галаву на спінку канапы...

Цалаваліся яны доўга, з узаемным жаданнем, смялеючы, шчыра п'ючы асалоду і расслабляючыся. У экстазе пяшчотнасці ціскаў зубамі ейную шыю і адчуваў імі цвёрдыя, падатліва-пругкія храсткі. Пасля сядзелі задуменныя. Віно, музыка і ласкі развярэдзілі іхныя душы да самага споду. Гэта як мора, бывае, хвалюецца толькі верхам альбо вадою на ўсю глыбіню — тады на дне трывожыцца і ўздымаецца буза.

Вераніка, каб заліць астатнюю рэштачку сораму, прапанавала яшчэ віна. Чуйкевіч абрадаваўся. У яго перасмягла горла... Дый мала выпіў. Захмялеў ад жанчыны, але не ад віна. Зрэшты, ад такога тонкага напою яму і захмялець цяжка. Павольнымі глыткамі ён асушыў келіх і паставіў яго на лакіраваную вішнёвую бакавіну канапы.

— Як захмялею, у мяне з'яўляецца адна дзіўнасць — люблю зырыць тэлевізар,— сказала Вераніка.— Па-другое, па неасцярожнасці можам скінуць твой келіх і разбіць...— Яна ўстала, пайшла. Чуйке-

віч міжволі прыліп позіркам да белага трохкутніка трусікаў, што прасвечваўся скрозь шаўковую кісяю халата і камбінашкі.

Неўзабаве Вераніка гукнула Чуйкевіча. Ён чакаў, што яна пакліча, і быў унутрана падрыхтаваны. У спальні адну сцяну займаў тоўсты бела-фіялетавымі ўзорамі кітайскі дыван. Каля двухспальнага ложка гарэў таршэр пад жоўтым абажурам. У правым куце свяціўся экранам каляровы тэлевізар, у левым — стаяла трумо з безліччу бутэлечак, пудэлкаў і карабкоў. Вераніка сядзела на краі ложка. Адлюстровак яе Чуйкевіч убачыў у трумо. Ён спыніўся ў парозе спальні, не ведаючы, што рабіць далей.

— Сядай,— сказала Вераніка.

«А куды сядаць? — ліхаманкава закруцілася ў галаве ў Чуйкевіча думка.— Можна з гэтага краю ложка, а можна з таго, дзе Вераніка...» Ён ведаў, што нахабства не ягоная зброя. Вераніка тут жа адвернецца ад яго, калі заўважыць у ім хоць драбнютку жлобства. Але не мог жа ён здавацца і бязглуздым, няўмелым блазанам. Жанчыне падабаецца, калі яна адчувае, што яе жадаюць. Чуйкевіч не хаваў, што жадае Вераніку, што яму з ёю прыемна, нават ганарова быць. І ён упэўнена пайшоў да яе і сеў побач. Яму здалося, што яна ледзь-ледзь пахінулася да яго. Правай рукою ён абняў яе спераду за паясніцу, левай ззаду за шыю. Пахіліў яе на ложак лёгенькім высілкам, але адчуў ейную непадатлівасць.

— Пры ўключаным тэлевізары не магу нават з мужам...— сказала яна нейк у нос, з млявасцю.

Ён прыўстаў і дацягнуўся ўказальным пальцам да кнопкі выключальніка. Экран патух, яшчэ якісьці час матава святлеў у прыцемку.

— А таршэр? — спытаў ён, нецярпліва блытаючы пальцы ў ейных валасах за спінаю.

Яна паймала левай рукою драўляны шарык і тузанула яго ўніз. Чуйкевіч знайшоў ейныя вусны сваімі. Падаў Вераніку ўпоперак ложка, і пасцель пад імі глыбока асела. Ён нацягнуў паверх коўдру: любіў інтым пад накрыццём. Цяпер ён адчуваў яе ўсю, млявую, адданую, даверлівую. Ягоная рука слізганула па ейнай гладкай назе, затрымалася; ён падшчаміў пальцы пад ейнае цяжкаватае сцягно. Яна закінула абедзве рукі яму за шыю. Так цалавацца было прыем-

на. Пальцамі, адчувальнымі, як індыкатар, ён знаходзіў эратычныя кропкі на ейным целе, і яна ўздрыгвала пры кожным дотыку. У якісьці момант ён адчуў, што Вераніка лёгенька патузваецца целам. З-пад сцягна ён перавёў руку бліжэй да жывата, зачапіўся за карункавы беражок, натрапіў на спружыністы пагорачак на трусіках — Вераніка паварушылася, і рука ягоная сама апусцілася на цёплую, бы адпараную прасам, мясцінку.

Адкінуўшы коўдру, ён аддаляўся ад яе на даўжыню сваіх рук і разглядаў з дзіваваннем прыгожае жаночае цела ў матава-цьмяным прысмерку вакна. Дзягцярна-чорныя валасы ад галавы і да самых клубоў узмацнялі кантраст, вычэрчвалі зваблівыя абрысы Веранічынай фігуры. Любавацца хараством чужой жанчыны — гэта эстэтыка альбо пошласць і цынізм, думаў Чуйкевіч. Ён, канечне, не меў наўвеце інстынкт, фізіялогію, безадказную распусту, прастытуцыю.

Чуйкевіч вельмі рана адкрыў у сабе гэтую замілаванасць ад прыгажосці жаночага цела, грудзей, ліній рук, частак нагі.

## РАЗДЗЕЛ 9

Гэта была таямніца — незразумелая, неадчувальная, якая можа быць адно ў маленстве, калі толькі задумваешся — «чаму»? — але не шукаеш, дзеля чаго і спатрэбіцца разгадка яе табе. У маленстве мы спазнаем свет, каб прыняць яго такім, які ён ёсць, каб в е д а ц ь, што ён ёсць. Дарослыя, мы імкнёмся яго пераўтварыць на карысць сабе, прыстасавацца да яго, бо ўжо зразумелі, колькі небяспек у ім.

Гэта — была таямніца прыгажосці, яна хвалявала, у яе арэоле было добра летуценіць. За перамогу ў конкурсе малюнкаў Кастусю рэдакцыя газеты «Піянер Беларусі» прыслала альбом рэпрадукцый эрмітажаўскіх карцін. Ён часта гартаў яго, падоўгу разглядаў «Данаю» Тыцыяна і «Данаю» Рэмбранта, «Саюз Зямлі і Вады» Рубенса і «Юдзіф» Джарджоне... Яму не зразумела было, чаму жанчыны на карцінах голыя, з адкрытымі грудзямі, тады як у жыцці яны хаваюць сваё цела. І разам з тым ён адчуваў, што гэта не той выпадак, калі трэба саромецца і таемна падглядваць. А ў сапраўднасці — тое самае? Каб уведаць, яны

і рызыкнулі з сябруком Жэнькам пайсці на «злачынства»: паназіраць праз вакенца лазні за дарослымі дзяўчатамі. Неадольна цягнула на свае вочы пабачыць жывое жаночае цела, параўнаць з тым, што на карцінах.

Лазня стаяла воддаль ад хаты, пад дзвюма высокімі грушамі-дзічкамі. Яны папаўзлі паўз частакол, уціскаючыся ў цёплую пыльную мяжу. Іх прыкрывала з вуліцы густая броўка пырніку, які заўсёды расце і не выкошваецца каля загарод. Пад каленьмі хрупалі прыкра, бы слімакі, ігрушкі-паданікі. Не падымаючы галоў, затаілі дыханне каля лазні.

Вакенца было маленькае, на адно бервяно, застаўлена шклом, праз дзіркі струменіла пара. Яна, сцены і зямля здаваліся цёплымі. А можа, яны, хлопцы, успацелыя ад хвалявання, страху і ўзбуджанасці, грэлі іх?

У лазні гаманілі дзяўчаты-нявесты (хлопцы прасачылі, калі яны пайшлі ў лазню). Чуваць было, як лілася вада, чвахаў венік... Смех... Віск... Напоўненыя радасцю войканні і ўсхліпы... Кастусю здавалася, іх не ўбачаць, а пачуюць — так брахалі ў грудзях сэрцы, бы каменні ў сцяну, калі яны прытуліліся, цягнучы галовы да вакенца. Шкло было запацелае, у лазні стаяла пара — і голыя целы плавалі ў ёй невыразнымі плямамі. Каб разглядзець, трэба было добра-такі паўзірацца ў прамытыя кроплямі шнары на запацелым шкле, але гэта пагражала выкрыццём, і тады... сораму не абярэшся.

Кастусь імгненна скеміў: адламаў ад грушы густую галінку і, схаваўшы ў ёй твар, наблізіўся да вакенца. З лазні на галінку не звернеш увагі, не тое што на чалавечы твар. Кастуся ўразіла, што ён убачыў (і даў паглядзець Жэньку). Асабліва востра кінулася ў вочы: цёмныя кружочкі ўнізе жывата і вялікія, ядраныя, бы маладыя гарбузкі-даўгулькі, бліскучыя грудзі... Выбух у свядомасці! Ён далучыўся як бы да якогасьці, самага вялікага на зямлі, таінства, але пасля нейкі час не мог прыгадваць без дрыжыкаў гэты свой учынак. Чаму не перамог сябе і што яго штурхала?

У альбоме, па сутнасці, ён наглядаў за тым жа самым — голым жаночым целам, з тым жа кружочкам цею ўнізе жывата і вялікімі грудзямі з ружовымі, як

маліны, саскамі. Толькі нішто яго не засмучала. Сэрца таксама білася, але не ад таго, што ён чымсьці рызыкаваў, а ад далучэння да НОВАГА СВЕТУ, неадольнай магіі фарбаў, тонаў, праменьчыкаў. Ён захапляўся не дэталямі паасобку ці ў цэлым, а сутнасцю ўсяго, што было закладзена ў карціне, што праменілася ў ягонае сэрца праз вочы. І душа ягоная напаўнялася якімсьці НОВЫМ чыстым пачуццём і зместам, незалежна ад жаданняў. Яму хацелася быць добрым, шчымліва-пяшчотным, спагадлівым... Гэтае ўздзеянне мёртвага ліста паперы, няхай сабе і размаляванага тонкаю рукою мастака, не магло не ўражваць, здзіўляць, вярэдзіць і кроіць душу, выварочваць яе на той спод, які быў яму нязведаны. Ён адразу станавіўся іншым, багацейшым, ці што, але невядома покуль — ЧЫМ багацейшы: яго не можна было ні палічыць, ні памацаць, ні пакаштаваць, як салодкі пернік альбо цукерку-падушачку. Так дзейнічала на яго Прыгажосць. І ён яшчэ не ўсведамляў, што ў ім, безглуздым блазане, прачынаўся ўжо мастак.

## РАЗДЗЕЛ 10

І ўсё-такі мастацтва прыроды, думаў Чуйкевіч, вышэйшае за чалавечыя вымудры, яно створанае самім Богам. Можа, чалавек са сваім эгаістычным складам натуры наўмысна ў суперніцтве з прыродаю навыдумляў законаў абмежавання. Бяроза ў лесе, жаваранак ў небе, рамонак пры згвалтаванай тэхнікаю дарозе — таксама не належаць чалавеку, але ён з асалодаю сузірае іх. Яму ніхто не забараняе гэтага рабіць. Чаму на жаночую прыгажосць, гэтак жа створаную Богам, накладзена вета забабонаў і прымхаў?

Чуйкевіч не разумеў гэтага, не мог апраўдаць ніякай мараллю. Тое, што нясе дабро, не павінна забараняцца. Дабро забараніць прасцей, чым зло. І пад маркаю, што трэба ў грамадстве штосьці забараняць, забараняецца зусім не тое. А зло, наадварот, часта пераводзіцца ў з'яву дабрадзейнасці і нават прэстыжу. Асабліва цяпер. Іначай скуль у свеце так багата зла і зусім мала дабра?

Праўда, апошнім часам пачалі з'яўляцца гурты натурыстаў, якія зусім голыя — жанчыны, мужчыны і дзеці — загараюць на пляжах, мыюцца ў лазнях,

купаюцца ў басейнах. Якой бы дзікасцю гэта ні здавалася, Чуйкевіч яе прымаў як НАБЛІЖЭННЕ да прыроды. Сваімі думкамі Чуйкевіч падзяліўся з Веранікаю, ужо лежачы з ёю пад коўдраю і вяла трымаючы на ейных грудзях руку. Пасля блізкасці, да якой, здаецца, чалавек скіроўвае ўсе свае намаганні, Чуйкевіч любіў казаць, часта жонцы: «А цяпер вось пачынаецца жыццё». Так, жыццё, нецікавае, голае, прагматычнае. І калі трэба вырашыць якуюсьці практычную справу, яе трэба абдумваць пасля блізкасці. Менавіта ў гэты кароткі прамежак, калі аслаблена ці зусім адсутнічае юрлівая цяга, якая непрыметна карэкціруе ўчынкі, думкі і паводзіны чалавека.

Вераніка прамаўчала. Яна, мусіць, не ўцяміла да канца, што хацеў сказаць Чуйкевіч. А хутчэй няўважліва яго слухала. І Чуйкевіч спачуваў ёй. Што праўда, то праўда: ёй было над чым задумацца. Яна — жанчына, з яе ўсё пачынаецца: і жыццё чалавека, і ягоныя заганы. У ёй прыродаю закадавана мэта — спакушаць.

Вераніка не хацела Чуйкевіча адпускаць, а ён не хацеў яе пакідаць. «А вось муж дарэмна пакідае надоўга такую тэмпераментную, адухоўленую жанчыну»,— падумаў ён, мілуючы ейнае цела ў чарговы раз і дзівячыся са сваёй неўтаймоўнай, проста падазронай пажаднасці.

У сексе з каханкаю мужчына знаходзіць тую звышасалоду, якой ніколі, ні пры якіх варунках не бывае з жонкаю.

Выбраўся ад Веранікі запозна. Людзей не было відаць. Толькі рэдкія палахлівыя таксоўкі ды машыны. Неба над горадам было высокае, чыстай густой сіні, на якой, быццам крышталіны, блішчэлі зоркі. Насустрач іхнаму святлу ішло з зямлі слабое святло зажураных ліхтароў. Лісце на каштанах узбоч Нямігі знізу было чорнае, а зверху жаўтаватае, акурат прыпудранае кветкавым пылком. Дыхнуў нечакана чэрствым парывам вецер — і жоўтыя чарапкі саспелых каштаноў градам пасыпаліся на асфальт. Стукаючыся, разбівалі свой яшчэ на дрэве трэснуты калючаваласы панцыр і, бліскучыя, гладкія, рассыпаліся па тратуары.

На што яшчэ мець увагу, ідучы па сонным, начным горадзе, Чуйкевіч не ведаў. Не хацелася, вядома,

сустрэцца з якой-небудзь хеўраю бандзюкоў ці выпівох. Хоць за спазнаную насалоду ён гатовы быў заплаціць і жыццём. У кожным разе, яму думалася: Вераніка — тая жанчына, якая проста неабходна пісьменніку, каб не даць знікнуць памяці аб ім так хутка, як гэта бывае пасля смерці з людзьмі, што нікому не патрэбныя. Наіўна спадзявацца, што ты патрэбны цяперашняму грамадству. Толькі патрэбнасць твая, тваіх спраў канкрэтным людзям, лепш за ўсё жанчыне, робіць цябе патрэбным грамадству.

Ён ішоў па вуліцы, не спыняючыся на прыпынках. Наўрад ці затрымаўся дзесьці на маршруце які-небудзь тралейбус. А можа, было б зусім не кепска, каб праз усю ноч хадзілі хоць нешматлікія тралейбусы і аўтобусы. Дзеля такіх паўночнікаў, як ён. Міжволі, як бы не па заказу, гучала ў душы:

Музыка на-а-а-ас связала,
Тайною на-а-а-шей стала,
Всем уговорам твержу я вослед:
Нас не разлучат — нет!

Беларускіх песень пра каханне ён не ведаў: іх, сучасных, проста не было.

Ён быў шчаслівы. Упершыню. І, можа, апошні раз.

Раптам уперадзе забліскаў ярка-блакітны маячок. Неслася «хуткая дапамога»: ці спяшалася да хворага, ці ўжо везла яго ў бальніцу. Хваля прыемнасці калыхнула Чуйкевічу радаснае сэрца: не ўсё безнадзейна ў жыцці, ёсць каму ратаваць чалавека.

І тут — скульсьці з дзюркі ў святочна пафарбаваным плоце выскачыла калматая перапялясая балонка. Віляючы нізенька хвастом, бы падмятала, пакацілася поперак шашы, проста пад колы «хуткай».

«Куды яна!..» — кінуўся да яе, але было позна.

Чуйкевіч пачуў стук з хрустам касцей. Балонка засталася ляжаць на шашы калматай горбачкаю, бы кавалак дзёрну. З гэтай горбачкі праз секунду паднялася валасатая галоўка і заскавытала жаласна, як дзіця. Чуйкевіч ад нечаканасці разгубіўся. Балонка прасіла дапамогі, пакутуючы ў смяротнай агоніі.

Чуйкевіч выбег на сярэдзіну шашы, зграб аберуч балонку, адчуўшы, што яна цёплая, як не гарачая. Вынес яе на тратуар і палажыў у траву пад плот.

Да самага дома Чуйкевіч думаў, што будзе з гэтай балонкаю: падбярэ хто-кольвечы ці яна сканае ад болю. А хутчэй ужо сканала...

Жонка яго не чакала. Як і ён яе ніколі не чакаў, калі яна запазнялася. Яшчэ не хапала па-дурному траціць сілы на падазронасць, быццам хтосьці некаму належыць, як асабістая рэч. Дзверы імі абаімі пакідаліся незамкнёнымі, каб не было лішняга шуму. Толькі апошнім часам іх не замыкаць было вялікай рызыкаю.

Зайшоўшы ў кватэру, Чуйкевіч не ўключыў у вітальні святла — праз шкляныя дзверы яно падала ў пакой, дзе спала жонка. Запаліў на кухні і сам туды праслізнуў. У слупку-шафцы за вэрхалам часопісаў, сшыткаў, цэлафанавых мяшэчкаў, пустых бляшанак з-пад бразільскай кавы даўно кісла пляшка гарэлкі. Ён ужо вывучыў сябе, свой арганізм і ведаў, што, узбуджаны, напоўнены эмоцыямі, не зможа заснуць. Пагасіць усё, радасць кахання, боль за сабачку, адрынуць, расслабіць яго мог грам алкаголю.

Ножыкам ён надрэзаў жоўтую шапачку на пляшцы, сарваў яе. Наліў у чарку — па перыметры сценкі сабраліся ртутна-сіняватыя шарыкі бурбалачак. Ён тонка адчуваў тую дозу, якая патрэбна для сну. Узяўшы яе, кусаў яблык, глядзеўся ў люстэрка на стале: зусім не брыдкі на фэйс — прадаўгаваты падбародак, сінія азёрцы вачэй, прамы нос з крутым выразам крылаў. Не дакараў сябе, бо кантраляваў, адчуваў уладу над сваімі ўчынкамі, з празмерным смакам іх аналізаваў.

Выключыўшы святло, пайшоў, мацаючы рукою сцяну, у свой пакойчык. Мармытаў сабе пад нос: «Чалавек без вачэй — яшчэ чалавек... Чалавек без слыху — яшчэ чалавек... І без рук ды без ног чалавек — чалавек... Чалавека няма без душы!» А можа, толькі паўтараў, што пасылалася з неба яму ў мазгі?

## РАЗДЗЕЛ 11

...Кастусёк прыўзняўся з сядзення на дыбачкі. Убачыў высозныя белыя трубы, якія чадзілі густым і жоўтым, бы воўна, дымам. Дзіўна, што дым жоўты. І воблакі на небе былі якіясьці жаўтавата-зеленаватыя, быццам іх падмаляваў дым. Кастусёк заглядзеўся на трубы з дымам і на воблакі... Раптам уявіў сябе ў горадзе. Як на шашы сосны, так тут пасунуліся на яго высокія шматпавярховыя дамы... І яму стала боязна: а раптам гэтыя каменныя глыбы рухнуць на машыну і заваляць іх.

«Бойся замкнутай прасторы»,— зноў прагучала яму ў вушах (Голас). Міжволі ён уціснуўся ў мяккае цыратовае сядзенне і, бы зацкаваны звярок, лыпаў сінімі вачанятамі на вокны. Маці, адчуўшы ягоную разгубленасць, пагладзіла яго па галаве. Ёй хацелася чымсьці яго зацікавіць, развеяць трывогу, якую прачытала ў сына на твары. Яна, застаўшыся без мужа гадаваць дваіх дзяцей, навучылася хваравіта-абвострана адчуваць іхныя страхі.

— Глянь вунека,— торкнула яна пальцам кудысьці ўгору, і Кастусёк зразумеў, што трэба паглядзець налева.

Насупраць прыгожага светлага будынка з белымі калонамі высіліся дзве шэра-сталёвыя постаці ў поўны рост. Адну, з выпрастанай, бы меч, рукою, Кастусёк пазнаў. Гэта быў Ленін. Бачыў яго ў «Буквары». Другая — вусаты дзядзька з зачасанымі ўверх валасамі — была незнаёмая.

— А гэта хто? — спытаў Кастусёк.

— Сталін,— у адзін голас адказалі маці і шафёр, здагадаўшыся, што Кастусёк не ведае менавіта яго.

— А-а-а... — працягнуў Кастусёк, быццам яму нагадалі пра тое, што ведаў, ды забыўся.

— Царом пасля Леніна быў у нас,— даходліва растлумачыла маці.

— Вам куды ехаць? — спытаў шафёр так не да месца, што Кастусёк ажно зморшчыўся: не даў маці расказаць пра вусатага дзядзьку.

— Да чыгуначнага вакзала...— Маці закапошкалася, шукаючы ў кофце грошы.

— Па дарозе. Я на цэментны завод,— сказаў шафёр і прыгнуў сваю доўгую, як у бусла, шыю. Зыркаў то на правы, то на левы бок. Міма туды-сюды снавалі машыны, трактары, матацыклы.

«Вось дзе нумароў назапісваў бы»,— падумаў Кастусёк, шкадуючы, што не ўзяў з сабою выразаны са сшытка блакноцік, куды без патрэбы, проста так запісваў нумары машын, якія праязджалі па іхнай вёсцы ці якіх бачыў на шашы.

Зрабіўшы паварот, шафёр спыніў «МАЗ». Маці суванула яму ў далонь некалькі медзякоў, але ён вярнуў іх:

— Няхай маломy будзе на марожанае.

— Ну, спасібка вам!.. — Маці абцягнула кофту, спадніцу, узяла Кастуська за руку.

Раўлі, ажно заканапачвала вушы, паравозы. Чорныя, дымныя, замазучаныя, як чэрці, грукаталі па рэйках. Кастуську здавалася, зараз расколецца зямля і яны палятуць у глыбозную прорву. Схаладнелай далонькаю ён мацней сціскаў патрэсканыя мацерыны пальцы. А калі падышлі блізка да рэек, маці сама дужа сцяла ягоную руку.

— На рэйкі не станавіся,— папярэдзіла маці і пераступіла рэйку, ставячы нагу не наском уперад, а бокам. Гэтак жа пераступаў рэйкі і Кастусёк. Рэек было шмат, зверху адпаліраваныя — белыя, па краях фіялетавыя паскі. Смярдзючай гарачынёю патыхалі ў твар чорныя шпалы.

— Шыбчэй, шыбчэй!..— патузвала за руку маці.

Ззаду іх пасвіствала дзіўная, падобная на катэр платформа.

— Дрызіна,— сказала запыханым голасам маці.

«Гэта дрызіна такая»,— грэбліва скрывіўся Кастусёк. Ён чуў не раз: на дрызіне ездзіць дзядзька Коля.

— А вунь і яйкабаза,— паказала маці на прыземістую,доўгую, як гумно, будыніну, каля якой віднеліся горы скрынь.— Там цётка Дарка працуе.

Непадалёку ад яйкабазы цётка Дарка і жыла. Хата ейная падобна на вясковую, толькі шыферам крытая і ашаляваная пафарбаванай дошчачкаю. Каля ганка, іх убачыўшы, забрахаў і закідаўся на ланцугу рабы даўганогі сабака. Шчэрыў іклы і драў лапамі бетонку. Кастусёк заўважыў, што кіпці ў яго сточаныя, быццам іх адшчыкнулі абцугамі.

Яны стаялі, баючыся падысці да дзвярэй, хоць сабака, як ні напінаў ланцуг, да іх не даставаў.

Раптам на ганак выскачыў Глебачка. Не зачыніўшы дзвярэй, кінуўся да іх. Ён пакруглеў з твару, пачысцеў. Быў роўна пастрыжаны нагала машынкаю, не тое што Кастусёк — нажніцамі, баразнамі, «пад авечачку». Кастусёк адразу пазайздросціў брату.

— Ведаеш, што ў мяне? — спытаў Глебачка.

— Не-а...

— Хадзем пакажу! Хадзем, мама, у хату...— Глебачка, стаўшы пасярод маці і Кастуська, узяў абаіх за рукі.— Шарык, марш у будку! — тупнуў, як дарослы, нагою на сабаку.

Усё ў хаце было незвычайнае: печ, абкладзеная з бакоў белай кафляю, скураная канапа з тоўстымі, як бярвенні, валікамі па краях, круглы стол пасярод

святліцы, жалезныя ложкі з бліскучымі пупсікамі, шкляныя шафкі, доўгія, аж да падлогі, парцьеры на вокнах, варсістыя дыванкі на падлозе. А колькі ўсякай драбязы! Гліняны леў з вузенькай шчылінаю на спіне — скарбонка; шкляная рыбіна, стоячы на хвасце, разявіла рот; з вузкагорлага гіпсавага збанка тырчаць пластмасавыя чырвоныя галоўкі цюльпанаў і белыя зубчыкі рамонкаў; каля вялізнага люстра на століку, засцеленым карункавай сурвэткаю, стаіць аблепленая ружовымі ракавінкамі шкатулка...

Вочы ў Кастуська разбягаліся. Боязна было ступіць, і ён хінуўся плечуком да коўзкай бакавіны печы. Яго ўзяла за руку цётка Дарка, цягнула да сябе, каб пацалаваць, але ён упіраўся.

— Вось што ў мяне! — Глебачка трымаў у руках чырвоны кардонны карабок.— Адгадай, што тут?

— Цукеркі,— буркнуў насуплены, як сыч, Кастусёк.

Глебачка падняў вечка з дзірачкаю сéрад, і ў Кастуська палезлі на лоб вочы. У карабку, абкладзеным ватаю, сядзела вавёрка. Звычайная жывая вавёрка. Гарэлі чорныя пацеркі ейных вачэй, і варушылася рудаватая вільготная мызка.

Вавёрка вышмыгнула з карабка на канапу. Драпаючы кіпцюрыкамі, скочыла на парцьеру. Імгненне — і яна апынулася пад самай столлю.

Кастусёк з захапленнем глядзеў на звярка.

— Яна ручная?

— Так.

— З цырка?

— Ды не! Ты што? — засмяяўся Глебачка.— Адны тут... цёткі Даркі хрэсніцы мне падаравалі.

— А як яе лавіць?

— Пагойсае і сама залазіць у карабок,— сказаў Глебачка.— Пойдзем у склад.

Кастусёк пайшоў за братам.

У складзе, збудаваным са шпал, было цёмна. Глебачка пстрыкнуў выключальнікам — пад столлю загарэлася лямпачка. Кастусёк зажмурыўся, бы ад сонца. Калі вочы асвоіліся, убачыў вакол сябе мноства паліц, на якіх стаялі бляшанкі з фарбаю, маленькія і вялікія бутлі, ляжалі на замасленых анучах ключы, адвёрткі, абцугі, пласкагубцы, маткі каляровага дроту і ўсякая іншая зялезная драбяза. У куце ў адшаляваным адсеку блішчэла гара каменнага вугалю.

— Вось якое багацце! — не мог стрымацца Кастусёк.— Нам бы столькі інструментаў.

— Мне дзядзька Коля абяцаў даць пласкагубцы,— пахваліўся Глебачка. Ён узяў з паліцы пласкагубцы з сінімі пластамасавымі ручкамі, пакляцаў імі. Знайшоў у сцяне цвік і, пацэліўшы ў канаўку на верхнім зубцы, перашчыкнуў яго, бы запалку.

Як мышы, Глебачка і Кастусёк пачалі шныпарыць па паліцах, у скрыначках і карабках.

Для Кастуська гэта быў зусім ІНШЫ, чым ён прывык, свет.

А ў святліцы тым часам вялі гутарку сёстры. Дарка, высокая, дужая ў стане, белатварая, з залатою фіксаю ў роце, распытвала Марусю:

— Як там мама?

— Нічога... І ў ягады, і па грыбы бегае. Заўсёды першая ўведае. Разы два ўжо сходзіць, набярэ, тады іншыя празнаюць.— Маруся сядзела на краі канапы, зложыўшы ў падоле між калень рукі. Яна была як бы вінаватая — за тое, што згадзілася выйсці за Рыгора замуж. А напраўду — загнаная жыццём маладая кабета, неймаверна цярплівая і ўпартая.

— Ад Рыгора нічога не чутно? — Дарка апусціла вочы — на маршчыністых павеках былі відаць тонкія набрынялыя ліловыя жылкі.

— Піша... Пісаў, што хутка дазволяць вярнуцца...— Маруся ўсхліпнула. І цяжка адной, і кахала яна Рыгора, лавеласа гэтага чортава. Сумна без яго-ных рук ейнаму ненатоленаму мужчынскімі ласкамі целу, мякчэе яно, рассыпаецца...

— Няўжо і праўда, што Міхалка на яго накляпаў?

— Ну канечне! — упэўнена выдыхнула Маруся.— Ён жа ледзь што: вы кроў нашу пілі! Цяпер наш час! А то ўсё было, што Рыгора Рыгорам Арцёмавічам завуць, а яго Проччымам. Як ета так: у мяне і сена ёсць, і дровы, і лазня — і ўсё роўна Проччым ды Проччым...

— А Зойка што, маўчыць?

— Ці ён з ёю раіцца! Усё ў грудзі б'е: «Я член парціі! Во ён, во!» — тыцкае пальцам у кішэнь, дзе парцейны білет носіць. Бегаў у райком, казалі... Крычаў там: мала, мала гэтага Чуйкевіча ў Сібіры патрымалі... як і раней, ва ўсім парцію вінаваціць. Ну, прыйшлі цёмначы, сказалі: збірайся, спецпасяленец. Дзяцей выпудзілі, каб іх пранцы!

— Ну яго ж не ў турму?

— Не. Так толькі, на ізаляцыю... А там хто іх ведае!

— Пакінь і Кастуська ў мяне на лета...— Дарка спачувальна глядзіць на сястру: «Чаму яна такая нешчаслівая?»

— Ён не застанецца...— уздыхае Маруся.

## РАЗДЗЕЛ 12

Восень праяўлялася ў колерах. На Ленінскім праспекце, на градцы між дарогаю і тратуарам, стаялі светлыя, якіясьці аж празрыстыя клёнікі. Вісела ў паветры трывалая, як вычасаны лён, смуга. Белыя чайкі лянівa пазыбваліся на цёмнай, валавяна-густой вадзе.

Міма Чуйкевіча пранеслася імпартовая чырвоная «вольва» з таніраваным цёмным шклом, аблепленым жоўтымі бярозавымі лістамі. Каля імпазантнага вадзіцеля сядзела спрытная, тугацелая самадайка і лісліва-пажадліва ўсміхалася шырокім да непрыстойнасці белазубым ротам.

Увесь тыдзень толькі і была гамана, што бэнээфаўцы рыхтуюцца ўшанаваць свята «Дзяды». Па горадзе расклейваліся лістоўкі, якія заклікалі браць удзел у ім. Кадэбісты і райкамаўцы зусім раненька гойсалі па людных месцах, зрывалі гэтыя лістоўкі.

Для Чуйкевіча, калі папраўдзе, было адкрыццё — памінаць дзядоў-прадзедаў увосень, 30 кастрычніка. У іхнай вёсцы з роду такім святам была Радаўніца — у першы аўторак пасля Вялікадня, ці, як яшчэ казалі, «пасля Паскі». Тады ўсе ад мала да вяліка ішлі на могілкі. Прыязджалі нават з-за свету дзеля гэтай нагоды.

У вячэрняй газеце Чуйкевіч прачытаў пастанову Мінгарвыканкама: «Разгледжана заява старшыні Мінскага гарадскога аддзялення савецкага фонда культуры і старшыні аб'яднання маладых літаратараў Седала пісьменнікаў БССР «Тутэйшыя» аб дазволе на правядзенне 30 кастрычніка 1988 года мітынгу-рэквіема, прысвечанага памяці продкаў («Дзяды»). У сувязі з адсутнасцю ў горадзе традыцый правядзення дня памяці, а таксама ў сувязі з правядзеннем 29—30 кастрычніка ўрачыстасцей, прысвечаных 70-годдзю ўтварэння ВЛКСМ, рашэннем Мін-

гарвыканкама ў правядзенні 30 кастрычніка г. г. мітынгу-рэквіема («Дзяды») адмоўлена».

Чуйкевіча самабольш уразіў бюракратычны стыль гэтай зацемкі і смехатворная прычына, па якой чыноўнікі забаранілі свята. Чуйкевіча не дужа вабілі ўсякія мітынгі, зборышчы, сходкі. Ён не мог прывыкнуць да іх, хоць апошнім часам іх праводзілася шмат. Хадзіў адно на тыя, дзе не мог не быць. Ці то па абавязку, ці з цікаўнасці. Праз гэтую ўраўнаважанасць і абралі яго сакратаром партарганізацыі.

...На той справаздачнай сходцы прысутнічаў высокі прадстаўнік з ЦК КПБ — мажны бялявы мужчына з бліскучымі, таемна пасаджанымі пад лоб вачыма. Папярэдне ў яго з Ямачкам, мусіць, не было дамоўленасці прапаноўваць менавіта Чуйкевіча. Але пры выбарах бюро ён набраў найбольшую колькасць галасоў — толькі адзін «супроць». А вось гэтую ўмову босы ці не абгаварылі: калі нашай кандыдатуры (а яна, без сумнення, была) накідаюць багата чорных шароў, няхай сакратаром будзе той, каму больш давяраюць камуністы. Цяпер ужо не трымаліся жалезнага правіла: праводзіць толькі КАНКРЭТНУЮ кандыдатуру. Нават партыйцы гулялі ў дэмакратыю, аддаючы правы калектывам. Калі ў рэдактаравым кабінеце засталося партбюро, каб абраць сакратара, высокі прадстаўнік, зусім нечакана, назваў Чуйкевіча. Ён, не апомніўшыся, тут жа ўстаў, падзякаваў за гонар і ўзяў самаадвод. Спаслаўся на вялікую нагрузку ў аддзеле і даволі турботлівыя абавязкі члена прафкама.

Высокі прадстаўнік уладным голасам, як ён гэта, казалі, асабліва ўмеў рабіць у сваім кабінеце, адхіліў Чуйкевічавы доказы: маўляў, камуністы вам давяраюць, вось і дзейнічайце. Бач, яму спатрэбіўся раптам давер камуністаў, а не ягоны: Чуйкевіч асабіста зусім не ведаў высокага прадстаўніка, як і той яго. Нават калі бралі Чуйкевіча на пасаду загадчыка аддзела часопіса, чамусьці — прэцэдэнт! — абышлося без абавязковай гутаркі-цэу ў фешэнебельным доме па вуліцы Карла Маркса. Мусіць, ягонае дасье было адносна чыстае, прынамсі, без крыміналу.

Экс-сакратар, ціхі, спакойны мужчына з гаспадарчага аддзела, перадаў Чуйкевічу ўсе партыйныя справы, ключ ад сейфа. Схадзілі ў райкам, пацвердзі-

лі гэты рытуал подпісамі. Больш за ўсё Чуйкевіч, смех сказаць, быў задаволены ключом ад сейфа, які сведчыў, што ягонай асобе даверана таямнічыя і важныя сакрэты.

Чуйкевіч, як і раней, вёў сваю лінію ў аддзеле, хоць часу ў яго зменшылася. Раз-пораз выклікалі ў райкам, якому цяпер не давалі спакойнага жыцця шматлікія грамадскія рухі і партыі, асабліва Беларускі народны фронт «Адраджэньне», і сейф ягоны не па днях, а па гадзінах цяжарыў «сакрэтамі» надзвычайнай важнасці.

За тры дні да свята «Дзяды» званок з райкама голасам інструктара-куратара Малкавай запрасіў Чуйкевіча на сустрэчу з першым сакратаром Гракавалавай. Яе Чуйкевіч ужо бачыў. Сярэдняга росту, у строгім чорным касцюме, з густой кароткай прычоскаю, хутчэй мужчынскай, чым жаночаю; і з голасам, пастаўленым гэтак, каб аддаваць загады. Зрэшты, ейная пасада толькі такіх жанчын і падпускала да сябе. На начальніцкіх крэслах УСЕ жанчыны — непрыгожыя.

Ісці ў райкам яму не хацелася. Меркаваў паглядзець па тэлевізары алімпійскія гульні з Сеула. Ды што зробіш: пайшоў. Ледзьве перастаўляў ногі, круціў па баках галавою. Пры плоце каля чорнай, аселай у зямлю хаты стаяла адзінока зусім голая, ані лісціка, рабіна, чырванела гліняна-цяжкімі гронкамі ягад. Яны віселі як упрыгожанні.

На ўваходзе ў актавую залу, як заўсёды, круцілася з агульным сшыткам у руцэ Малкава. Высокая, хударлявая, светлавалосая, з сінімі цікаўнымі, крыху насцярожанымі, як у сарокі, вачыма. Чуйкевічу не падабалася ейная мітуслівасць, а валасы, вочы, тонкія пасачкі на шырокіх вуснах нават вабілі.

Ён павітаўся з ёю. Малкава сказала, каб зайшоў да яе, узяў пастанову апошняга пленума РК КПБ.

— Зараз ці пасля сустрэчы? — спытаў ён па-беларуску. Вітанне ягонае «Добры дзень!» яе не бянтэжыла, бо такое ж ёсць і рускае.

Вочы ў Малкавай успыхнулі страхам. Яна адхіснулася ад яго, як ад пракажонага.

— Потом, потом,— замахала рукою, паказваючы, што вельмі занятая. Кудысьці пабегла па калідоры, да прыкрасці нягегла адстаўляючы ў бакі ногі.

Чуйкевіч у душы пасміхнуўся. Ён адчуваў, што

яна яго баіцца. І менавіта праз тое, што ён размаўляе па-беларуску. Відаць, яго запісалі ў нацыяналісты ці, можа, у штосьці яшчэ страшнейшае.

«Колькі ж тут вачэй сочыць за мною, калі я балакаю па-беларуску?..»

Гэтую перамену ў паводзінах інструктара Малкавай ён заўважыў крыху раней, дзесьці на пачатку верасня. Яна выклікала яго тады ўзяць якіясьці чарговыя пуставата-прэсныя паперы, якія апантана пладзілі шчыгульныя хлопчыкі ў нетрах райкамаўскіх катакомбаў. Чуйкевіч пашкрэбаўся ў кабінет. Малкавай не было. У куце за сталом сядзеў вайсковец. Непрыкметны, якісьці бескалёрны твар, сухарлявы клінок выгаленага да парэзаў скуры падбародка. Гартаў сшытую папку. Чуйкевіч спытаў, дзе Малкава.

— Она вас вызывала? — чамусьці пацікавіўся вайсковец-падпалкоўнік.

— Так.

— Должна быть.

— Добра, я пачакаю.— Чуйкевіч выруліў з кабінета. Штосьці на душы ў яго варухнулася ад гэтага ўпэўненага рускамоўнага голасу. Але на той момант ён не даў яму вялікай увагі. Да вайскоўцаў у яго была даўняя павага: ягоны брат Глеб таксама насіў афіцэрскія пагоны.

Чуйкевіч пасунуўся ў скверык, які быў акурат насупроць райкама. Сеў на лаўку, чытаў на тоўстай, бы ступа, рэкламнай тумбе афішу тэатра імя Янкі Купалы. На клёнах ужо зажаўцеліся кончыкі лісця. Колькі лістоў упала на дарожку. Дзяўчынка годзікаў трох, учапіўшыся за мацерын указальны палец, нагіналася, паднімала іх. Маці біла яе па ручцы, сварылася: «Кінь, кака!» Чуйкевічу здавалася, яна дарэмна так робіць.

Другім разам Чуйкевіч застаў у кабінеце Малкаву. І вайсковец быў там. Як і раней, корпаўся ў папцы.

— Этот товарищ из ревизионной комиссии,— паспяшалася яго адрэкамендаваць Малкава. Яна ўсучыла Чуйкевічу ёменькую, бы цаглінка, невялікага фармату светла-рудую кніжачку «ПЕРЕСТРОЙКА — ДЕЛО ВСЕХ И КАЖДОГО». Чуйкевіч кінуў спрактыкаваным вокам на яе, пагартаў. Кніжачка была ананімная. Не ўказана, хто аўтар, хто выдаў, якім накладам. Затое пытанні ў ёй былі пастаўлены канкрэтна (на рускай мове):

«Как относиться к коммунистам, участвующим в работе так называемых «неформальных» объединений?»

«Почему некоторые коммунисты выступают в печати со статьями, огульно охаивающими партию, нашу советскую действительность, искажающими нашу историю, и не несут за это никакой ответственности?»

«В каких случаях сотрудниками милиции применяется резиновая палка?»

«Почему было отказано в регистрации белорусского народного фронта?»

«Являются ли указ Президиума Верховного Совета БССР от 15 августа 1988 г. и «Положение о порядке организации и проведения собраний, митингов, уличных шествий и демонстраций» (утверждено указом ПВС БССР от 4 апреля 1988 г.) антиконституционными? Нужно ли обязательно разрешение на проведение митингов и демонстраций или же достаточно уведомления соответствующих органов?»

Такіх пытанняў і адпаведных адказаў у кніжачцы-цаглінцы было аж сто. Трэба ж было выдумаць іх. Тут, канечне, таксама патрэбны талент.

Чуйкевіч усміхнуўся:

— А што, я сваёй галавы на плячах не маю, не чытаю газет, указаў, каб разабрацца?

Малкаву перасмыкнула. Яна глянула на вайскоўца. У Чуйкевіча яшчэ з часоў раённай газеты не было адчування сваёй ніжэйшасці перад райкамаўцамі. Ім гэта дзіка не падабалася. Аднойчы сакратар па ідэалогіі так яму і рэзнула: «Чуйкевіч, не забывайце, з кім вы размаўляеце!» А сапраўды — з кім? Не напісана ж у сакратара на лобе, што гэта Богам выбраны чалавек і ён у кішэні носіць ісціну на залатым ланцужку.

— Но это же рекомендации!— акруглiла здзіўленыя вочы Малкава. У гэтай паставе неўразумення яна была па-жаночы вабная і нават спакуслівая. Аж-но ўскалыхнулася ў Чуйкевіча сэрца.

— Дык няхай аўтар паставіць сваё прозвішча, каб я ведаў, хто мне рэкамендуе і на каго спаслацца, калі мой учынак акажацца няправільным.

— Вам, Константин Григорьевич, недостаточно, где вы получили эту книгу?

Чуйкевіч адчуў, што вайсковец спружыўся, бы рысь для скачка, і толькі паказвае, што глядзіць у папку, а сам слухае іхную перапалку.

— Недастаткова,— Чуйкевіч гаварыў без злосці, нават з жартаўлівай інтанацыяй. Спрачаўся хутчэй дзеля разваг, чым дзеля прынцыпу. Гэтая кніжачка ні да чога яго не абавязвае. Прыйшоў, кінуў у сейф — няхай абрастае цвіллю. Малкава ж ягоныя словы ўспрыняла ўсур'ёз. І, падобна, бралася абараняць яго перад вайскоўцам.

— Константин Григорьевич, вы, видимо, заболели... у вас лицо воспаленное, глаза... температура, да? Идите домой...— Падводзіла так, што ў яго гарачкавае трызненне. Дзякуй, канечне. Чуйкевіч сапраўды адчуваў сябе нядужа. Смылела ў горле, заваліла нос і ад ветру запалымнелі шчокі. Калі не прыняць мераў, можа злегчы. Ды на яснасці думання покуль, здаецца, гэта не адбілася.

— Пусть, пусть говорит. Хотя меня, честно говоря, русского офицера, оскорбляет это наречие,— раптам рыпнуў голас у вайскоўца.

Чуйкевіч усё яшчэ заставаўся зняволеным у палоне даверу да гэтага вайскоўца. Падумаў, што таму, чалавеку статута, проста цікава чуць нязвыклыя, з дэсідэнцкім душком меркаванні. Прынамсі, у гасцях у брата ён адчуваў да сябе шчырую прыязнасць ягоных сяброў, асабліва ў застоллях.

І ён, натхнёны слухавою прагавітасцю вайскоўца, такаваў як цецярук. Малкава не ведала, што рабіць. Чуйкевіч тлумачыў такія ейныя паводзіны мітуслівасцю натуры. Сказаў багата пра што. І пра беларускую мову, якую занядбалі, а цяпер яшчэ дыскутуюць, ці надаваць ёй статус дзяржаўнай; і пра партыйную наменклатуру, якой разам з пасадаю даецца права на бязгрэшнасць і правільнасць; і пра тое, што не абнародаваны віноўнікі сталінскіх рэпрэсій.

Малкава ўжо не слухала яго. Адно лепятала, што ён хворы і яму трэба ў ложак. Вочы ейныя пырхалі як матылькі.

Пасля гэтага выпадку Чуйкевіч і адчуў, што адносіны Малкавай да яго з'іначыліся. Яна пачала чужацца яго. Рэдка званіла і размаўляла без ранейшай жывінкі. Яна, незамужняя, можа, нават не супроць была завесці з ім шуры-муры (вядома, калі гэта дазволена райкамаўкам). Пра тое ж, грэшны, думаў і Чуйкевіч, бачачы ў вачах у Малкавай пастаянную жаночую заклапочанасць. Вось тады ён і прыгадаў вайскоўца. Зразумеў, што гэты рускі афіцэр быў ва-

рожа настроены да беларускасці, да такіх людзей, як Чуйкевіч. Але боязі не адчуваў. Крыўдна было за сваю лапавухасць: не раскусіў адразу чалавека. Зрэшты, наіў, давер да людзей часам яму шкодзілі, ускладнялі жыццё, як у выпадку з партманетам. Ідзеш да чалавека з чыстымі намерамі, гэткага ж чакаеш і ў адказ, а папраўку на чалавечую непрыстойнасць, затоенасць не робіш. Тут і б'ецца крохкая ёлачная цацка духовага высакародства.

**РАЗДЗЕЛ 13**

Малкава пабегла ад яго ўцякаць, як ліса ад чырвонага сцяжка ці піянерскага гальштука, а Чуйкевіч пайшоў у залу. Сеў, як зазвычай, у апошніх радах. Заўзятыя камуністы па-ранейшаму лезлі ў першыя — на вочы начальству. Покуль на трыбуну выйшла Гракавалава, чытаў «Звязду».

Сакратар заклікала быць пільнымі, не пападацца на вуду экстрэмістаў, мацаваць аўтарытэт партыі... У канцы секанула важкім, бы меч, словам пра намечаны мітынг-рэквіем. Паколькі ён забаронены, то не трэба на яго ісці, «могуць быць правакацыі, сутычкі і іншыя небяспечныя эксцэсы». Пра гэта абавязкова сказаць у калектывах, а яшчэ лепш, калі ўдасца людзей запалохаць. Ад страху, як ад дзяржаўнай палітыкі, выходзіць, яшчэ не адмовіліся.

Брыдзенькае было ў Чуйкевіча адчуванне, калі ён пакідаў залу пленумаў. Быццам і ён у ганаровым пасадзе гэтай палітыкі.

У паветры пахла ўжо зімою, хоць ейных прымет было яшчэ мала. На даляглядзе тоненькай палоскаю сачылася трывожная ружовасць першых замаразкаў. Вяршкі травы каля платоў пашарэлі, скруціліся ў кольцы. Патаўсцелі галкі, збіліся ў цяснейшыя кучы. На галовах у жанчын з'явіліся кудлатыя футравыя шапкі, падобныя на гнёзды.

Чуйкевіч падумаў, што пара плашч мяняць на куртку.

Перад тым як ісці ў аддзел, Чуйкевіч заглянуу да Ямачкі. Той устаў яму насустрач, нахіліўся, левай рукою падгрэбваючы крыссе расплікнутага пінжака.

— Як справы, партайгеноссэ? — Былы цэковец, цяпер наменклатуршчык, ён сачыў, якія сігналы ідуць з партыйных органаў. Яму хацелася спакойна дачакацца пенсіі — гарантаванага кавалка хлеба.

Жыццё гэтыя шанцы з кожным днём катастрафічна змяншала, і сэрца ў Ямачкі ўсё часцей лекацела ў брыдкай трывожнасці.

Чуйкевіч не без іроніі расказаў, што пачуў у райкаме. Ямачка выклікаў кадравічку, цельпукаваценькую, як пінгвініха, жанчыну і загадаў ёй сабраць усіх на агульную сходку. Яна доўга на яго глядзела.

Сабралася на сходку меншыня супрацоўнікаў. Прысунуліся самыя цікаўныя і каторыя не спяшаліся ў сем'і. Страх ужо нікога на афіцыйныя зборышчы не заганяў. Ямачка даў слова Чуйкевічу:

— Давай, лідэр перабудовы...

Разумеючы кур'ёзнасць таго, што будзе казаць, Чуйкевіч папярэдзіў людзей аб небяспецы (яна і праўда не выключалася), якая чакае ўдзельнікаў забароненага мітынгу.

Адзін з літсупрацоўнікаў камуніст Скронь не зразумеў і з насмешкаю спытаў, ад каго чакаць небяспеку: ад міліцэйскіх дубінак ці неаперанных, юных талакоўцаў*.

Чуйкевіч, таксама не без жарту, адказаў, што кожны атрымае па заслугах. Прысутныя засмяяліся, і Чуйкевіч даў сходцы хутка сканаць. Пастановы не прымалі. Чуйкевіч часта не захоўваў фармальнасці. Праўда, насіў з гэтага ў душы дадатковы неспакой. Палова асоб у рэдакцыі — стукачы, «людзі ў пагонах», як хтосьці трапна сказаў.

Апрануўшыся, Чуйкевіч пайшоў на прыпынак тралейбуса па мосце цераз Свіслач. На чорнай вадзе малявала зігзагі пара дзікіх качак. Раз-пораз яны станавіліся на лапы на ваду і пругка махалі крыламі. Лёгкі ветрык ганяў дробную, падобную на вяроўкі, рабізну. Чырвонае лісце пад клёнам, варушачыся, прыпадымалася, бы язычкі полымя.

## РАЗДЗЕЛ 14

Раптам у пакоі пацямнела. Нахапіўся парывісты вецер, закружыў-закідаў снег, утварыўшы звар'яваную куламесу. Вецер так ірваў, што людзі, нахіляючыся і захінаючы твар, пасоўваліся павольна да слупоў і дрэў — гэтых валасоў зямлі.

---

* «Талака» — нефармальнае аб'яднанне моладзі, якое ўзяло за мэту адрадзіць нацыянальна-фальклорныя традыцыі.

Чуйкевіч стаяў суботнім днём каля вакна.

Парывы ветру пругка білі па шыбах, закручвалі ў розных напрамках снег. Нягода шалела нядоўга, хвілі тры. І — адразу стала светла-светла. Сонца молада ўзбрыкнула порсткімі промнямі на сінім, з бялёсымі воблачкамі небе.

Да зімы было яшчэ далёка.

Гідру подласці знішчыць немагчыма. Яна рэгенеруе. Ссекшы адзін адростак, ёй не нашкодзіш: вырастае другі. Зайздрасць — адзін з адросткаў. Чалавек, пазбаўлены зайздрасці, часцей за астатніх лучае пад нападкі тых, хто ёю валодае з лішкам.

Тужліва, калі не ладна ў жыцці. Не вельмі радасна і тады, калі клеіцца і ўсё спрыяе. Ахоплівае туга, што не зможаш нацешыцца шчасцем, якое прываліла. Але ўсё гэта фікцыя — шчасце.

Цішкоў ездзіў у камандзіроўку ў Літву. Расказваў пра тамашнія лозунгі і патрабаванні. Той-сёй дае гарантыю, што праз два-тры гады Літва, Латвія і Эстонія адлучацца ад Савецкага Саюза.

## РАЗДЗЕЛ 15

А гром грымнуў сярод яснага неба ў першы дзень лістапада, у аўторак.

Чуйкевічу пазваніла ўпершыню сама Гракавалава:

— Вы ведаеце, таварыш сакратар, што вашы камуністы ўдзельнічалі ў забароненым мітынгу?

Упярэдадзень ён пачуў ужо, што Скронь не толькі браў удзел у мітынгу, але і выступіў на ім. Увогуле раілася багата ўсякіх чутак і здагадак. Шчыра кажучы, Чуйкевіч і не падазраваў, што ўсё гэтак сур'ёзна. Да Маскоўскіх могілак, дзе перадусім намячаўся мітынг, удзельнікаў міліцыя не пусціла. Тады натоўп рынуў на Курапаты. Там і адбылася грандыёзная сутычка між удзельнікамі і захавальнікамі парадку. У ход пайшлі дубінкі, брандспойты, слязлівы газ пад лірычным менаваннем «Чаромха». Перапала па хрыбціне аднаму маладому таленавітаму мастаку, які нібыта сваімі магутнымі плячыма засланяў сястру Скроня. Лідэру БНФ Пазьняку пырснулі ў вочы «Чаромхаю», пасля чаго ён доўга не па сваёй ахвоце плакаў. Камусьці з аператараў пабілі кінакамеру; у другога вынялі з фотаапарата плёнку і засвяцілі.

Калі б Чуйкевіч ведаў, што так, як більярдныя

шары ад спрытнага ўдару кія, раскоцяцца падзеі, то, без сумнення, пайшоў бы на мітынг хоць бы дзеля цікавасці, паразявачыць. Зменлівым рабілася жыццё. Нязвыклым. Раску апатыі, абыякавасці, якою былі зацягнуты хмурныя душы людзей, ускалыхнулі, збэрсалі нечакана крутыя працэсы. Ад іх Чуйкевіч ніколі не стаяў убаку. Ён не мог (як і ніхто) раней тварыць гэтыя, ужо кімсьці вынашаныя ў вярхах працэсы, а толькі праводзіў у жыццё. Ціха, спакойна, не адхіляючыся ні на міліметр. Іначай чалавек партыяй-уладай міжволі адсоўваўся, як пясок ад нажа бульдозера, на ўзбочыну; пра яго забывалі, ён нікому не быў патрэбны, зводзіў сваё марненне да вузенькага інтарэсу нейк біялагічна выжыць. Партыі патрэбны былі бязмоўныя рабы — без пачуцця годнасці і ўласнасці.

Паслухаўшы выхаваўчы экспромт Гракавалавай, Чуйкевіч не без гонару сказаў, што пра Скроня ведае.

— У дзве гадзіны з рэдактарам да мяне! — загадала трубка голасам Гракавалавай.

Ямачкі ў кабінеце не было.

— Выклікалі ў ЦК,— сказала сакратарка Жанна — з далікатным тварам, абаяльная дзяўчына. Можа, з усіх жанчын рэдакцыі часопіса «Ідэі перамагаюць» яна асабліва імпанавала Чуйкевічу. Аднойчы ён нават прысніў яе. Яго ахінае неймаверная пяшчотнасць. Ён трэцца няголенай шчакою аб ейную далікатную белую скуру на шыі, грудзях. Адчувае голае цела і жаданне. Ложак. Коўдра. Але — вакол людзі. Яму сорамна, а яна як быццам не саромеецца. Лёгка горнецца да яго і дазваляе цалаваць сябе. У прадчуванні насалоды ад блізкасці, якая будзе з ёю, кружыцца галава... Ён сузірае ейныя вабныя формы. І толькі. І ўсё. І нічога не адбываецца. Ён уплываў. Несумненна, ён уплываў сваімі думкамі на сваю пачуццёвасць і пачуццёвасць тых жанчын, з якімі хацеў блізкасці. Жаданні тут жа, без прамаруджання, ажыццяўляліся ў снах, а пры сустрэчы з жанчынамі ён бачыў, што яны наэлектрызаваныя ўвагаю да яго.

Але зараз было не да пачуццёвасці.

Гадзіны праз дзве Ямачка сам запрасіў Чуйкевіча.

— Я, мілай, толькі што з ЦК...— Ён быў разгублены.— Справа сур’ёзная. Камуністаў, хто ўдзельнічаў, будуць звальняць з работы. Скронь, сабака, засвяціўся! Не паспеў аперыцца, а ўжо столькі клопату з ім.

Чуйкевіч сказаў, што іх на дзве гадзіны выклікае першы сакратар райкама. У Ямачкі выпат пакрыў лоб і скроні («з-за Скроня»).

Дарогаю развражалі, што рабіць. Ямачка даводзіў: у ЦК (як у Анатоля Кашпіроўскага) устаноўка — звальняць! Чуйкевіч не разумеў: за што. Гэта была праўда. Ён не прыкідваўся наіўным, што адмыслова ўмеў рабіць дзеля распальвання суразмоўцы. Ямачка мякчэў: самае малае — суровая вымова з занясеннем.

Сядзелі ў прымальні і чакалі запрашэння. На вакне здурнела цёрлася спінаю аб шкло чорная мясная муха.

Гракавалава патрымала іх усяго хвіль пяць. Хоць было падзякуй ёй за такую міласць. Сустрэла нахмураным тварам. Запрасіла садзіцца. На борціку пінжака ў яе блішчэў перламутрам значок дэпутата райсавета. Яна загаварыла пра адказнасць камуніста ў цяперашніх варунках.

Чуйкевіч, слухаючы ейныя развражанні, думаў: не, такія кадры за сабою народ не павядуць. Не пойдзе! Ужо не пойдзе. І раней не ішоў за кімсьці. Яго гналі перад сабою. Цяпер пастухі апынуліся спераду, дзе, зрэшты, і заўсёды сябе на словах ставілі.

Калі ўдалося ўклініцца ў размову, Чуйкевіч сказаў на вясёлай ноце, як часта рабіў менавіта ў райкамах, бо перад астатнімі начальнікамі ён адчуваў нясмеласць і скаванасць; дык вось, на вясёлай ноце сказаў, што не бачыць у Скроня «состава преступления». У чым тут зло, што ён выступіў супроць сталінізму, за адраджэнне беларускасці? Пра гэта ж цяпер гаворыць сама КПСС, ейная перадавая частка. Зразумела, багата каму з партакратаў не падабаецца ПЕРАБУДОВА. Свежы вецер ім пахне толькі навальніцаю страху, а не ачышчэння. Але не той час, калі можна чыніць над чалавекам гвалт.

— Як у мяне парторг? — з двухсэнсоваю задаволенасцю крэкнуў Ямачка. Ні пахвалы, ні асуджэння ў Гракавалавай ён не заслужыў.

— Ды ваш гэты Скронь... — Гракавалава не знаходзіла слоў.— Бэнээфавец!

Чуйкевіч адказаў: наколькі яму вядома, Скронь сябра гісторыка-асветніцкага таварыства «Мартыралог Беларусі».

— Гэта адно і тое,— сказала Гракавалава.— Ваш «Мартыралог», калі хочаце знаць, трымае сувязь з

Прыбалтыкай і пераймае іх формы барацьбы з партыяй. Там ужо створаны не толькі фронт, але й «Інтэрфронт».

Чуйкевіч адчуў, Гракавалава відочна штосьці блытае. Запісала «Інтэрфронт» у ворагі партыі, а ён жа акурат створаны з прадстаўнікоў некарэннага насельніцтва як альтэрнатыва народнаму фронту Літвы «Саюдзісу». Увогуле, напалоханая, засыпаная зверху і знізу званкамі, яна стрыножана боўталася ў бурлівым, непераадольным для яе патоку інфармацыі. Выплысці з яго яна не магла, хапалася за выратавальную саломінку, выяўляючы дзіцячую бездапаможнасць, кволасць інтэлектуальных ножак.

— Дарэчы, а што гэта за слова... мартыралог?

«Што ж нападаць на таварыства, калі не ведаеш сутнасці ягонай назвы і чым яно займаецца?» — і дзівіўся, і шкадаваў Гракавалаву Чуйкевіч.

Ямачка з радасным запалам штосьці тлумачыў ёй. Гракавалава ўвесь час патузвала ўверх борцікі пінжака, міжволі чапляючы вялікім пальцам зеленавата-перламутравы дэпутацкі значок. Як у паўліна, уставала, тапырылася высокая густая прычоска жаўтавата-сівых валасоў.

— Карацей, гэта як бы пералік усіх ахвяр сталінскага генацыду,— праясніў сэнс Чуйкевіч. Апошняе слова, здаецца, кальнула яе іголкаю.

— Звальняйце Скроня! — падвяла строгую рысу пад гутаркаю Гракавалава. Яна, відаць, была задаволеная міралюбнасцю сваіх паплечнікаў па кампартыі.

— Што будзем рабіць? — цяпер ужо спытаў Чуйкевіч, калі з Ямачкам выпнуліся на вуліцу.

Падалі рэдкія крупкі снегу, сухія, цвёрдзенькія, як пярлоўка. Скочваліся з плячэй. У ямачках (не блытаць з дзецьмі рэдактара Ямачкі) на асфальце яны бялеліся, бы шматкі чысцюткай ваты. Такога ж колеру быў твар у Ямачкі. Чуйкевіч шкадаваў і яго: навошта яму, пажылому чалавеку, гэтыя перажыванні?

— Падумаем, мілай,— адказаў Ямачка. Чуйкевіч зразумеў, што яму трэба з кімсьці параіцца, далажыць змест гутаркі ў райкаме. А можа, гэта адно здагадкі. У той дзень Чуйкевіч з Ямачкам больш не сустракаўся.

## РАЗДЗЕЛ 16

У кабінеце пацямнела, і Гракавалава ўключыла святло. Пяціражковая люстра засерабрылася глыбаю дарагога чэхаславацкага крышталю.

Гракавалава была ў разгубленасці. Што за насланнё? Скуль узялося гэтае шаленства ў галовах? Хто сумеў за кароткі час парушыць адладжаны тэлефонны механізм кіравання людзьмі? Так і да роспачы дайсці можна, а не толькі страціць уладу. Колькі гадоў, пачынаючы з пасады інструктара райкама камсамола, яна гартавала ў сабе веру ў непераможную моц партыі. Людзі, заходзячы да яе ў кабінет, ніякавелі, былі паслухмяныя, бы гліна ў дужых ганчарскіх пальцах. А цяпер што? Якіясьці гнілыя інтэлігенцікі не баяцца яе, спрачаюцца, даводзяць сваё. Ім, бачыце, волі захацелася, беларускай мовы, гістарычнай праўды... Ніхто ж і так не забараняў ім размаўляць. Партыя нават прэміі прысуджала за творы, напісаныя на г э т а й мове. Як быццам у мове справа. Нават калі ўсе да адзінага на ёй загавораць, заРЭкаюць ды заЧЭкаюць, хіба ад гэтага дадасца каўбасы ды масла на прылаўках? Смехатура!

Асабліва гэты, малады Чуйкевіч, на сценку лезе. Таксама мне знайшоўся пракурор: ён не бачыць крыміналу ў тым, што Скронь выступіў на забароненым мітынгу. Ды гэта, калі разабрацца, дзяржаўнае злачынства! І ў самога рыльца ў пушку: пракуратура занялася.

Ямачка — той мудрэйшы. Адразу відаць, што чалавек прайшоў партыйную шліфоўку. Не паддаецца часовым павевам з затхлых куточкаў усякага нацыяналізму-дурнізму. Усміхнулася: «Яшчэ адзін ІЗМ».

Гракавалава была край узбуджаная. Адчувала, што падняўся ціск. Баялася глянуць у люстэрка: твар будзе шызы, як сліва. Яна дастала з сумачкі ружаваты гузічак крыстапіну, укінула ў рот і запіла вадою з графіна. Адчыніла падвойныя дзверы ў прыёмную. Седзячы каля стала на крэсле, яе чакаў з газетаю ў руках вадзіцель Міша — малады чубаты хлопец, якога яна пераманіла вышэйшым акладам з Саюза мастакоў.

— Адвязі, Міша, мне на кватэру прадукты і можаш гадзінку-другую пазарабляць для сябе. А я сама дабяруся...

Ёй хацелася прайсціся пехам, падыхаць свежым паветрам, адчуць людскі настрой. Акурат пралапатаў дождж, і з адчыненай фортачкі цягнула прыемным скразнячком. Для яе, былой вяскаўчанкі, быў блізкі самотны восеньскі водар.

Яна ступала па тратуары малымі крокамі. Баялася пакаўзнуцца, і не так гучна цокалі абцасы італьянскіх ботаў.

Барадаты дворнік з цагляна-чырвонымі яблыкамі скул прама перад ёю змятаў рыжае мокрае лісце каштаноў. Яна разгубілася: з якога боку яго абысці? І так яны таньчылі: дворнік налева — і яна налева, дворнік направа — і яна направа...

## РАЗДЗЕЛ 17

Чуйкевічу нечакана прыснілася Галя — ягоная дзяўчына студэнцкай пары. Яна была родам са старажытнай Мсціслаўшчыны, вучылася ў Магілёве на кулінара. Але дзеля яго прыехала працаваць у Маладзечна (бліжэй да Мінска). І вось яна дома ў іх, у вёсцы. Прывезла шмат сваіх малюнкаў. Яны проста выклікаюць у Чуйкевіча захапленне нацыянальным каларытам. Як, да прыкладу, доўгі палац — руды, з разьбяным фасадам, шматлікімі ўзорамі. Драўляная цэркаўка ў засені старасвецкіх ліп. Чырвонабелы кужэльны ручнік, вышыты мулінэ, звісае з жэрдачкі і пакалыхваецца ад ветру. Якісьці экзатычны, але ўсё роўна беларускі пейзаж — возера на вялікую таемна-чорную глыбіню. Героі шматлікіх народных казак. Чуйкевіч кажа ўсім: «Сапраўдны талент!» — і да Галі: «Калі б ты вучылася не кулінарнаму майстэрству, а жывапісу, то стала б славутай мастачкаю, беларускай, самабытнай». Паказвае бацьку рукою на малюнкі. Ён чамусьці бязрадасны, а тады шэпча яму ў ціхім куточку: «Вас абаіх пасадзяць за нацыяналізм». Чуйкевіч адчувае, што не можа ажаніцца з Галяю, а яна чакае менавіта гэтага. І яму шкада яе да слёз, да спазмаў у горле, але нічога не можа з сабою зрабіць. Тады Галя апранае паліто, ідзе з хаты — і ён не паспявае яе праводзіць. Глядзіць у вакно і бачыць яе ўжо на зямлі... З вядром у руках каля яе стаіць Гракавалава ў абледзянелых бліскучых ботах. Галя не можа падняцца — коўзка. Чуйкевіч чамусьці скамянеў, а яна ўсё ляжыць і мацае пабітую нагу. Ён

жахаецца: «А калі пералом?» Падбягае. Гракавалавай ужо няма. Галя — маленькая, як авечачка. Ён стаіць якісьці час над ёю, потым бярэ і нясе на лаўку. Думае: трэба выклікаць «хуткую дапамогу» яшчэ і таму, што Галю забяруць з вачэй у бальніцу...

## РАЗДЗЕЛ 18

Назаўтра з раніцы Ямачка закамандаваў сабраць пасля абеду партбюро з парадкам дня: «Аб удзеле члена КПСС Скроня В. А. ў забароненым мітынгу, які адбыўся ў раёне Маскоўскіх могілак 30 кастрычніка 1988 года». Усе члены партбюро пра гэты факт ужо ведалі. Лішніх пытанняў Чуйкевічу не задавалі. Ва ўсіх у вачах ён чытаў насцярогу і засяроджанасць.

Засядалі ў кабінеце галоўнага рэдактара за сталом, за якім праводзіліся планёркі і рэдкалегіі. На стале быў разасланы саматканы абрус з нацыянальнымі беларускімі ўзорамі, вышытымі чырвонай ніткаю. На абрусе стаяла высокая шкляная ваза. З яе тырчаў мёртвы пластыкавы васілёк. Члены партбюро сядзелі ў зборы. Не было Скроня. Ён у сябе ў пакоі пісаў тлумачальную — пасля таго як два разы пабываў у Ямачкі. Чуйкевіч не ведаў, пра што ў іх была гамонка.

Уляцеў Скронь. Малы, худзенькі, з каратка, «пад нулёўку» падстрыжанай патыліцай, абапал якой тырчалі вялікія сакавіта-ружовыя, бы рыжыкі, вушы. Аддаў Чуйкевічу пісулю. Чуйкевіч кінуў на яе вокам:

«У партыйнае бюро рэдакцыі часопіса «Ідэі перамагаюць» ад члена КПСС Валянціна Скроня.

ТЛУМАЧЭННЕ.

Калі я пачуў, што мітынг-рэквіем «Дзяды», насуперак забароне ўладаў, усё-такі 30 кастрычніка будзе праведзены, я доўга думаў, ісці альбо не ісці. З аднаго боку, мы ўсе вымуштраваны партыяй да бязмоўнага падпарадкавання ейным рашэнням, з другога боку, памяць аб нашых прашчурах, сярод якіх шмат палегла ў зямлю ад гвалтоўнай смерці ў часы сталінскага генацыду, Вялікай Айчыннай вайны, будзіла маё сумленне.

Выступаць я перш не меў намеру. Але пасля, калі пачаліся сапраўдныя ваенныя баталіі, я ўзяў слова, каб папя-

рэдзіць магчымыя правакацыі, якія б прывялі да кровапраліцця ў раёне Маскоўскіх могілак і ўрочышча Курапаты. Я выказаў шчырую падтрымку курсу перабудовы і дэмакратызацыі, узятага лепшымі сіламі КПСС на чале з М. Гарбачовым. Лічыў, што выканаў свой патрыятычны абавязак як сябра Рады Беларускага гісторыка-асветніцкага таварыства памяці ахвяраў сталінізму. Цяпер мне кажуць, што гэта несумяшчальныя рэчы — высакародная праца ў літаратурным і грамадска-палітычным часопісе «Ідэі перамагаюць», які курыруецца ЦК, і сумніцельная дзейнасць таварыства.

У блізкім часе я зраблю свой выбар.

2 лістапада 1988 г. *В. Скронь».*

Чуйкевічу здалося, што Скронь зрабіў проста дыпламатычны ход. Можа, нават яго падказаў Ямачка. У кожным разе, і той, і другі ратаваў сябе.

Весці пратакол выбралі камуніста П.

Чуйкевіч, сказаўшы колькі слоў дзеля запеўкі, запрасіў засяроджана-напыжаных членаў бюро выказвацца. Доўгі час ніхто не асмельваўся. Усе ўтупіліся ў бліскучую паліроўку стала, разглядалі ў ёй свае твары. Ямачка круціў у руках цяжкую вазу, назіраючы, як па ейнай гарлавіне бегае былінка васілька. У вакне крыжавалася халоднае восеньскае сонца, і здавалася, што ў вазе цялёпкаецца вада. Мусіць, сапраўды не шкодзіла б паставіць графін з вадою асвяжыць горла, якое ў таго-сяго, калі не ва ўсіх, перасыхала ад хвалявання. Але нават на сходках не было завядзёнкі ставіць ваду. Творчыя людзі не хацелі лішніх атрыбутаў афіцыйнасці.

Цягам двух дзён у невыразна-мышынага колеру папку «Пасяджэнні партбюро — 1988 год» Чуйкевіч падшыў аддрукаваны на машынцы пратакол за № 3. Звільжэлая ад адказнасці рука П. занатавала трохі іншыя, непадкарэкціраваныя ПАСЛЯ меркаванні членаў партбюро, якія ніжэй зашыфраваны літарамі.

## РАЗДЗЕЛ 19

«Я»: Як вядома, аб забароне мітынгу было двойчы абвешчана ў партыйным органе гаркама партыі «Вячэрні Мінск». Нягледзячы на тое, актывісты за правядзенне гэтага мерапрыемства зрабілі ўсё неабходнае, каб мітынг адбыўся, што было расцэнена

партыйнымі і мясцовымі органамі як грубае парушэнне грамадскага парадку. Удзел у мітынгу прынялі нефармальныя арганізацыі, членамі якіх з'яўляюцца некаторыя камуністы. Самы непасрэдны ўдзел у гэтым забароненым мерапрыемстве прыняў член нашай партыйнай арганізацыі Валянцін Скронь, які выступіў з прамовай на мітынгу. На вялікі жаль, камуніст Скронь пачаў сваю дзейнасць не з таго. Варта было б звярнуць увагу тав. Скроню як маладому супрацоўніку рэдакцыі на сур'ёзнае стаўленне да сваіх творчых, працоўных абавязкаў, засяродзіцца на паляпшэнні работы па прапагандзе нашай багатай духоўнай спадчыны, рэдагаванні матэрыялаў.

«В»: Дарэчы, Валянцін Скронь у мінулы панядзелак прыняў непасрэдны ўдзел у неафіцыйным сходзе па стварэнні ў рэдакцыі часопіса ці то пярвічнай ячэйкі БНФ, ці то якойсьці іншай. Як камуніст, ён павінен быў паставіць у вядомасць партыйную арганізацыю і адміністрацыю. Мне званілі ўжо нават з КДБ, пыталіся... Што да мітынгу-рэквіема «Дзяды», то тут склалася наступная афіцыйная думка: нефармалы звярталіся ў гарвыканкам, але ім было забаронена правядзенне мітынгу. Тым не менш мітынг адбыўся. Як ён праходзіў, я не ведаю, не бачыў. Ужо вядома, што Скронь выступіў на мітынгу. Члены партыі ў несанкцыяніраваным мерапрыемстве ўдзельнічаць не павінны, як не павінны прымаць удзел у нефармальных арганізацыях.

Скронь: Ніхто ніякай таямніцы не рабіў наконт сходкі ў рэдакцыі. На сходцы было абвешчана аб стварэнні ў рэспубліцы гісторыка-асветніцкага Таварыства «Мартыралог Беларусі». Я лічу мэту гэтага Таварыства высакароднай. Ёсць дэкларацыя, у якой выказваецца падтрымка курсу на ПЕРАБУДОВУ.

«В»: Трэба, каб Скронь зачытаў прамову, з якой ён выступіў на мітынгу.

Скронь: Я рыхтаваўся загадзя да гэтага выступлення (чытае прамову).

«Я»: Прамова эмацыянальная, але навошта было збірацца, калі забаронена.

Скронь: Мяне не папярэдзілі.

«Я»: Мітынг быў забаронены. Закон ёсць закон. Яго ў прававой дзяржаве трэба выконваць.

Скронь: Калі б не пачаліся эксцэсы, я б не выступаў. Удзельнікі — моладзь. Гэта натоўп, які заўсёды

«беременный опасностью», як сказаў паэт. Трэба было штосьці рабіць. Мы былі акружаны трайным ланцугом міліцыі. Паводле слоў аднаго старшага лейтэнанта міліцыі, колькасць работнікаў органаў унутраных спраў даходзіла да дзвюх тысяч.

«Я»: Тав. Скронь парушыў заклік Рады «Мартыралога Беларусі» не выступаць, пра што, дарэчы, прасіў напярэдадні мітынгу старшыня.

Скронь: Пра гэта не ведаў.

«Я»: Падпарадкоўвацца дысцыпліне трэба. Покуль існуе партыйная дысцыпліна, трэба яе захоўваць. Факт: камуніст удзельнічаў у забароненым мітынгу.

«Т»: Мы маем справу з неардынарнай сітуацыяй. З аднаго боку — высакароднасць мэты Скроня па раскрыцці нявінна рэпрэсіраваных ахвяр сталінізму, зварот на мітынгу да памяці нашчадкаў, з другога — удзел у забароненым мітынгу, што падрывае яго аўтарытэт як камуніста і вымушае нас прыняць у адносінах да Скроня меры партыйнага ўздзеяння.

Скронь: Больш выступаць не буду.

«Я»: Цябе падштурхнулі. Мы перш за ўсё супрацоўнікі часопіса, і кожны на сваім участку можа прынесці карысці значна больш. Мы павінны даць ацэнку гэтаму факту. Факт, як казаў Ленін, рэч упартая.

«К»: Мы маем справу з парушэннем загаду мясцовых улад. Да ўсіх падобных мерапрыемстваў прымешваецца шмат людзей, якія выступаюць супроць ПЕРАБУДОВЫ.

«Б»: Я таксама лічу, што член партыі павінен прытрымлівацца партыйнай дысцыпліны і не парушаць дзеючага заканадаўства.

Скронь: Як савецкі чалавек, я быў абураны паведамленнем заходніх радыёслужбаў аб тым, што мяне арыштавалі. На самай справе я не быў арыштаваны.

«М»: Трэба прыняць да ведама заяву Скроня.

«Я»: За парушэнне загаду мясцовых улад, самавольны ўдзел у забароненым мітынгу я прапаную аб'явіць члену КПСС Скроню Валянціну вымову. Камуністу Скроню мець на ўвазе: у сувязі з неабходнасцю паляпшэння работы аддзела навукі і мастацтва галоўную ўвагу акцэнтаваць у далейшым на прафесійных абавязках.

«В»: Паколькі Скронь толькі што прыйшоў да нас,

не ведаў, што могуць быць такія вынікі яго ўдзелу ў мітынгу, а сам ён меў толькі добрыя намеры, прапаную абмежавацца абмеркаваннем і папярэджаннем.

За першую прапанову галасавалі: «Б», «М», «П», «Я» і «Т», супроць — «В».

За другую прапанову галасаваў «В», супроць — «Б», «М», «П», «Я» і «Т».

ПАСТАНАВІЛІ:

1. За парушэнне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 15 жніўня 1988 года «Аб адказнасці за парушэнне ўстаноўленага парадку арганізацыі і правядзення сходак, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый» камуністу В. Скроню аб'явіць вымову.

2. Звярнуць увагу В. Скроня на неабходнасць выканання сваіх першачарговых вытворчых абавязкаў.

*Сакратар партбюро. Роспіс.*

**РАЗДЗЕЛ 20**

Гэты арыгінал пасля той-сёй крэмзаў, змякчаў свае выпады супроць Скроня, рабіўся больш «агрэсіўным» да партыі, браўся ледзьве не заступнікам бэнээфаўцаў. Хтосьці страчыў нататку ў газету, у якой асуджаў разгон мітынгу-рэквіема «Дзяды».

Чуйкевіч разумеў, што гэта не так сабе. Мабыць, ЦК адчуў, што перабраў меру, дацяміў, што і да нефармалаў трэба ставіцца крыху памяркоўней. Але было ўжо позна. Водгалас аб падзеях 30 кастрычніка ў Мінску выплеснуўся на ўвесь свет. Ацэнку ім даў нават акадэмік Сахараў. Алесь Адамовіч назваў сталіцу Вандэяй.

А цяжэй за ўсё ў гэтых варунках было, мусіць, Чуйкевічу. Адразу ж пасля партбюро ён з Ямачкам паехаў у Дом палітасветы — мадэрновы гмах каля стадыёна «Дынама». Там спешна збіралі ідэалагічны актыў вобласці. Партыйныя функцыянеры пнуліся захоўваць эпікурэйскі спакой. Але Чуйкевіч бачыў, што п'едэстал пад імі мітынг магутна страсянуў. Вымуштраваныя хлопцы ў рабочых спяцоўках з чырвонымі банцікамі на лацканах нападалі на інтэлігенцыю, пісьменнікаў (асабліва), мастакоў, артыстаў. Яны не разумелі, што іх падставілі.

У Чуйкевіча змрочна было на душы. І сядзець было нязручна — ягоны рад крэслаў пад цяжарам

атлусцелых ідэалагічных байцоў выдраўся ножкамі з паркетнай падлогі і хіліўся ўперад, як заколаты матадорам бык. Ціснуў пад калені. Ногі ў Чуйкевіча замлелі. Нават калі б і хацеў сядзець, дык не ўседзіш.

Не чакаючы канца засядалаўкі, пагробся па насках чужых туфляў да выхаду.

На вуліцы пасля яркіх хрустальных люстраў было чорна.

Зняможаны, ён змог запісаць у дзённік толькі адну фразу: «З гэтага мітынгу пачнецца пераварот у свядомасці беларусаў».

## РАЗДЗЕЛ 21

З ДЗЁННІКА:

«Сесія Вярхоўнага Савета СССР задаволіла просьбу Андрэя Грамыкі аб вызваленні яго з пасады Старшыні ў сувязі з узростам. Адышла цэлая эпоха ў савецкай гісторыі. На ягонае месца член палітбюро Зайкоў прапанаваў Гарбачова. Паўтарылася трукацтва (іначай не назавеш) ранейшых лідэраў».

Чаму гэтак атрымліваецца? Адказ просты: не хапае законнай улады. Аднаго аўтарытэту кіраўніка партыі, аказваецца, мала. І праводзяцца фармальныя выбары... каго? Прэзідэнта краіны! Хто «за»? Мандаты ўверх — «адзінагалосна». Чуйкевіч прыгадаў, як і колькі ўжо вядзецца барацьба за прэзідэнцкае крэсла між Бушам і Дукакісам у ЗША. Там, канечне, абы-каго не выберуць. Кандыдату трэба пераканаць н а р о д, што з'явіўся сапраўдны лідэр нацыі, які будзе абараняць ейныя інтарэсы.

## РАЗДЗЕЛ 22

Прыпаўзлі ценькімі белымі нагамі сараканожак першыя замаразкі. Чуйкевіч іх любіў. Любіў ісці па сцятай марозікам траве, адчуваючы, як з пяшчотным хрустам патанаюць ногі. Стоячы на прыпынку, глыбока ўдыхаў вастраваты холад паветра. Вецер падхапіў і панёс старонку «Праўды» з партрэтам Гарбачова (Старшыні Вярхоўнага Савета СССР) — было чуваць, як яна суха шуршэла на заінелай траве.

На калідоры Чуйкевіча перастрэў Скронь. Падаў кашчавую халодную руку.

— Ты вельмі мудра зрабіў, прагаласаваўшы супроць вымовы.

Ён не тлумачыў, у чым была мудрасць. Чуйкевіч сам зразумеў. Скронь меў на розуме ход наступных падзей.

— Сходка пакажа,— сказаў Чуйкевіч. Не сумняваўся, што камуністы падтрымаюць Скроня. Цяпер лічылася за правіла не ладзіць з афіцыйнай думкаю, а пярэчыць ёй. Скронь адышоў з задаволеным тварам, выраз якога залежаў ад вушэй-лакатараў, настроеных на хвалі ўсяго свету. Чуйкевічу ён не падабаўся адным: здаецца, ці не наўмысна нарываецца на скандал, пускае кругі вакол сваёй асобы.

Чуйкевіч зайшоў да Ямачкі. Хацеў параіцца, калі праводзіць сходку. Здалося, твар у шэфа асунуўся, пад вачыма зачарнеліся падковы кругоў. Чуйкевіч яму спачуваў, ведаючы, у якіх варунках той працуе. З аднаго боку, прывязаны да наменклатуры, з другога — трэба паказваць, што не адстае ад жыцця, мае перадавыя погляды.

Сходку прызначылі на сярэдзіну лістапада.

З роўнядзі жыццё выплыла на перакаты. Перад кастрычніцкімі святамі ў райкаме зноўку сутаргава-спешна сабралі сакратароў пярвічак. Чуйкевіч ужо прыходзіў туды дзеля цікавасці ды іранічнага пакепліванне. Хоць сядзеў у зале ніжэй, чым партапаратчыкі ў прэзідыуме на сцэне, глядзеў на іх звысоку. І гэта зусім не ад высакамер'я. Ён, бадай, упершыню гэтак яскрава ўбачыў, якія перад ім дробненькія, бы неўрадлівая бульба, чалавечкі. З ягоных вачэй памалу ссунуліся шоры, а партапаратчыкі ў нязвыклых для сябе варунках высвецілі сваю бездапаможнасць.

Гракавалава, з напалоханымі вачыма, устрывожаная, паведала ім сваім загадна-грубаватым голасам, што па горадзе зноўку расклееены лістоўкі, быццам на 7 лістапада намечана «Талакою» дэманстрацыя пратэсту. І таксама недазволеная. У які ўжо раз заклікала «быць пільнымі». Не пускаць у калоны незнаёмых людзей. Яны могуць ісці пад нацыяналістычнымі бел-чырвона-белымі сцягамі, з гербам «Пагоня», несці свае — зрабіла акцэнт — лозунгі.

Чуйкевіч абурыўся. У гэтым будынку шмат крычаць пра «чужыя» лозунгі. Але ніхто не называе канкрэтна гэтыя лозунгі. Такое адчуванне, што проста баяцца называць, бо людзі ўбачаць: у гэтых ло-

зунгах нічога варожага няма, а толькі тое, што баліць кожнаму сумленнаму чалавеку, грамадзяніну, урэшце, проста беларусу. Падобна, «застойшчыкі» не думаюць здавацца і не хочуць нават прыслухоўвацца да людзей на вуліцы, мітынгах, не тое што саджаць у глебу здаровае зерне з праграм грамадскіх рухаў.

Што значыцца «мы», «нашы ідэі», «нашы газеты»? Бюракраты, ідэі таталітарызму, камуністычныя выданні? Так разумець? А калі ён, Чуйкевіч, не згодны, што беларуская мова нікому не патрэбна, што беларуская культура павінна задыхацца ў смуродзе невуцтва, нігілізму, абыякавасці? Хто тады «мы»? Ён жа — таксама «мы». І Быкаў — «мы». І Пазьняк — «мы». Ці гэта — «яны»?

Што гэта — зноў, як і ў 30-я, пошукі ворагаў?

Чуйкевіч не ўстаў і не сказаў пра гэта адно таму, што яго ўся зала асадзіла б вокрыкамі: «Нацыяналіст!», затупала б нагамі, абсвістала. А ён быў укручаны і без гэтага ў такі водаварот, што ледзьве трымаўся на паверхні. Таямнічыя званкі пачасціліся. Жонка была ўжо схільная думаць, што звоняць ягоныя каханкі.

## РАЗДЗЕЛ 23

«Штосьці прыпякае хлопцу! — ціха прамовіў Пётр Пятровіч, калі выпусціў нізенька над апаратам тэлефонную трубку.— Мы яшчэ выведзем яго на чыстую ваду. Бач, артачыцца!»

Псіхалагічна падрыхтаваўшы сябе, ён пазваніў Чуйкевічу і запрасіў яго прыйсці. Той лёгка згадзіўся: мусіць, падумаў, што атрымае ўжо адказ.

Пётр Пятровіч ледзьве пазнаў свайго «злачынцу». Асунуўся, твар белы, вочы — сінія — плаваюць у чорных вірах. Ажно схамянуўся: ці варта далей здзекавацца з чалавека? Але невядомая сіла падказала, што варта.

Пётр Пятровіч павёў гутарку здалёку: маўляў, Субач, магчыма, хворая, трэба з'ездзіць у псіханеўрадыспансер і праверыць. А потым, як бы між іншага, прызнаўся, што і яму, юрысту, творчасць не чужая. Выняў з шуфлядкі сваё апавяданне, украдліва, бы паміж імі ўжо існавала змова, падсунуў да Чуйкевіча.

— Вось, калі ласка... маё. З мяне такі грамацей...

Але кіньце вопытным вокам. Друкавацца ўсім хочацца, хто піша, а графаманам больш, чым каму...

Чуйкевіч узяў у рукі змацаваныя сашчэпкаю аркушы, паднёс блізка да вачэй. Дзесьці на палове старонкі ён спыніў чытанне. Здалося, грэбліва кінуў на стол апавяданне і сказаў з нечаканай, якойсьці хваравітай суровасцю:

— Бяздарнае, як і ваша следства!

Пётр Пятровіч ажно сцяўся. Во даў дык даў! Відочна, што хапіў праз меру малады чалавек. Забывае, з кім мае справу. Што ж, няхай крыўдуе на сябе. Праціўнік яшчэ не зломлены.

Словы Чуйкевіча так балюча сцебанулі Пятра Пятровіча па самалюбстве, што ён, застаўшыся сам-насам, зусім страціў над сабою ўладу і доўга мармытаў пад нос праклёны. Не столькі ў адрас Чуйкевіча, колькі ў свой, бо адчуваў сябе прысаромленым вучнем. Ведаў жа: не лезь не ў сваю парафію, іначай і ў сваёй будзеш страчваць з такою цяжкасцю, праз буру сумненняў набытую ўпэўненасць.

Ён цішком падышоў да дзвярэй і замкнуў іх на ключ. Выняў з сейфа бутэльку каньяку, ужо адпітую, і прыцiснуў рыльца да сухіх тонкіх губ. Калі піў, верхняя губа ўлазіла ў бутэльку як п'яўка.

## РАЗДЗЕЛ 24

Упярэдадзень сходкі Чуйкевіча выклікаў Ямачка. Твар у яго быў змарнелы. Дайшлі чуткі, быццам нефармалы збіраюцца ўнесці ў парадак дня пункт: «Стварэнне пярвічнай арганізацыі БНФ».

— Наўрад,— усумніўся Чуйкевіч.— Яны могуць стварыць яе і без нашай сходкі.

Падумаў: ад страху Ямачку ўжо блюзніцца Бог ведае што. На календарыку ён адзначаў дні і вылічваў, колькі яму засталося да пенсіі.

Скронь меў адносіны да нефармалаў раней. Пасля партбюро адкінуўся ад іх. Чуйкевіч проста пацікавіўся ў яго: якую лепш, на ягоную думку, праводзіць сходку — адкрытую ці закрытую? Скронь выбраў закрытую. А значыцца, усе сумненні адпадалі.

Чуйкевіч даў мастаку цыдуліну з парадкам дня:

1. Абмеркаванне праектаў Закона аб выбарах народных дэпутатаў СССР і Закона аб змяненнях і дапаўненнях Канстытуцыі СССР.

2. Зацвярджэнне пастановы партыйнага бюро.

Назаўтра мастак вывесіў яркую аб'яву: чырвоныя літары на белым полі ватмана нагадвалі нацыянальны беларускі сцяг.

На сходку прыйшлі толькі камуністы. Было ціха, як на хаўтурах. Ніхто не рваўся ў кабінет. Ніхто не бушаваў, не ламаў дзвярэй. Кожны моўчкі і асцярожна, бы там мог быць цвік, садзіўся на крэсла.

Першае пытанне, нягледзячы на глабальны маштаб, не заняло багата часу: усе разумелі ягоную фармальнасць. Пару выпусцілі на зацвярджэнні пастановы партбюро па Скроню, якую зачытаў Чуйкевіч.

Стары камуніст, які па незразумелай матывацыі сімпатызаваў нефармалам, першым заклікаў сходку асудзіць «атавістычнае»* партбюро.

Чуйкевіч таемна парадаваўся за сябе, што чуццё яго не падвяло.

Цямнела на вуліцы хутка, быццам з неба апускалася заслона. Вокны адлівалі сінім перламутрам. Уключылі святло. Кабінет і ўсе людзі глыбока адлюстраваліся ў шкле вокнаў. Чуйкевіч, слухаючы выступоўцаў, глядзеў на іх, як на нямое кіно.

Галасы ён аднавіў пазней праз пратакол. Яны зашыфраваны тут літарамі.

## РАЗДЗЕЛ 25

«Д»: Лічу, што няправільна атавістычнае партбюро вынесла вымову камуністу Скроню. Я растлумачу. У свой час «талакоўцы» звярнуліся ў выканкам аб правядзенні мітынгу ў скверы Янкі Купалы. Ім было адмоўлена. Месца не было прызначана другое. Але мітынг быў арганізаваны. Супроць дэманстрантаў паўстала міліцыя. Рыхтаваліся як да ваенных вучэнняў. Прашу партыйнае бюро адкласці пастанову да высвятлення падзей. Прапаную пастанову не зацвярджаць.

«Ж»: Сёння ўжо апублікавана рашэнне Вярхоўнага Савета БССР па гэтым пытанні. Думаю, што мы павінны зацвердзіць пастанову партбюро.

«Ш»: Пытанне вельмі прынцыповае. Якая пазіцыя

---

* Атавістычны, -ая. Які (-ая) мае дачыненне да атавізму. Атавізм (ад лац. atavus — продак) — *перан.* Рэшта, паўтарэнне чаго-небудзь, што было ўласціва папярэднікам.

камуністаў у правядзенні мітынгу, мы павінны высветліць. Думаю, за гэта не трэба караць. Вымовы тут няма за што даваць.

«Р»: Я скажу тое, што думаю. Колькі было выпадкаў, калі мы прымалі ўказы, пастановы, рашэнні супроць асобных людзей, а пасля яны аказваліся памылковымі. Я сапраўды не бачу з боку Скроня парушэння. Няма падстаў яму даваць вымову.

«К»: Я лічу сябе законапаслухмяным. Скронь парушыў пастанову гарвыканкама, але ж ён мог памыліцца. Памыляюцца і начальнікі, і яны часам не адказваюць за свае ўчынкі. Прапаную: абмежавацца абмеркаваннем і папярэджаннем.

«М»: Бюро засядала па гарачых слядах і з цягам часу сітуацыя набыла іншую афарбоўку. Мітынг праверыў кожнага з нас. Сёння трэба гаварыць голасам свайго сумлення. Я буду галасаваць супроць пастановы партбюро, хоць і не згодзен з ацэнкаю камуніста «Д», што яно атавістычнае. Якраз яно працуе панovаму, з улікам сённяшняга дня.

«Я»: Камуністы даволі яскрава выказаліся. Скронь паводзіў сябе ў дадзенай сітуацыі няправільна. Забарона мітынгу — таксама памылковае рашэнне. Факт заканадаўчага парушэння. Прапаную змяніць фармулёўку рашэння партбюро: за ўдзел у несанкцыяніраваным мітынгу камуністу Скроню паставіць на від. І другі пункт: лічыць рашэнне гарвыканкама аб забароне мітынгу памылковым.

ПАСТАНАВІЛІ:

1. Пастанову партбюро ад 2 лістапада адмяніць.

2. Лічыць, што рашэнне аб забароне мітынгу-рэквіема «Дзяды» было памылковым з боку мясцовых улад.

3. Абмежавацца абмеркаваннем удзелу камуніста Скроня ў мітынгу.

4. Партыйнаму бюро павысіць выхаваўчую ролю камуністаў.

## РАЗДЗЕЛ 26

Прачытаўшы апошні пункт, Чуйкевіч скрывіўся. Лёгка прымаць пастановы, а як яе павысіць, гэтую выхаваўчую ролю? І ці трэба? Запечным пылам, спырснутым прусакамі, патыхнула на Чуйкевіча ад гэтага пункта.

Але турботы са Скронем на гэтым не скончыліся. Вядома, што бывае з камячком снегу, які зрушыўся з вяршыні гары, асабліва калі гара крутая. І добра: гэты паток змятаў, заглушаў ровам і шумам асабістыя праблемы Чуйкевіча. Нейкім часам нават здавалася, што іх увогуле не існуе, яны выдумаліся ім.

На агульнай сходцы супрацоўнікаў усіх літаратурных часопісаў у Седале пісьменнікаў Скронь выйшаў на трыбуну і зачытаў заяву аб выхадзе з партыі:

«У партыйную арганізацыю часопіса «Ідэі перамагаюць» ад члена КПСС Скроня В. А.

ЗАЯВА

Прашу з гэтага дня не лічыць мяне членам КПСС. Саму камуністычную ідэю лічу утапічнай. Не прымаю сродкаў і метадаў, якімі яна ажыццяўляецца».

Неронаўскім жэстам уручыў заяву Чуйкевічу, які сядзеў у першым радзе. Ну, як тут не скажаш, што чалавек сапраўды шукае звадак? Бо ягоны крок не назавеш ні смелым, ні прынцыповым. Цяпер выхад з партыі нічым не пагражаў. Гэта была чарговая кан'юнктура, як калісь уступленне ў яе. Людзі шчырыя і сумленныя не надта паважалі тых, хто, у гады застою маючы выгоду з членства ў КПСС, у часы ПЕРАБУДОВЫ бессаромна здраджваў партыі, ганьбіў яе. Самае дзіўнае, тут асабліва шчыравалі былыя цэкоўцы, хоць цёплыя крэслы, у якія селі з ласкі ЦК, пакідаць не збіраліся. З такой крывадушнасцю трэба яшчэ ўмець глядзець у вочы людзям.

Гэтая Скронева выхадка не вельмі засмуціла Чуйкевіча. Адно пазней пашкадаваў, што ўзяў заяву там, у зале. Няхай бы Скронь аддаў яе ў рэдакцыі.

Чуйкевіч пазваніў Малкавай і сказаў пра Скроневу заяву. Тая выслухала навіну надзіва безуважна.

— Парадак такі,— сказала яна.— Запісвайце... Завесці персанальную справу, стварыць камісію партыйнага расследавання, якая займецца Скронем (хто бацькі, якая сям'я, жонка, дзеці, жыллёвыя ўмовы, хто ўплывае на ідэйную перакананасць). Зацвердзіць характарыстыку і прыняць пастанову на бюро. Фармулёўка наступная: за нежаданне знаходзіцца ў радах КПСС — выключыць.

Божа, зноў засядалаўкі!.. Няўжо табе, Чуйкевіч, няма чым займацца, іранізаваў сам з сябе. Як адчуваў, калі не згаджаўся на партыйнага важака. Багата часу і сіл траціць марна. Праўда, у гэтай крутаверці менш думаў пра свае балячкі, засяроджваўся на іх. А грунт для трывог быў, як ніколі, вялікі. Званілі кожны дзень. Адзін раз хтосьці дзяркната кашлянуў у трубку. Заціх, як мыш пад венікам, Пётр Пятровіч пасля таго, як Чуйкевіч абазваў яго бяздарным. То і добра. Шкада, што не ўдаецца ўбачыць Вераніку. Але ўспамін аб сустрэчы ў яе на кватэры яшчэ грэў яго. Можа, гэта — адзінае, што яго грэла ўвогуле.

Тыдзень прашалясцеў зборам патрэбных папер. Усе дні былі змрочныя, сырыя, «цяжкія» — паводле астралагічных прагнозаў, што друкавалі газеты. Снег абвальваўся нечакана — і раставаў, бо зямля была цёплая. Дзеці не паспявалі пагарэзаваць з ім, надыхацца ягонай першароднай чысцінёю.

Адно за адным правялі партбюро і партсходку з парадкам дня: «Персанальная справа члена КПСС т. Скроня В. А.» Адзінагалосна была прынята і зацверджана пастанова: ВЫКЛЮЧЫЦЬ З ЧЛЕНАЎ КПСС т. СКРОНЯ ВАЛЯНЦІНА АЛЯКСАНДРАВІЧА ЗА НЕЖАДАННЕ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў РАДАХ КПСС.

Сенсацыі гэта не выклікала. А калісь, помніцца, даярка адмовілася пасля праходжання кандыдацкага стажу ўступаць у члены, дык справа дайшла ажно да Масквы, да абмеркавання на Палітбюро.

Тоненькую папачку Чуйкевіч панёс у парткамісію райкама партыі. Кабінет гняздзіўся на першым паверсе ў цёмным канцы калідора. Там чамусьці не гарэла лямпачка. Старшынёю была жанчына. Небарака, якраз між броваў у яе сядзела тугая, бы аскепак падсмажанай гарошыны, радзімка.

«Надта шмат з'явілася жанчын у партыйных органах»,— здзівіўся Чуйкевіч. Раней, як правіла, была адна — сакратар па ідэалогіі.

Жанчына мела вядомае прозвішча — Яшына. На выгляд ёй можна было даць гадоў пяцьдзесят. Па манеры размаўляць, ураўнаважаным, пастаўленым голасе ў ёй угадвалася былая настаўніца. Уплыў апошняй пасады адчуваўся ў тым, што Яшына не цярпела пярэчанняў. Яна ва ўсім была перакананая. Гаварыла — быццам адсякала сякеркаю словы.

Яшына надоўга затрымала Чуйкевіча ў кабінеце: вучыла жыць. Ён на яе зусім не пакрыўдзіўся. Яна шчыра працавала. Належала да тых, чыя свядомасць часам ужо не мяняецца.

Чуйкевіч выйшаў з райкама ў прысмерках. На свежым снезе ад слупоў і дрэў ляжалі доўгія чарнільныя цені. Такога ж колеру было і неба. На даляглядзе, мусіць, іншага — ружаватага, ды з-за дамоў не відаць. Патрэскваючы, звінелі правады. Першы раз у гэтым годзе пачуў звон правадоў.

Як падкраўшыся з-за вугла, ударыў мароз. Абцасамі цёплага абутку праскрыпелі некалькі дзён. І дрэвы забухмаціліся ад інею. Толькі галіны, дзе сядзелі галкі, былі голыя, чарнелі,як падпаленыя на кастры.

Яшына запрасіла Чуйкевіча разам са Скронем на пасяджэнне парткамісіі. Сярод ейных членаў бальшыня было ветэранаў. Белагаловыя, з вясёлкавымі плітамі ордэнскіх планак. Яны добра пагневаліся на Скроня. Адзін надзьмуты вусач кінуў і Чуйкевічу:

— Трэба разабрацца і з такім сакратаром, які размаўляе па-беларуску і запусціў выхаваўчую работу.

Яна Чуйкевіча нават не рассмяшыла, настолькі была замшэлая, «трыццацьсёміста» афарбаваная.

— Што б ні здарылася, вы яшчэ пашкадуеце за гэты ўчынак,— кінула на развітанне Скроню Яшына.— Партыі камуністаў жыць вечна, а архівы ўсё захаваюць...

Прыблізна гэтак калісь, адпускаючы ў сталіцу, казаў першы сакратар райкама і Чуйкевічу: «Хацелі з цябе зрабіць чалавека — не згадзіўся: будзеш шкадаваць». А вось жа не шкадуе, здаецца... Хоць наперад заказваць цяжка. Непрадказальная наша савецкая гісторыя.

Чуйкевіч прыгадаў чатырохрадкоўе, якое прывёз з камандзіроўкі ў Прыбалтыку Цішкоў:

У нас теперь эпоха гласности —
Она навеки нам дана,
Но комитет госбезопасности
Запишет наши имена.

«Маё, мабыць, ужо запісаў»,— жартаўліва усміхнуўся Чуйкевіч. Зусім выпадкова, воляю незалежных ад яго абставін, у яго з гэтай службаю перасеклася багата шляхоў: прапанова супрацоўнічаць, сябар Мякота, Вераніка... Гэта што ведае. А колькі не ведае? Можа, не аднаму сексоту ён зрабіў кар'еру. Субач

гразілася... Трывога і боязь перад малавядомай і злавесна затоенай спецслужбаю трымалі чалавека пад каўпаком прыніжанасці і пакоры.

А ўпершыню з кадэбістам ён сутыкнуўся пад час працы ў «раёнцы», там, дзе з яго хацелі «зрабіць чалавека». Нейк улетку ў рэдакцыі раз-пораз пачаў з'яўляцца непрыметны чалавек са светла-рудаватай цвёрдзенькай папачкай. Ён і праўда быў непрыметны. Невысокі ростам, маленькая прылізаная галоўка, гарчычнага колеру касцюм і такія ж туфлі. Калі ён станавіўся да пафарбаванай на жоўтае сцяны, то відаць былі толькі ягоныя вочы — быццам кабінет глядзеў на цябе чалавечымі вачыма. Гэта, звычайна, быў кабінет рэдактара. Чалавек з папачкаю вадзіўся толькі з ім. Адсюль высновa, што ўсе кіраўнікі...

Калі Чуйкевіч заходзіў, чалавек замаўкаў, адсякаючы паўслова, нават літару ад слова. Але праз якісьці час, мусіць, з рэдактаравай падачы, чалавек пачаў давяраць Чуйкевічу. І нават гэтак, што, стрэўшы на вуліцы, пытаўся, гледзячы кудысьці ўдалеч адрынутымі вачыма: які настрой у супрацоўнікаў рэдакцыі, друкарні. Чуйкевіч нязменна адказваў жартаўлівым тонам: «Настрой — хоць у скокі!» Чалавек, мабыць, палічыў яго за легкадумнага, непрыдатнага для сур'ёзнай справы, бо неўзабаве пачаў размінацца, не заўважаючы.

Можа, праз месяц, пасля ўжо Новага года, Чуйкевіча выклікалі ў райкам. У агульным аддзеле мілавідная, зусім не суровая жанчына, рэдкая сярод партапаратчыкаў, пад распіску дала яму дакумент са штампікам САКРЭТНА .

«Пастанова бюро раённага камітэта Кампартыі Беларусі г. Мінска ад 25 студзеня 1989 года, пратакол № Б-24. Пастанова пярвічнай партарганізацыі рэдакцыі часопіса «Ідэі перамагаюць» аб т. Скроню В. А., члена КПСС з верасня 1977 г., партбілет № ..... (дакладчык т. Яшына).

Зацвердзіць пастанову пярвічнай партарганізацыі рэдакцыі часопіса «Ідэі перамагаюць» ад 24 снежня 1988 г. За адыход ад ідэйных пазіцый КПСС, здачу партбілета Скроня Валянціна Аляксандравіча з членаў КПСС выключыць.

Сакратар райкама Кампартыі Беларусі г. Мінска
*Н. Гракавалава*».

Чуйкевіч адразу ўзяў увагу, што прычына выключэння з партыі Скроня іншая, чым у іхным пратаколе. Гэта яго не кранула. Цяпер было ўжо ўсё роўна. Партыйцы проста палохалі. Паказвалі, што яны яшчэ грозныя. Але гэта былі перадсмяротныя курчы, няздольнасць змірыцца з непазбежным. Ад калісьці непарушнага айсберга адколваліся тысячы кавалкаў і раставалі ў цёплым, напаленым моры грамадскіх страсцей.

Дарога ў райкам і з райкама Чуйкевічу была знаёмая, здаецца, да драбніц: нахадзіўся дай Божа. І ўсё роўна кожнага разу яму адкрывалася штосьці новае: мянялася жыццё, прырода, людзі. Кусты ядлоўцу, прысыпаныя снегам, стаялі белагрудыя, кучненька збітыя, як пінгвіны. На яблыні пры штакетніку вісела голая лялька з заламанымі на спіну нагамі. У задзірынкі і расколіны на штакецінах паўплішчваўся снег. Вецер-узвейка круціў сухі снежны пыл, які морассю аблеплівў твар, халадзіў тонкім лядком.

Голас: «Пра слова меркаваць можна толькі вымаўляючы... Тады адчуеш ягоны смак, як адчуваеш смак ежы».

## РАЗДЗЕЛ 27

У будынку рэдакцыі сталоўкі не было, і харчавацца Скронь хадзіў у буфет інстытута замежных моў, які быў праз дарогу. Выбіраў час, калі студэнты сядзелі на лекцыях,— дзесьці а палове першай.

Скронь, абхапіўшы з двух бакоў сурковую шапку, ямчэй насунуў яе на галаву і выйшаў з масіўных дзвярэй рэдакцыі.

Браўся вецер, і на снезе гулялі бяльматыя змейкі завірухі. На скрыжаванні міліцэйскі «уазік» з мігалкаю, два сутыкнутыя легкавікі і натоўп разявак гарбелі цёмнай варухлівай хмараю.

«Мусібыць, аварыя»,— падумаў Скронь.

Скронь ацэньваў першыя стравы не па смаку, а па колеры. Вось такая была ў яго дзіўнасць, як у кожнага творчага чалавека. У студэнцтве і на пачатку самастойнай працы ён любіў чырвоныя баршчы — з буракоў-рэпачкі, капусты, морквы, памідораў. Пазней упадабаў малочны рысавы суп — беленькі, з залацістымі скалкамі сметанковага масла. Апошнім часам яму прыглянуўся жоўты гарохавы булён. Прасіў яго

ў раздатчыцы, таўстушкі Ніны, заўсёды дзве порцыі і еў, смакуючы, ажно з паўгадзіны.

Скронь меў комплекс маленькага чалавека. У прамым сэнсе — маленькага ростам. Па інтэлекце, духовасці ён ставіў сябе на п'едэстал гігантаў. Але праз нізкарослацць яму здавалася, што яго не заўважаюць, і ён лез куды трэба і куды не трэба, каб выткнуць свае вушы над натоўпам. І часта іх вытыкаў, ды ўсё роўна людзі не аддавалі яму належнае, не ацэньвалі ягоных волатаўскіх якасцей. А калі ўжо такі комплекс усяліўся ў дзяцінстве, яго не вытруціш да скону. Уся энергія будзе траціцца на тое, каб даказаць, што я — першы. Можа, і нічога страшнага ў гэтым не было, калі б не выглядала кур'ёзным заўсёднае самарэкламаванне любымі сродкамі. І зусім няма розніцы, дзе быць прыметным,— раней у КПСС, членства ў якой грэла, цяпер сярод дэмакратаў, што ладзілі кар'еру на бічаванні камуністаў, а пазней можа стацца так, што трэба служыць якойсьці трэцяй суполцы людзей, здраджваючы дэмакратам...

Зайшоўшы ў вестыбюль інстытута, Скронь адразу ўлавіў носам саладжавы пах гарохавага булёну і лаўровага ліста з духмяным перцам.

— Добры дзень! — павітаўся ён з гардэробшчыкам. Ім быў маладжавы высокі стары з касцістым, як у Пастэрнака, тварам і вялікімі выпуклымі губамі.

— Калі ласка, калі ласка! — ветліва запрасіў гардэробшчык, ужо ведаючы, што Скронь — таленавіты паэт. Пад бар'ерам на паліцы, дзе заўсёды стаяў трохлітровы слоік з півам, ляжала Скронева танюсенькая кніжачка з аўтографам.

Скронь прычасаўся і паплыў у стыхію пахаў.

## РАЗДЗЕЛ 28

Стончанай ліпкавата-прыкрай жуйкаю цягнуўся вечар. У кватэры была халадэча: слаба грэлі батарэі. Чуйкевіч нацягнуў паверх кашулі чорны турэцкі світэр з каляровымі ромбікамі спераду і сеў піць перад тэлевізарам чай.

За ім прыклеілася такая звычка: прыносіў у залу кубак, заварніцу, квадратныя грудкі рафінаду альбо лыжку з мёдам (калі быў). Праз сітца наліваў у кубак чай, завараны на травах. Сачыў, каб не трапіла ніводнай смецінкі. Жонка лічыла такое свяшчэннадзей

ства дурнотаю. Ёй акурат падабалася, калі ў чаі плавалі і чаінкі, і лісцікі травы, і парушынкі.

У вузкі каля дна і шырокі ўверсе кубак наліў мутнавата-рудога чаю, укінуў грудку цукру — напаверх усплыў белы квадрацік пены.

Зазваніў тэлефон — тоненька, пяшчотна. Гэта быў новы апарат, тайландскі. Яны з жонкаю купілі яго нядаўна на Камароўцы ў спекулянтаў за шэсцьсот рублёў. Чуйкевічу ён падабаўся, як і ўсё далікатнае,— лёгенькі, кнопачны, з памяццю і аўтаматычным пераборам нумару. А галоўнае, не верашчыць, як той, ранейшы, і не злякае.

Чуйкевіч узяў трубку. Якоесьці імгненне ніхто не абзываўся. У яго заштурхалася моцна сэрца, адразу пад горлам. Хацеў адкінуць трубку, бы змяю, але не паспеў — пачуў:

— Алы-лё! Это біты... э-э, Чуйкевіч? — Бас незнаёмы, густы, прапіта-пракураны.— Беспакоят таварышчы...

— Хто? — сутаргава вырвалася ў Чуйкевіча.

— Таварышчы, кажу... Што, не ясна? — павысіў бас ноту.— Нам нада ад цябе бабкі.

У Чуйкевіча пацямнела ў вачах, хіснулася трумо, акурат дзьмухнуў на яго вецер, запыліў. У люстры ён бачыў свой размыты абрыс.

— Дзе я вам вазьму? — закрычаў Чуйкевіч: і несвядома, і свядома, каб паказаць, што ён не з баязлівых.— Я што, кааператар? Я беларускі пісьменнік... самы няшчасны ў свеце. Якія ў мяне грошы?..

— Не касі, фраер! Ёсць,— басіў незнаёмец.— Збіраешся клячу купляць, правы маеш...

Чуйкевіч стаяў белы як смерць. У яго дрыжалі ногі, падступала пад лыжачку млосць.

«Усё-ткі, сволачы, не адсталі!..»

— На машыну мне брат паабяцаў пазычыць. Ён ваенны, падпалкоўнік...— Чуйкевіч яшчэ цяміў: наіўна думаў, што гэта адштурхне падонкаў.

— Мы многа не трэбуем,— настойваў бас.— Усяго пяць кускоў.

— Вы што, звар'яцелі?! — закрычаў у трубку Чуйкевіч.— Знайшлі, з каго здзіраць! Я беларускі пісьменнік... Нас так мала. Нам трэба адраджаць край, культуру, мову! («Можа, гэта іх спыніць?»).

— Нам без разніцы, хто ты... Гані бабкі, іначы будзе худа,— прыгразіў бас.

— Дык што, мне ісці, як вам, красці? — не здаваўся Чуйкевіч, адчуваючы, як сіла пакідае цела, праз ногі выцякае ў бетон дома.

— Я кажу: знойдзеш. Калган на плячах ёсць,— раіў жалезны бас.— Мы ведаем, калі твае спінагрызы ў школу ходзяць, дзе бывае мара твая, калі сам позна на сабраннях тусуешся...

Гэта быў моцны псіхалагічны націск, адпрацаваны ўдар пад дыхаўку, пасля якога воля ахвяры паралізуецца. Без сумнення, падонкі ўжо не раз яго выкарыстоўвалі. Лезці на сценку, зразумеў Чуйкевіч, карысці мала. Яны не адстануць. Покуль трэба ісці на замірэнне з імі. Мець час на абдумванне, раду, прынцце якіхсьці захадаў.

— Ты хоць падумаць дасі, дрэнь? — здаючыся, зняважлівым тонам, не хаваючы ў голасе грэблівасці, праскрыпеў зубамі Чуйкевіч.

— Вось так, мазгуй,— памякчэў бас і стаў як бы крышачку нават вінаватым.— Але папярэджваю: не бяжы ў кантору звякаць. Замочам. Я ісчо пазваню...

Чуйкевіч уявіў спітую, адутлавата-сінюшную морду, якая ўлезла перад ім у чаргу і нахабствам якой роблена абурылася фіфа.

Бас мог належаць толькі ёй, гэтай мордзе.

Чуйкевіч стаяў аглушаны і атупелы. Тое, чаго баяўся, што прыгнятала яго, з'ядала радасць жыцця, здарылася. Падонкі не забылі яго. Мусіць, яны вядуць банк дадзеных на сваіх ахвяр, і вось надышла ягоная чарга. Ім пляваць, што ён пісьменнік, патрэбны культуры, народу. Яны такія ж бязлітасныя, як ЛЮБАЯ — па колькасці — група людзей, аб'яднаных мэтаю. Для іх ён — грашовы кліент, як яны кажуць, ла́кшавы фраер.

Чуйкевіч сціскаў зубы, якія дробна пастуквалі. Прыйшлі з вуліцы Вася і Арцём. Аблепленыя снегам з ног да галавы — як белыя мядзведзікі.

— Тата, чаму ты такі... страшны? Ты п'яны? — спытаў Арцём.

Чуйкевічу хацелася рыдаць, ірваць валасы, тупаць нагамі ад бяссілля. Сынам пра бяду, якая звалілася на сям'ю, ён сказаць не мог. З жонкаю трэба параіцца. Але што яна параіць, жанчына? У яе ўсё будуецца на эмоцыях, а не на здаровым розуме. Самы лепшы тут дарадчык, вядома, генерал. А можа, звярнуцца да Веранікі і праз яе да ейнага мужа? Як-ніяк, КДБ не

параўнаеш з міліцыянтамі. Але ж проста так не адкрыешся Веранічынаму мужу, а ён не возьмецца абыкаму дапамагаць. Раней не было б пытанняў: сказаў бы ў райкаме, і ў адзін міг дзесяткі вышукнікоў горада сталі б на абарону партыйца. Як гэта разумець — замах, пагрозы сакратару партыйнай арганізацыі?

Чуйкевіч набраў службовы нумар генерала. Ішлі працяглыя зумеры — ніхто трубкі не падымаў. Чаго ён будзе так позна на працы? Дахаты Чуйкевіч генералу ніколі не званіў. Цяпер было не да інтэлігенцкіх далікатнасцей. Адказаў прыемны, мяккі, бы ў Папялушкі, галасок — генералава дачка:

— Папы нет. Он на мероприятии.

«Хоць бы не ў адпачынку»,— маліў Бога Чуйкевіч.

У Чуйкевіча было такое адчуванне, што ён заляцеў у космас. Там усё і адбываецца. Гэта — сон, фантазія, пераход у паралельны свет, але не рэальнасць. Зараз ён прачнецца і з палёгкаю ўздыхне: «Фу-у-у, добра, што сон!..» І яшчэ доўгі час рэальнае будзе здавацца яму сном.

Чуйкевіч уяўляў, як будзе раскручвацца шпуля падзей: ад самага шчаслівага зыходу для яго да самага жудаснага. Не, ёсць жа Бог на свеце. Ён павінен зрабіць так, каб зло не перамагло. Хоць агрэсія цёмных сіл моцная, а чалавек мала ведае сродкаў барацьбы з імі.

Нецярпліва чакаў з лазні жонку. Дарослы чалавек, з ёю можна раіцца.

Людміла паставіла ў парозе сівенькую скураную торбу, з якой тырчаў наўскасы адсечаны лычык веніка. Твар ейны свяціўся ружовасцю, памаладзела блішчэла смуглаватая скура. Здаецца, нават чорная слязіна пад вокам пасвятлела.

— Абрадую цябе,— сказаў Чуйкевіч адразу. Знерваваўся, чакаючы яе. Нічога не лезла ў галаву.— Ужо атрымаў ультыматум ад «таварышчэй».

— Бляха-муха!..— выдыхнула жонка і падціснула вусны.— Што цяпер рабіць? Не вылазіць з кватэры?

— Параюся заўтра з Міхаілам Антонавічам. Я ж ім не каапературатар, які грабе шуфлем дармовыя грошы,— апраўдваўся Чуйкевіч.

— А мог бы быць,— і тут не забыла падкусіць яго Людміла.

Собіла ж яму ўблытацца!

— Кінь ты! Які з мяне каапературатар?

— Дык і яны ж, мусіць, не сапраўдныя рэкецiры. Звычайныя падонкі, былыя зэкі, алкашы, якім няма за што выпіць.

І раптам, як гэта часцяком бывала, у свядомасць Чуйкевічу ўпілася яшчэ адна атрутная жыбулька: гэтыя акурат без усякіх тармазоў, для іх не існуе ні гонару, ні маралі, ні выпрацаваных у сваім асяродку законаў. Іхныя паводзіны непрадказальныя. Аб гэтым папярэджваў, помніцца, і нябожчык Мякота.

Думкі, атрымаўшы штуршок, зараіліся ў галаве. Гарачь, здавалася, валасы, і ён чуе іхны трэск.

Спаць Чуйкевіч лёг з жонкаю. Даўно не клаліся разам. Трывога запаланіла яго ад цемечка да пятак. Ён праглынуў дзве ладачкі радэдорму. Але сон да яго не спускаўся, лунаў дзесьці на небе. Быццам не бетонны дом, а фанерная скрыня: любы рып, грук зверху, знізу, з бакоў было добра чуваць. За кожным разам Чуйкевіч здрыгаўся. Мірсцілася: бандзюкі лезуць у кватэру, рушацца дзверы, сцены...

— Што ты круцішся, як уюн? — незадаволена скрозь сон прамармытала жонка.

Ён падняўся, адскуб ад рулона ваты два касмылікі. Зрабіў тугія тампончыкі і засунуў у вушы. Гукі заглухлі, але... шумела мора. Такое адчуванне, што хвалюецца мора, вада напаўзае на гарачы пясок. Чуйкевіч заняўся аўтагеннай трэніроўкаю: «Я спакойны, я цалкам спакойны... Я ні пра што не думаю... У мяне няма ніякіх праблем... Усё будзе добра...»

Уяўляў сапраўды мора, бела-зеленаватае, дымнае неба, цёплыя промні ў сябе на спіне, белых кручкадзюбых чаек на гладзенькім, вылізаным беражку каля саменькай вады... Гэтая аўтагенная трэніроўка ўжо аднойчы выратавала яго. Нечакана, падрэзанае маленькімі ножанкамі няўдач і злых намераў акружэння, пахіснулася здароўе. Здароўе — мінное поле, выбух на якім адбываецца нечакана. Як у пясок, знікла прага жыцця: не радавала праца, не хацелася кампаній, збрыдзела гарэлка, не вабілі жанчыны... Якаясьці экзема чырвонымі плямкамі заслядзіла ўсё цела. У скурдыспансеры пасля доўгіх сумневаў яму прыляпілі дыягназ: псарыяз. Ён паставіўся да яго безуважна, як і да ўсяго на той час, і толькі пасля, калі ачуняў, начытаўся медыцынскай літаратуры, з жахам зразумеў, чаго магла яму каштаваць памылка дактароў, праз якую заганяўся ў падсвядомасць

страх перад каведнасцю, фактычна, невылечнай хваробы. І ачуняў ён менавіта дзякуючы гіпнозу ці, як раней казалі — умусту, з дапамогаю якога арганізм абнавіў свае функцыі, нашчэнт разбурыўшы ўнутранага «ворага» па ўсіх пазіцыях, дзе на многія гады ўмацавалася ўпэўненасць, яснасць мэты, адчуванне сваёй патрэбнасці. Ён вывеў сябе з-пад аўтарытэту вакольных людзей; яны былі яму да лямпачкі.

І вось, здаецца, «вораг» зноўку пайшоў у атаку. Як ён спаў і колькі, адзін Бог ведае, але сон убачыў. Нібыта яны з Васем прыехалі ў Афганістан. Выходзяць з будынка вакзала — цёмна, ніводнага ліхтара. Ніякага транспарту. Ён сіліцца ўспомніць, куды яму, у гасцініцу альбо інстытут, дзе прыпынак (вельмі моцнае адчуванне, што раз ужо тут быў),— і не можа. І раптам да іх прыстаюць двое — хлапчукі, але не чарнамазыя, як у Афганістане. Ён адбіваецца ад іх, а яны не вельмі агрэсіўныя. Адзін кінуўся і выверну яму кішэнь, але ён паспеў выхапіць у рабаўніка насавік, ключы ад машыны і паваліць яго ў снег. Скуль у Афганістане ўлетку снег? Другі валіць Васю. Тады ён дастае сцізорык, вымае лязо, але хуліганы не ўцякаюць. Ён замахваецца нажом... і не можа ўдарыць. А Вася ў снезе, набраў у штаны. Голы — боязна, што застудзіцца. Чуйкевіч цэліцца аднаму ў нагу, але не б'е чамусьці. Азіраецца: чаму няма царандоя, людзей ці якіх машын? І — прахопліваецца...

З вуліцы ў пакой пнулася шэрае святло. Цьмяна блішчэў вішнёвай паверхняю газетны столік, на якім цікаў круглы, як цыклопава вока, будзільнік. На дыбачках паклыгаў на кухню. Адкруціў кран, папіў халоднай вады: у роце перасмягла, як пасля цяжкога пахмелля. Галава была тупая. Ён зусім не адпачыў. І калі цяпер адпачне — невядома. Багата часу яму спатрэбіцца, каб перажыць гэты смылючы сцябок па нервах, прывыкнуць да самога факту, зачапіцца за надзею. Дзе яе ўзяць, надзею? Яны пакідалі яго адна за адною, як рыба пакідае завоіну, што пачала раптоўна мялець і броснець.

Без адной хвілі восем пазваніў генералу. Калі трубка шчоўкнула і зафаніравала, Чуйкевіч бясконца абрадаваўся.

— Міхаіл Антонавіч, на мяне нейкае напасце,— забыўшыся павітацца, сказаў ён з надрывам.— Зноў патрэбна ваша парада.

— Што такое? — без намёку на трывогу ў голасе спытаў генерал.

Чуйкевіч распавёў яму пра здарэнне ў магазіне і пра ўчорашні званок. Генерал на момант змоўк. Нават яму навіна здалася нечаканай.

— Так. На забойства яны не пойдуць,— сказаў, як здалося Чуйкевічу, няўпэўнена генерал.— Але нервы папсуюць. Першае, што табе трэба зрабіць,— заявіць у міліцыю, у свой райаддзел. Я выйду на таварышаў, падключу патрэбных людзей. Выконвай усё, што трэба будзе для аператыўных мерапрыемстваў.

Пасля размовы з генералам хмары трывогі пагусцелі. Гэтае ягонае «на забойства яны не пойдуць» цвіком засела ў мазгах. Трэба ісці ў міліцыю. А бас прыгразіў: «Не ўздумай бегчы ў кантору звякаць». Яны таксама слоў на вецер не кідаюць. Можа, за ім ужо сочаць. Выйдзе ён з пад'езда — і трапіць на кручок. Людзей вакол багата: паспрабуй разбярыся, чыё вока за табою віжуе. Давядуць да міліцыі — і ўсё зразумеюць. Вялікага розуму тут не трэба. Нават адпітых мазгоў хопіць. Чуйкевіч адчуў, што дзверцы пасткі няўхільна прычыняюцца. Ліхаманкава, бы птушка ў сілку, забілася ягоная думка.

Прачнулася жонка, прышлёпала ў тапках на кухню. Падпухлы, пакамечаны пасля сну твар — зусім не той, што быў учора. Набрыняла пад вокам чорная слязіна.

Чуйкевіч са спадзяваннем глядзеў на жонку. Яна нязвыкла цярпліва выслухала ягоныя перасцярогі.

— Сядай на таксі ды едзь,— сказала жонка.— Не пагоняцца ж яны за табою.

І сапраўды, гэта было выйсце. Безумоўна, сачыць за ім яны будуць не на машыне. І калі ён возьме таксоўку, яны так хутка не змогуць сесці, нават калі будуць стаяць за ім. Хвіль пяць-дзесяць трэба чакаць наступную машыну.

Чуйкевіч вынырнуў з пад'езда, як суслік з нары. Позірк ягоны пачаў вышукваць падазроных тыпаў. Маладая жанчына вяла ў садок дачку ў белай, як адуванчык, шапачцы. Каля чырвонага «Запарожца» з адчыненым багажнікам корпаўся мужчына ў доўгім, да калень, світэры,— быццам ліняў скураю, спускаў яе пад ногі. Пажылы таўстапузы дзядзька выгульваў чорненькую калматую балонку з белым сырамятным ашыйнікам. Падмятала ганак суседняга пад'езда

прыгажуня прыбіральшчыца, з якою Чуйкевіч заўсёды прыязна вітаўся.

Адлягло на сэрцы. Ды тут жа кроў гарачай хваляю плёснула ў галаву: што, яны дурні выстаўляцца напаказ? Цікуюць скульсьці з-за вугла альбо здалёку.

Праляцела нізка чорная галка, трымаючы ў дзюбе ладны кавалак белага хлеба.

Хоць да таксі было блізка, праехаў адзін прыпынак на тралейбусе і выйшаў. Нягледзячы на раніцу, у чарзе на таксі стаяла пяць чалавек. Сцяты, бы спружына, Чуйкевіч чакаў, хто стане за ім. Прысунулася цётка. Па ўсім відаць, вясковая: з белай хустаю на галаве, у рудым даўгаватым палітоне і валёнках. У кожнай руцэ трымала напакаваную торбу. Не падобна, што з іхнай хеўры. Мусіць, да сына ці дачкі з блізкай ад Мінска вёскі прыехала маці. Закалолі япручка — і прыехала. Трэба карміць дзяцей: з магазінаў зніклі мяса, каўбаса, рулеты.

Седзячы ў таксоўцы, Чуйкевіч раз-пораз азіраўся: ці едзе ўслед якаясьці машына. Пільна ўглядаўся на паваротах. «Хваста», здаецца, не было. Не на верталёце ж яны.

За перагародкаю, закратаванай чорнымі сталёвымі прутамі, тырчаў ядроным падасінавікам дзяжурны афіцэр. На левым рукаве ў яго чырванела абтрэпаная па краях павязка. Валасы ў афіцэра былі шорсткія і рыжыя, як засохлая сасновая галінка, а твар цаглянага колеру. Ён з недаверам глядзеў на Чуйкевіча, покуль той тлумачыў, што яго сюды прывяло. Запісаўшы ў журнал прозвішча і адрас наведніка, сказаў Чуйкевічу падняцца на другі паверх, у пакой № 18, да маёра Серады.

Маёр Серада, лысаваты, з чорнымі вусікамі, маленькімі, як дзве фасоліны, лагодна запрасіў яго сесці. Даў аркуш паперы, ручку. Сказаў пісаць заяву. Чуйкевіч здзівіўся, што маёр ужо быў у курсе справы. Парупіўся Міхаіл Антонавіч. Аператыўна, нічога не скажаш!

Размаўлялі з паўгадзіны.

— Выконвайце ўсё, аб чым я вас тут прасіў,— папярэдзіў на развітанне Серада.— Ваша задача — цягнуць час. З гэтага моманту ваш тэлефон падключаны на праслухоўванне.

— А ахова мне будзе? — на поўным сур'ёзе спытаў Чуйкевіч.

Маёр пасміхнуўся ў акуратныя вусікі:

— Калі спатрэбіцца, будзе.— У куточку ніжняй губы ў яго прыліпла жоўтая махорынка. Чуйкевічу свярбела яе змахнуць. Мусіць, ад удзячнасці. Здаецца, у гэтую хвілю ён быў шчаслівы.

А якім яно, шчасце, уяўляецца іншым? Успомніў, што возіць у дыпламаце атрыманае ім «Пісьмо ў шчасце!». Не ведае, што з ім рабіць. Усе тэрміны рассылкі ўжо прайшлі.

## РАЗДЗЕЛ 29

«Само пісьмо знаходзіцца ў Ліверпулі! Яно абышло вакол свету 444 разы. З гэтым пісьмом да вас завітае шчасце, удача, але пры ўмове: пісьмо трэба паслаць таму, каму вы жадаеце шчасця. Будзьце ўпэўнены: прыйдзе шчасце, нават калі вы не верыце.

Пісьмо было напісана ў 1254 г. У Расію яно трапіла ў XX стагоддзі. Яго атрымала бедная сялянка Урупава, і праз 4 дні яна адкапала скарб. Затым выйшла замуж за князя Галіцына, адале стала мільянершаю ў Амерыцы.

У 1921 г. Конан Дойл атрымаў пісьмо, але не размножыў яго і трапіў у катастрофу, яму ампутавалі абедзве рукі.

У 1937 г. пісьмо трапіла да маршала Тухачэўскага, які спаліў яго і праз 4 дні яго арыштавалі, судзілі, затым расстралялі.

Хрушчову ў1964 г. пісьмо падкінулі на дачу, але ён выкінуў яго. Праз 4 дні яго звергнулі таварышы па партыі.

У 1980 г. Ала Пугачова адправіла 20 пісьмаў, праз 4 дні яна атрымала запрашэнне ад фірмы, і за 4 месяцы на яе рахунку было 2 мільёны.

Ні ў якім разе не рвіце пісьма. Пастаўцеся да яго сур'ёзна. Гэта нітка між нашым цяперашнім і будучым. Пісьмо можна адпраўляць у адкрытым канверце. Абы яно дайшло да адрасата.

Тэксту не мяняць:

| | | | |
|---|---|---|---|
| X-31 | X-x, | 15—18 | 2x+11 |
| E-31 | | ep | —31 |

Гэтыя знакі і пісьмо прынясуць вам шчасце. Гэтае пісьмо робіць круг вакол зямлі за 9 гадоў. Цяпер шчасце павінна наведаць ваш дом. Адпраўце яго людзям, якія ў ім маюць патрэбу. Не затрымлівайце

пісьма больш 96 гадзін. Адашліце яго сваім сябрам і праз некалькі дзён чакайце сюрпрызу. Не пасылайце грошай, шчасце не купляецца. Гэты лозунг прыдуманы пенсіянерамі Венесуэлы.

Зрабіце 20 копій і абавязкова адпраўце.

Гэта не шарлатанства, чакайце сюрпрызаў!»

**РАЗДЗЕЛ 30**

На Тройцу баба Аксюта абторкала хату галінкамі клёна і бярозы. Лісце падсыхала, і хату разрываў лясны дух. Маці сказала Кастуську, што паедуць да бацькі ў бальніцу. Упярэдадзень яна засекла курыцу, зварыла яе.

Кастусёк і Глебачка былі шчаслівыя. Ні з таго ні з сяго ў іх аб'явіўся бацька, на якога яны ўжо страцілі надзею. Прыехаў скульсці з Сібіры, худы, хворы, але свой. Браў іх на рукі і хутка ссаджваў на падлогу: быў зусім слабы.

Бальніца для сухотнікаў была за Слаўгарадам, у вёсцы Лясной. Маці ўзяла Кастуська за руку, і яны крадком ад Глебачкі пайшлі на шашу.

Паўз гасцінец красавала жыта. Яно хадзіла зеленавата-жоўтымі хвалямі. Сцябліны былі фіялетавыя, з белымі пояскамі каленцаў. З краю відаць былі сінія вяночкі васількоў. На дробненькім сухім пяску жукі пакінулі ланцужкі слядоў.

Белыя нізкія карпусы бальніцы стаялі наводшыбе ў саснячку. Бацька паявіўся ў вылінялым байкавым халаце. У яго быў сумны зжаўцелы твар, вочы запалі. Яны пайшлі глыбей у саснячок. Спыніліся на палянцы. Селі ў цень на траву пад бярозаю. Кастусёк сарваў белавата-ружовы кутасік смолкі.

— Як скончыў другі клас? — спытаў бацька ў Косціка, пацягнуў яго да сябе за руку.

— На пяцёркі,— адказаў Кастусёк, сарамліва хінучыся да бацькі. Нязвыкла было адчуваць сябе ў мужчынскіх абдымках. Кастусёк прыслухоўваўся, як бацька расказваў маці пра Сібір, як цяжка працаваў там і «залез у чахотку», як абследаваў яго доктар і напісаў, што трэба вярнуцца ў цяпло і на добрыя харчы... Але хутка Кастуську надакучылі дарослыя размовы. Што ён разумее ў гэтых «высланы», «раскулачаны», «рэабілітаваны»? Ці ў нейкай энкавэдэўскай даведцы, якая «вечна ўсплывае напаверх»...

Бацька неахвотна жаваў белае сухое мяса курыцы.

— Сходзім, паглядзім помнік,— сказаў ён, аднёсшы загорнутую ў газеціну курыцу ў палату. Кастусёк чуў пра помнік у Лясной. Ідучы з маці да бальніцы, бачыў здалёку белую мураўку. Цяпер абрадаваўся бацькавай прапанове.

Свяціла сонца. Ад яго люстранеў бляшаны дах капліцы. Кастусёк набліжаўся да яе з незразумелым хваляваннем у душы. Было адчуванне, што ён сніць трывожны сон.

Злева ад капліцы на вяршыні гранітнай скалы шырока раскінуў крылы арол. Кіпцюрамі ён разрываў чужы — шведскі — сцяг з паламаным дрэўкам. На чорнай пліце надпіс абвяшчаў белымі літарамі:

У ПАМЯЦЬ БІТВЫ ПРЫ ЛЯСНОЙ —
МАЦІ ПАЛТАЎСКАЙ ПЕРАМОГІ — 1709.
*28 верасня 1908 г.*

Яны абышлі вакол скалы, аснова якой патанала ў снезе рамонкаў.

— На адкрыццё помніка збіраўся нават прыбыць цар Мікалай II,— урачыстым голасам сказаў бацька і чамусьці палахліва агледзеўся. На шчоках у яго з'явілася лёгкая чырвань.— Але нібыта вялікія ўрачыстасці ў Маскве не дазволілі яму прыехаць.

На капліцу Кастусёк глядзеў, задраўшы галаву. Яна была не такая высокая, як хацелася Кастуську. Ён сам як бы падвышаў яе. Яны зайшлі ўсярэдзіну. Гарэлі па кутах тонкія доўгія, як салома, свечкі. Пахла воскам. Пасярод раскінулася панарама бою — маленькія гіпсавыя чалавечкі на конях. Рускія і шведы. З коп'ямі і мячамі.

З унутраных вузенькіх дзвярэй выкаўзнулася жанчына ў зялёнай сукенцы з белым каўнерыкам, падобная на рамонак. Яна трымала ў руках указку. Голас ейны Кастуську спадабаўся — быў чысты, роўны, якісьці казачны. Кастусёк зразумеў, што гэта экскурсаводка.

— Гэты храм-абеліск пабудаваны на месцы брацкай магілы, дзе пахавана каля тысячы рускіх ваяроў,— жанчына абвяла вакол сябе ўказкаю. Кастусёк лавіў кожнае ейнае слова.— Дваццаць восьмага верасня тысяча семсот восьмага года войскі Пятра I разбілі шведскі корпус генерала Левенгаўпта, які спяшаўся на дапамогу Карлу XII. Вораг страціў во-

сем з паловаю тысяч забітымі і параненымі, увесь абоз і артылерыю...

З Кастуськовага слыху час ад часу голас экскурсаводкі выпадаў. Ён не паспяваў пераасэнсоўваць пачутае. Уяўленне сілком пераносіла яго ў той далёкі час. Гледзячы на панараму бою, зброю, адзенне ваяроў пад шклянымі каўпакамі паўз сцены, ён страчваў адчуванне рэальнасці. Чытаў на пажаўцелым аркушы паперы мудрагелістымі завіткамі напісаныя словы і, здаецца, чуў голас Пятра I: «Сия у нас победа может первая называться, понеже над регулярным войском никогда такой не бывало, к тому же еще гораздо меньшим числом будучи пред неприятелем, и поистине оная виною благополучных последований России, понеже тут первая проба солдатская была и людей, конечно, ободрила, и мать Полтавской баталии как ободрением людей, так и временем, ибо по девятимесячном времени оное младенца счастье принесла...»

Гісторыя бітвы пад Лясною, так блізка ад ягонай вёскі, запалаліла Кастуська. Яму не верылася, што калісь гэта было. Магло быць дзесьці далёка, на краі свету, але не тут. Няўжо па гэтай зямлі хадзіў сам Пётр I, пра якога Кастусёк не раз чытаў і чуў? Фантазія пярэчыла, а логіка змірала з гэтым фактам.

Кастусёк доўга не мог супакоіцца. Нічога, апроч гэтай бітвы, не лезла ў галаву. Ён нават не помніць, як развітаўся з бацькам, толькі стаіць уваччу ягоны схуднелы, зморшчаны твар.

Па-ранейшаму ярка свяціла сонца, калі яны з маці пыльнай дарогаю ішлі на аўтобусны прыпынак. Услед ім сумна глядзеў бацька.

## РАЗДЗЕЛ 31

З карніза на павуцінцы спусціўся маленькі чорненькі павучок і завіс акурат перад тварам у Людмілы. Яна сядзела, задуменная, за сталом. Людміла дзьмухнула — павучок адляцеў, але павуцінка не парвалася, і ён зноўку вярнуўся, закруціўся, бы юла, каля самага кончыка носа. На пліце ў патэльні сквірчэла мяса. Людміла чакала са школы Васю. Васю яна любіла, бо ён агрызаўся з бацькам, абараняў яе. Арцём не лез у іхныя сваркі, але гэта зусім не азначала. што ён не перажываў. Бачыла — перажываў.

Жонкі дзеляцца на тры групы: жонка-Дай, жонка-На і жонка-Дай-На. Самая малалікая — другая. Першая і апошняя могуць супернічаць, хоць часцей перацягвае першая.

Людміла Чуйкевіч паўнапраўна належала да самай няўдзячнай, з пункту погляду мужчыны, першай групы. Хто б мог падумаць на пачатку сямейнага жыцця, што ейныя бяскрыўдныя свавольствы з грашыма, іх безаглядная трата на легкадумныя дрындушкі перарастуць ў ненасытнае, грозна-патрабавальнае «Дай!».

«Дай футра! Дай завушніцы з брыльянтам! Дай джынсавую спадніцу! Дай машыну!»

Калі Кастусь на гэтыя патрабаванні ўжо не мог станоўча адказаць, Людміла перастала бачыць патрэбу ў ім. Тое, што ён творца, можа, мільянер духоўнасці, яе мала цешыла: за гэта нічога не купіш. Цяпер была свабода: зарабляй колькі хочаш і — галоўнае — як хочаш. Чуйкевіч і не хацеў, і не мог. ПЕРАБУДОВА ўспеніла напаверх жыцця ўсякіх хапужнікаў, а ён такім не быў.

Пра якісьці чалавечы абавязак шкадаваць, спачуваць, ратаваць яна і блізка не думала. Навошта? Нават калі ніякіх ейных затрат на яго не было, усё роўна такі муж, ад якога нічога не прыбывае асабіста ёй, не ўяўляў каштоўнасці.

Голас: «Для чалавека багацце — не багацце».

У Людмілы была рэдкая здольнасць: не бачыла, што мужам зроблена, і бачыла, што не зроблена. Абвастралі ейны зрок і сяброўкі. Адна, пабыўшы ў кватэры, сказала, што ў ёй не адчуваецца мужчынскай рукі. Жаночай не адчувалася, можа, яшчэ больш, але гэта іх абедзвюх не цікавіла. Як і тое, што саленні-варэнні розныя год ад году рабіліся менавіта ім. Гатаваў ён адмыслова і — галоўнае — з вялікай творчай любоўю.

Задыміла на патэльні мяса, і Людміла схамянулася. Халера ясная, зноў не будзе Вася есці, скажа, падпалена. Проста дзіва, які ён гурман, гэты Вася. Абы-што не есць, крыху не з тым душком страву нават не паднось. Вось ужо каму ў жонкі патрэбна будзе адменная кулінарка. Дзе яе знайсці? Сучасных дзяўчат яшчэ больш, чым з ейнага пакалення, не прыгнаць да кухні. Дый размовы пра голад не без грунту.

## РАЗДЗЕЛ 32

З Чуйкевічам адбывалася штосьці няладнае. Воля, якой ён таемна ганарыўся, здраджвала яму. І кіравала ім ужо не воля, а невядома што. Ён быў агалены, адкрыты для нападаў, без усякай ахоўнай абалонкі. Бы смоўж, з якога знялі ракавіну. Што сталася з жыццём? З ім самім?

А калісь жа ён бегаў, абліваўся халоднай вадою, адчуваў сябе бадзёрым, упэўненым. Яму лёгка, з натхненнем пісалася. Тут была такая ўзаемнасць: радасць жыцця нараджала натхненне, а натхненне нараджала жыццёвую радасць. Цяпер, адчуваў, яго затапіла паводка тугі ад безнадзейнасці, разгубленасці, няпэўнасці. Здавалася, сваё прызначэнне на зямлі ён выканаў. Мусіць жа, ад такой нязгоды, разладу з людзьмі і грамадствам, ад страты мэты пайшоў самахоць з жыцця ягоны дзед Арцём.

Скуль у ім, Чуйкевічу, з'явіліся такія думкі? Ён іх не жадаў, яны самі прыйшлі. Самі-то самі, але ён разумеў, што брыдзе па краі крутой бездані. Ён ледзьве трывае, каб не сарвацца і не паляцець у небыццё. Багата псіхалагічных разгадак яму падказвалі сны, лунанне думак у звышрэальным, тонкім свеце.

## РАЗДЗЕЛ 33

Яны, ДУШЫ, убачыліся яму белымі, у выгінастых абрысах рознай велічыні. І яны размаўлялі з ім, праўдзівей, размаўляла адна, большая памерам, адказвала на пытанні чалавечым голасам. Ён адчуваў, што гэта не сон. Вось ён, ляжыць на канапе, а думкі ягоныя бы па тэлеграфе лётаюць у свет душ. Ён іх запамінае, дзівячыся з дакладных афарыстычных, часам проста геніяльных адказаў з неба.

Пасля ён глядзеў каласальнай моцы і яркасці сюжэт (падумаў: «Гляджу кіно!»), дзе быў галоўнай дзеючай асобаю. Сюжэт складаўся з трох частак. І ён зноўку жахаўся, лежачы пры свядомасці, толькі з закрытымі вачыма, наколькі ўсё тут ясна, выразна, незвычайна.

Частка 1. Маладая густая зялёная рунь. Яму трэба кудысьці паспець, і ён бяжыць па гэтай руні, правальваючыся па пояс, як у снезе. Рунь здратавана, і ўжо да яго з кучкі людзей, якую адчувае за спінаю, тупаціць вартаўнік. Ім аказваецца дзядзька Мі-

халка-Проччым. Кідаецца ў вочы, што ў яго круглы, адкормлены твар. Чуйкевіч кажа: «Я засыплю гэтыя ямкі». Грабе зямлю, бачыць у ёй непраpослае жыта, але гэтай зямлі катастрафічна не хапае, каб зраўняць. Скульсьці за ім сочаць незнаёмыя маладыя людзі ў невядомай вайсковай форме. У замку ў шырокім вакне стаіць... Васіль Быкаў, таксама ў акружэнні такіх людзей. Чуйкевіч дзівіцца яго бачыць і, здаецца, гэта ён імчаў менавіта да яго.

Частка 2. У рэдакцыі. Ямачка кагосьці з маладых аўтараў выпраўляе з кабінета, рэзка, злосна. А побач за сталом начальнік СТК Ілля Нічыпаравіч Мочкін прымае ў Чуйкевіча экзамен на вадзіцельскія правы. Але заміж білетаў даў яму некалькі вокладак часопіса «Ідэі перамагаюць». І ён павінен гэтыя вокладкі разгадаць. Адну разгадвае — Мочкін паказвае другую. Чуйкевіч кажа, што не ведаў, што трэба і гэтую, але ўсё роўна паспяхова разгадвае. Сілуэт вялізнага быка, і цень ад яго (яшчэ большы) кладзецца на зямны шар, за якім чорная дзірка ў тумане. Гэта сімвал пагрозы планеце, якая зыходзіць ад ядзернай зброі — такі быў ягоны адказ. Зноў вокладка... Якісьці монстр, тыпу чалавека, унізе якога тулава пераходзіла ў бутэльку ў форме фаласа. Разгадка: праз алкаголь чалавек вылівае з сябе энергію. Трэці малюнак на вокладцы. Вялізная конская галава з чырвонай скулою на пашчэнцы. Гэта камуністычная прышчэпка, якая не вылечыла, а дала нарыў — так адказаў ён. І Мочкін лёгка паставіў яму залік. А потым той малады хлопец, якога вытурыў Ямачка, уручае Чуйкевічу ў цэлафанавым пакеце вэнджаную палавінку ляшча, сакаўную, тлустую. Ён кажа: «Я тут ні пры чым, ад мяне нічога не залежыць»,— але бярэ. Бярэ, а ў самога гэтай рыбы навалам (брат прывёз). Тут жа, каля століка, багата ягоных аднакурснікаў, яны ўсё бачаць. Чуйкевіч думае: калі гэтая палавінка ляшча будзе лічыцца хабарам, то, на выпадак канфлікту з рэдактарам, хлопец напіша на яго данос. І Чуйкевіч вяртае яму гэтага ляшча. Яму не спадабалася. І вось ужо трое хлопцаў палююць на яго, каб пабіць. Ён адразу пабойваўся іх, а тады, калі яны селі пад сцяну замка і адзін з іх нагою ўдарыў яму ў пахвіну, бачачы, што вакол людзі (горад), пачаў лупцаваць хлопца. У яго (і ў астатніх) у вачах спалох, і Чуйкевіч думае: праўду кажуць, што злу трэба

даваць адпор. Зноў вяртаецца да Ямачкі. Там на стале ўжо процьма ўсякай рыбы, ікры. І з'явіўся старшы літсупрацоўнік Агурэчнікаў (у сапраўднасці: зусім лысы) з новай прычоскаю — доўгія валасы, палова чорная, палова сівая, зачэсаныя назад.

Частка 3. Сабраўся ў вёсцы ўвесь род: сваякі, блізкія. Ён — у цэнтры ўвагі. Цётка Дарка гэтак шчыльна да яго прыхінулася, гладзіць па галаве і кажа: «Во гэтая разумная галава ўсяго дабілася... Хоць і бацька з кулакоў, нічога не перашкодзіла». Чуйкевічу вельмі прыемна слухаць яе, усведамляць, што ім ганарыцца род.

Адале вабная жанчына з акругла-поўнымі нагамі (нібыта вольных паводзін, родам з суседніх Смародзічаў), распрануўшыся, ідзе на агарод, а за ёю незнаёмы мужчына. Хто гэта? Пётр Пятровіч?.. Скуль ён тут узяўся? Зіма. Жанчына пачынае прыгожы танец на снезе, і вакол яе, як здані, жанчыны купальскіх кастрышчаў. Чуйкевіч начоўкамі чэрпае снег і абсыпае ім жанчыну. Яна аж гарыць ад блёстак. Уражанне неймавернага хараства, казкі. Ён робіць гэта з азартам, радасна...

## РАЗДЗЕЛ 34

Сны былі вялікай часткаю ягонага духовага свету. Ён зрабіў багата назіранняў над імі, пранік у такія-сякія таямніцы іхнай прыроды. Сны разгружалі ягоную псіхіку ад патаемных жаданняў, выштурхоўвалі ўсякую непатрэбшчыну, падказвалі ягоных ворагаў, у чым хаваецца зло; загадзя папярэджвалі, скуль чакаць небяспеку; у снах нараджалася шмат вобразаў, нават вершаў, новых, невядомых картатэкам слоў, прыкладам, *турыснуў* (кінуў, шпурнуў). Ішоў падсвядомы працэс творчасці, у якім было куды менш загадак, чым у свядомым.

Як жа ён шкадаваў, калі, прачнуўшыся, мала што помніў. Чуйкевіч разумеў, што сны для творчага чалавека — знаходка. Ім вялікае значэнне надаваў Максім Гарэцкі. Нядаўна Чуйкевіч прачытаў, што Грэму Грыну сны падказваюць сюжэтныя хады. Чуйкевіч і радаваўся снам, і баяўся іх. Баяўся, бо некаторыя ягоныя сны былі прарочыя, спраўджваліся: хутка, праз колькі дзён, альбо нават праз гады. Нядаўна ён, гартаючы запісныя кніжкі ранейшых гадоў, наткнуў-

ся на сон: пажар у іхнай вёсцы, згарае хата і жанчына ў ёй — Ганна Чуйкевіч, маці ягонага сябра Жэнькі.

Дзіва б тут не было. Ганна сапраўды згарэла — так, як апісана ў сне. Але адна дэталь патрэсла Чуйкевіча: сон прысніўся за тры гады да таго, як ускінуўся пажар. Чуйкевіч не паверыў. Будучы ў вёсцы ў адпачынку, ён удакладніў у маці, калі згарэла Ганна. Яна назвала год. Памылкі не было. Як пасля такога сябе адчуваць?

І быў другі сон, пра які Чуйкевіч успамінаць не хацеў. Багата было пražыта, ледзьве атрэпаўся ад удару. І здарылася гэта тады, калі ён назойліва думаў пра Жанну, сакратарку, заляцаўся да яе, адчуваючы ўзаемнасць, і ўсё ў іх ішло да сустрэчы пасля кавярні ў якімсьці схронным закуточку. Бо ў рэшце рэшт да гэтага толькі і зводзіцца інтарэс адно да аднаго разнаполых асобаў.

Ён прысніў, што сын Арцём упаў у глыбокую яму і моцна пакалечыўся. Роўна праз тры дні, у нядзелю, Вася і Арцём выйшлі пагуляць на вуліцу. Праўдзівей, яны з жонкаю выправадзілі іх на свежае паветра. Тыя не хацелі ісці, лезлі да тэлевізара. Можа, праз паўгадзіны прыбягае Вася, збялелы, напалоханы: «Там Арцёмка ўпаў!.. Ён страціў прытомнасць...» — «Дзе ён?» — толькі і спытаў Чуйкевіч, вылецеў на вуліцу. Арцёма дзяўчаты ўжо занеслі ў домакіраўніцтва і адхайвалі. Чуйкевіч глянуў і не паверыў сваім вачам: твар у сынка ўвесь быў у крыві... Арцём стагнаў, мармытаў: «Я нічога не помню...» Божа, гэта сон!.. Усё як у сне! Няхай гэта будзе сном!

Ён адмовіўся тады ад заляцанняў да Жанны. У здарэнні з сынам убачыў нябеснае папярэджанне. Значыцца, гэтая ягоная сувязь была непажаданая, магла мець сумны вынік.

Чуйкевіч зрабіў адкрыццё: іншы раз сны былі асабліва яркія, сімвалічныя і насычаныя пасля выпівак альбо якойсьці стрэсавай узбуджанасці. Тады сам сон ледзьве не праз усю ноч быў суцэльным снабачаннем. З малюнкамі, дыялогамі герояў. Ён радаваўся: вось падораны Богам шэдэўр, які застаецца адно запісаць. І, магчыма, каб ён устаў адразу пасля прагляду, то і запісаў бы яго. Але не давала лянота. Мо наўмысна? Ён засынаў, а ўранні, прачнуўшыся, на жаль, помніў толькі абрыўкі сцэн і фраз. Кшталтам, вось гэтыя: у фінале кадэбісты надзелі яму на-

ручнікі, і ён спытаў: «За што?» — адзін, азызлае мурло з пунцова-заплылым павекам, груба рыкнуў: «За нападки на конституционность!» Якія нападкі, калі яны былі? Вунь жа нават Скроня не арыштоўваюць. Выразна запомнілася ідэя твора, якую прадыктаваў Голас: «Усякае грамадства *хлусіць,* быццам робіць усё для чалавека, таму і разбурае гэтага чалавека, сее зло і смерць, нянавісць і мярзоту».

Не ўтоплены ў вялікім горы, Чуйкевіч тапіў сябе ў маленькай чарачцы. Так яму в ы д у м а л а с я выратаванне. Разумеў, што гіне, і не мог нічога з сабою зрабіць. Ён быў выхаваны як раб, і перамены, што перавярнулі ідэалы, бязлітасна губілі яго. Грам алкаголю быў адзіны шчыт ад напасцяў. Пад ім ён знаходзіў куточак у чорным пакоі зла.

Каўтаў грамульку, а значыцца — не працаваў. Ён ніколі не садзіўся за стол нават пасля глытка піва. У такім стане не давяраў свайму розуму. Лічыў, што і кропелька алкаголю пазбаўляе яго натуральнасці. Ён будзе выдаваць не тое, што трэба, а нешта скамечанае, расхістанае, пазбаўленае адметнасці. Гэта зусім не азначае, што яму не прыходзілі думкі. Прыходзілі — ды яшчэ як! У думцы чым больш нечаканасці, парадоксу, свежасці, тым лепш. Чытаць прозу, у якой няма думак, усё роўна што піць з пустога кубка. А з твора, пераплеценага такімі думкамі, можа атрымацца бязглуздзіца. У творы ўсё да тонкасцей прадумана — кожная дэталь, знак прыпынку, абзац,— няма нічога выпадковага. Нават інтуіцыяй адкрытыя рэчы праходзяць стадыю ўсведамлення. Карыснае чалавечай душы ляжыць толькі ў плоскасці свядомасці, разбуральнае дзейнічае з падсвядомасці. І мастацтва якраз вымятае з падсвядомасці душэўнае смецце. Гэта чалавекам не адчуваецца. Ён толькі раптам заўважае, дзівіцца, што стаў лепшым, яму хочацца рабіць дабро. І не разумее, чаму зноў становіцца злосным, незадаволеным.

## РАЗДЗЕЛ 35

Ратаваўся Чуйкевіч некалькі дзён. Бы трэску, высякаў сябе з жыцця. Яно цякло дзесьці за дзвярыма ягонага пакоя, за межамі кватэры, на вуліцы, у транспарце, дзяржаўных установах. А ён паміраў для гэтага жыцця. На пэўны час. Іншы раз, ідучы па

вуліцы, ён уяўляў, што яго НЯМА. І што мянялася? Нічога. Зямля стаяла, і было гэтае месцейка, па якім ён ідзе.

Не думаў пра бандзюкоў, якія запрасілі ў яго пяць тысяч, пра Субач з ейнай пагрозаю здаць яго органам, не ўспамінаў нават Вераніку... Любата! Ён страчваў адчуванне дня і ночы. Спаў удзень, прачынаўся сярэдначы. Галава трашчала ад тугіх ціскоў. Знаходзіў чарачку-лялечку, рабіў маленькі глыток... Ціскі адпадалі ад галавы, як мачты ад ракеты перад стартам. Яснела ў вачах, быццам мянялі ў люстры лямпачкі меншыя на большыя. На душы цяплела, і ён думаў, што час — гэта катэгорыя, выдуманая для біялагічнага рытму чалавека. У духоўным плане такога паняцця няма. І прасторы няма, бо адносна чаго яна прастора, калі ён сам — прастора, цэлы космас?

Чуйкевіч выдзіраў з паліцы беларускую кнігу. Менавіта беларускую, бо яму ні з таго ні з сяго раптам хацелася добрага сакавітага беларускага слова. Развальваў кнігу на выпадковым месцы і з прытоенацёплай радасцю чытаў: «Памагала полю балота, ціхія, цёплыя, зарослыя асакою затокі, зацягнутыя тванню канавы з асклізлым ламаччам, смярдзючыя лужыны з цінай і раскай. У Куранях, мабыць, не было такой хаты, якая не мела б рыбалоўнай прылады».

Голас: У кожнай фразе, як у зубе, павінен быць жывы нервік».

І ў душы, спаленай агнём атрутнага зелля, наклёўвалася, напамінаючы, што яшчэ жывая, магічная прага пісаць. Можа, гэта і была ў ягоных безнадзейна заблытаных варунках адзіная сіла, якая вырывала яго з «піке», штурхала ў грудзі, у галаву: ты яшчэ патрэбны, ты можаш быць карысны грамадству, яно не выраклася і не адрынула цябе цалкам. Навошта губіш сябе, так нікчэмна распараджаешся Божым дарам? Прыгажосць падуладна табе — захапляючыся ёю, ты павінен сеяць вакол ясныя, чыстыя эмоцыі, якія будуць грэць людскія душы. Яно яшчэ наладзіцца, грамадства гэтае, ачысціцца ад бруду, і ачысцішся ты...

Ён лажыў на стол кнігу, адкідваўся на канапу і засынаў. Сон быў мёртвы, але кароткі. Прачнуўшыся, не вагаўся — піць сваю грамульку альбо не піць.

Чуйкевіч не піў, але і не пісаў. Хіба што дзённік,

і то з перамежкамі. Бітумна-цяжкі духовы стан не нараджаў натхнення. А без натхнення творчасці не бывае, можа быць толькі рамесніцтва. Плод ягоны халодны, як замарожаны яблык, не мае ў сабе магіі прыцягальнасці, што нябачна сачыцца з твору мастацтва. Гарэлка вымывала з мазгоў і сэрца чалавечае, цымус унутранай прыгажосці. Раба нельга адпускаць на волю, ён робіцца п'яны і некіруемы, бо запраграмаваны, як робат. Раб-работа-рабак (чарвяк)-рак — назовы, дадзеныя Богам. Робат — слова, прыдуманае людзьмі, і таму ў яго закралася памылка. Трэба: раба́т — нежывы раб.

З грудзей выпірала спружына. Здавалася, вось-вось пстрыкне ўверх — і галава разляціцца на кавалкі, бы спелы кавун ад моцнага ўдару, а ружовая мякаць мазгоў звыродна прыклеіцца да сцен. Чуйкевіч сціскаў зубы, каб не даць волі гэтай спружыне.

## РАЗДЗЕЛ 36

Уначы ён пакутаваў. То хтосьці цяжка навальваўся на яго, скручваў у бараноў рог і гнёў да зямлі, і ён, амаль наяве адчуваючы яго, не мог скінуць: разам з ім пранікаў скрозь паверхі дома, бачыў сябе ў зямлі. То раптам чуў, як хтосьці ламаецца ў кватэру, тупае, ідзе да яго... Бандзюкі, Субач?.. Але гэта аказваўся Цішкоў з незнаёмаю жанчынаю за руку. То бачыў сябе страшнага, апухлага, znявечанага ў люстэрку і думаў, куды ісці ў паліклініку...

Выхлап — і ён прачнуўся. Было цёмна. Стаяла зняверанaя ноч. Колькі часу, ён не ведаў. Гадзіннік невядома дзе. Калі б не гадзіннікі і не чаргаванне дня і ночы, чалавек не фіксаваў бы час увогуле.

Ступіў да вакна. Ён любіў глядзець у цёмнае начное вакно без святла ў пакоі. Ад неонавых ліхтароў цьмяна льсніліся цэментовыя ходнікі. Блішчэлі круглыя размытыя плямы святла на кузавах панураных ад беспрытульнасці легкавушак. Ніводнай жывой душы. Значыцца, дзесьці гадзін каля трох ночы.

Чуйкевіч адчыніў фортачку. Па-мышынаму піскнула завеска. Пад кашулю на змарнелае цела пацёк ядраны халадок. На імгненне-другое — гэта быў паратунак. А далей — пакуты. Да раніцы далёка, і ён напакутуецца дай Божа. Ці вытрымае?

Чуваць праз сцяну, як сапе жонка ў суседнім

пакоі. Сыны спяць ціха. Яму было шкада іх. Менавіта іх, а не сябе. Якая ганьба, што ў іх бацька алкаголік. А можа, рабОтаголік? Так мянуюць тых, хто не можа без работы. Не, ён не рабОтаголік, а рабАтаголік.

«Хвароба, гэта хвароба...— скрыпеў зубамі ад бязлітаснасці прысуду.— Раз хвароба, ужо ўсё роўна. Мне не ўваскрэснуць!» Хворае грамадства — хворы і ён. Заражаны ўсімі тымі хваробамі, што і грамадства. Іначай і быць не можа, бо ён з'яўляецца клетачкаю грамадскага арганізма. Ён свядома вёў сябе да адчаю, каб рухнулі апошнія, ужо кволыя падпоркі. У нейкі момант ён адчуў, што сумленне дарэшты вычарпана і на самы маленькі дакор яго не засталося. Ён не ўсё і не да канца яшчэ праверыў і выпрабаваў на сабе. Дзяржава, якой ён сумленна служыў, не можа нават забяспечыць яго цывілізаваным напіткам. Што застаецца — брыдота?

Ціхенька адчыніў дзверы свайго пакоя і на дыбачках, абліваючыся потам, празыбаўся па вітальні на кухню. У «слупку» на верхняй паліцы быў ягоны здароўны куток: электрабрытва, дэзадаранты, тубы з жэле пасля галення, адэкалон. Дрыготкая рука вылавіла галоўку бутэлечкі з адэкалонам. Цяпер уся ўвага хваравіта засяродзілася на гэтай пляскай бутэлечцы з наклейкаю «Саша» — прыгожы сексапільны твар маладога мужчыны.

«Эх, Саша!..» — уздыхнуў Чуйкевіч. «Саша» не выдасць, не напіша данос, абы толькі не прачнулася жонка. Узяў хрустальны кілішак — шырокенькі, на тоненькай ножцы. У халадзільніку знайшоў яблык, паклаў у кішэню трыко і адчуў сцягном халадок.

Пракраўся, як злодзей, у свой пакой. Паставіў кілішак на падваконнік. З рыльца бутэлечкі здушана, з кароценькім свістам булькнула. Цякоміна апякла горла. Спёрла — не прадыхнуць. Праз нос ірвануў на волю горкі, нейкі мыльны пах. Сцяўшы дыханне, Чуйкевіч адкусіў яблык, адчуўшы на языку сок, але не смак. Глытнуў — зжаваная кашка яблыка перасела дзесьці між горлам і страўнікам: пругкі напор з сярэдзіны глыбей яе не пускаў. Ён адкусіў яшчэ і ледзьве прапіхнуў кепска перацёртую зубамі кашку ў страўнік. Выцер з вачэй едкія, як бензін, слёзы.

Лёг на канапу. Свядомасць не адключалася, з ейнай вашчыны натужна высубліваліся думкі. Бачыў квадрат вакна. У шкляной сіні неба калюча мігцелі

зоркі. Ён наліў яшчэ кроплю і выпіў з меншай цяжкасцю. Свядомасць затуманілася, але танюткая павуцінка яшчэ трымала долю яснасці ў ёй. І гэтую яснасць ён абарваў трэцяй кропляю. Бутэлечку і кілішак, не задумваючыся, шпурнуў у фортачку. Кілішак аб штосьці звякнуў, а бутэлечка слізганула па ўтаптаным снезе і мякка, бы пінгвін, выехала акурат на ходнік. Блішчэла там, як скручаная зялёная змейка.

«Бог з ёю, хто здагадаецца, скуль яна выпала?» — падумаў Чуйкевіч і лёг. І раптам яго апаліла: «Мусіць, гэта той кілішак, да якога дакраналіся вусны Веранікі!..»

## РАЗДЗЕЛ 37

Са скляпеністай столі бункера выпаў і з'ехаў убок круг метровай таўшчыні. З люка бязгучна апусцілася на мармуровую падлогу жанчына Няміла. Зверху над падвічкаю выпстрыкнула антэна. Акурат па ёй палова жанчыны па вертыкалі знікла.

Як па камандзе, перад палавінкаю жанчыны Нямілы выстраіліся чорныя струкападобныя істоты.

— Пакажыце аб'ект!

Са сцяны выпнуўся дрыготкі, жывы, як вада, экран. Праз секунду на ім праявіўся клазет. Над ракавінаю, абняўшы яе рукамі, курчыўся ў сутаргах голы мужчына. Напружвалася худая спіна, жывот уцягвала да самай хрыбціны, з рота міліметровай лёскаю цякла вязкая сліна. Вочы ў мужчыны лезлі на лоб, чырванелі, як вішні, а шчокі былі белыя, як папера. З плячэй курэла пара. Грудная клетка ад частага дыхання хадзіла ходарам, рэбры выпіналіся, як мяхі гармоніка.

Неймавернай прыгажосці вока жанчыны Нямілы міргнула.

— Узмацніце ўздзеянне! І пара выходзіць на міражы смерці.

Істоты наперахапкі пабеглі ў нару дзвярэй.

## РАЗДЗЕЛ 38

Хтосьці ўладарны накручваў у грудзях спружыну. Яна тужэла, набіраючы ў сабе сілу. І гэтая невядомая сіла кідма кідала Чуйкевіча па кватэры. Ён не знаходзіў сабе месца. Ён ні на чым не мог засяродзіцца. У яго ўсяродку наспяваў якісьці вы-

бух. Шумела ў вушах, бы там засела мыльная пена. Скрозь гэты імглісты шум незразумелы Голас паклікаў яго: «Кастусь, хадзі!» Ён падумаў: было б добра, каб прыйшла жонка. Але ў вітальні нікога не было. Выходзіць, здалося? У люстра трумо ўбачыў на скроні касмыль сівізны. Спалохаўся: «Раптам пасівеў?..» Але гэта пryліпла пер’інка з падушкі.

Сеў на канапу, сілячыся ўтаймаваць сябе. Загадваў: «Супакойся! Усё нармальна! Нічога з табою не адбываецца!..» А чаму ў пакоі столькі пылу? І чаму ён лятае, калі зачынена фортачка і няма ветру? На фоне цёмна-вішнёвай сценкі-секцыі лялалі белыя пылінкі. Ён глянуў на вакно. Неба было чыстае, блакітнае — і ў ім кружылася чарада шпакоў. Што за дзіва? Скуль цяпер, узімку, у горадзе шпакі? Можа, гэта вароны? Не, на варон таксама не падобна.

Чуйкевіч прылёг і заплюшчыў вочы. Вейкі трэсліся, і трэслася цемрыва, у якім раптам пачалі з’яўляцца прыгожыя твары, смяяліся, плакалі, грымаснічалі. Часам сярод іх мільгалі знаёмыя, як толькі ўспамінаў — хто, яны мяняліся. Калейдаскоп твараў!

Ён адплюшчыў вочы — твары зніклі. Позірк запыніўся на вакне — зноў чорны мак птушак. Чуйкевіч перакаўзнуў позірк на штору — і на месцы ўзораў, выгнутых, бы канькі-снягуркі, лісцяў, пачалі вымалёўвацца твары. Не выродлівыя, а зграбныя, правільныя, у абрысах выгнутых лісцяў. Ну, сапраўды лісце так выткана, што падобна на твар. І чаму ён раней гэтага не заўважаў?

Чуйкевіч перайшоў у свой пакой, абклееены светла-зеленаватымі шпалерамі з букецікамі белых кветак. Калі ён засяроджваўся на якім-небудзь пялёстку, з яго вынікаў тут жа партрэт. І гэта не быў сон альбо галюцынацыі. Чуйкевіч дзівіўся: няўжо вось гэтая кветка, здаецца, малачаю, не падобна на мужчынскі твар? Падобна, бо нічога не мяняецца ў контурах гэтай кветкі. Хіба што сама яна як бы імгліцца. Дзіўная творчасць адбывалася ў яго на вачах. Яна зусім здалася Чуйкевічу неверагоднай. Як толькі ўяўляў чыйсьці знаёмы твар, ён тут жа з’яўляўся на кветцы. З мёртвых. Прыгадаў Брэжнева — і да кветкі прыклеіўся ягоны партрэт: дабрадушная ўсмешка, ямачкі на шчоках, патузваюцца густыя чорныя бровы. Госпадзі, ну не звар’яцеў жа ён! Усё разумее, кантралюе, усё адчувае. Няўжо гэтакім чынам адбываецца ад-

плыццё ў «мир иной»? Ён слухаў, як хваравіта часта торгаецца ў грудзях сэрца.

Яго ахапіла няўтрымнае хваляванне. Ён не баяўся смерці, але надта моцна ў ім сядзеў інстынкт жыцця. Дзе лунае, куды перанеслася ягоная свядомасць? У зменены стан? Чаму менавіта ў гэты момант? «Няўжо чахол?..» Трэба шукаць выйсце, нейк ратавацца. У галаве кіпелі мазгі, раздзіраючы швы чэрапа. Ён узяў у рукі круглае люстэрка: белы зблажэлы твар СМЕРЦІ глядзеў на яго ягонымі ж чырвонымі, налітымі вачыма.

Ён зразумеў, што сам сябе ўратаваць не зможа.

### РАЗДЗЕЛ 39

Ледзьве трапляючы ўказальным пальцам на белыя фасоліны кнопак, Чуйкевіч набраў 03.

Стаяў каля вакна і чакаў «хуткую дапамогу». На суседнім шасціпавярховым доме дзядзька ў вушанцы адбіваў ломам са страхі вялікія ледзяшы. Яны былі матавыя ад марозу. Ледзяшы грукалі аб асфальт і далёка разляталіся, мільгалі аскалёпкі.

Перад ім быў свет — неўладкаваны, хворы, са страсцямі, радасцямі, урэшце, слязамі, але — сапраўдны. Чуйкевіч выпраўляў сябе ў свет знявечаны, перакручаны, пераніцаваны. У свет такіх жа адрынутых, як сам, які толькі для людзей збоку быў таксама жорсткай, нявыдуманай рэальнасцю.

Белай растлусцелай гускаю нячутна падплыла да пад'езда «хуткая», з маячком, падобная на тую, што падбіла на шашы сабачку. З яе вылезлі тры рухавыя, спружыністыя мужчыны. Адзін з чамаданчыкам.

— Што здарылася? — спытаў з насцярогаю мужчына. Чуйкевіч загадзя адчыніў дзверы.

— Мне цяжка... Здаецца, што я паміраю...

— Збірайцеся! — уладна загадаў мужчына. У яго былі порсткія чорныя вочы.— Вы алкаголік!

— Як, за што браць? — не зразумеў Чуйкевіч.— Я мала і рэдка п'ю.

— Адзявайцеся. Вазьміце пашпарт. Мы ведаем, што робім.

«Бясслаўны канец»,— сядзела, як цвік, у мазгах думка ўсю дарогу да Навінак. Ён разумеў і бачыў у заінелае вакенечка, куды яго вязуць. Пастаноўка на ўлік, лячэнне... Далоў пасведчанне на кіраванне аўта-

мабілем, таварыства паляўнічых і рыбаловаў, паездкі за мяжу. Не маючы амаль ніякіх правоў, ён пазбаўляўся і гэтага мізэру. Ён ужо не вінаваціў грамадства, бо такі прысуд вынес сабе сам.

У рэгістрацыйным пакоі на яго завялі амбулаторную карту. Чуйкевічу было блага, яго заліваў пот. Ледзьве стаяў перад рэгістратаршаю — яркавуснай жанчынаю; на пераносіцы ў яе была глыбокая складка, якая надавала бровам хіжы злом, а вачам драпежны выраз. Яна не запрашала яго сесці, быццам ён якаясьці бронзавая статуэтка, а не хворы чалавек.

— Хадземце са мною,— нарэшце сказала рэгістратарша. Завяла яго ў кабінет з таблічкаю «Псіхіятар-нарколаг».

За сталом сядзеў высокі малады мужчына з шыкоўнай светлай барадою, бруснічнымі, дзіцячымі губамі. Ён, відаць, быў з тых, хто бараду носіць не дзеля моды, а дзеля таго, каб схаваць недахопы твару — масіўны падбародак і россып барадавак на шчацэ. З-пад лоба ўважлівасцю свяцілі праніклівыя вочы.

«Напрактыкаваны позірк»,— падумаў Чуйкевіч. Доктар паказаў рукою на выцертае да нітак крэсла каля стала. Задаваў пытанні тактоўна, не прыніжаючы годнасці Чуйкевіча. Хутчэй нават спачуваў свайму пацыенту. Адказы на тры пытанні яго, падобна, здзівілі: якая прафесія ў Чуйкевіча («журналіст»), ці мае дзяцей («двух сыноў») і ці піў сурагаты, адэкалон («адэкалон»).

Чуйкевіч і сам дзівіўся, бо кепска піў і пераносіў нават звычайную гарэлку. Выходзіць, усё адбываецца не з ім, а з ягоным героем: пішучы раман, ён наўмысна ездзіў да мужа жончынай сяброўкі, аднаго кіношніка, які два разы лячыўся ад алкагалізму.

— Вы разумееце, спадзяюся, як гэта называецца,— сказаў на заканчэнне доктар.— Мы прывядзём вас у форму, а далей падумаем, што з вамі рабіць. Ідзіце ў працэдурную. Там усё раскажуць. Я напісаў, якое лячэнне.

Чуйкевічу доктар спадабаўся. Без цынізму, грубасці. Мусіць, яшчэ не паспеў сапсавацца: па выгляду, гадоў на пяць-сем быў маладзейшы за Чуйкевіча. «Толькі ад чаго лячэнне — не разумею... А ўвогуле тут людзі адзін цуд, апроч рэгістратаршы, вядома»,— падумаў Чуйкевіч, убачыўшы медсястру ў працэдурнай. Нават паміраючы, трэба любавацца на жанчыну.

Медсястра мела сярэдні рост, рэльефныя, крутыя выгіны клубоў пад белым халатам, зграбныя, паўнаватыя ногі. Такой Чуйкевіч убачыў яе са спіны. На ягоны «добры дзень» яна павольна павярнулася. Ягоны позірк слізгануў пад цнатліва скруглены абрыўчык жывата і прыляпіўся там на нейкае імгненне. Ну, канечне ж, у жанчыны з такой спакуслівай паставаю павінен быць і адпаведны твар. Чыстай белізны скура, мяккая закругленасць падбародка, выразлівыя вочы, бровы, вусны. Яшчэ б сюды ўсмешку — і адухоўлены жаночы вобраз засвеціцца ва ўсім сваім хараstве. Дзівак, пра што ён думае ў такой трагічнай сітуацыі?

Медсястра пасадзіла яго за столік. Размашыста чырканула ў карце ручкаю. Спытала, ці хварэў ён на Боткіна. Узяла з вены кроў на СНІД і апусціла прабірачку ў вочка фанернага прыёмніка.

Чуйкевіч міжволі ўстрывожыўся: а раптам? А раптам яго якімсьці чынам паразіла гэтая невылечная зараза? Ёю ж хварэюць не толькі путаны ды «блакітныя», а нават дзеці. Можа, дзесьці падчапіў і ён гэты вірус: вядзе амаральны лад жыцця, ходзіць у лазню, цырульню... Вось калі выявіцца — што тады?

— Кладзіцеся. Паставім кропельніцу. Вам адразу палягчэе.

— Гэта доўга? — спытаў Чуйкевіч, падыходзячы да высокай, засланай цэлафанам канапкі. Каля яе на нікеляваным штатыве быў прымацаваны шкляны, падобны на кокан, сасудзік з гумавай зялёнай шлангачкаю, у канец якой была ўтаркнута іголка.

— Гадзін каля трох. Покуль уся вадкасць не пера-капае вам у вену,— адказала медсястра.

Чуйкевіч ледзьве не самлеў: «Тры гадзіны ляжаць?» Але ўпарціцца не стаў. Скінуў чаравікі і ўзгробся на канапку.

Дотык жаночых пальцаў да голай рукі Чуйкевічу быў прыемны. Ён засяродзіўся на гэтым адчуванні і не пачуў, як медсястра падключыла сасудзік-кокан да вены. Зняла з зялёнай шлангачкі заціскачку, і гумавая змейка пачала выпускаць яму свой «яд». Як, помніцца, калісь і сынку Арцёму, калі разбіўся...

— Ляжыце. Адпачывайце. «Огонек» будзеце чытаць? — спытала медсястра, і Чуйкевічу чамусьці падумалася, што яна не кожнаму прапаноўвае такі занятак.

Чуйкевіч і чытаў, і думаў. Жонцы ён прызнаецца. Ад яе не ўтоіш: трэба ж казаць, дзе ён падзеўся. Хоць пасля гэтага, не сумняваўся, пра яго будзе ведаць уся Беларусь. У рэдакцыю можна пазваніць і сказаць, што трапіў у бальніцу з якімсьці прыступам. Да прыкладу, хапілі ныркі. У рэшце рэшт усё раскрыецца, але на першым часе навошта сеяць плёткі. А там, калі Ямачка не звольніць за прагулы, ён падасць заяву «па ўласным жаданні».

За вакном шумеў вецер. На небасхіле ляжала роўная папялова-шызая града воблакаў. Махнулася ў квадраце закратаванага вакна чорна-белым чаўнаком сарока, села на старую яблыню з крывымі, прамакутнымі сукамі. «Можа, вестку з рэдакцыі прынесла?» — здзекліва падумаў Чуйкевіч. Ён заплюшчыў вочы: цемрыва мільтусілася, дрыжэла, а тады з яго пачалі выплываць прыгожыя эфірна-мройлівыя твары. «Чорт, па-ранейшаму!..» — Чуйкевіч сціснуў зубы. У скронях цікала, бы гадзіннік, насычаная нарадрэналінам кроў.

У працэдурную час ад часу заходзілі хворыя. Сярод іх былі вясёлыя, і Чуйкевіч не разумеў, чаму тут радавацца. Медсястра шпіляла ім уколы. Чуваць былі плескачы па голым целе.

Чуйкевіч ляжаў, здалося, вечнасць. Нерухома. Можа, нават і спаў. А хутчэй былі правалы свядомасці, якая кудысьці ад яго адрывалася.

— Зараз і вам зробім укольчыкі,— сказала медсястра, вырваўшы з вены джала гумавай змейкі і наклеіўшы на ранку пластырам вату.— Ажно чатыры.

— Колькі?

— Чатыры.

«Ну і давёў жа я сябе грамамі, калі гэтак трэба мяне ратаваць»,— варухнуўся дакор. Адна радасць, што ім займаецца прыемная, мілавідная медсястра. Ад такой можна і дзесяць уколаў вытрымаць і не здурнець. Чуйкевіч ужо даўно заўважыў: ёсць нейкая дзіўная залежнасць якасці працы ад вонкавага выгляду чалавека.

Ён агаліў па просьбе медсястры ягадзіцы і назіраў, як яна надразае тонкі кончык ампулы, адломвае яго і забірае шпрыцам лякарства. Заціскала шпрыц між пальцаў, лёгка пляскала па ягадзіцы — іголка зусім бязбольна ўлазіла ў цягліцу. Цяпер ён зразумеў прыроду тых плескачоў па голым целе, якія чуў, лежачы

на канапцы. Такі манер рабіць уколы Чуйкевіч бачыў упершыню.

— Астатняе лякарства... таблеткі, вітаміны вам прынясуць у палату. Хадземце.

— А ці доўга я тут буду? — гэтае пытанне ўжо даўно свярбела на языку ў Чуйкевіча.

— Мабыць, пару тыдняў.

— Столькі шмат?

— Такі ў нас курс.

З усім згаджацца Чуйкевіча змушала ўпэўненасць, што жыццё ягонае ў бяспецы. Што б з ім не прыключылася, тут ведаюць, як ратаваць. І — квола цеплілася спадзёўка, што за гэты час адчэпяцца, забудуць на яго падонкі. Няхай жонка ім скажа, што ён у бальніцы пры смерці. Няўжо ў іх няма сэрца?

У палаце было пяць ложкаў. На двух спалі, накрыўшыся з галавой коўдрамі. Мужчына за тумбачкаю каля вакна чытаў дэтэктывы Чэйза.

Чуйкевіч, павітаўшыся, сеў на засланы ложак злева каля дзвярэй. Выцягнуў з-пад коўдры падушку і лёг. Цішыня. Пад ложкам у куце шабуршэла. Мусіць, мышка грызла заваляны сухар. Трэск стаяў як у каменяломні. Але ён Чуйкевіча не раздражняў. Мышка здавалася яму самай бяскрыўднай істотаю.

## РАЗДЗЕЛ 40

Малкава адамкнула кабінет, шматанула на стол мяккую скураную торбачку — яна ляснула ўсімі сваімі металёвымі зашчапкамі і ражкамі. З маленькага, як табурэт, сейфіка выняла новы пачак «Космасу», імпартовую запальнічку і пайшла ў туалет.

З дзесятка сакратароў партыйных арганізацый, якія Малкава курыравала, яна адразу вылучыла Чуйкевіча. Ён глядзеў на яе паблажліва і, здаецца, не верыў ніводнаму ейнаму слову. Ён спачуваў ёй як чалавеку і не прымаў як начальніцу над сабою. Выказваўся рэдка, але ніколі не падтрымліваў, а толькі пярэчыў. І ўсё роўна штосьці вабіла яе да яго. Яна жыла адна ў пакоі інтэрната, які належаў тэлебачанню, дзе яна да райкама працавала вызваленым сакратаром камітэта камсамола. Сохла без пары і хутка. Ёй у галаву часцей і часцей прыходзіла крамольная думка запрасіць яго ўвечары да сябе, пачаставаць сухім віном, каваю, паслухаць магнітафонны

запіс гурту «Кіно» на чале з Віктарам Цоем, які дасягнуў вар'яцкай папулярнасці сярод моладзі. Што будзе далей, яна не думала, хоць ужо даўно, яшчэ ў школе, развіталася з цнатлівасцю, легкадумна пакахаўшы прапаршчыка роты, якой камандаваў ейны бацька. Найперш яна бачыла ў Чуйкевічу проста цікавага суразмоўцу. Гэта для такой жанчыны, як яна, самае важнае.

Але чым часцей яна спрычынялася да Чуйкевіча, тым больш ён яе насцярожваў. Здаецца, ён не вызначыў сваю пазіцыю ў цяперашніх грамадскіх працэсах. Ва ўсякім разе, барацьбітом за партыйную справу яго не назавеш. Падазрона і тое, што ён усюды і з усімі размаўляе па-беларуску. У яе нават склалася ўражанне, што ён проста не ведае рускай мовы. Аднойчы яна асмелілася пра гэта яму жартам сказаць. Ён таксама аджартаваўся: «Так, я зваліўся з неба, дзе жывуць адны беларусы».

Пасля — гэтая Пракуратура. Так проста туды не выклікаюць. Можа, справа той графаманкі — толькі зачэпка для кампетэнтных органаў дзеля больш саліднага расследавання. Партапаратчык, яна ў тое-сёе была паінфармавана. Не так даўно яе запрашалі як былую супрацоўніцу тэлебачання ў адну ўстанову прысутнічаць пры адпаведным манціраванні плёнкі, на якую быў зняты мітынг у Курапатах.

Ахопленая трывогаю за ўласны лёс, пасаду, Малкава адчула, што ёй лепш старанікца Чуйкевіча, менш кантактаваць з ім. Чаго добрага, яшчэ ўлічаць яе ў сімпатыі да яго.

Малкава адкруціла кран, паднесла пад струменьчык недакурак — ён адразу разбрыняў — і кінула яго ў сметніцу. Вымыла рукі цёплай вадою з мылам, якое ляжала на ракавіне ў залацістай мыльніцы. Націснула кнопку паветранай сушылкі. Пругкі напор гарачага паветра пранізаў ейныя пальцы. Цыгарэта ў вуснах і гэты гарачы пругкі напор узбуджалі ейную сексуальнасць. Яна палахліва зіркнула па баках, прыслухалася, ці чуваць тупат ног на калідоры, і шмыганула ў кабіну. Пстрыкнула зашчапка.

Малкава падняла на клубы спадніцу, ссунула да калень калготкі разам з чырвонымі трусікамі і запусціла пальцы пад ніз жывата.

Можа, хвіліны праз дзве цела ейнае зламалася ад спёртага юрлівага стогну...

## РАЗДЗЕЛ 41

Перад выпіскаю доктар-барадач запрасіў Чуйкевіча да сябе ў кабінет. У ім пахла піхтавым маслам*. У Чуйкевіча закруціла ў носе, і ён колькі разоў чхнуў.

— Будзьце здаровы! — сказаў доктар.

— Здаровы — далей некуды! — За гэтыя дні арганізм у Чуйкевіча ачысціўся ад бруду, падмацаваўся вітамінамі — льга было і пажартаваць.

— Што будзем рабіць, Кастусь Рыгоравіч?

— Піць, ва ўсякім разе, не будзем. Нават чарачкамі-лялечкамі.

— Не заракайцеся. Як правіла, нашы пацыенты праз нейкі час сюды зноў трапляюць.— Доктар пільна, без усмешкі глядзеў на Чуйкевіча.— Я маю на ўвазе тых, каму не зашылі ампулу і хто не закадзіраваўся... Чулі пра метад Даўжэнкі? Выбірайце адзін з двух варыянтаў.

— Гэта абавязкова? — І зноўку пажартаваў: — Нават тым, хто не п'е?

— Сілаю мы не прымушаем. Вы чалавек дарослы і нясеце адказнасць за свае ўчынкі.

У самой магчымасці піць (нават калі не піць) была закладзена адна з нямногіх радасцей не па-чалавечы жорсткага жыцця. Чуйкевіч сам прыбіўся менавіта да такой высновы, назіраючы вакол сябе павальнае п'янства. Віно ажыўляла прыгнечаныя цэнтры сацыяльнага здавальнення, дапамагала заводзіць сяброў і падтрымліваць з імі сувязь. І, канечне, без яго зусім мізарнелі шанцы на каханне, ускладнялася знаёмства і ўзаемнасці з жанчынамі. Пазбавіць сябе чаркі — значыцца, свядома пайсці на знішчальны прысуд: пустэльніцтва, адзінота, прэснае існаванне, беднасць эмоцый. А гэта — надлом псіхікі, заскарузласць, што асабліва непатрэбна чалавеку творчаму. Не, лепш згінуць у багне п'янства, чым згаджацца на такое. Недарэмна ніводная перадача па тэлевізіі цяпер не абыходзіцца без п'янак.

— Мне здаецца, у мяне дастаткова волі, каб устрымацца ад алкаголю і без штучнага тормазу,— сказаў Чуйкевіч, ні на хвілю не сумняваючыся.— Тым больш што я не люблю ні гарэлкі, ні віна.

---

* З а ў в а г а. Водар піхтавага масла павышае патэнцыю ў мужчын.

— Падумайце.— Гэтак жа быў упэўнены і доктар.— Ёсць жа яшчэ і падсвядомасць... апроч волі. Скажу больш: алкагалізм — гэта жывасілам прышчэплены вам вірус, а змест вашай трагедыі — унутры.

— Тут, як кажуць, ёсць пытанне, але... Дзякуй! Пажывём так,— рашуча сказаў Чуйкевіч, бачачы, як сінія вочы ў доктара поўняцца спачуваннем.

— На гэтым заставайцеся здаровы! — Доктар падняўся з-за стала, магутны, дубацелы, падаў Чуйкевічу тонкую цёплую руку. Можа, гэта і няўдзячнасць, і парадокс, але ў Чуйкевіча не было велькай пашаны да доктара. Нутро адмаўлялася прыпісваць яму якіясьці заслугі. Хутчэй ягоная настойлівасць гнявіла: бач ты, разбіраецца...

Чуйкевіч выпнуўся на вуліцу з разбэрсанымі пачуццямі. Пасля трохдзённай адлігі і разводдзя пекануў мароз. На кустах бэзу на кончыках галін віселі празрыстыя, як ампулы, лядзяшыкі. Цвёрды, бы жарства, снег суха хрусцеў пад нагамі. Насустрач ехала машына з валікам-мяцёлкаю пад сабою — у бакі разлятаўся жоўты снегавы пыл. Салатавага колеру лаўкі былі пакрыты інеем. На планках, дзе ўбіты цвікі, чарнелі круглыя плямкі, быццам прайшоў кот і пакінуў сляды. З краю мясціна вытаяла — хтосьці сядзеў.

Гэты свет быў звыклы і вядомы Чуйкевічу. Але сам ён змяніўся, стаў іншы ў гэтым свеце. Таму няўтульна і адчужана сябе пачуваў. Ішоў да прыпынку аўтобуса насцярожаны, як звер. З бухматых таполяў сыпалася дробненькая бліскавіца. Нехлямяжа-панылымі шапкамі чарнелі ўгары грачыныя гнёзды. Іхная скалелая запакінутасць навявала нуду.

Чакаючы аўтобуса, стаяў не на прыпынку, а крыху воддаль, на тратуары. Блізка ад сябе ўбачыў двух мужчын; яны ішлі. Адзін высакаваты, з торбаю на плячы, у шэрай куртцы, другі сагнуты да гарбатасці, у паношаным паліце, зашпакляваным пылам і паараным маленькай махнатай моллю з воўчым апетытам. Твары ў абодвух счарнела-зморшчаныя, з тою абавязковай бледнасцю, якая вызначае алкаголікаў.

Гарбаценькі ступіў да Чуйкевіча, у руцэ ягонай была кніга.

— Мужык,— крануў ён Чуйкевіча за локаць,— купі кнігу.— Павярнуў вокладкаю ўгору. Вокладка была белая, як іней, а літары на ёй чорныя. Кніга была не зусім новая, дабравата пахадзіла па руках —

яе чыталі. Дзеля цікавасці Чуйкевіч прыпыніў позірк: «Густав Флобер. Воспитание чувств». Ад грэблівасці да чорнай, бы ў негра, рукі на белым, хоць і не свежым полі вокладкі Чуйкевіч сутаргавым голасам выціснуў першае, што прыйшло ў галаву:

— У мяне такая кніга ёсць.

А потым ужо думаў: ці ёсць? Цікава, колькі прасіў бы алкаш за кнігу, дзе ўзяў яе, ужо чытаную? Паспеў заўважыць, што гарбаценькі падышоў да інтэлігентнага, з барадою, у цёмных акулярах мужчыны.

«Умее ж, гад, выбіраць пакупніка!..» — падумаў Чуйкевіч. Балюча было, што з кватэр выносілі кнігі і прадавалі. Не да пачуццяў, нават самых высокіх, флабераўскіх, было цяперака людзям: і тым, што прадаюць, і тым, каму прапаноўваюць... ПЕРАБУДОВА дала волю нізкім, жывёльным інстынктам. І ад тых, каму гэтыя інстынкты дапамагаюць неймаверна хутка ўзбагачацца, трэба будзе вельмі-вельмі доўга чакаць к у л ь т у р ы.

## РАЗДЗЕЛ 42

У рэдакцыі часопіса «Ідэі перамагаюць» усе пра ўсё ведалі, але не паказвалі выгляду. Ды сам Чуйкевіч быў свежай, аголенай ранаю, з якой дымілася пара. Частка супрацоўнікаў шкадавала яго: някепскі, здаецца ж, чалавек — і чаму так Бог пакараў? Другая частка, да якой належалі зласліўцы, зайздроснікі, няўдачнікі, хабарнікі, радавалася: чарговы саступіў з дарогі да славы, стаў неканкурэнтназдольны, як сказалі б рыначнікі.

Чуйкевіч хадзіў на працу, хоць і разумеў, што ягоная песенька спета. Гэтак жа калісь спелася песня і ягонага дзеда Арцёма.

Ён падбіраў момант, каб падаць заяву на звальненне. Лепей гэта зрабіць тады, калі падрыхтуе сябе да творчасці. Каб з адной дзейнасці тут жа перакінуцца на другую і не так хваравіта ўрасці ў новае існаванне. Без сумневу, у ім ужо ніколі не знойдзецца месца і часу на грамулі, распусту. Яны не патрэбны будуць. Ён замкнецца ў сабе. Самі сабою адпадуць жанчыны, сябры, падхалімы, шмат якія клопаты, праблемы. Ён цалкам адгародзіцца ад дурняў, хоць без іх сумна: няма з кім параўноўвацца. І — будзе пісаць. Вось толькі пра што пісаць? Раней пісаў тое, што

патрэбна было партыі, што спрыяла лепцы чалавека камуністычнай будучыні. І раптам, умомант, гэта было адкінута, стала нікому не патрэбна. Ні-ко-му.

Але мінула колькі часу, і Чуйкевіч адчуў, што ацэнка ім ранейшых падзей пачынае мяняцца. Выпарылася кудысьці агіда да гарэлкі. А з ягоных зага́раў* зыходзіў нават якісьці водар рамантычнасці. Выключыць сябе з жыцця, кінуць свой розум у брыду пачварнасці, даць пабоўтацца там і вынырнуць зноўку на белы свет абагачаным падсвядомымі з'явамі, можа, безумоўна, толькі унікум. Галоўнае — начэрпаць у душу эмоцый, адкрыццяў. Менавіта ў такім стане зmененай свядомасці, расхістанай атрутаю псіхікі ён выходзіў у якоесьці новае, больш тонкае вымярэнне, дзе спляталіся малюнкі мінулага і будучыні, прароцтвы і прадказанні. Нармальны свет для нармальных людзей. Здаровая (у нашым разуменні) свядомасць не выходзіць за рамкі звыклай прасторы, часу, сэнсу, энергіі. Вырвацца ў іншы, наглуха зачынены, але і с н у ю ч ы свет можна толькі адхіленнем ад нармальнасці. Гэтае адхіленне можа выклікаць траўма, моцны нервовы стрэс, разрад электрычнага току альбо маланка, алкаголь, наркотык, любы іншы дурман. Нездарма індыйскія чараўнікі, каб абвастрыць сваё яснабачанне, нюхаюць атрутную горную траву. І ён спіўся наўмысна таму, каб з хворага грамадства вырвацца ў чужы *прыгожы* свет, дзе няма гвалту і крыві.

Хто дакажа, што гэтыя белыя пылінкі і чорныя кропачкі не ёсць энергетычныя патокі з вечнасці? Які скептык усумніцца, што твары на шторах і шпалеры — гэта праяўленне духу людзей, якія пакінулі гэты свет, але лунаюць вакол нас у іншай матэрыі? Можа, нармальнасць была якраз да нас, будзе пасля нас, але — не МЫ? Хіба можна назваць нармальным грамадства, у якім столькі зла: войны, забойствы, гвалт, здрады, кроў, хлусня, п'янства, даносы, прастытуцыя, хваробы, крадзеж, двурушніцтва, радыенукліды? Такое дазволіць сабе можа толькі грамадства вырадкаў альбо вар'ятаў. Ці, можа, іншыя, высокаарганізаваныя, светы сплаўляюць нам, зямлянам, усю мярзоту, ачышчаючы сваё быццё? І МЫ — усяго толькі магілкі захавання адыходаў зла.

---

* Загар — нашае народнае слова, блізкае па значэнні да сённяшняга «запой».

Чуйкевічу не хацелася прымаць законаў цяперашняга грамадства. І ён свядома ішоў на іх парушэнне. Свядома ствараў сам сабе крытычную сітуацыю, каб лезлі думкі неверагодныя і жудасныя. Чалавек, прывучаны быць рабом, што за яго думалі, вырашалі, планавалі, не можа выжыць у новых варунках, калі кожны — самастойны, а фактычна — безадказны. Нават калі б ён і захацеў стаць незалежным, нікому не падпарадкоўвацца, яму б не дазволілі. Бо астатнія таксама не прывучаны, не падрыхтаваны даваць волю іншым. Раб павінны памерці, каб саступіць месца свабоднаму чалавеку. Але хто яго народзіць?

Голас: «Дэмакратыя — гэта палітычная коўдра».

Ён набліжаўся да смерці. І з вечнасці да яго прыходзілі сны. Скуль яшчэ? Прыснілася, што ён вывучае вочы Льва Талстога перад ягонай смерцю. Жаданне: запомніць вочы генія. Здалёку, калі падступае, яны гараць глыбокім сінім святлом, як у ката ў цемры. А зблізку — звычайныя. Жонка падказвае Чуйкевічу, што адно вока павінна быць паранена. Ён узіраецца, але не бачыць ніякай раны. Тады яна нацягвае павекі, каб іх закрыць, і відаць след ад кулі. Чуйкевіч гадае: з часоў севастопальскіх баёў?

Ён прымаў цяпер адно законы прыроды. І не разумеў, чаму яны не ўсёмагутныя. Чаму па іх не жывуць усе людзі? Няўжо гэта таксама закон прыроды? Вымалёўваўся зачараваны круг. Законы прыроды — гэта чысціня, гармонія, разумнасць, прыгажосць. Чуйкевічу час ад часу здавалася, што душа ягоная вырастае з зямлі разам з травою, дрэвамі, выцякае крыніцамі і рэчкамі, плыве воблакамі, вылятае птушкамі, кузуркамі, матылькамі.

## РАЗДЗЕЛ 43

У Кастуська была неадольная цяга да птушак, раслін і кветак. Пасля таго як шпакі селі награваць яйкі, нецікава стала бавіцца пад хлявом. Канечне, ён мог пабегчы на пагулянку да хлопцаў, насіцца па лужынах, будаваць на ручаях запруды, назіраць, як расцякаецца тонкай рознакалёрнаю плевачкаю бензін-смярдзючка. Але гэтага было мала. Яго цягнула на адзіноту, хацелася мець якуюсьці сваю таямніцу, далучэнне да якой і разгадка якой давалі волю фантазіі і роздуму. Клікала кудысьці

ў невядомасць нез'яснімая ўнутраная сіла. Уладу над ім узялі расліны. Іхны смелы, надзвычай дружны выхад з зямлі, неўтаймаваная прага расці, развінаць лісцікі, выкідваць кутасікі і расцвітаць моцна хвалявалі Кастуська дзе б ён ні быў: на пагоне, у лесе, ішоў па дарозе альбо капаў з маці грады... Дарэчы, пра грады... Бацька, яшчэ слабы, да іх не прычыняўся. Кастусёк з маці выносілі з хлява гной, растрасалі і ўскопвалі зямлю. Потым дзялілі яе на роўныя прамакутнікі. Перш-наперш садзілі цыбулю. Загадзя маці пазразала з цыбулін вяршкі з хвосцікамі, пакідала ў міску з вадою. Граду расчарціла на квадраты, у куточкі якіх торкала цыбуліну зрэзанай мясцінкаю кверху. На гэтых мясцінках ужо выпнуліся светла-зялёныя тугія расточкі. Буракі, моркву, агуркі садзіць было прасцей. Цапком маці праворвала лунку, брала жменьку разбрынялага ў вадзе насення і сыпала ў яе. Услед Кастусёк загортваў зямлёю.

Займеўшы навыкі агародніка, ён задумаў завесці сваю маленькую зялёную гаспадарку. Ускапаў пры хляве, адкуль назіраў за шпакамі, лапік зямлі, дбайна ўзрыхліў, перабраўшы пальцамі кожны камячок, і нават абгарадзіў калкамі. Навыкопваў, а то проста навырываў усякага зелля і перасадзіў на свой агародзік. Браў з лужыны пад страхою бляшанкаю ваду і паліваў. Травінкі перш падвялі, пасагнуліся, а пераначаваўшы, выструніліся так, быццам у кожную хтосьці ўставіў сталёвы дроцік. Сачыць за іхным ростам, новымі лісцікамі, што вылазілі невядома з якіх мяшэчкаў, было не менш цікава, чым за шпакамі. Маці пасміхалася з Кастуськовага занятку, а ён раўніва аберагаў свой гадавальнічак. Дарослыя, яны заўсёды ўмешваюцца ў дзіцячыя гульні, забавы, пакепліваюць, вучаць, а то й прыніжаюць, не ведаючы, што ў іх, можа, зародкі геніяльных ідэй, адкрыццяў, якія прыйдуць апасля, калі дзеці вырастуць. Бацька аднаго разу прыйшоў да гадавальніка, моўчкі пастаяў, дакрануўся далонню да Кастуськовай галавы і пайшоў, а ён застаўся ў незразумелай няпэўнасці, нават якойсьці незадаволенасці.

А неўзабаве тонкі саладкаваты водар, што хваляваў Кастуська на пачатку вясны, разліўся ў паветры густа і ўладна: пахла развораная бліскучая зямля — людзі садзілі бульбу. Вясёлы пярэгалас запоўніў і агарод Чуйкевічаў. Дзядзька Міхалка прыгнаў каня

з плугам. Араў сабе, а заадно й ім. Каля яблынь было няпроста круціцца, ворчык біў па ствалах, здзіраў кару, а хамут чапляўся за галіны, сцярушваў ружаватыя бутоны, і дзядзька Міхалка мацюкаўся.

Устрывожаная нечаканым шумам, вылецела са шпакоўні шпачыха, спалохана косіла вочкамі на зямлю. Кастусёк перажываў, што астынуць яйкі і не выведуцца шпачкі. Ён ужо глядзеў не ў баразну, а на ліпу, на шпакоўню. Рабенькая шпачыха сядзела на галінцы, а потым усё-такі шмыгнула ў шпакоўню.

Можа, праз тыдзень Кастусёк выйшаў на агарод да свайго гадавальнічка. Мелькам зіркнуўшы на шпакоўню, убачыў, як з яе вылезла шпачыха. У дзюбе яна трымала светлы камячок. Паднялася ў лёт і дзесьці праз паўсотню метраў выпусціла тое, што было ў дзюбе. Кастусёк кінуўся глянуць — гэта была пяшчотна-блакітная шалупінка ад яйка. «Вывеліся шпачкі!..» Ён узяў шалупінку на далонь — здаецца, яна яшчэ таіла ў сабе далікатнае цяпло птушанячага цельца. Налюбаваўшыся, Кастусёк паклаў шалупінку на падсохлую забялелую раллю і з якойсьці незразумелай усхваляванасцю, усцешнай радасцю прыляпіўся позіркам да акрытай мяккай лістотаю ліпы.

## РАЗДЗЕЛ 44

Звера гоніць страх, і ён уцякае ў цемрыва глушэчы альбо нары. Чуйкевіч ад страху перад поганню ўцякаў, наадварот, у святло — у святло кахання.

Увечары горад светлы, неба цёмнае. Удзень горад цёмны, неба светлае. Такое адкрыццё зрабіў Чуйкевіч, стоячы на вакзале каля прыступак метро і пераносячы час ад часу позірк з твараў людзей на будынкі і неба. Дзьмуў халаднаваты вецер, гнаў па прывакзальным пляцы абгорткі з-пад марожанага. Зоркі на небе былі ярчэйшыя, чым ліхтары на слупах і вокны ў дамах. Вокны, у якіх гарэла святло, выпісвалі ломаныя лічбы — як на канверце індэкс.

На Чуйкевічу было чорнае паліто і плямістыя сінебелыя джынсы-варонкі. На плячы вісела чорная торба з дзвюма вялікімі кішэнямі на «маланцы». У адной з кішэняў ляжала чатыры білеты на цягнік «Мінск — Масква».

Ён чакаў Вераніку. Пільна ўглядаўся ў змрочныя

твары людзей, што валілі з каменнай пашчы падземнага перахода. Хваляваўся, бо пабеглі ўжо мінуты ад часу, у які яны дамовіліся сустрэцца. Чуйкевіч сам ніколі не спазняўся і не любіў, калі хтосьці спазняецца. Хваляваўся было ад чаго. Менавіта ён, джыгануты асою страху, задумаў гэтую катавасію і ўцягнуў у яе Вераніку. Праўда, яна асабліва не пярэчыла. Ёй, жанчыне, нават лесціла, што каханак прапанаваў ашаламляльную ідэю правесці ноч у купэ цягніка. Да таго ж, яна разумела, што як жанчына можа праявіць сябе толькі па-за сям'ёю і без мужа. Муж — панцыр для жанчыны.

Дзеля гэтай поўнай свабоды, якую не можа даць ні кватэра, ні гасцініца, Чуйкевіч не пашкадаваў грошай на чатыры білеты. А што шкадаваць гэты тлен чалавечага сумлення?

Вераніка прыбегла запыханая, расчырванелая. Вочы былі вясёлыя, поўныя чакання і цікаўнасці, вусны без памады свежыя, як ранішнія макавыя пялёсткі. Яна ўзяла Чуйкевіча пад ручку.

— Прабач за спазненне! Дзіянка не адпускала...

— А маці?

— Паверыла...— Вераніка апусціла вочы.

Яны абое сказалі сваім, што едуць у камандзіроўку, толькі не ў Маскву, а ў Брэст. Прыдумаць прычыну ні Чуйкевічу (для жонкі), ні Веранiцы (для маці) не склала цяжкасці. Цяперашняе жыццё поўнае мітусні, падзей, нечаканасцей. Яно спрыяе ўсякім прайдзісветам. Страчаны кантроль за нормамі грамадства. Грамадства спушчана з усіх тармазоў, нясецца, дратуючы ранейшыя ідэалы. І нават прыстойнаму чалавеку ёсць магчымасць саграшыць. Нас усіх псуе сексуальнае незадаволенне.

Доўгае сіняе цела цягніка павольна прысунулася на віратліва-шматлюдную платформу.

— Нумарацыя вагонаў пачынаецца з галавы поезда! — аб'явіў рупар хрыплаватым жаночым голасам.

У вагон яны залазілі паасобку. Вераніку Чуйкевіч прапусціў уперад, наўмысна адстаў: баяліся знаёмых. Праціскаўся па вузкім калідоры, выглядаючы на пластыкавых дзвярах купэ пазначаны ў білеце нумар месца.

У прачыненым купэ ў канцы вагона сядзела дзяўчына па імені Вераніка. Чуйкевіч пастукаў у дзверы і жартаўліва павітаўся:

— Добры вечар! Можна да вас?

— Месцы занятыя,— не разгубілася Вераніка, зграбна ўкладваючы за плячыма валасы.

— Я экстрасенс. Маё прозвішча Чу...

— ...мак! — засмяялася Вераніка.

— Правільна! Я чытаю думкі. Месцы ў гэтым купэ якраз свабодныя. Вас завуць Вераніка.— Чуйкевіч павесіў паліто, гупнуўся на сядзенне.— Да вас прыехала маці з вашай дачушкаю. Дачушку завуць Дзіяна. У вас ёсць каханак. Ягонае прозвішча... Ат! Не будзем выкрываць.

Яму было весела. Радасць жыцця нечакана разыгралася ў ім зноў, як у дваццацігадовага. Пётр Пятровіч нарэшце назваў справу Субач «отказной». Калі б не падонкі... Жонка сказала, што былі таямнічыя званкі ў той час, калі ён ляжаў у бальніцы. Ды Бог з імі! «Не напірай на жыццё»,— раіў філосаф.

Абаім было зразумела, што авантура ўдалася. Што ноч будзе іхная. Гэтае маленькае ўтульнае купэ стане куточкам шчасця. Можа, вяршыні шчасця, падзенне з якой будзе смяротным. У прадчуванні насалоды Чуйкевіча злёгку зябіла. Ён успомніў са страхам пра бутэльку ў торбе. Адчуў, як загусла, патужэла ў жылах кроў. «Не пачынаць?»

Голас: «Гарэлку трэба піць, але не любіць».

Іх чакаў яшчэ адзін экзамен — перад правадніцаю. Але адказ ужо быў падрыхтаваны загадзя. Прыкра было за несумленную гульню.

Чуйкевіч глядзеў у запацелае, зрабаціненае кроплямі вакно. Мярэжылася, стамляла вочы пашматкаванае святло ліхтароў. Снавалі па пероне людзі з вялікімі чамаданамі і сумкамі на колцах, што нядаўна ўвайшлі ў моду.

Не мог дачакацца, калі цягнік кранецца. Нарэшце ён тузануўся — ляснулі буферы — і лёгенька паплыў. У калідорчыку гаманілі, хадзілі пасажыры; у кожнага быў свой клопат. Чуйкевіч задраіў вакно: сціснуўшы па краях шпінгалеты, апусціў рудую дэрмацінавую шторку. У купэ яшчэ больш паўтульнела.

Хвіль праз пятнаццаць заглянула правадніца. У чорнай уніформе, з высокай распушанай прычоскаю дробна, бы руно, завітых валасоў. Спытала білецікі. Чуйкевіч аддаў ёй чатыры білеты:

— Суседзі выйшлі ў другі вагон. Да сваякоў ці каго там...

Праваднiца разгарнула чорную планшэтку, засунула бiлеты ў вузенькую кiшэньку i выйшла.

Чуйкевiч тузануў убок дзверы. Крутнуў два разы ручку замка. Чай i пячэнне ў цягнiках ужо даўно не насiлi. Разам усе збяднелi. I мiнiстэрства шляхоў зносiн таксама. «То й дзякаваць Богу»,— падумаў Чуйкевiч i радасна сказаў:

— Цяпер мы забранiраваныя, як у танку.

— Хвалю за кемлiвасць! — Веранiка дала ацэнку ўсёй ягонай задуме. Было вiдаць, яна засумавала па iм. Яна не ведала, чаму iм не ўдавалася сустрэцца доўгi час. Калi б уведала — жахнулася б i не паверыла.

Чуйкевiч, сцiснуўшы зубы, выставiў на адкiдны прываконны столiк бутэльку «Белавежскай настойкi горкай» i дзве маленькiя металёвыя, распiсаныя валькамi, чарачкi-лялечкi. Дзеля Веранiкi ён iшоў на парушэнне абету не пiць. Iначай якi ён мужчына, не кажучы ўжо пра рыцара. Хлюпiк, цюхняй, слабак, зануда. Н і к о л і не страцiцца сэнс рабiць сябе сапраўдным мужчынам.

Парэзаў на тоненькiя лусцiкi тоўстую вараную каўбасу, цёмна-барвовы, падобны на гiганцкую вiшню,польскi яблык. Веранiка падала яму плоскую, без наклейкi бляшанку, якую дастала са сваёй торбачкi.

— Адчынi. Гэта крабы. Мама прывезла.

— У нас царская вячэра,— усмiхнуўся Чуйкевiч. Хоць ён i задумаў гэтую паездку зусiм не дзеля таго каб есцi, а тым болей — пiць. Каханне лячыла i ратавала яго. Адно адчуванне, што чужая жанчына, сувязь з якою тоiць небяспеку, належыць яму, акрыляла. Няхай на дзень. Хоць на момант. I дзень гэты цi нават момант значылi ў жыццi больш, чым што iншае. Дзеля гэтага можна было iсцi на ўсё. Такой самаахвярнасцi яму, як нi дзiўна, не маглi надаць нi дзецi, нi праца, нi творчасць. Ён гэта адно фiксаваў, канстатаваў, а не штучна цi няшчыра змушаў сябе ў гэта верыць. Пачуццi самi хлусiць не ўмеюць. Але пра iх могуць хлусiць людзi, зыходзячы з выдуманых, пiсаных законаў.

Нiшто ў чалавеку такiм безаглядна-шчырым не бывае, як пачуццё кахання. Толькi не трэба яго стрымлiваць. Пiшы дыктоўку, слухаючы яго. Тады за яе, колькi б памылак ты нi зрабiў, будзе выстаўляцца заўсёды «пяцёрка». Якiя бар'еры могуць быць i хто

мае права іх ставіць на шляху ў таго, каму хочацца сэрцам, над кім ні на ёту няма насілля? Асуджэнню падлягае насілле, а не мастацтва прыроды.

Іх гайдала: каханне, хмель і вагон. І ўсё ў розных накірунках — упоперак, уверх і ўдоўжкі. Прыемна цалаваць жанчыну адухоўленую, зняможаную ў шторме пяшчоты.

У купэ гарэў адзін цьмяны, з чырвоным крыжыкам на шкле плафон — над верхняй лаўкаю.

Чуйкевіч устаў, каб з вышыні сузіраць жаночае цела. Вераніка ляжала голая на белым прасцірадле. Прыпаднялася на левы локаць, прыпнуўшыся спінаю да сцяны. Сагнула правую нагу ў калене, паставіўшы яе на насок. Яна адкрылася зроку Чуйкевіча ва ўсім сваім пякельным харастве. Скура была смуглая, лёгка загарэлая, толькі свяцілася белізною вакол цёмнага астраўка ўнізе жывата і двума шнуркамі над выгінамі паха — след пляжных трусікаў. Збэрсаныя валасы закрывалі правае плячо, спадалі на грудзі; скрозь рэдкія кончыкі выпіналіся акуратныя, пругкія, бы палавінкі мяча, паўшар'і з высокімі чорнымі саскамі. На левым запясці блішчэў срабрысты ланцужок, бяленіся кончыкі доўгіх пазногцяў. Бялкі вачэй былі чыстыя, сіняватыя, колеру снегу, на які капнулі чарніла. Пажадліва растуленыя вусны адкрывалі блакітную палоску зубоў. Калі цалаваліся, Чуйкевіч адчуваў кончыкам языка іхную гладзенькую, бы шкло, паверхню. Увесь твар быў азораны ясным, якімсьці ліловым святлом.

Вераніка не саромелася. Яна ведала цану сваім прывабнасцям, увогуле сабе як жанчыне. Дасканаласць прыроды нельга хаваць, не пераставаў думаць Чуйкевіч, ёю трэба захапляцца. Інакш няма ў ёй ніякага сэнсу. Абое, не пазбаўленыя пачуцця прыгожага, разумелі гэта. І разняволенасць іхная была натуральная, як вада ў рэчцы, як птушка ў лёце.

Чуйкевіч стаяў зачараваны, расхваляваны ўшчэнт. Ён яшчэ адчуваў усім сабою шоўк Веранічынай скуры — цёплы і прыцягальны. Зноў неадольна карцела акунуцца ў яговыя тугія хвалі.

Ацаніць прыгажосць жанчыны можа адно той мужчына, якому дадзена адчуванне прыгожага наогул. Чуйкевіч не ведаў, ці ацэньваў ён Вераніку па вартасці.

Да раніцы яшчэ было далёка.

Голас: «Какецтва і флірт — не ўменне, а паталогія».

Чуйкевіч прыпадняў шторку — за вакном пстрыкалі, акурат валіліся, раптоўна падрэзаныя, чорныя ствалы сосен. Між імі гойсала, бы вавёрка, мутная пляма жоўтага месяца.

Ён прысеў да століка, на лаўку да Веранікі. Яна абвіла цёплымі рукамі ягоную паясніцу. У правай руцэ ён трымаў бутэльку, левай пагладзіў Веранічыны грудзі, адчуўшы на пругкай мякаці каляныя па плавочкі саскоў. Наліў у чарачкі настойкі. Яны выпілі. Вераніка паклала яму на сцягно галаву. Ейныя валасы слізганулі яму па каленях. Кроў у яго з галавы хлынула да ног. Ім было горача, акурат над імі шугала полымя. Па лагчынцы спіны ягоная рука папаўзла да Веранічыных клубоў, не баючыся згарэць у полымі. Усё, што задумана прыродаю, ТРЭБА.

У шале мілавання яны вылецелі з адчування руху і часу, праўдзівей, вылецеў іхны дух. Яны пісалі дыктоўку, заняволеныя ўсемагутным голасам пачуццёвасці. Іх зноўку доўга гайдала ў розных накірунках. У нейкі момант Чуйкевіч адчуў, як скульсьці з калень смарганула салодкую сілу і выкінула яе штуршкамі ў чэрава маладой прагнай жанчыны.

Шчаслівыя, ляжалі пад прасцірадлам доўгі час моўчкі. Чуйкевіч думаў: «Людзі няшчырыя, закамплексаваныя, і таму ўтойваюць усё гэта, паказваюць, што яны не такія, а самі вар'яцеюць ад шчасця... Ва ўсякім разе, НІХТО ад яго не адмаўляецца».

— Што будзем у Маскве рабіць? — спытала Вераніка сонным голасам. На змену безразважнай палкасці непазбежна прыходзіць цвярозы, як пустая бутэлька, прагматызм.

— Сходзім у Маўзалей Леніна. Ты наведвала?

— Не.

— Я таксама. Колькі разоў бываў у Маскве: то на рамонт зачынены Маўзалей, то няма доступу, то чарга... Хутка, адчуваю, перазахаваюць нашага правадыра і не пабачым.

— Ты ведаеш, я не засмучуся...

— І ўсё-такі. За Леніным вялізны кавалак нашай гісторыі. Для ўсіх нас ён быў Богам. Святым, бездакорным Богам.

— Я лепш па магазінах пашвэндалася б. Кажуць, у Маскве танная кава.

— Хопіць часу і на гэта,— упэўнена сказаў Чуйкевіч, хоць такі заўтрашні дзень яго мала радаваў. Найпакутлівейшая справа — штурхацца ў чэргах. Палову здароўя савецкія людзі кладуць на яе.

Вераніка раптоўна заціхла. Чуйкевіч скосіў позірк і здзівіўся, як хутка яна заснула; грудзі ейныя, падымаючыся, пакалыхваліся. Ён дапіў з рыльца настойку і лёг у раскачагараны жар Веранічынага цела. На цягніках Чуйкевіч ездзіць не любіў. Мітусня на пероне, цісканіна ў праходах. У купэ людзі, сабраныя воляю выпадку, як бы становяцца абавязаныя адно аднаму. Уначы ён не мог у цягніку заснуць — здавалася, увесь час хтосьці тармосіць цябе, будзіць. Гэтым разам Чуйкевіч спаў як забіты.

Нараніцу яны прахапіліся ад стуку ў дзверы купэ. Правадніца голасна будзіла пасажыраў. Цягнік пад'язджаў да сталіцы.

Вераніка прыціскала да грудзей скамечанае прасцірадла і няўцямна лыпала. Пад ніжнімі вейкамі расплылася туш вострымі іголачкамі ўніз.

## РАЗДЗЕЛ 45

Заўсёдашні страх за дзяцей пасля паездкі ў Маскву ўхапіў Чуйкевіча зубамі алігатара. Уяўленне ўжо не раз малявала яму іхныя катаванні. Бандзюк упірае ў шыйку Арцёму ці Васю вострае лязо нажа — прагінаецца ямачкаю скура. Загадвае плакаць у трубку і прасіць бацьку, каб вызваліў. У сына спалатнелы твар, напоўненыя жахам вочы.

Пасля доўгага перапынку зноў пазваніў бас:

— Эта шобла таварышчэй. Дзе прападаў? Ад нас не ўлізнеш. Што ты нам скажаш?

«Хачу плюнуць вам у вашыя паганыя мурзакі!..» — ірвалася ў Чуйкевіча з грудзей. Але нямаверным высілкам асаджваў сябе. Пасля такой заявы гаворка ў іх з ім можа быць кароткаю. Па-другое, сарве задуманае вышукнікамі аператыўнае мерапрыемства.

— А што ты хацеў пачуць?

— Нэ понэл,— сумеўся бас.

Чуйкевіч ведаў, што іхную размову запісваюць. І зараз робіцца ўсё, каб засекчы, з якога тэлефона звоняць.

— Пытаюся, што цябе цікавіць.

— Не касі, Чуйкевіч! — пагрубеў бас.— Нам вядома, што ты ў кантору ўжо зганяў... («Бярэ на мушку ці сапраўды ведае?..» — пахаладзела ўсярэдку ў Чуйкевіча). Прымем меры. У мяне нет врэмені. Бабкі настрыг?

— Я, канечне, згодны... Пайду вам насустрач... Але...— мямліў Чуйкевіч, і бас, мусіць, звярыным чуццём унюхаў няладнае. Ён занерваваўся, пачаў крыць мацюкамі, урэшце кінуў трубку.

Чуйкевіч разгубіўся. Мусіць, не так ён павёў гульню. Спудзіў «аб'екта». А можа, яго аператыўнікі сцапалі, і зараз ён у наручніках скрыгоча ад бяссілля зубамі?

«Што рабіць?»

З задуменнасці вывеў пяшчотны тэлефонны званок.

— Начальнік аддзела крымінальнага вышуку маёр Серада. У наступны раз, калі пазвоніць, пытайцеся, куды, у якое месца прынесці ім грошы. Куклу з сабою носіце? На ўсякі выпадак, не баўцеся позна на вуліцы.

«Значыцца, не выключаюць нападу на мяне!..»

У кватэры пазмрачнела, быццам заміж электралямпачкі запалілі курны гаснік. Такое ўжо бывала з ім пад час меланхоліі альбо пасля рэзкага псіхалагічнага сцябка, як цяпер. Ды Бог з ім самім, каб толькі не перанеслі свае звярыныя намеры на дзяцей.

Яго ахапіла пячорная туга. Ён не мог з ёю саўладаць. Яна выпхнула яго на вуліцу. Дзесьці на стадыёне каля школы павінны гуляць Арцём і Вася. Ён убачыў іх здалёку. У сініх куртачках, вязаных чорных шапачках, яны ганялі па снезе мяч. Здаліся яму кволымі і безабароннымі: худыя шыйкі, тонкія рукі і ногі. Чым яны правініліся, што і над іхным жыццём навісла пагроза? Ды нічым. Яны проста расплочваюцца за бацькавы грахі. А ці справядліва гэта? Яшчэ ж Сталін кінуў кліч: дзеці за бацькоў не адказваюць. На словах. А на справе адказвалі. Юрыдычна, можа, не ўсе, а маральна, псіхалагічна — як адзін. І ён, Чуйкевіч, носіць у сабе бацькаў, сталінскіх часоў, страх. А дзеці ягоныя таксама панясуць далей гэты страх нявольнага чалавека, рабскую псіхалогію Чуйкевічаў...

Чуйкевіч скружыў па чыстай ад снегу асфальтаванай дарожцы вакол стадыёна. Калісьці, як толькі

перасяліліся ў новую кватэру, па гэтай дарожцы ён бегаў. Амаль штораніцы. Ён тады быў малады, да беражкоў напоўнены сілаю, не думаў пра здароўе. Думкі пра здароўе прыходзяць той час, калі яно дае прабоіну, як трум лодкі альбо карабля.

Пад ногі яму прыкаціўся футбольны мяч — чорнабелымі пяціграннікамі. Гэты мяч Чуйкевіч выйграў на стадыёне «Дынама» ў латарэю «Спрынт». Арцём і Вася вельмі абрадаваліся: даўно хацелі мець такі мяч. Цяпер круглы, як зямля, клубок клікаў і яго на поле. Чуйкевіч падумаў, што ў беганіне з дзецьмі добра будзе атрэсціся ад цяжкіх думак. Ён ударыў па мячы «шчотачкаю» правай нагі, пабег за ім па здратаваным, перамешаным з травою снезе.

— Тата! — закрычаў Арцём радасна.

Дзіўная рэч: толькі на імгненне выпадалі абрыўчыкі ў клейкай стужцы назойлівага думання. З гэтага было мала радасці.

— Колькі вы будзеце яшчэ гуляць? — спытаў ён у Васі.

— З паўгадзіны.

«Трэба пачакаць».— Чуйкевіч не сумняваўся, што тая прапітая рожа здольная на любы садызм. І справа не ў тым, што яна прапітая. Ён узышоў на абледзянелы гліна-пясчаны насып, сеў на лаўку, адчуўшы сцёгнамі палоскі холаду.

Над горадам вісеў набрынялы сакавіта-крывавай ружовасцю круг сонца, як палавінка разрэзанага кавуна. Спакойны шызаваты аксаміт неба вабіў позірк, быццам высмоктваў з вачэй трывогу і смутак.

## РАЗДЗЕЛ 46

Жанчына адукаваная, з праніклівасцю ды інтуіцыяй, якія не кожнай дадзены, Вераніка не магла не бачыць, што Кастусь перажывае трагедыю. Страху ад гэтага яна не адчувала. Гэта не мастак, не пісьменнік, лічыла, калі ягоная ўнутраная біяграфія бедная, не напоўнена болем і пакутамі. Без хваравітасці, неладоў, падзенняў нельга прыйсці да якіхсьці арыгінальных, а тым больш філасофскіх высноў. Кастусёвых кніжак яна не чытала па той простай прычыне, што была расіянка і не ведала беларускай мовы, але гаворка ягоная ёй імпанавала. Ён і праўда шалёна захоплены прыгажосцю. Ён траціць прытомнасць ад

ейнай музыкі. Хто калі зрабіў ёй камплімент як жанчыне за тое, што яна ўмее іграць? Нават бацькі, калі аддавалі яе ў музычную школу, бачылі ў гэтым адно прэстыж. Муж увогуле лічыць, што мастацтва разбэшчвае, робіць людзей некіруемымі, яго можна было б забараніць.

Шалі іхных з Кастусём душ былі ўжо даўно ўраўнаважаны. Гармонія нараджае толькі святло. Ад святла ўсім радасна. А ёй — і пагатоў.

Па ледзьве ўлоўных сімптомах, навучаная слухаць свой арганізм, яна зразумела яшчэ да месячных, што зацяжарала пасля таго вагоннага кахання. Калі б Кастусь не сказаў, што два месяцы не браў нават грама ў рот спіртнога, яна, не задумваючыся, перапыніла б цяжарнасць. Тая бутэлька на дваіх наўрад ці паўплывае на якасць зачацця. Арганізмы, маладыя, спрытныя, падсцёбнутыя пылкасцю закаханых, зробяць сваю справу. Вось толькі трывожнаю нітачкаю сучылася ў свядомасці думка: чаму Кастусь так доўга ўстрымліваўся ад піцця, да якога быў раней, здаецца, не зусім абыякавы? Мо захварэў? А можа, усё прасцей: жонка, адчуўшы, што Кастусь мае каханку, вырашыла мацней прывязаць яго да сябе, да сям'і, нарадзіўшы трэцяе дзіця. Вось і загадала яму «прасохнуць». Ва ўсякім разе, гэта ейныя праблемы, а яна таксама хоча мець дзіця ад чалавека, якога кахае, які, на ейную думку, са сваёю арыгінальнасцю адзіны ў свеце. Хто ёй можа забараніць, не даць гэтае права? Адкрывацца альбо не адкрывацца Кастусю? Яму, канечне, не пазайздросціш.

Вераніка села за раяль. Узмахнула рукамі, трошкі затрымала іх у паветры, сагнуўшы і расслабіўшы пальцы, і апусціла на клавішы...

## РАЗДЗЕЛ 47

Па снезе хадзілі галкі, тырчалі, як галавешкі. На даляглядзе падымалася хмара. Сунулася хутка, напорыста, быццам пхнула перад сабою ўсё неба.

І без таго вострая духовая пакута абвастрыла чуццё да крайняй мяжы. Звычайная дробязь, на якую чалавек не павінен зважаць, іржою ўядалася Чуйкевічу ў мазгі, успыхвала яркім малюнкам замаху на яго. На гэты малюнак накладваліся новыя балесныя мазкі. І ўжо праз гадзіну перад вачыма вісела чорная

карціна забойства. Часта здавалася, што ўсё ўжо з ім было, а цяпер ён толькі ўспамінае.

Па дарозе дахаты Чуйкевіч завярнуў у магазін. У драцяную на маленькіх колцах каляску паклаў круглую буханку «нарачанскага» хлеба, паставіў дзве макраватыя бутэлькі кефіру. Плаўленых сыркоў, ім упадабаных, і гэтым разам не было. Узяў пачак кукурузных палачак. Ён быў лёгкі, хрусцеў у пальцах.

Падкаціў да касы. У чарзе стаялі дзве пажылыя жанчыны і высокі плячысты дзяцюк. Касірка, яшчэ год назад маладая зграбная дзяўчына, нечакана патаўсцела, бы гуска, аплыла мяккім тлушчам і страціла былую пекнасць. Чуйкевіч дзівіўся, гледзячы на яе, і думаў: мусіць, выйшла замуж, мужык трапіўся харчавіты, вось і стаіць небарака ўвесь вольны час каля пліты. Разлічыўшыся, Чуйкевіч спыніўся каля доўгага абшарпанага століка, каб перакласці купленае ў цэлафанавы пакет, і раптам убачыў невысокага ўчарнелага мужычка, які хуценька адхапіў позірк і нейк нервова заварушыўся. Рукі ён трымаў у кішэнях зацухмоленай балонневай курткі, якая была яму ніжэй калень: падобна, з чужога пляча. Чуйкевічу здалося, што мужычок за ім віжаваў. Што рабіць? Павярнуць назад у магазін, перачакаць? Спытаць у касіркі, дзе чорны ход, і выйсці праз яго? А можа, дарэмна ўстрывожыўся? Дзень жа, вакол людзі.

Чуйкевіч падлавіў момант, калі накіраваўся да выхада высокі плячысты дзяцюк, які стаяў перад ім у чарзе, і параўняўся з ім, быццам яны ідуць на пару, знаёмыя. Учарнелы мужычок ужо вышмыгнуў з магазіна. Стаяў на прыступках і касіўся на дзверы. Убачыўшы Чуйкевіча, павярнуўся да яго, але Чуйкевіч віхнуўся ўбок і адгарадзіўся ад мужычка тулавам дзецюка. Не азіраючыся, шпаркім крокам, уподбег пачасаў ад магазіна, паказваючы, што спяшаецца на прыпынак, да якога пад'язджаў тралейбус. Пад нагамі на снезе ўспыхвалі пунсовыя плямы крыві.

Чуйкевіч адчуваў, што ён збялелы, змарнела выглядае. Нават вострая, нечаканая думка магла крута змяніць ягонае аблічча, не кажучы ўжо пра здарэнне.

Хто гэты нядошленькі мужычок? Зладзеяваты позірк, сам — камяк нерваў. Рукі ў кішэнях. А што ў кішэнях? Нож? Зброя? Няўжо наёмны забойца? Высачылі, гады, і падаслалі!..

Чуйкевіч, зайшоўшы ў кватэру, замкнуў дзверы, зняў туфлі. Занёс на кухню і паставіў у халадзільнік бутэлькі з кефірам. Буханку «нарачанскага» засунуў у хлебніцу, размаляваную кветкамі чырвонага маку. Гукнуў сыноў і аддаў ім кукурузныя палачкі. Не хацеў здацца жонцы залішне палахлівым, таму не сказаў ёй пра мужычка.

Без ахвоты перакусіўшы, моўчкі сядзеў перад тэлевізарам і зноў аналізаваў эпізод у магазіне. Быў у яго незразумелы самому, проста сабачы нюх на людзей, ён рэдка памыляўся ў іх. Гэтую якасць у ім, мусіць, заўважалі і сябры. Адзін сталы, сам не дурны, мужчына наўмысна прыязджаў да яго ў Мінск з Барысава, каб спытаць, ці варта браць на працу чалавека, якога Чуйкевіч ведаў яшчэ з часоў «раёнкі». Хочаш не хочаш, трэба згаджацца, што вакол кожнага існуе энергаінфармацыйнае поле, якое таму-сяму дадзена счытваць. Чуйкевічу нярэдка хапала аднаго позірку, вымаўленага слова, каб зразумець, што за чалавек перад ім, на што ён здольны. Ён таксама наперад ведаў, як зрэагуе чалавек на ягоныя канкрэтныя словы, нават што ён адкажа. Таму, калі хацеў, карэкціраваў свае словы і ўчынкі так, як было выгадна яму.

Часта без усякага самападману думаў, што з яго быў бы добры следчы. Дадаць сюды яшчэ логіку, інтуіцыю, якімі ён таксама не быў абдзелены, і гатовы канкурэнт Шэрлаку Холмсу. Выходзіць, нездарма ўдалася яму аповесць «Следчы». Збоку Чуйкевіч такім праніклівым не здаваўся, наадварот — простым і рахманым, чалавекам, якога лёгка пакрыўдзіць. Адпаведна да яго і ставіліся, не здагадваючыся, што ён ужо ведае, хто перад ім.

Перад пачаткам перадачы «Крок», якую Чуйкевіч збіраўся паглядзець, дыктар прачытала аб'яву:

— Паведамленне міністэрства ўнутраных спраў рэспублікі. Сёння, прыкладна ў сем гадзін вечара, на тралейбусным прыпынку па вуліцы Каліноўскага невядомы мужчына нанёс нажавыя ўдары двум мужчынам, адзін з якіх на месцы сканаў. Прыметы злачынцы: на выгляд гадоў трыццаць-трыццаць пяць, хударлявага целаскладу, валасы цёмныя. Быў апрануты ў доўгую балонневую куртку. Тых, хто бачыў ці ведае пра забойцу, просяць пазваніць па тэлефонах...

Чуйкевіч ледзьве не падскочыў з канапы. Усе пры-

меты ўказвалі на таго мужычка, якога ён бачыў у магазіне. Яму што, не было розніцы, каго забіць? Чуйкевіч адразу адчуў, што той узведзены, як курок пісталета. Ці, можа, ён, псіхапат, з адчаю, што не ўдалося выканаць «заказ», накінуўся на невінаватых мужчын? А можа, яшчэ горш: свядома зарэзаў чалавека, каб потым сказаць, што расквітаўся менавіта з ім, Чуйкевічам? Хто ведае: мажліва, на кон было пастаўлена жыццё яго самога, гэтага мужычка.

Чуйкевіч разлінейваў у свядомасці розныя варыянты, кожны з якіх (нават першы — самы спрыяльны для яго) пагражаў даканаць яго. Здаецца, спружына, устаўленая ў грудзі невядома кім, была накручана да адказу. Яшчэ абарот — і яна пэнкне...

Чуйкевіч пазваніў у райаддзел міліцыі. Ягонае прозвішча там ужо ведалі: з заявою азнаёмілі ўсіх супрацоўнікаў, а дзяжурнаму, які заступаў, перадавалася ў абавязковым парадку, як дзейнічаць, калі пазвоніць «грамадзянін Чуйкевіч».

— Можа, я залішне цяпер падазроны, але я бачыў мужчыну, які падобны на забойцу... Ён цікаваў за мною ў магазіне.

— Калі, у які час? — спытаў дзяжурны.

— Сёння. Роўна без дзесяці пяць. Я глянуў на гадзіннік.

— Прынята. Я далажу начальству.

Сярод ночы Чуйкевіч прачнуўся ад бязглуздзіцы, якая яму прыснілася. Глянуў на вакно: шчыльныя шторы імгліліся драбнюткімі срабрыстымі пылінкамі. Хтосьці падказаў яму: калі глянеш на вакно альбо дзверы — сон забываецца.

## РАЗДЗЕЛ 48

Незнаёмы раённы гарадок. Высокія старасвецкія дрэвы — парк. Хеўра падлеткаў нібыта на чале з Сяргеем Вірлаком (стрыечны брат, маладзейшы на два гады) кідаюць у Чуйкевіча жалезныя коп'і, тыпу верцела ў электрапліце. Покуль не трапляюць, але ж боязна — металёвыя, могуць пранізаць толькі так. Ён пагражае ім, таму-сяму адвешвае поўху — хоць бы што. Затым апынаецца за горадам у агародзе на мяккай раллі. Кусцікі чорных парэчак паўз плот. І сюды ляцяць з вышыні коп'і. Ён у рашучасці хапае адно — гне яго, перакручвае, як бараноў рог, разгінае

зноў. Яно ламаецца, і ён кідае яго з агарода на вуліцу. Чапляецца за электраправады — звіняць; выглядвае, ці ёсць замыканне. Скручвае ў бараноў рог і астатнія тры (але не ламае) ужо на вачах тых, хто кідаў; шубае ўсё ў стары парк, у якім нібыта могілкі. Бачыць, ідуць хлопцы-равеснікі з ягонай вёскі, кідаецца ім насустрач. Ужо ў верандзе — вітаецца, але яны не падаюць яму рукі, толькі так, словамі, адказваюць. Ён выходзіць на вуліцу. Там ужо незнаёмыя. І адзін, завадатар, прыпірае яго — за тыя коп'і,— а каб прызнаваўся, тыцкае яму ў сцягно іголку; балюча — не так, як медычка; спачатку паколвае, потым заганяе яе. Ягонаму цярпенню наступае канец — ён хапае завадатара загрудкі, адчувае, які той дужы, і думае: недарэмна завадатар. Усё-ткі Чуйкевіч скручвае яго і хапае за горла, як Мцыры леапарда, кладзе ў веранду на падлогу. Тут выходзіць бацька. Ідуць у хату. Там нібыта маці па-маладому раскінулася на канапе. У яе белыя, цяжкія, як марлевыя торбачкі з тварагом, грудзі. Ён расказвае, у чым справа. У куце маленькі тэлевізар, узяты ў якуюсьці тумбу з прораззю для экрана, а таму выдае меншым. Потым маці з тоўстымі вапнавымі нагамі мые падлогу. Бацька ходзіць моўчкі. На галаве ў яго сіняя шапка з чырвоным аколышам, на якім напісана чорнымі літарамі: «Я НЕ ХАЧУ БЫЦЬ ВОРАГАМ НАРОДА». Чуйкевіч выходзіць на веранду, і завадатар нібыта ўжо баіцца яго чапаць.

**РАЗДЗЕЛ 49**

Ціхі, прымглёны празрыстым туманком зімовы дзень аджываў сваю лепшую, маладую, частку. Роўнае, матавае шкло неба мела такі ж колер, як і зямля, што толькі нядаўна дыхтоўна акрылася снегам. Ніжні край шкла быў няроўны — паўтараў зубцы верхавін старых таполяў, якія шчыльна стаялі ўздоўж вуліцы Максіма Горкага на прамежку вуліцы Сурганава да вуліцы Някрасава.

Чуйкевіч сядзеў за пісьмовым сталом, блізка прысунутым да сцяны з батарэяй, у якую ён упіраў — грэў — ногі. На падваконніку стаяў гліняны зеленаватай паліўкі вазон: з яго разбэрсаным чубам раскінуліся доўгія, як шпагі, зялёныя лісты з белавата-крэмавымі падоўжнымі лініямі. Гэтая расліна мела

навуковы назоў хларафітум кашлаты, а ў народзе яе звалі «Лятучым галандцам». І менавіта з-за яго, гэтага народнага назову, а зусім не з-за дробненькіх белых, сабраных у мяцёлку кветак, любіў Чуйкевіч гэты вазон. Акуратна паліваў яго, абразаў нажніцамі засохлыя, пажаўцелыя лісты-шпагі.

Засяроджанасць на кветках немінуча прадказвала Чуйкевічу, што наспявае якоесьці ««жаночае пытанне». Так ужо было не раз. І цяпер ягоныя думкі круціліся вакол кветак і жанчын. Жанчыны, кветкі і сабакі існуюць дзеля таго, каб не астывалі ў чалавеку ласка і дабрата. Заняты сабою, ніяк не знойдзе часу пазваніць пакутніцы Алёне, падбадзёрыць яе.

Аркуш паперы перад ім ляжаў чысты. Толькі ўверсе былі напісаны два словы: «Слёзы беларуса». Такую назву ён даў свайму будучаму раману. Як золата час ад часу трэба паліраваць, так і да слова, раней напісанага, не шкодзіць зноўку і зноўку вяртацца. Думкі ягоныя былі куды больш дзёрзкія, чым само жыццё. Трагедыя чалавека ў разладзе між задумамі і іхным здзяйсненнем. Адмесці раз і назаўсёды «жаночае пытанне» — для пісьменніка-мужчыны азначае паставіць крыж на творчасці. Лепш яго паставіць на сабе, чым на творчасці.

Г о л а с: «Жанчына патрэбна толькі для пачатку».

Пазваніла Вераніка. У нядзелю і дахаты (звычайна, нават у экстраных выпадках звоніла на працу) — значыцца, здарылася штосьці сур'ёзнае. Зрэшты, Чуйкевіч так і думаў, што некалі іхная сувязь павінна чымсьці нядобрым скончыцца. Так не бывае, каб патаемная вяровачка вілася бясконца. Голас у Веранікі быў устрывожаны, і гэта пры тым, што яна ўмела трымаць сябе ў руках. Балазе трубку падняў сам Чуйкевіч: як адчуваў. Але, менавіта адчуў, што званок ад яе, хоць чакаў ад баса.

— У мяне, Косця, праблемы.

— Неадкладныя?

— Заўтра давай збяжымся каля філармоніі.

Што там у яе? Няўжо муж?.. Тады гэта жахліва. Увесь час над ім вісіць дамоклавым мячом небяспека ад Веранічынага мужа.

На другі дзень, у абедзенны перапынак, яны сустрэліся. Вераніка была ў белай куртцы-пухавіку, чорных штроксах і чорных ботах, на галаве вялікая чорная хуста ў яркія зялёна-чырвоныя букеты. Све-

жасць твару была заценена заклапочанасцю. Яна неахвотна падставіла Чуйкевічу шчаку. Яму здалося, шчокі ў Веранікі пацямнелі, пад вокам набрыняла і канвульсіўна білася жылка.

Падалі рэдкія, лянівыя сняжынкі, на руках і твары адразу craналі. Тратуар быў прыцярушаны тоненькім слоем, акурат пасыпаны мукою. І гэтак жа, як мука, сняжок прыліпаў да падэшваў. Стракацелі ў вачах чорныя сляды, бліскучыя ад вады.

— Я цяжарная,— проста, без хітрыкаў сказала Вераніка.

— Праўда? — спытаў Чуйкевіч адно дзеля таго, каб мець паўзу падумаць. Ейныя словы ўдарылі па ім, як малаток па шкле, і толькі таму, што ён не быў шкляны, ён не рассыпаўся.

— Не да жартаў.

— Можа, затрымка?

— Думала сама. Але заляцела тады ў вагоне.

— Тэрмін невялікі,— сказаў Чуйкевіч не без радасці, але і без намёку на якуюсьці падказку. Ён пакутліва думаў цяпер, чым можа пагражаць яму гэтая пастка, у якой апынулася Вераніка. У яго была свая даволі моцная. Не хацелася заганяць і яе. Самая грозная небяспека зыходзіла, вядома, ад Веранічынага мужа, праўдзівей, ад прафесіі, якой ён служыў. Гэта — не дэградаваныя падонкі, што шантажыруюць яго. Нават не Пётр Пятровіч са сваім іезуіцкім расследаваннем. Тут работа тонкая і дзейсная. Усё, што стукне ў разгарачаную галаву мужа-раганосца, ажыццявіцца ў міг вока. Можа падкруціць так, што і за краты сядзеш. Навешае згвалтаванне — і будзь здароў.

— Бяда ў тым, што з мужам мы даўно не жылі і не пераканаеш, што ад яго. Ён у мяне чалавек уніклівы, дакладны. Нават ведае цыкл маіх менструацый і вядзе графік. У апошні прыезд па духу адчуў, што са мною нешта не тое. Запсіхаваў, і мы нават не кладіся разам у ложак.

— А ты што, думаеш раджаць? — не зразумеў Чуйкевіч. І тут жа пашкадаваў, што не вельмі далікатна вырвалася пытанне.

— На выпадак выяўлення. Аборт — не самая простая аперацыя. Нават калі вакуум.

— Твой муж — бландзін? — спытаў Чуйкевіч. Вераніка ніколі не паказвала ягонай фоткі і не апісвала

знешнасці: ён забараніў яшчэ да шлюбу, узяўшы распіску.

— У тым і соль, што не. Я ўжо думала пра гэта. Гены брунетаў заўсёды мацнейшыя. Ён мне сам гэта даводзіў. І я таксама цёмная. А дзіця, чамусьці я не сумняваюся, будзе вылітае ты — светлае...

Голас: «Па думкалініях дваіх тчэцца з космасу зародак будучага чалавека».

Невядома, што было ў Веранікі на душы, але гаворку яна вяла так, быццам рыхтавалася да родаў. Выпадкаў багата было, калі жанчына дзеля каханага мужчыны, каб мець аб ім памяць, нараджала ад яго дзіця. Незалежна ад таго, здагадваўся муж альбо не. Вось на такую самаахвярнасць здольная жанчына, калі кахае. Самаахвярнасць — вялікая рэч, але гэтым разам Чуйкевічу не хацелася, каб Вераніка ёю сябе спальвала. У ношу праблем, пад якою ён і так гнуўся і стагнаў, уплішчыўся б яшчэ важкі груз. І — тады: ці вытрымае ягоны хрыбетнік, які, здаецца, ужо цяпер не ў адным месцы звіхнуўся? Вераніка, мусіць, разлічвае, што яны, творча адораныя людзі, народзяць генія. Каб жа... Хутчэй дэбіла ці вырадка.

Думкі ў Чуйкевіча рассеяліся, як зярняты, кінутыя на зямлю. Калі і чым якая ўзыдзе — было цяжка сказаць. Ён паклікаў на дапамогу неба.

«Вывяргай семя сваё сам, уяўляючы яе, а не чужаложствуй з ёю».

Чуйкевіч не зразумеў: ці так падумалася яму самому, ці пачуў Голас. Але спакою ад гэтага не дадалося.

Каля запляванай сметніцы сядзеў жабрак з лысай галавою; між абрубкаў ног ляжала стаптаная аблавушка, і Чуйкевіч кінуў у яе жменю медзякоў.

З гулкага падземнага перахода па вільготных коўзкіх прыступках яны вынырнулі на вуліцу Веры Харужай. На правым баку выстраіліся шчыльна адзін пры адным барвяна-вішнёвыя гандлёвыя латкі, ці, іначай, «камкі». З'явіўся новы, даволі салідны слой у грамадстве — слой прадаўцоў. Прадавалі ўсё: гарэлку, адзенне, прадукты, кнігі, апаратуру, цыгарэты... Ніводзін з тых, хто прадаваў, нічога не вырабляў. Паралельна з прадаўцамі ў магазінах існаваў як бы неафіцыйны клан прадаўцоў, нагрузка на якіх цяпер была куды большая, чым на афіцыйных.

Чуйкевіч часам любіў каля «камкоў» прыпыняцца,

каб пабачыць, якія тавары ёсць у свеце. «Бясплатны музей»,— іранізаваў ён. Хоць не да жартаў тут было. Хадзілі чуткі, што мафія перахоплівае гуманітарную дапамогу з заходніх краін і перапрадае па шалёных цэнах. Вузенькая, з палец таўшчынёю, у маляўнічай абгортцы амерыканская шакаладка каштуе трыццаць рублёў. А ў інстытуце радыялогіі галадаюць хворыя на лейкемію дзеткі, вывезеныя з чарнобыльскай зоны. Які чалавек выжыве ў гэтым свеце? Скуль напасці і за што на людзей кара? Дзе яшчэ гэткае можа быць, якая ўлада такое дазволіла? Ва ўладзе засталіся ТЫЯ ж, толькі разбэшчаныя без страху перад партыйнай дысцыплінай.

Голас: «Улада для сябе, а не для цябе».

Раптам яны пачулі крыкі. На пляцы каля магазіна «Мэбля» мітусня і беганіна. Мусіць, там успыхнула бойка. А неўзабаве і відаць было, як хеўра чарнамазых у цёмна-рудых дублёнках каўказцаў насядала на тройку даўгалыгіх стрыжаных хлопцаў, якія, стаўшы спіна ў спіну, адбіваліся рукамі і нагамі. Ногі ўзляталі высока, да самых твараў.

— Не падзялілі сферы ўплыву,— ціха сказаў Чуйкевіч пачутыя калісь ад Мякоты словы. Вераніка ўзяла яго пад ручку.— Давай пяройдзем на другі бок, а то яны і аўтаматы могуць пусціць у ход...

Звычайна Вераніка здзіўляла Чуйкевіча тым, што тонка прадумвала ўсякія дробязі ў іхных узаемнасцях. Цяпер жа, праз гэтую ейную цяжарнасць, ён бачыў яе няўпэўненай і разгубленай. Прадчуванне горшага пахаладзіла Чуйкевічу спіну: «Яна пойдзе на рызыку!» І ён ніколі не зможа ёй сказаць, каб яна перапыніла цяжарнасць. Не тая жанчына. Яна расцэніць ягоныя словы як здраду. Лепей смерць, чым здрада ў каханні.

— Можа, тэрмінова з'ездзі да мужа,— сказаў Чуйкевіч без цвёрдасці ў голасе.

— Ні разу, уяві, не ездзіла. Ён адразу ўсё зразумее,— не прыняла падказкі Вераніка.— Дый, шчыра кажучы, баюся: уначы магу назваць яго Косцем.

Мужчыны — дзеці. Чуйкевічу палесціла тое, што сказала Вераніка. Яна ставіла яго вышэй за мужа. І таямніца між імі была велькая. Чуйкевіч быў у тупіку, як ужо не аднойчы за апошні час. Абаім развесціся і стварыць новую сям'ю? Але ці хопіць у яго сілы на другую сям'ю? Хоць адчуваў — гэта найперш

выратаванне для яго. Мужчына, жаніўшыся ў другі раз на жанчыне з якасцямі менавіта жаночымі, неверагодна і хутка перарабляўся.

Ён не сказаў Вераніцы пра гэты самы крайні запасны ход.

— Ты і так, Косця, у вялікім трансе,— улавіўшы разгублены Чуйкевічаў позірк, сказала Вераніка.— Я больш не буду цябе турбаваць, бяру ўсё на сябе.

У ейным голасе не было звыклай пяшчотнасці. У ёй адразу прачнулася жанчына-пантэра. І экіпіроўка адпаведная — чорная, толькі вочы не белыя.

«Узяць на сябе цяпер ты можаш, а чым павернецца справа пасля?» Сумненні крамсалі Чуйкевічу душу. У няпэўнасці жыць, ведаючы, што хтосьці вырашае твой лёс, ён не мог. Мусіць, сапраўды гэты ягоны лёс ужо нічога не варты, калі не ён над ім валадар. Па ўсіх кірунках, як трэшчыны па шкле, пайшло разбурэнне. Ён ужо не мае стваральнай сілы. Як стваральнік,ён сябе, відаць, вычарпаў. Не цікавіць праца, тармазнула творчасць. Не задавальняе ён сыноў як бацька, а жонку як муж. Ягонай душы пара адлятаць на неба. Ёй месца не ў бедламе і брыдоце, а сярод лагоды і спакою. Ён мог бы яшчэ ўтрымацца ў гэтым жыцці, калі б пісаў,— тады б не бачыў вакол крыві, зла, боек! Але яму не пісалася.

Ён ішоў побач з Веранікаю, як апушчаны ў ваду. Нядобрыя прадчуванні вярэдзілі яго.

**РАЗДЗЕЛ 50**

Цягам наступных дзён Чуйкевіч не знаходзіў месца: клінне стрэсаў няшчадна расшчапляла яму мазгі. Насуперак волі грувасціліся па гэтых расколінах думкі пра бязмэтнасць жыцця і самагубства. Але ён яшчэ валодаў сабою. Крэпасць псіхікі не была разбурана дашчэнту. Сілы абарончага рэфлексу яшчэ сядзелі ў ёй, мелі боепрыпасы. Хоць і ворагаў было залішне.

Голас: «Ты — гэта крэпасць, напоўненая ворагамі».

Чуйкевіч разумеў, як бязлітасную ісціну, што смерці яму не мінаваць. Адно жахала і не хацелася, каб яна прыйшла ганебным чынам: праз самагубства альбо алкаголь. А ён, мусіць, генетычна схільны да самагубства, бо ім скончыў жыццё ягоны дзед Арцём.

Мільгала вар'яцкая думка — як выратаванне, як шчасце! — пагібель ад рук забойцаў — найлепшы варыянт. Няшчасны выпадак... Абурэнне, шкадоба, спачуванне забяспечаны. Калі браць з пункту погляду звычайнага чалавека. А ён незвычайны — даўно пераканаўся і калісь нават з гэтага радаваўся. Тут лепей стасуецца і да смерці незвычайны падыход. Скандальны! Ці, ва ўсякім разе, у трагічных асабістых варунках. Так скончала жыццё багата знакамітых людзей. І тады на іх біяграфіях лямпачка цікавасці ззяла вечна. Яна вабіла, але ўражанне ад яе было адно: асуджэнне. Не заваяваная часцінка крэпасці менавіта гэткую і рабіла Чуйкевічу раскладку смерці.

Ад кожнага тэлефоннага званка Чуйкевіч здрыгаўся, і ў яго імгненна псаваўся настрой — відочная нездаровая рэакцыя. Ён баяўся званкоў і жадаў, каб тыя падонкі хутчэй што-колечы зрабілі з ім. Гэта быў псіхалагічны парадокс: баяўся званкоў і не баяўся смерці.

— Зноў прывет табе ад таварышчэй,— загундосіў бас, калі Чуйкевіч узяў у сына трубку.— Няма калі шалаболіць. Карочы, каб заўтра ў гадзіну і трыццаць мінут бабкі былі ў парку «Дружбы народаў». Знаеш такі парк? Эта возля плошчы Бангалор... Там ляжыць вялікі валун. Пастаіш пяць мінут ля яго, тады пачэшаш па дарожцы ў напрамку аўтастанцыі на вуліцы Кульман. Цябе перастрэне кент і скажа: «Белагорлага бульдога не бачыў?» Эта пароль. Ты ўсучыш яму бабкі. Прывядзеш за сабою хваста, лішым жызні ў два шчота.

«Нарэшце!..»

Чуйкевіч адчуў сябе страшэнна спустошаным. Сілы магло хапіць хіба што на заўтрашні дзень.

Чуйкевіч ужо даўно насіў у дыпламаце «куклу» — пакунак са стосамі паперы, які яму ўручылі ў міліцыі. Менавіта яе трэба несці вымагальнікам.

Багата падзей было зведана Чуйкевічам, але ні за адну з іх ён так не перажываў. У сустрэчы з бандзюкамі ўсё для яго было новае і звязанае з немалою рызыкаю. Да таго, што тоіць у сабе смерць, трэба вельмі доўга прывыкаць. А ён не альпініст, не шахцёр, не падводнік, нават не лётчык, а ўсяго толькі звычайны, мірны інтэлігент. І прафесія ў яго самая што ні на ёсць мірная — пісаць ды чытаць, чытаць ды

пісаць. У якія ж несхадзімыя нетры завалакло цябе грамадства, Чуйкевіч, што ты нясеш на плаху сваё не такое ўжо працяглае жыццё і не надта шкадуеш?

Раніцаю, адсунуўшы левую, з боку фортачкі, што-ру, Чуйкевіч убачыў, што на дварэ валіць снег. Чуваць, як хлапякі суха чырхаюць па шкле. За сто метраў суцэльная імгла, нічога не відаць. На кузавах легкавікоў выраслі белыя «пірамiды Хеопса». Чорны сухарлява-тугі англійскі дог з асалодаю качаўся па белым снезе, як па разасланай пасцелі. Каля яго стаяў жыватасты гаспадар — у ботах, спартыўных штанах з трыма белымі палоскамі і ў куртцы «Аляска». Цяпер шмат хто заводзіў сабак. Покуль сабака яшчэ быў надзейным сябрам.

Надвор'е не было спрыяльнае ні для адных, ні для другіх. Чамусьці пра гэта перш-наперш падумаў Чуйкевіч, хоць не быў ні вышукнікам, ні вымагальнікам. Недарэмна ён лічыў, што з яго вышліфаваўся б добры следчы. Міліцыя не будзе мець мажлівасці здалёку назіраць. А бандзюкі будуць апасацца, што пад прыкрыццём снегавой куламесы могуць нечакана наляцець мянты. Калі і быў якісьці плюс у такім надвор'і, то адно для бандзюкоў. Як-ніяк, не возьмеш на мушку ў аптычны прыцэл, не разгледзіш у бінокль. Адзіным сродкам зносін між сабою застаецца рацыя.

Чуйкевічавы ж варункі гэтым снегападам яшчэ больш ускладняліся. Ён апынецца без нагляду ў пустэльным, замаскаваным месцы адзін на адзін з вопытным, мацёрым крымінальнікам. Без сумнення, на такую справу алкаша верхавод не пашле. Ужо хоць бы таму, што не даверыць яму вялікую суму грошай.

Яму ніхто не званіў. Вышукнікам не было сэнсу: тэлефоны яны праслухоўвалі. А бандзюкі, выходзіць, сваіх намераў не мянялі. На ўсякі выпадак пазваніў жонцы на працу і сказаў, што *ідзе*.

У гадзіну Чуйкевіч апрануў старую куртку, чорную трусіную шапку, узяў дыпламат, цяжкаваты ад «куклы». У парозе, стоячы тварам да дзвярэй, пацёр рукі, аж пацяплелі, звёў далоні над галавою шпілем і плаўна апусціў іх паўзбоч. Як бы заключыў сябе ў ахоўны панцыр. Было такое адчуванне, што яму ў грудзі б'е моцны вецер, адпіхвае назад. З сумам глянуў на вокны сваёй кватэры. Правую палавіну вакна ў ягоным пакоі засланяла штора. Падкаціўся пад грудзі дакор на сябе: забыўся як след адсунуць шторы.

Снег крыху ўтаймаваўся, але ўсё роўна быў густы. За хвілю заляпіў Чуйкевіча з галавы да ног, асеў на бровы, на вусы. Дыпламат з чорнага перафарбаваўся на белы, патаўсцеў, нібы пяхцер. Чуйкевіч глянуў уверх: неба не было, зусім нізка трэслася перад ім, як ад ветру, палотнішча марлі. У адкрытыя вочы траплялі сняжынкі — холад праколваў, быццам біла токам.

У 13.25 Чуйкевіч падышоў да чорнага валуна з вызубленым вакенцам для надпісу. Непадалёку ад прыпынку таўклося некалькі чалавек. Звычайныя людзі. Ягоны візіцёр будзе ісці з процілеглага краю. Як яе знайсці, тую сцежку пад снегам, што перасякае па дыяганалі абшар парку і выходзіць да станцыі «Кульман». Трэба будзе перціся па цаліку.

Марудна цяклі хвілі. Тралейбус забраў на прыпынку людзей. Адзін мужчына — высокі, у лыжнай вязанай шапачцы — застаўся. Выпадкова альбо не? Хто ён: вышукнік ці з хеўры?

Падбегла маленькая рабая сучачка, прысела на снег і пакінула на ім жоўтую пляму.

Роўна ў 13.30 Чуйкевіч адчаліў ад валуна. Да болю ў вачах углядаўся перад сабою ў мітуслівае, мутнае марыва: ці ідзе хто насустрач? Вось, здаецца, і палова шляху. Нікога. «Можа, я скасіў і размінуўся?» — засумняваўся Чуйкевіч. У бакі было відаць метраў на пяцьдзесят-семдзесят, але ні злева, ні справа не чарнелася ніякай постаці. Толькі стаялі аблепленыя мокрым снегам ліпкі, падобныя страката сцю ствалоў на бярозы, ды лысыя булдавешкі кустоўя.

Наперадзе захліпалі лямпачкі ў вокнах аўтастанцыі, масляніста-крывавыя агеньчыкі стоп-сігналаў. Усё! Пуста. Ніхто яму не сустрэўся. Што ж такое? Перадумалі і не паслалі візіцёра? Ці ўсё-ткі пры кепскай бачнасці размінуліся? «А можа?.. — Чуйкевіч упершыню падумаў пра гэта.— Можа, яны, нягоднікі, мяне проста разыгрываюць?» Сэрца ў яго шалёна заброхала ў грудзях. Ён перакруціўся разы са тры, пільна ўзіраючыся ў наваколле. Вышукнікі ў любым выпадку не акажуцца. І бандзюкі ж не дурні: можа, хочуць перш праверыць, упэўніцца.

Чуйкевіч глянуў на гадзіннік: сем хвіль ён ішоў ад валуна да гэтага месца. Сем хвіль ліхаманкавай натугі і страху. Цяпер, загарэўшыся новай здагадкаю,

якая асяніла яго, ён раптам адчуў сябе ледзьве не самым шчаслівым чалавекам на свеце. Звар'яцелы ад радасці, кінуўся па сваіх слядах назад.

«Разыгралі... Разыгралі...» — стукала ў скроні кроў.

## РАЗДЗЕЛ 51

Жанчына Няміла грацыёзна плыла па сутарэнні. Ніводная складачка не варушылася на ейных чорна-белых строях. Як улітая сядзела на галаве высокая падвічка. Жанчына Няміла спынілася пасярод сутарэння. Высеклася пад прамым вуглом левая частка тулава да пояса і такая ж частка з правага боку і знізу.

Дзверы ў сцяне расчыніліся шырэй, чым звычайна. Істоты беглі адна за адною. Гэтак і сталі. Здавалася, стаіць адна істота — доўгая, як змяя.

— Як дзейнічае банда?

— Аслабіла націск,— забалбаталі шарыкі ў адтулінах істот.

— Стол сюды!

З дзвярэй прыплыў вялізны круглы стол з багатым пітвом і закуссю. Французскія напоі «Бенедзікцін», «Шартрэз», шампанскае, іспанскае віно, італьянскі лікёр «Амарэта», гарэлка «Польская» і «Гарбачоф». Пірамідамі бляшанак стаяла піва «Тубарга», «Карлсберга», «Будвайзера», «Хейнекена». У талерках ляжалі вэнджаныя куры, смажаныя парасяты, гусі, качкі, вяленая і фаршыраваная рыба, рулеты, вяндліна, карбанады, кумпякі. Былі тут усемагчымыя салаты, блішчэла каштоўнымі каменьчыкамі чорная і чырвоная ікра. Ад начасночаных квадрацікаў чорнага хлеба зыходзіў апетытны пах...

Істоты перастроіліся ў шыхт.

З дзвярэй вываліла хеўра. На чале яе валюхаўся самавітай паходкаю прыстойнага выгляду дзяцюк — у «варонцы», клятчастых штанах і ў чорных туфлях.

Хеўра абступіла стол.

Жанчына Няміла цераз галовы ўзяла бутэльку «Бенедзікціну». Корак вылецеў як снарад з гарматы.

Хеўра пацягнулася кілішкамі да бутэлькі.

Пілі і елі доўга, але на стале піцця і страваў не змяншалася.

## РАЗДЗЕЛ 52

Зняўшы з сябе неабходнасць быць пільным і насцярожаным, нейк незаўважна перанёсшы вагонны кір з Веранікаю, Чуйкевіч зноўку сарваўся. Цвярозай шкляной яснасцю бліснулі два месяцы, як ён пабываў у бальніцы. Можна ўжо было б трымацца і без грамаў! Ён і трымаўся б, калі б не сябры. Усе беды і трагедыі чалавека ад сяброў.

Пачалося з Цішкова.

Чуйкевіч позна сядзеў у рэдакцыі — стомлены і галодны: чакаў званка ад Пятра Пятровіча. Той паехаў у псіханеўралагічны дыспансер, што на вуліцы Бехцерава, праверыць, ці стаіць на ўліку Субач. Лепш бы не ўспамінаць пра гэты дыспансер. Мусіць, звесткі пра яго ўжо паступілі туды.

Зайшоў Цішкоў з чорнай торбаю на баку. Працёр запацелыя шкельцы акуляраў. Сказаў, што ёсць пляшка «Зуброўкі». Паляпаў па торбе.

Чуйкевіч доўга аднекваўся: «Ты ж мяне ведаеш...»

— Я перастану цябе, Костусь, паважаць,— прыгразіў Цішкоў. Псаваць адносін з ім Чуйкевічу не хацелася: Цішкоў беспартыйны і, можа, калі-небудзь прыдасца як сведка-абаронца на Трыбунале.

На смак «Зуброўка» здалася Чуйкевічу салодкай. Ён захмялеў ад кроплі.

Пётр Пятровіч чамусьці не пазваніў. Мусіць, штосьці ў яго там не зладзілася. А можа, працягвае псіхалагічны націск. Хутчэй за ўсё. Надта ж дзіўна зацягвалася справа. Не справа, а дрожджы ва ўнітазе грамадства.

— У любым выпадку падавай на Субач у суд,— сказаў Цішкоў. Ён выпіў больш за Чуйкевіча.

— Шчыра кажучы, у любым выпадку мне не хочацца з ёю судзіцца, хоць заява падрыхтавана,— вялым голасам сказаў Чуйкевіч.— Які сэнс?

— А што яна, сука, тэрарызуе?!. — успыхнулі злосцю вочы ў Цішкова. У яго не клеілася з жонкаю. Здаецца, ён падазраваў яе ў сувязях з дырэктарам гасцініцы. Нейк, моцна п'яны, прагаварыўся.

— Гэтым яна сябе і карае....— з філасофскай шматзначнасцю прамовіў Чуйкевіч.— Што мне дасць гэты суд? З'есць толькі нервы... Ты ж ведаеш нашу казуістычную юрыспрудэнцыю. Ды крыху пацешыць маё самалюбства...

— Ты абаронiш сваю годнасць!

— Няма ў мяне ўжо гэтай годнасці... — Голас у Чуйкевіча задрыжэў.— Забілі яе, растапталі. Не змог я адстаяць яе, зламаўся. Ці то рана, ці то позна, мусіць, нарадзіўся... Не мой гэта час наступіў, вось што я табе скажу. Я не магу жыць. Я спрабаваў шукаць ратунак, але... Замудохаўся я, браце!.. — не сказаў, а прастагнаў Чуйкевіч.

— Жанчыны ва ўсім вінаватыя... Яны! — Цішкоў не ўтойваў свайго антыфемінізму.— Костусь, не абагаўляй жанчыну, не маліся на яе... Яна гэтага не варта! Колькі маральнасці ўпала праз яе, наколькі рух прагрэсу затармазіў, колькі талентаў не раскрылася — ты ведаеш? — Цішкоў выняў з кішэні хусцінку, працёр акуляры. Ён глядзеў на Чуйкевіча: не разумеў і не пазнаваў яго. Не той гэта быў Чуйкевіч, якога ён упершыню ўбачыў у Доме творчасці на Новы год. І ён падумаў, што трэба ратаваць сябра.

Яны пайшлі ў рэстаран «Патсдам».

— Ты мне скажы, чаму ты дагэтуль ходзіш у сакратарах партыйнай арганізацыі? — калі ўзялі чаркі, рубам паставіў пытанне Цішкоў. Пагневаўшыся на жанчын, ён перакінуўся на партыю.

— Я лічыў, покуль існуе партыя як структура, якая ўплывае, няхай у ёй будзе больш людзей творчых, нацыянальна свядомых, чым звычайных чыноўнікаў-выканаўцаў, варожых беларускасці. Ад іх, можа, і не вялікая карысць, затое шкоды менш... Гэта адназначна.

— Можна пагадзіцца,— пакруціўшы лысай галавою, нечакана хутка здаўся Цішкоў.

Прачнуўся Чуйкевіч уранку дома. Ён разумеў, што яго панесла, бы трэску быстрыня, якая ведае адзін кірунак. Дзіўна, але ў такім стане ён мог востра, з незвычайнай праніклівасцю аналізаваць усе свае праблемы. Яны міма ягонай волі ўсплывалі ў свядомасці, высвечваліся ва ўсіх, раней не заўважаных тонкасцях.

Незразумела, як быць з Веранікаю. Яна стала нервовая, у апошнюю сустрэчу сказала, што цяжарнасць — гэта ейная асабістая справа. Што яна задумала? Відочна — нячыстае. Перш-наперш у адносінах да сябе самой. Жаночае каварства мяжуе з вар'яцтвам. Ад таго яно і небяспечнае, і непрадказальнае.

З Субач ён наважыў цвёрда: ні сілы, ні часу на яе траціць больш не будзе. Годзе! Абы толькі адчапілася яна. Чым дурнейшы чалавек, тым больш разумна з ім трэба сябе паводзіць. Зрэшты, цяпер яму ўжо ўсё роўна. Быццам яблык, толькі з неймаверна большай хуткасцю, саспявала рашучасць напісаць дзве заявы: «Прашу звольніць...» і «Прашу вызваліць мяне ад абавязкаў сакратара партыйнай арганізацыі...». (Ён тады яшчэ не ведаў, што стане «апошнім з магікан» — апошнім сакратаром партарганізацыі ў рэдакцыі часопіса «Ідэі перамагаюць»; а гэта ўжо гістарычны факт). Няхай там у райкаме Гракавалава з Малкавай разбіраюцца. Чуйкевіч не сумняваўся, што партыя стаіць перад крахам. Давер у грамадстве яна ўжо не заваюе. Можа, і на шкоду сабе, але народ хоча паспрабаваць іншага. У новым ёсць заўсёды зародак спадзявання на лепшае, на існае. Без спадзявання на лепшае жыццё не мае сэнсу.

Крэкчучы, як стары, Чуйкевіч устаў з канапы. Ён сядзеў у цяжкім роздуме, сціснуўшы галаву рукамі. Ён фізічна адчуваў, як выходзіць з яго энергія, хутка, імгненна, кожны дзень. Ён належаў да людзей-донараў, а вакол сабраліся вампіры. Які б ён быў шчаслівы, калі б у гэтую хвілю належаў сам сабе, нідзе не быў патрэбны, ніхто яго не чакаў. Жыць пустэльнікам, адгарадзіцца ад свету, у якім усё не на месцы, разбэрсана. Хіба гэта не шчасце? Большага шчасця ён цяпер не ўяўляў. Што за межамі гэтага ўяўлення, тое не яго, тое вышэйшае ці ніжэйшае.

Ён пайшоў у ванную мыцца. Глянуў у люстра... і ўбачыў ніжэй пляча драпіны. Палічыў: пяць; дзве з іх перакрыжаваныя. Што за таямнічы знак і скуль? Такія, здаецца, былі ў Хрыста. Яны маглі быць проста нанесены ім самім у сне альбо паходжанне іх нябеснае? Ва усякім разе, яму цяпер, прымхліва-падкаванаму містыку, было над чым памудраваць. Не без унутранай асалоды ды іранічнай радаснай думкі, што ён — выбраннік, з пячаццю Хрыста. Калі нават па скуры прабаразнілі ягоныя пазногці, то чаму яны пакінулі след менавіта хрыстоўскіх драпін? Гэта ўжо была несусветная галаваломка, разгадка якой ляжала па-за свядомасцю.

Падступіла млосць, і, каб не грымнуцца на падлогу, ён вярнуўся ў свой пакой. Паляжаў. Тады сеў да стала. Са стоса пісчай паперы выцягнуў два аркушы.

Аблёгшыся грудзінаю на край стальніцы, узяў ручку. Сціснуўшы зубы, пачаў пісаць.

Марудна адвалілася чорным кавалкам палова дня. Чуйкевічу стала лягчэй, і ён паехаў у рэдакцыю.

Над горадам нізка, пры самых дахах дамоў, віселі касмылі шэрага туману. Снег набрыняў вільгаццю, асеў, хрусцеў пад абцасамі, як лісце капусты. Тры чорныя крумкачы сядзелі на клёнах, высока абкладзеных глінянымі глыжамі. Калі Чуйкевіч праходзіў міма, яны дружна, як па камандзе, павярнулі да яго насатыя галовы. Яго ўразіла, што крумкачы сядзелі на роўнай адлегласці адзін ад аднаго, быццам хтосьці абазначыў імі канцы роўнастаронняга трохкутніка (крумкач-А, крумкач-В, крумкач-С), вяршыня якога ўказвала на зямлю — крумкач-А.

Крумкачы навялі Чуйкевіча на тужлівы роздум: «Жыццё — гэта страты, суцэльныя страты. Я страчваю кожную секунду штосьці, нават калі ў гэтую секунду нічога не адбываецца. Наперадзе жыцця няма, толькі ззаду. Не можа лічыцца жыццём тое, што не пражыта... Даўжэйшае жыццё — больш пакут і страт. І толькі. Хочаце пакутаваць — жывіце!»

Голас: «Геній можа жыць і на сасне з варонамі».

Чуйкевіч зайшоў у кабінет да Ямачкі. Той быў у чорным касцюме, падобны на крумкача-С, упіўся ў яго напалохана-разгубленым позіркам. Белы аркуш у руках у Чуйкевіча сімвалізаваў капітуляцыю. Чуйкевіч адсунуў крэсла ад стала і сеў. Падпіхнуў да Ямачкі аркуш.

— Не палохайцеся, Аляксандр Іванавіч!

У Ямачкі за шкельцамі акуляраў забегалі вочы.

— Я, мілай, не падпішу,— ураз ахрыплым голасам сказаў ён.— Чуеш, Чуйкевіч?

Задуменне адключыла Чуйкевіча ад рэальнасці. Ён не збіраўся ні спрачацца з рэдактарам, ні штосьці даказваць яму. Калі ёсць розум, сам усё бачыць і разумее. А калі няма розуму, то няма сэнсу тлумачыць. Не разумець чалавека — значыцца, не мець здольнасці, сілы пранікнуць скрозь ауру да ягонай сутнасці.

— Што вы сказалі?

— Не падпішу, кажу, заяву.

— А дзе вы дзенецеся? — горка,варты спачування, усміхнуўся Чуйкевіч.— Зап'ю — і самі вытурыце. Я сябе вычарпаў. Я жыццё сваё пражыў...

— Ну ты, мілай, даў! Я хачу яшчэ на пенсіі папрацаваць. І я п'ю — ну і што? Гэта не загана. Усе п'юць.

— П'юць, каб жыць. А я п'ю, каб спіцца разам з дэградаваным грамадствам,— не вельмі зразумела выказаў думку Чуйкевіч.— Каб ведалі, што я пабачыў, якое ўніжэнне перажыў...

— І мяне па ЦК зацягалі... Умей прыстасоўвацца да жыцця!

— Чаго толькі мітрэнга с Субач вартая...

— Ды кінь ты, мілай! — узмахнуў крумкачовымі крыламі Ямачка.— Знайшоў гора... З-за нейкай шызафрэнічкі...

— Усё роўна, я вам скажу, брыдка. Мне ўвогуле часам здаецца, што я купаюся... прабачце, у брудзе, у нечыстотах. Нехта дзесьці адкрыў шлюз — і заліло ўсю зямлю. Дзе схаваешся? Толькі на небе. Я хачу туды. Мне ўжо білет туды заказаны. І я дарую ўсім... і гэтай, як вы кажаце, шызафрэнічцы, і ўсім астатнім, хто рабіў мне зло, выпякаў душу напаленым жалезам, як партыя...

Ямачка падазрона паглядзеў на Чуйкевіча. Заморгаў вейкамі. Кітайская ручка з залатым пёркам, як івалга, заскакала ў руцэ. Ён уздыхнуў з усіх печаней:

— Як я буду без цябе, мілай, змагацца з нефармаламі?.. — І з такім адчаем чыркануў ручкаю, што пёрка прарэзала паперу, падняло калматыя вусікі. Гэтыя вусікі ўбачыліся Чуйкевічу высокімі аснежанымі вяршынямі гор, як на карцінах Рэрыха.

«Госпадзі, што я нарабіў?.. — Чуйкевіча калаціла. Ён сядзеў у тралейбусе каля вакна і дакранаўся рукою да халоднага вільготнага шкла. Адчуваў сябе зусім блага, накочвалася абмарока. Халадок як бы праясняў галаву і астуджваў усярэдку.— Навошта я звольніўся? Гэта — пагібель... Праца трымала мяне, а партыя дысцыплінавала... Цяпер я нікому не патрэбны».

Ён даўно не пісаў, нават да дзённіка не даходзілі рукі — ляжаў у прыскрынку, цярпліва чакаючы свайго гаспадара. Чуйкевіч адчайваўся, але не асуджаў сябе. Усё засталося ў мінулым і не мае працягу. Апроч кахання. Так, менавіта Вераніка, нягледзячы ні на што, светлай вузенькай, як на лісці «Лятучага галандца», лініяй злучае яго з будучыняй. Яму рвалася паехаць да яе, пазваніць ёй. Калі трэба, павініцца, унізіцца. Сэрца жанчыны іначай і нельга завая-

ваць, як уніжэннем. І тады адплата непазбежная. Адна яна, дзівосная Вераніка, угледзела ў ім штосьці большае, чым бачыць сам, не кажучы ўжо пра астатніх.

«Мусіць, на тое Божая воля, што мы сустрэліся з ёю. Такое бывае раз на стагоддзе, не часцей...»

Свежасцю дыхаў спрасаваны, цяжкі, бы лёд, снег. Паветра было светла-сіняе, а неба — чорна-фіялетавае, як спелы боб, і такое ж тугое, што з-пад яго не прабівалася ніводнай зоркі.

Духовая туга абвастрала ўспрыманне, агаляла яго, як кроватачывую рану, і ад лёгкага дотыку — імпульсу думкі — Чуйкевічу балела. Грам алкаголю, як морфій, здымаў яму боль. І тады ён так-сяк прымаў свет, у якім жыў. «Раней ці пазней... Раней ці пазней...» — цвёрдай асою білася ў галаве думка.

Ён зайшоў у кватэру. Насустрач яму выбеглі радасныя сыны: «Тата прыйшоў! Тата прыйшоў!»

— Дай грошай на жуйку,— папрасіў Вася: меў болей нахабства.

Чуйкевіч моўчкі выняў з кішэні дзесятку і даў яе сыну.

Малыя, яны не разумелі, якое злое наканаванне вісела над іхным бацькам. Ім і ведаць не трэба. Усё да іх яшчэ прыйдзе. Незайздросная доля чакае іх. Дэградацыя зробіць крок наперад.

Чуйкевіч зачыніўся ў сваім пакоі. Адамкнуў тумбу ў стале. Там у два рады, як снарады ў скрыні, ляжалі бутэлькі. Іх сабрала яму невядомая сіла.

Голас: «Няма дарогі да шчасця, ёсць дарога да ісціны».

Такое з Чуйкевічам іншы раз здаралася. Перш выразна, да дробязей, уявіцца, што гэта з ім ужо было, а тады прыходзіць само дзеянне (як бы па напісаным кімсьці сцэнарыі). Вось і цяпер яму здалося, што калісь ён спрабаваў канчаць жыццё самагубствам, але не скончыў. Уявілася гэта так...

**РАЗДЗЕЛ 53**

Няма дарогі да шчасця... Гэтая думка, міжволі снавала ў свядомасці, выпісвала іскрыстыя зігзагі, потым запынялася ў якойсьці кропцы, і ён пачынаў разумець яе. Марна шукаць дарогу да шчасця, калі гэтай дарогі проста не існуе. Ісціну ён,

здаецца, зразумеў: тое, што зрабіла б яго чалавекам, было забіта ў ім яшчэ генетычна — праз бацьку ўліўся ў ягоныя клеткі страх быць пакараным у любы момант за вальнадумства, творчасць, выпадковы нязграбны крок і нават за чыесьці правінкі. Партыя, якой ён служыў верай і праўдай, распяла ягоную душу канчаткова, ператвэрыўшы яго ў рабатаголіка. Засталася адно ягоная фізічная абалонка, дзеля функцыянавання якой даволі было інстынктаў. І гэтай фізічнай абалонкі Чуйкевічу зусім не было шкада, і апроч грэблівасці ніякіх іншых пачуццяў яна ў яго не выклікала.

Ён устаў з ложка і вышмаргнуў са штаноў жоўтую скураную дзягу. Тоўстую, мусіць, з конскай скуры.

З абодвух бакоў вакна ішлі водаправодныя трубы таўшчынёю з касільна, прымацаваныя да сцяны жалезнымі пярочкамі. На правай трубе адна пярочка была акурат пад столлю.

Чуйкевіч прасунуў канец дзягі ў медны квадрат пражкі. Зубы ў яго ляскалі, рукі і ногі сцяў курч. Ён уяўляў з сябе няўклюдную каракаціцу. Гэтая каракаціца ўзгрэблася на стол і прывязала канец дзягі да трубы вышэй жалезнай пярочкі. Аберуч яна ўзяла абруч пятлі.

Чуйкевіч ненавідзеў брыдкую каракаціцу на стале са скураною пятлёю ў руках. Яе гідка нават забіваць, бо наробіць смуроду, які не выветрыцца. Каракаціца паднесла абруч да галавы, быццам вянок.

За сцяною рвануў вецер — забрунжала ў верхнім кутку рамы адарваная палоска паперы, якой заклейвалі на́зіму вокны. Гук гэты быў падобны на брунжанне асы. Калісь ён ад злосці праткнуў шпількаю шыю асе і з садысцкай асалодаю назіраў, як яна змагаецца за жыццё. Гэтае прымітыўнае стварэнне даражыла жыццём і ні за што не аддала б яго самахоць. Тыя ейныя пакуты так уразілі Чуйкевіча, што ён напісаў пра іх нават апавяданне, якое пыліцца дзесьці ў архіве. Яму захацелася перад сконам прачытаць гэтае апавяданне.

Чуйкевіч злез са стала, адчыніў тумбачку, дзе стосам ляжалі папкі. Ён засунуў у глыбіню руку і намацаў слізкае і халоднае, як змяя, цела бутэлькі...

Багацце натуры (душы) не выключае, а якраз уключае ўсё, што бывае і МОЖА БЫЦЬ з чалавекам, у тым ліку ёсць месца і самагубству.

## РАЗДЗЕЛ 54

Урочышча, куды часта хадзілі ў грыбы, называлася Прапайшчына. Яно было ў тым баку, дзе Слаўгарад. Колісь і Слаўгарад меў назоў — Прапойск. Старыя людзі і цяпер ніколі не скажуць: паеду ў Слаўгарад, а толькі: паеду ў Прапойск (Прапоськ, Прапойсык). Летапісны Прапойск першапачаткова ўпамінаецца ва ўстаўнай грамаце 1136 года Смаленскага князя Расціслава Мсціславіча ў форме Пропой. Мясцовыя гаворкі перайначвалі назоў на свой лад. Але сэнс заўсёды ўкладваўся адзін — месца названа ў знак горкіх п'яніц, прапойцаў. Хадзіла багата легендаў. Адну з іх ведаў Чуйкевіч. Горад стаяў на зліцці дзвюх рэк — Сажа і Проні. Па іх плавалі на суднах багатыя купцы. Прычаліўшы, ішлі ў карчму. Іх так шчыра ўмелі прывячаць, што яны не вылазілі, покуль не прапівалі ўсе свае запасы. Адсюль і пайшло — Прапойск. Абарыгены тут былі ні пры чым. Але іх празвалі таксама прапойцы. Хоць пілі яны не больш і не менш, чым у іншых месцах. Нелітасцівы гэты крыж неслі не без жарту. Іначай што б падштурхнула ў вайну вядомага савецкага пісьменніка Канстанціна Сіманава напісаць такі верш:

Должно быть, название это
Недаром Пропойску дано,
Должно быть, и зиму, и лето
Там пьют беспробудно вино.
Должно быть, в Пропойске по-русски
Грешит до конца человек
И пьет, как в раю,— без закуски
Под дождик, под ветер, под снег.
Под нежным влиянием женским
Мы все до конца там допьем,
И город Пропойск — Протрезвенском,
На радость всех жен, назовем.

Назвалі Слаўгарадам. Не важна, як яго назвалі. Важна, у якім перажылі гора. Славы гораду і праўда перапала з лішкам. Толькі ў Вялікую Айчынную ён пабачыў крывавыя баі, тысячы палеглых на берагах Сажа і Проні чырвонаармейцаў. Сталіну далажылі: маўляў, няёмка пакідаць гераічнаму гораду назоў, які ўзнік ад непрабуднага п'янства мясцовых людзей. І ў 45-м годзе з'явіўся ўказ аб перайменаванні.

Насуперак абскурантызму, свайму і маскоўскаму, навука даказала, што назоў Прапойска паходзіць

зусім не ад заганнай з'явы, а ад слоў пропасць і пропуск.

Чуйкевіч лічыў: ад чаго б ён ні паходзіў, у ім гісторыя краю, нацыянальны каларыт. І Прапойск быў адзін, а Слаўгарадаў па краіне, здаецца, некалькі.

Барацьба з адметнасцю, індывідуальнасцю была дзяржаўнай палітыкаю.

## РАЗДЗЕЛ 55

Пропасць — адсюлека ўсё-ткі паходзіць найменаванне месца, дзе Чуйкевіч нарадзіўся. Вунь колькі сінонімаў у гэтага слова: прорва, бяздань, бяздонне, прадонне, пройма, пролубка, праломіна, дрыгва, багна...

Дзіва што ён цяпер прападае, ужо не на краі, а ў самой пропасці (з нараджэння).

## РАЗДЗЕЛ 56

Чуйкевіч праспаў, як у казцы, тры дні і тры ночы і за гэтыя трое сутак пастарэў не на адзін дзесятак гадоў. Такі ён вылез са свайго берлагу. Цяпер ён быў вольны і не ведаў, што рабіць. Маршрут пралёг да кавярні «На рагу». У кішэні скульсьці з'явілася пачка дзесяцірублёвак. Ён выпіў сваю кроплю каньяку, закусіў падсохлымі да жоўтай бліскучасці лустачкамі сыру і ўспомніў, што калісь тут пазнаёміўся са студэнткаю, якую звалі Ала. Яму накруцілася на мазгі думка знайсці яе. Ён ведаў той інтэрнат, у якім яна жыла. Яшчэ студэнтам у ім бываў. Ягоны сябар там падчапіў ганарэю. Інтэрнат знаходзіўся за чыгуначным вакзалам.

Вахцёрка, пажылая жанчына, з круглым тварам і вялікай, як арэх, растрэсканай бародаўкаю на кончыку носа, не хацела яго пускаць. Прыгразіла міліцыяй. Міліцыянтаў ён заўсёды пазбягаў. Рахавацца з імі было небяспечна: для іх не існавала ні законаў, ні этычных нормаў. Што хочаш з табою вычвараць — і не дакажаш. Багата прыстойных людзей ад гэтага пацярпела. Сярод іх былі і Чуйкевічавы знаёмыя.

Чуйкевіч варушыў п'янымі мазгамі, шукаючы выйсце. Хіба ён не быў студэнтам і не жыў у інтэрнаце? Запыніў двух хлопцаў, якія, расчырванелыя, узбуджаныя, вываліліся з дзвярэй. Яны абмяр-

коўвалі кінафільм «Інтэрдзяўчынка». Чуйкевіч і на падпітку не страчваў пачуцця рэальнасці і такту. Павініўшыся, папрасіў іх, каб гукнулі «Алу з сорак пятага пакоя».

Яна выйшла з ліфта, які з грукатам расчыніўся, у квяцістым мультановым халаце. Разгублена шнырыла вачыма — шукала, хто яе мог паклікаць. Чуйкевіча яна відочна не пазнала. Ён ступіў да яе, несучы на вуснах блазенска-п'янаватую ўсмешку.

— Не палохайцеся, гэта я вас выклікаў... Памятаеце кавярню на рагу вуліц?

Яна зачырванелася, прыкрыла далонню вочы; запусціўшы ў валасы кончыкі белых пальцаў, папраўіла прычоску.

— Кавярню помню, а вас не... Гэтак нечакана...

«Дзе ж яна мяне можа пазнаць, калі я пастарэў раптам не на адзін дзесятак гадоў?» — падумаў ён.

— Без нечаканасцей нецікавае жыццё. І я вось нечакана змяніўся... Ты можаш мяне правесці?

— Не. Дый у нас дзяўчат цэлы пакой.

— Гэта ж добра.

— Я разумею. Але ці добра ім? Вы п'яны...

— Уразумеў. Давай тады сустрэнемся заўтра.

— Не магу.— Яна апусціла вочы.

— Не магу ці не хачу? — Ён быў назойлівы.

Ала маўчала. Не хацела яго крыўдзіць? Яе, мусіць, бянтэжыла тое, што ён п'яны і невядома, як заўтра паглядзіць на сваё дамаганне.

— Каля паштамта. У шэсць вечара. Буду чакаць.

Адказу ад яе ён так і не пачуў. Раздражняцца, тым больш злавацъ — не меў права. Умомант працверазеўшы і ўсёкшы, што да іх прыглядаецца вахцёрка, зразумеў: пара адчальваць. Інакш дачакаецца двух хлопцаў у форме і з дубінкамі ў руках. На развітанне яшчэ раз сказаў Але: «Чакаю, юная спадарыня...»

У каханні ён быў наіўны і летуценны. Думаў, што і ўсе такія. Чакаў ад людзей паводзін, якія ў яго самога, а яны аказваліся заўсёды не такімі.

Назаўтра,прачнуўшыся, адразу ўспомніў пра свой няўдалы візіт у інтэрнат. У дэталях і падрабязнасцях. Ён не сумняваўся, што Ала прыйдзе. Чаму ёй не прыйсці? Ён не сноб, не грубіян, не якісьці нягоднік. Гэта відаць. І нават малодачцы відаць. Пах гарэлкі з рота — для мужчыны не загана, а ў цяперашніх умовах як бы нават абавязковасць. Яна павінна гэта

разумець. Не давяраць яму ў яе няма грунту. Тады ў кавярні яны хараша пагаманілі і ветла рассталіся. І цяпер на большае, чым на размову, на толькі самую мажлівасць пабыць з юнай істотаю, ён, здаецца, не разлічвае. Ён не здрадзіць Вераніцы, не прамяняе яе. А яна, Ала, таксама няхай падумае, чым ён цікавы і патрэбны ёй.

Адчы́каў шэсць гадзін квадратны гадзіннік на фасадзе, і Чуйкевіч зразумеў, што спатканне правалілася. А без пятнаццаці шэсць, калі толькі ўзышоў на мармуровыя прыступкі паштамта, у ім амаль не сумняваўся. Ён пільна ўглядаўся ў людзей на процілеглым баку праспекта. Можа, яна і прыйшла дзеля цікавасці, каб упэўніцца, што ён не хлусіў, не балбатаў сп'яна, але не пакажацца. Пацікуе скульсьці з-за вугла, усміхнецца цнатліва-белазубай усмешкаю і памахае ручкаю. І правільна зробіць. Чуйкевіч зусім не крыўдаваў на Алу. Якое права ён мае яе змушаць? Ён проста спадзяваўся на нейкую лучнасць, інтарэс альбо штосьці такое. Раз не спрычынілася — значыцца, так трэба было.

Ён пастаяў яшчэ каля пятнаццаці хвіль. Азірнуўся і зыгнуўся з мармуровых прыступак. Настрой быў ушчэнт сапсаваны. Не праз тое, што яго праігнаравала дзяўчына. У яго проста быў пусты вечар. Ён наўмысна нічога не задумваў на яго. У яго шмат было страчаных вечароў, дней і начэй. Здаецца, да гэтага ўжо прывык і не дакараў, як калісь у маладосці. Тады ён горка засмучаўся ад самай маленькай няўдачы, нягожасці.

У прыцемках ляніва церусіў блакітнаваты снег. Крапчаў невялікі марозік. На тратуарах сцяўся тоненькі, як цэлафан, здрадлівы лядок.

## РАЗДЗЕЛ 57

А раніцаю ўспрыманне ягонае яшчэ больш абвастрылася. Назойліва, як галодная восеньская аса, лезла думка пра Алу. Мусіць, не так сабе ён шукаў з ёю сустрэчы. Так проста нічога не бывае. Розум, і праўда, тлумачыў усё рамантыкаю, быў атручаны ўкусам зялёнага змія і мог штурхаць на бязглуздыя, легкадумныя крокі. А тое, што было вышэй за яго, сядзела пад замком у падсвядомасці, цяпер вызірнула па-зладзейску на свет і сказала яму:

ты, калі б спрыгалубілася, саграшыў бы і таемна спадзяваўся, каб Ала панесла ад цябе; табе хочацца раскідаць сябе па свеце як найхутчэй. У гэтым ты бачыш Боскае наканаванне: лічыш, што пасеянае табою ўзыдзе толькі дабром, якое падмацуе сілы барацьбы са злом. Але дарэмна ты гэтак лічыш. Ты нічым не лепшы за тых, з якімі змагаўся і якія загубілі цябе. А адводкі твае будуць яшчэ горшыя за цябе. Ты — маральны злачынца і нясеш пакаранне.

Таемна ты радуешся і таму, што ад цябе зацяжарала Вераніка. І толькі рабскі страх перад дзяржаўнай структураю, да якой належыць ейны муж, прымушае цябе вагацца. Ты на кожную жанчыну глядзіш як на самку, якую трэба апладняць. І ты не вінаваты: так задумана прыродаю. Неба звязана з тваёй падсвядомасцю, яно праходзіць праз яе нябачнай плоскасцю, якая рассякае падсвядомасць усіх людзей зямлі, і кіруе. Чалавек пра гэта проста не думае. Вучылі, што ў сабакі інстынкт. Не, ім таксама кіруе неба, як і чалавекам, толькі на ніжэйшым узроўні, адпаведным дадзенаму віду. Інстынкт не можа забяспечыць на кожны выпадак. Скажыце, які інстынкт — прыродны ці набыты — мог прывесці аўчарку Вясну з Сібіры, дзе яе пакінуў гаспадар, зноў у Мінск? (Пра гэты факт пісалі газеты).

Наасфера выбрала цябе і пасвяціла ў многія свае таямніцы. Табе адкрыўся духовы свет, які існуе па-за матэрыяй. Ты апусціўся ў глыбіні душы, ейны туман... Дом не будуецца адразу, перш у галаве архітэктара ствараецца праект. Карціна не з'яўляецца раптам, перш задума ўзнікае ў галаве мастака. І чалавек, яшчэ больш складаны матэрыял, не нараджаецца проста так. Перадусім у К а г о с ь ц і ўзнікае думка, ЯКІ будзе чалавек, а тады ён такі нараджаецца, ужо з доляю, напісанай гэтым К і м с ь ц і. І вось калі зможа індывідуум якімсьці чынам пранікнуць у свет гэтых схаваных ідэй-думак, ён можа там тое-сёе пачэрпнуць пра сябе, знаёмых людзей, задуманыя падзеі... Такі індывідуум становіцца прарокам тыпу Настрадамуса.

І ты зусім не спіўся, а шчыра падумаў, што спіўся, каб растлумачыць сваё празарэнне. Ад кропель не співаюцца.

Г о л а с: «Так. Але ты маўчы. Людзі не здольныя покуль цябе зразумець, твой час не наступіў. Яны

палічаць цябе за дурня. Алкаголь — тваё выратаванне. Усё спішуць на яго. Але не бойся. Думку забівае не алкаголь, а быт». (Ён і праўда заўсёды баяўся быць незразуметым).

Чуйкевіч падхапіўся з канапы. Ён спаў і чуў усё гэта ў сне, як нярэдка апошнім часам бывала, ці разважаў? Падобна, не спаў і чуў. Голас звінеў выразна, дакладна, выграньваў кожнае слоўца.

«Спакойна. Усё нармальна. Зараз не выходзь на вуліцу. Пачакай трыццаць хвіль і можаш смела ісці»,— зноў пачулася Чуйкевічу.

«Чаму?» — спытаў ён.

Голас не адказаў. Вушы заканапаціла тугая вашчына цішыні. Яна залівала гарачынёю і галаву. Здаецца, разломіць яе. Хоць бы якісьці гук. Прыслухаўся. Знізу, з двара, далятае: цюк-цюк-цюк...

«Прыбіральшчыца?.. Дарагая... Ты самая прыгожая ў свеце...»

Глянуў у вакно. Гэта яна, якой таемна сімпатызаваў, выратоўвае яго. У цёмнай целагрэйцы, сінім трыко з дзвюма белымі палоскамі па швах, у сіняй хустцы; на нагах лямцавыя боты з кароткімі халяўкамі. Трымаючы аберуч цяжкі лом, адколвае наледзь на дарожцы. Вялікі палец на правай рукавіцы парваўся і адтапырыўся, уздрыгвае пры кожным удары лома. На ступакі ботаў сыплецца дробная ледзяная пацяруха. Яна часта робіць перадых і азіраецца па баках. Мусіць, саромеецца, што хтосьці са знаёмых убачыць яе за такім грубым заняткам.

Чуйкевіч прымеціў гэтую маладую прыбіральшчыцу яшчэ з мінулага лета. Яна была тады ў сукенцы колеру хакі, якая шчыльна абцінала ейнае дужае цела. Зграбала на газонах скошаную траву. Па тым, як яна ўвіхалася з граблямі, Чуйкевіч зразумеў, што яна любіць і ўмее працаваць. Без сумнення, яна была дзіцём вёскі, а не кволым парасткам гарадскіх камяніц, які чахне ад ляноты і нерухомасці.

Уранку, калі Чуйкевіч ішоў на працу, дзяўчына першая з ім віталася. І ён захапляўся ейнай увішнасцю, дадзенай прыродаю сілай.

І цяпер, зніякавелы, Чуйкевіч тупіўся на яе з вакна. Наўмысна, сілком канцэнтраваў на ёй усю ўвагу. Свет існуе, покуль мы трымаем яго ў сваім розуме, покуль можам ацэньваць прыгажосць.

Дзяўчына-прыбіральшчыца ўдзяўбнула лом у гур-

бу ёй жа наскіданага з дарожак снегу і кудысь пайшла.

Чуйкевіч узяў са стала гадзіннік: было дваццаць хвіль на дзевятую. Ні мыцца, ні чысціць зубы, ні тым больш прамываць нос не стаў. Дзе там! Хадзіў, як тармазнуты, па кватэры. Выпараў у кладоўцы трохлітровы слоік, капронавае вечка, сетку. Саслабелы, кінуўся на ложак, і ў галаве быццам церлася галька — марскія каменьчыкі.

## РАЗДЗЕЛ 58

Без дзесяці дзевяць пакінуў кватэру. Каля універсама была піўнуха. Ён грэбаўся туды. Не быў упэўнены, што асіліць чаргу. Там дагэтуль ужо сабралася багата «адмарожаных».

Бушавала беллю ясная раніца. Аб'інелая бяроза стаяла амаль непрыметная, злівалася з паветрам. Наўскасы рухаўся з неба дробненькі сняжок. На чорнай голай паласе зямлі раставаў — там пралягала цеплатраса. Са свістам разразаючы паветра, кружылі два — белы і чорны — галубы, выглядаючы месца, дзе сесці пажывіцца. Тоўстая, бы ступа, жанчына ў чорным халаце паверх фуфайкі брала з вядра пясок і рассейвала яго па дарожцы, як ранейшым часам жыта.

Вынырнуўшы спаміж дамоў — ішоў задворкамі,— убачыў каля піўнухі кучкі мужыкоў. Яны гнуліся, бы кныры, сунулі рукі глыбока ў кішэні. Жаўцеў, як града сланечніку, «газік» з цыстэрнаю. Значыцца, піва ёсць. Цяпер толькі дастаяцца б да яго.

Да зачыненага вакенца са слоікамі ў руках у бязладнай чарзе штурхаліся дзесяткі два мужчын. Сярод іх былі і прыстойныя на выгляд.

Чуйкевіч спытаў, хто апошні. Нічым не вылучаўся сярод бальшыні: такі ж абцёрханы, брудны, прапашчы і змізарнелы. Чалавек загарадных звалак.

Мардатая ў завэдзганым спераду, як у мясніка, белым халаце цётка адчыніла вакенца. Нішу да яго адразу ж запачкавалі. Лезлі самыя нахабныя і сасмяглыя. Бадай да апошніх мог сябе далучыць і Чуйкевіч, але ў яго зусім не было нахабства. А вось злавіць тварам чужы кулак у яго былі ўсе шанцы.

З гадзіну таптаўся на месцы, як вартавы на пасту. Чарга скарачалася мізэрнымі долькамі. Ні па які дыхтоўны тавар ён ніколі б яе не выстаяў.

З налітым слоікам і двума куфлямі, з якіх выпаўзала і ляцела долу белая пена, ён падступіўся да століка. Слоік у сетцы заціснуў між ног. Жывіца з куфля, халодзячы горла, палілася ў сціснутае, скручанае ў тугі вузел нутро.

— Дазволь? — Два куфлі навіслі над столікам. Іх трымалі рукі двух барыг. Адзін худы, сутулы, з глыбока запалымі вачыма, падрапанай шчакою. Другі высокі, з круглай, як рэпа, ражкаю, якую асвятляў сіне-ліловы «ліхтар» пад вокам.

Хударэбрына дастала з кішэні зашмальцаваную, у махорцы галоўку тараньки. Адшчыкнула кавалачак і з ліхою годнасцю прапанавала Чуйкевічу:

— Можа, даць?

— Дзякуй. Не трэба,— адмовіўся Чуйкевіч. Ён меў цэлыя запасы гэткага дабра — наслаў брат, які служыў блізка ад Балхаша,— і мог бы накарміць усю выпівошную армію. Але не любіў сушанай рыбы і нават не ўспомніў пра яе, ідучы на піва. Барыгі відочна скмецілі ягоны слоік з півам і праглі схаўрусавацца. Яны цадзілі піва і ліхаманкава коўзалі позіркам па баках.

— Эй, Марфута! — гукнуў кагосьці таўстун. Да століка прытупала кабетка — маленькая, у жоўта-чорным палітоне, з апухлым тварам, скура на якім напялася і блішчэла. У руцэ трымала вялікую рудую торбу з вяровачкамі заміж ручак.— Ёсць што?

— Цісну, як не хер дзелаць! — Кабетка па-ідыёцку засмяялася, адкрыўшы голыя чырвоныя, як морква, дзясны.— Паўсоцік за фунфыр.

Барыгі пашапталіся. Лапалі па кішэнях, шукалі грошы.

— Чырвончык дакладзёш? — звярнуўся таўстун да Чуйкевіча.— Мяне завуць Коля, яго Жёра (іменна Ж-ё-ра).

Чуйкевіч, не задумваючыся, аддаў дзесятку.

Кабетка нагнулася над торбаю, ейная спіна завастрылася, як у рыбіны. Сунула Колю ў кішэню заткнутую капронавым коркам пляшку сівухі, мутна-жоўтай, бы сыроватка. Пацюпала між столікаў.

Коля выдраў зубамі корак, крута перакуліў пляшку над Жёравым куфлем, тады пліхнуў Чуйкевічу, астатняе, ледзьве не палову, выліў сабе.

— О, гэта клас! — выскаліў чорныя з'едзеныя зубы Жёра. У гэтым мужыку Чуйкевіч штосьці ўпада-

баў. Здавалася, у ім засталася яшчэ макулінка прыстойнасці. Чуйкевіч меў на прыстойнасць беспамылковае чуццё. З падазронымі тыпамі ён не стаў бы піць ні пад якім прымусам. Нават калі б гэта выратавала яго ад смерці.

Чуйкевіч ведаў, што гэтае пойла падкосіць яго. І піў.

Ён абдымаўся з Жёрам, а Коля падняў ужо на стол ягоны слоік з півам. Чуйкевіч скмеціў, але не абурыўся. З такімі хаўруснікамі ён адчуваў сябе вольна, упэўнена і смела: тут іх паважалі і пабойваліся. Трэба ж і яму хоць раз пабыць чалавекам, «паважаным чалавекам». Менавіта людзі дна былі цяпер гаспадарамі становішча. Яны, а не чыноўнікі, наводзілі жах, мелі доступ, камандавалі, выносілі прысуды, каралі. Улада — гэта і ёсць магчымасць караць.

«І раней, пры партнаменклатуры, быў наверсе, і цяпер, калі дэградаваў...» — п'яна паіранізаваў з сябе Чуйкевіч. Яго развезла, яму было проста і лёгка, не даймала сумленне, трывога, не душылі думкі. Вакол карагодзілі, хадзілі, хісталіся, рылі асфальт насамі п'яныя морды, скоса паглядвалі на столікі, ці засталіся ў якімсьці куфлі альбо слоіку рэшткі піва.

Ужо дабравата ўднелася. Неба паяснела, на ім праявіліся выцягнутыя воблакі, падобныя на разасланыя, з разрытаю пасцеллю ложкі,— зверху снегавабялёсыя, аднізу цёмныя. Чуйкевіч краем свядомасці зразумеў, што пара ісці дахаты. Ён падаў руку кампаньёнам. Коля не хацеў адпускаць яе, да хрусту ў суставах сціскаў сваёй жалезнай лапішчай.

Коля з Жёрам унадзіліся за ім, валакліся следам. Мусіць, мелі спадзяванне, што дзесьці ў яго яшчэ ёсць дабавутак. Чуйкевіч не хацеў іх весці на кватэру. Кружляў між дамоў, лоўчачы за вуглом схавацца. Якойсьці агрэсіўнасці Чуйкевіч у іх не заўважаў. Проста гэта былі валацугі, якім усё роўна, дзе быць, з кім піць і што рабіць. Абы змарнаваць дзень. Знаёмствы іхныя гэтак жа спешна заканчваліся, як і пачыналіся.

Нарэшце, азірнуўшыся, Чуйкевіч не ўбачыў за спінаю Колі з Жёрам. Але радасці вялікай не адчуў. Наперадзе яшчэ была цяжкая сустрэча з жонкаю. Ён позна зразумеў, што здраджваць, выпіваць і быць справядлівым можна толькі маючы прыстойную жон-

ку. Непрыстойныя такой вольнасці не даруюць. Людміла цяпер лаяла яго на кожным кроку, гразіла міліцыяй, разводам. Ён абыякава, атупела ўспрымаў ейныя словы, адно калі сварка была пры дзецях — незразумелая, дзікая віна разрывала яму сэрца. Ён гатовы быў плакаць; і плакаў, прамаўляючы скрозь слёзы: «Я скончаны чалавек... Я дрэнь... Я прапаў...»

Сыны глядзелі вялікімі, здзіўленымі вачыма на бацьку. Яны не разумелі, у чым ягоная бяда, хто яго пакрыўдзіў, што яму пагражае. Яны не бачылі ні маленькіх, ні вялікіх ягоных ворагаў.

У гэтую ноч прыснілася: ён заціснуў у пальцах, як экспандэр, чарачку і грозіць ёй, што задушыць, скрышыць яе, калі будзе лезці да яго. А за кустоўем туліцца якісьці зэк у чорнай робе. Раптам прыбягае Вася з роспачлівым тварам і кажа, што зэк хавае ў рукаве заточаны спічак, каб кінуцца на яго, Чуйкевіча.

## РАЗДЗЕЛ 59

У сутарэнні цемната была чорная. Ніводнай светлай палоскі. І раптам са столі ўпаў тоўсты слуп святла — з'ехаў убок круг са столі. У гэтым слупе, як у шкляным цыліндры, заззяла жанчына Няміла. Круг стаў на месца, і ўсё зноў паглынулася чорнай цемраю.

Затупацелі дробныя, бы казліныя капыткі, ногі.

— Праверце аб'ект на гатоўнасць да смерці!

Здалося, па каменнай падлозе хтосьці рассыпаў сухі гарох.

## РАЗДЗЕЛ 60

Сон абарваўся тым, што Чуйкевіч адчуў, як яго падняло ў паветра. Ён вісіць над канапаю, сіліцца ўпасці, але адно зыбаецца, акурат знізу яго падпірае пругкая хваля. За вакном ноч. Ды ён бачыць з вышыні ярка асветлены пакой. Бачыць сябе з заплюшчанымі вачыма на канапе, ніжнюю частку паліцы з кнігамі, паперу, ручку, нататнік, нажніцы, пудэлак з клеем на стале. Свядомасць ягоная выразна разумее, што з ім, што ён раздвоіўся: адзін падняўся ў паветра, а другі ляжыць на канапе. Так не павінна быць, і ён прымушае сябе зліцца ў аднаго. Як толькі яму гэта не без высілку ўдалося, ён прачнуўся.

Што з ім? Ці не ўпершыню такое адчуванне Ён,

падобна, вымяшчаўся са свайго фізічнага цела, якое ляжала на канапе. Але ці ён тады гэта быў? І што было б, калі б ён не змусіў сябе вярнуцца ў сваё цела?

У такім незвычайным стане свядомасці ў яго ўсталявалася прамая сувязь з Голасам.

«Я памру?» — спытаў Чуйкевіч.

Душы, падобныя на воблакі, толькі не аб'ёмныя, а плоскія, бы просціны; адна сказала яму: «Не, ты не памрэш... (Ён абрадаваўся). Ты загінеш... (І стварылі малюнак з такой жа матэрыі, як самі: два цені навісаюць над ім). Але я перадам табе зараз сакрэт доўгага жыцця і вечнай маладосці і ты запішы яго ў свой дзённік. Ён не патрабуе ні лекаў, ні якіхсьці працэдур. Вымагае толькі сістэмы. Нельга прапускаць ніводнага дня. На жаль, гэтым сакрэтам ты ўжо не пакарыстаешся. Так задумана. Але ты пакінеш яго для нашчадкаў. Я зраблю, што яго прачытае вялікае мноства людзей ва ўсім свеце. Запамінай словы, якія трэба паўтараць штодня перад сном: «У мяне выдатна працуе гарманальная сістэма, нармальна функцыяніруе. Дзякуючы Боскай дапамозе, касмічнай энергіі і псіхічнай волі, гарманальная сістэма самаачышчаецца, самарэгулюецца, самаўдасканальваецца, самавылечваецца, самаамалоджваецца... (Уяві падстраўнікавую залозу. Каб лепей уяўляць, вазьмі анатамічны малюнак і вывучы размяшчэнне органаў і залоз). У мяне выдатна працуе падстраўнікавая залоза, нармальна функцыяніруе. Дзякуючы Боскай дапамозе, касмічнай энергіі і псіхічнай волі, падстраўнікавая залоза самаачышчаецца, самарэгулюецца, самаўдасканальваецца, самавылечваецца, самаамалоджваецца... (Перабяры гэтак жа прастату і шчытападобную залозу, агулам слізістыя залозы. Пераходзь да крывятворнай сістэмы: печань, селязёнка, касцявы мозг. Далей кожны орган паасобку: ныркі, мачавы пузыр, страўнікава-кішэчны тракт, лёгкія, сэрца. У такім парадку, як я назваў. І цягам усяго жыцця)».

Чуйкевіч у гарачцы падскочыў да вакна і адчыніў фортачку. Яму здалося, што свядомасць выплывае з-пад кантролю. Стаяў нерухома і глядзеў у цемрыва, на дамы, над якімі міргалі зоркі. У запалёны твар дзьмуў халаднаваты струмень. Ён адчуваў, як на ягоныя шчокі часта сыплюцца пругкія кропелькі слёз.

Чалавек, які мае вартасць, не можа не зафіксавац-

ца ў жыцці; справамі, учынкамі, памяццю людзей, мужчына — жанчынамі, жанчына — мужчынамі.

ВЕРСІЯ Чуйкевіча, на якую ён мае права:

Інтэлект кожнага, які б ён ні быў, уліваецца ў Вышэйшы Розум (можна толькі ўявіць, якая ў яго сіла!). Ён, В. Р., мае копію зямнога жыцця аднаго, імгліста-бялёса-блакітнага — як раніца — колеру і бачыць усё, што робяць людзі; прыкладам, памірае чалавек — яму відаць, як яго хаваюць, хто прысутнічае, што гавораць. Тады чаму ён, спытаеце вы, дазваляе злачынствы? Забраць душу ён не можа, гэта амаральна, але злачынцу падбіраецца такі варыянт жыцця, які ў рэшце рэшт і карае яго. (Адсюль і прарочыя сны — калі чалавекам лавіцца задума В. Р. яшчэ да ейнай рэалізацыі ў зямных справах). А ў свеце душ ягонай душы вызначаецца сціплае месца з боку без права кантакту з зямлёю.

**РАЗДЗЕЛ 61**

Людміла адкінула коўдру і ціхенька прайшла на кухню. За сметніцаю ў куточку мойкі стаяла бутэлька. Яна ўзяла яе: ведала, Кастусь устане, пачне шныпарыць па шафах, шукаць пахмелку. Гэта ёй ужо абрыдла, выцягнула ўсё жылле і сокі. Страшна не тое, што Кастусь піў, а тое, што праз гэтыя выпіўкі ён не жыў, пакутаваў сам і прымушаў пакутаваць сям'ю. Думка, якая пракалола ёй свядомасць і бегала,бы кольца карніза па дроце, была жахлівая: адным махам пазбавіць ад пакут і яго, і сям'ю. Ёй не патрэбны муж — проста муж, дзецям не патрэбны бацька — проста бацька. Ад яго павінна быць якаясьці карысць, выгада. Ад Кастуся карысці не было, адно абуза, шкода, слёзы. Навошта такі чалавек у кватэры. Другі год яна вымае з шуфлядкі і круціць вадзіцельскае пасведчанне, а машыны ў іх як не было, так і няма... І не будзе! Столькі нацярпелася з гэтымі правамі! Бойкую, языкастую, зусім разняволеную сярод чужых, яе адразу прымецілі ў групе і выбралі старастам. Лішні клопат, што і казаць: кожны дзень з журнальчыкам на занятках; якія змены ў раскладзе — усіх абзвані, паведамі; захварэў інструктар — папярэдзь асоб, у якіх ваджэнне. Але — падумала: гэтая начальніцкая пасада дапаможа ёй без праблем атрымаць правы. Так яно і вый-

шла, злашча ў яе завязаліся блізкія адносіны з выкладчыкам. Звалі яго Мацвей Аронавіч, ён быў яўрэй, гадоў на дзесяць старэйшы за яе. Са студэнцкіх часоў, калі сябравала з сакурсніцай Наташай Шнэерсон, у яе ўсталяваліся вельмі прыязныя адносіны да людзей яўрэйскай нацыянальнасці. Наташа багата на што адкрыла ёй вочы, збольшага пазнаёміла з сусветнай літаратурай, нават пару разоў звазіла ў Маскву ў Вялікі тэатр. Шкада, што гадоў колькі таму эмігравала ў Ізраіль.

Мацвей Аронавіч быў ветлівы, просты, часам да непрыстойнасці. У дадатак любіў чарку, што і сыграла сваю злую ролю. Яна таксама не лічыла сябе непітушчай. І часта, каб расслабіцца пасля дзённай мітусні, яны заставаліся пасля заняткаў у класе ўдваіх. З'яўлялася на стале бутэлька, закусь, цукеркі, нават шакалад і маленькія, бы грэцкі арэх, мандарынчыкі. Вядома, не з ейнай торбачкі, а з саліднага сакваяжа Мацвея Аронавіча.

Яна не была ўпэўнена ў сваім мужу. Пры ягоных паводзінах, адрынутасці было б дзівам, калі б ён не здраджваў; аднойчы нават ляпнуў, што **любіць усіх жанчын свету**. Так думала яна ў тыя моманты, калі п'янаваты Мацвей Аронавіч далікатна лапаў яе за локці, запускаў руку пад паху, стараючыся пальцамі дастаць да грудзей. Калі ўжо зусім страчвалі ад выпітага розум, ён прасіў яе аддацца. І аднойчы, расцвеленая ягонымі ласкамі і млявым мармытаннем каля вуха пунсовых гарачых губ, яна рашуча задрала спадніцу і ўперлася рукамі ў стол... На брудную, затаптаную падлогу легчы не асмелілася, а са стала маглі скаціцца і пакалечыцца.

Доўга яна дакор не насіла, а цяпер дык і радавалася патаемна, што зрабіла **такога** мужа раганосцам.

...З-пад ліфчыка Людміла дастала спярэшчаны чорнымі лацінскімі літарамі празрысценькі пакецік з белым бліскучым парашочкам. Яго пад вялікім сакрэтам даў ёй сваяк, муж стрыечнай сястры, які працаваў урачом-рэаніматарам на станцыі «Хуткай дапамогі».

Надрэзала нажніцамі ражок пакеціка. Рукі ейныя дрыжэлі, бы ў алкаголіка, бы ў Кастуся нараніцу. Яна нахіліла пакецік над чаркаю і пастукала па ім указальным пальцам, усё роўна як збівала попел

з цыгарэты. Дробненькім сняжком парашочак смыкнуўся ў чарку. Сутарга звяла ёй пальцы, яны не слухаліся яе, акурат былі драўляныя. Яна не ведала, што рабіць. А раптам зараз устане Кастусь і прыйдзе на кухню? Ейнае цела ўсё ўміг аслабела, кімсьці выпілася з яго сіла. Яна ўжо не магла рухацца, ступаць; ёй хапіла адно ўмення прыплысці ў паветры да ракавіны, але расціснуць пальцы не ўдалося, быццам яны ўраслі ў чарку.

«Божачкі, што рабіць?!.»

Няўжо гэта ён, сам Гасподзь Бог, прымушае яе давесці задуманае да канца? Ну гэтак жа. Ён трымае яе за пальцы. Людміла памкнулася левай рукою адкруціць кран, і — о, дзіва! — пальцы расслабіліся. Вада лінулася ёй на руку і змыла здранцвенне. Вада была халодная, а хваля па целе пайшла цёплая.

Яна стала на табурэтку, якая хістанулася пад ёю, адчыніла вісячую шафку і паставіла чарку з парашочкам побач з такой жа чаркаю і бутэльку.

Пачула, нарэшце, крокі — устаў Кастусь, дыбае на кухню. Яна зноў сцялася, як дажджавы чарвяк, калі паўзе. Глянула на яго і ледзьве стрымала слёзы: нягледзячы на азызласць, смяротную бледнасць, твар быў да болю свой, родны, як братаў усё роўна. Калі б ён мільгнуў дзесьці ў натоўпе, яна незвычайна ўзрадавалася б.

Кастусь сеў за стол, абхапіў рукамі светлавалосую галаву і прастагнаў працяжна, бы параненны звер на апошнім подыху:

— У-у, бляха!..

— Цяжка? — Яна палахліва зіркнула на яго.

— Не тое слова. Дай грамок, памру... Я ўжо, лічы, забіты.

Яна доўга маўчала, кусала вусны. Знутры яе душылі слёзы. Шкада было Кастуся як чалавека, але не як мужа. З ім, як кажуць, усё ясна. Трэба хутчэй пазбаўляцца ад яго, покуль яшчэ маладая. Яна ж таксама чалавек і хоча па-чалавечы жыць, урэшце, зразумець, што такое муж. Пражыла колькі гадоў у замустве, а мужа, фактычна, не мела. Гэта ж не муж: мала што ідыёт, вылюдак, дык яшчэ спіўся. Яна, без сумнення, знойдзе мужчыну. Прыстойнага, уважлівага, дзелавога. Бізнесмена. Ці хоць бы Мацвея Аронавіча, які нейк намякнуў, што разводзіцца з жонкаю. А што? Пажэняцца і махануць у Ізраіль

альбо ў Амерыку. Хоць дзеці пажывуць без гэтай радыяцыі і нітратаў. Вось толькі бацьку ім, канечне, ніхто не заменіць. Але той бяды! Дзеці пра яе, як вырастуць, не падумаюць, не паклапоцяцца. А хтосьці ж павінен абагрэць ейную старасць.

Людміла ўступілася на табурэтку.

— На, адкаркуй,— падала яму бутэльку.

Ён здзівіўся, што хутка ўдалося ўгаварыць жонку. Падкалупнуў відэльцам шапачку, сарваў яе зубамі, адчуўшы, як чыкнуў па губе востры беражок. Засаланіў у перасмяглым роце прысмак крыві. Аддаў жонцы адкаркаваную бутэльку.

Людміла так, каб бачыў ён, лінула ў чаркі — яму і сабе.

Падала яму няпоўную чарку. У яе пабялеў лоб: «Хома хоміні лупус эст...»*

Кастусь убачыў на паверхні гарэлкі дробныя масляністыя кропачкі, але не да разважанняў было, скуль і што гэта за кропачкі, можа, алей капнуў у чарку. Пераадольваючы агіду, выцадзіў гарэлку, адчуўшы, як зашчымела парэзаная губа. Адкусіў яблык, які ляжаў каля вазона на падваконніку.

Людміла тут жа, у яго на вачах, выпіла сваю долю і паставіла чарку перад ім на стале. Выйшла з кухні. Глянула на сябе ў люстра, быццам на лобе ў яе павінна быць напісана, што яна злачынка.

Хацела заняцца ў ваннай мыццём, але адчула, што коўзае бялізнаю па пральнай дошцы абы-як, а ў галаве ТОЕ. Яшчэ, чаго добрага, звар'яцее: зацыкліцца і звузіць свой інтэлект да адной вузкай шчылінкі. Дурніца, навошта пайшла гэтым шляхам? Няхай бы лепш ён сам сканаў ад гарэлкі ці трэба было падстроіць штосьці такое, каб смерць ягоная выглядала як няшчасны выпадак. А тут жа павязуць на экспертызу, будуць браць аналізы крыві. Выявяць яд — пачнецца расследаванне... Божа, навошта яна гэта зрабіла? Вярэды не паменела, а дадалося яшчэ больш. Вострыя кіпці рвалі цела знутры.

У кватэры яна заставацца не магла. Неўзабаве яд пачне дзейнічаць, і бачыць смяротныя мужавы курчы — гэта звыш усякай моцы. Яна чула, як ён пайшоў назад да сябе ў пакой і рухнуў на канапу. Уявіла, які ён будзе ў труне.

* Чалавек чалавеку воўк *(лац.)*.

Яна хуценька сабралася і выйшла з кватэры, каб перастрэць на вуліцы сыноў са школы і паехаць з імі да сяброўкі.

## РАЗДЗЕЛ 62

Гэта быў новы, ніколі раней невядомы пратэст арганізма. Чуйкевіч адчуў гэта адразу. Чаму пасля адной чаркі так доўга спаў? Цяжкая, тугая санлівасць спавіла яго. Праз нейкія прамежкі ён прачынаўся — рот быў каляны, сухі. Дацягваўся рукою да слоіка з вадою, прагна піў... Яму спалася. Было добра, спакойна і не хацелася гарэлкі. Цягам часу вады арганізм патрабаваў больш і больш.

Ён хадзіў у ванную, наліваў слоік і асушваў яго. Надвечар яго пачало ванітаваць. Сутаргава, праліваючы на сябе, піў ваду, і яе тут жа вывяргала (ён прынёс памыйнае вядро). Так ён перапампаваў праз сябе, можа, дзесяткі два трохлітровых слоікаў. Цьмянай іскрынкаю прашывалася па свядомасці думка: што такое, чым закусваў? Нічога такога, што магло б атруціць, не прыгадвалася: яблык... Колькі радыенуклідаў ці нітратаў у ім ні было б, так не падзейнічала б. Гарэлка выключаецца: не так шмат ён выпіў.

Уначы, калі ўжо ўсе спалі, ён адчуў, як справа, у падрабрынні, пачаў наклёўвацца боль. Востранькі, бы ад дроціка, які хтосьці тузае за канец. Чуйкевіч круціўся, выбіраючы, як зручней легчы, але боль даймаў незалежна ад паставы. Неўзабаве ён разросся да такіх памераў і сілы, што трываць было немагчыма.

Быццам крумкач-В сядзеў і моцнай глюгою дзюбаў у печань...

На здранцвела-непаслухмяных нагах пайшоў у залу да жонкі, крануў яе за плячо і сказаў:

— Выручай. Штосьці са мною нядобрае робіцца...

Яна спрасонку падхапілася, дзіка заверашчала, сыплючы напаўцямныя праклёны і мацюкі. Ён зразумеў, што напалохаў яе, моцна заснутую ад снатворных, і хуценька выкуліўся. Боль вар'яваў, і Чуйкевіч курчыўся на падлозе, ловячы голым целам ейны холад, запіхваў у рот край дывана. Ягоныя стогны, мусіць, чулі суседзі зверху і знізу.

І раптам ні з таго ні з сяго ў ягонай свядомасці

бліснула маланка азарэння: «Яд! Пячонка расшчапляе яд... Вось адкуль пякельная смага і ваніты...» І адразу ўсе дэталі, як паслухмяныя салдацікі, пачалі лагічна станавіцца на пустыя месцы: і чаму гэтак лёгка ды хутка жонка знайшла яму пахмелку, і скуль узяліся тыя масляністыя кропачкі ў чарцы... Так, няма сумневу, жонка хацела яго атруціць, а потым зваліць усё на п'янку. Ён не разумеў, як магла пайсці на такое жанчына, маці дваіх дзяцей? Нават калі ён заслужыў у яе самай няшчаднай кары. Гэткім подлым, нікчэмным шляхам пазбаўляць чалавека жыцця... Не, Бог ёй гэтага не даруе. І калі ён, Чуйкевіч, не здохне, ён яшчэ ўбачыць суд над ёю. Вось толькі сон...

Свайго жыцця Чуйкевіч не шкадаваў і не рваўся сябе ратаваць. Яму наканавана не гэткая смерць. Да раніцы яго калаціла, скручвала абаранкам. Пад языком уздуліся залозы, выпнуліся шурпатасцю вострай, бы грэчка, выдзялялі празрыстую вадкую сліну, якая бясконца бегла, а калі адкрываў рот — пырскала ценькімі фантанчыкамі. Падняцца з ложка ён не мог...

Раніцаю на яго са страхам і недаверам глядзелі сыны.

— Каб ты здох! Чаму ты не здох? — накінулася, зайшоўшы, жонка. Ён, сцяўшы зубы, маўчаў. Падобна, яна не раскайвалася ў сваім злачынстве. Няўжо яна звар'яцела? Гогаль, здаецца, сказаў: няма большай Боскай кары, чым вар'яцтва.

### РАЗДЗЕЛ 63

Чорную, бы з пачка фотапаперы, палоску часу разарваў званок Пятра Пятровіча. Лісліві галасок сказаў, што Субач на ўліку не стаіць; значыцца, яна ў сваім розуме і нясе адказнасць за тое, што робіць.

— І што цяпер? — спытаў Чуйкевіч асуджана. Ён кепска цяміў, яшчэ горш адчуваў сябе пасля ТОЙ ночы.

— Экспертыза! — радасна, як выстраліў у сэрца, выгукнуў Пётр Пятровіч.

Чуйкевіч на ватных нагах пасунуўся ў свой пакой, сеў за стол. Па аркушы паперы пабеглі шнурочкі дробных разбэрсаных літар:

«Мілая Вераніка!

Прабач, што я не знайшоў мужнасці падтрымаць цябе ў жаданні мець наша агульнае дзіця. Цяпер я прашу цябе: абавязкова нарадзі яго. Нягледзячы ні на што. Дзеля гэтага я завяшчаю табе ўвесь свой грашовы запас, дзённікі і архіў (у ім, дарэчы, шмат ненадрукаваных рэчаў), якія покуль будуць захоўвацца ў майго брата.

На вялікі жаль (а можа, на шчасце?), я развітаюся з жыццём не па сваёй волі. Ты не паверыш у гэта. Але ў свеце багата з'яў, якім няма тлумачэння з пункту погляду звычайнага чалавека. Мая смерць — адна з іх.

Разам з пісьмом я высылаю завераны ў натарыуса тастамент і рэцэпт вечнай маладосці. Чаму не жонцы? Складаная і доўгая гаворка, а ты — свая, ты духовая.

Да сустрэчы! Так, так, да сустрэчы. Я чакаю цябе, але не падспешваю, бо сіе ад мяне не залежыць.

25 лютага 1989 года. *Твой Кастусь».*

Чуйкевіч заклеіў канверт і панёс пісьмо на пошту. Укінуў яго ў сіняе пуза скрынкі і зачыніўся ў кабіне міжгародняга тэлефона. Ён пазваніў брату і папрасіў яго абавязкова прыехаць — «па вельмі важнай, неадкладнай справе». Мусіць, па голасе ягоным, прагнутым і слабым, як павуціна, Глеб зразумеў, што брату сапраўды не да жартаў; паабяцаў «як-небудзь вырвацца».

Дні праз два Чуйкевіч атрымаў ад Глеба тэлеграму: ВЫЯЗДЖАЮ ТЧК.

Чуйкевіч сустрэў яго на вакзале. Ледзьве пазнаў. Глеб быў загарэлы, высахлы, як таран. Яны абняліся, і Чуйкевіч адчуў на спіне ў брата цвёрдыя косці. Цяжка было стрымліваць слёзы. Не таму, што доўга не бачыліся, а таму, што брат паслухаўся і прыехаў. Міравецкі мужык, нічога не скажаш.

Быў вечар. Ліхтары асвятлялі будынкі — белыя, як злепленыя дзецьмі са снегу.

Яны хадзілі па вуліцах, і Чуйкевіч пасвячаў Глеба ў сваю трагедыю. Той, здаецца, не зусім усур'ёз яго ўспрымаў, лыпаў маленькімі чорнымі вочкамі. Разы два прапанаваў зайсці ў рэстаран, мяркуючы, што там, за чаркаю, гамонка пойдзе весялейшая. Вайсковец, ён быў, нягледзячы на худзізну, надта тоўсты для тонкіх матэрый.

Чуйкевіч хацеў аднаго: каб брат ведаў, уразумеў

на цвярозую галаву, што ў яго, пісьменніка Кастуся Чуйкевіча, ёсць дзённікі, якія той павінен узяць на захаванне і спагадзя трыццаць гадоў праз Косаву Вераніку Анатольеўну абнародаваць.

«Ды кінь ты, Косця! А то зараз стружку здыму»,— асаджваў яго брат. І Чуйкевічу ўсё больш здавалася, што таму ўвогуле не пад сілу асэнсаваць блытаную, блізкую да трызнення размову. Адзінае, аб чым цвёрда дамовіліся,— Глеб забярэ з сабою семнаццаць спісаных агульных сшыткаў, да якіх будзе прыкладзена пісьмо, у якім УСЁ тлумачыцца.

Шчыпаў, як дураслівы сабачка, мароз. Крыштальна расквечваліся ў небе белыя зоркі. Пад нагамі пешаходаў суха стагнаў снег, пратэстуючы супроць насілля над сабою.

Урэшце Чуйкевіч прывёў брата на прыпынак, каб везці дахаты. Такога гасцявання той, мусіць, зусім не чакаў. Быў спахмурнелы, збянтэжаны. Ужо ў тралейбусе, глянуўшы на яго зблізку, Чуйкевіч убачыў, што ў Глеба на лобе грае гармонік трывожных думак.

## РАЗДЗЕЛ 64

Пётр Пятровіч падпіхнуў уверх акуляры і глянуў у вакно: крывавым набітым вокам зырчэла, чамусьці блізкае да шкла, закотнае сонца. Аправа залатых акуляраў стала чырвоная, бы аголеныя сасуды. Ён перавёў позірк на сейф, але замочная адтуліна доўга не праяўлялася.

«Ну што, пара выцягваць на свет Божы справу... Усё ясна, Субач стаіць на ўліку ў псіханеўрадыспансеры. У іску ёй адмоўлена. А Чуйкевічу я нахлусіў, няхай хвалюецца... Мяне ўжо новая справа чакае, гэтым разам жудасная — бацька згвалтаваў трохгадовую дачку... Ужо званілі, прапаноўвалі хабар у пяць тысяч долараў ЗША. Колькі-та часу?» — Адсунуў рукаў пінжака, намацаў кнопку падсвета на японскім гадзінніку: было а палове шостай. Можна было б яшчэ пасядзець, але адключылася электрыка: мусіць, дзесьці аварыя. Аварыя за аварыяй...

Соўгаючы па падлозе нагамі, ён пабраўся да дзвярэй, баючыся, што зачэпіцца ў цемры за штонебудзь і загрыміць касцямі. З маленства сядзіць у ім гэтая боязь, што ў яго слабыя косці і могуць лёгка паламацца.

Шкадуючы сябе, ён шкадаваў і другіх. Хоць і патурзаў Чуйкевічу нервы, але ж не засудзіў яго. А мог бы. Цяпер гэтае згвалтаванне... Ці такое ўжо яно жудаснае? Не чужы ж чужую, а бацька родную дачку. Ён яе нарадзіў, ён за яе і адказвае. Цяжка ёй будзе, зганьбанавай бацькам,— няхай з яго і пытае. Пакончыць з сабою, як вырасце і ўведае, не выйдзе замуж — гэта іхныя сямейныя праблемы. А хабар, канечне, салідны... Мусіць, кааператар якісьці. Але — разбярэмся.

Пётр Пятровіч ішоў па тратуары ў натоўпе людзей і адчуваў сябе самым шчаслівым сярод іх.

## РАЗДЗЕЛ 65

Каля дома чамусьці не гарэў ліхтар. «Ён ўжо даўно патух ці толькі сёння?» — падумаў Чуйкевіч, здзівіўшыся, што раней не зацеміў гэтую дэталь. Мусіць, як адчапіліся ад яго тыя нягоднікі, ягоны парог небяспекі павышэў. Зрэшты, зусім не забыўся, што яго падпільноўвае небяспека, але і не так часта пра яе думаў. Увогуле толькі Веранікаю і вярэдзіўся. Ейны муж скончыў службу ў Глыбокім і цяпер быў у Мінску; казала Вераніка, збіраецца прадаваць аўтамабіль.

Ён мінуў купку клёнаў, што былі абкладзены глінянымі глыжамі, і раптам пачуў ззаду крамяны хруст чыіхсьці паспешлівых крокаў па снезе. Усяродку ўсё здранцвела, патыліцу быццам сціснулі абцугамі і здзіраюць скальп. Ён баяўся павярнуцца, бо ведаў, што гэта бяжыць да яго ягоная с м е р ц ь. На дзвюх ці на чатырох нагах — ужо ўсё роўна.

Ён хацеў закрычаць, ды не было голасу. Плёнка, калісь убачаная ім у сне, пракруцілася з шалёнай хуткасцю, і на апошнім кадры чорны цень матлянуўся ў Чуйкевіча за спінаю, і ён адчуў, як пад напорам спружыны разарвалася ў яго скронь... З яе паваліў чырвоны дым і, густы, ліпкі, як мёд, запрудзіў наваколле...

Бандзюкоў было двое. Ударам кастэта ў скронь яны збілі Чуйкевіча з ног. Ён застагнаў і скурчыўся. Галава ляжала на снезе белая, яркая, бы вялікая гуля бручкі са зжаўцелым лістам.

— Во табе прывет ад таварышчэй, член парціі! — Маленькі, каранасты бандзюк спрактыкавана ўдарыў

два разы Чуйкевічу нагою ў жывот пад рэбры. Вышэйшы падхапіў яго, абмяклага, як вадзянога, пад пахі і павалок па дарожцы да пад'езда дома. Маленькі палахліва азіраўся па баках. Ускочыў на прыступкі, адчыніў левыя дзверы.

— Цягні сюды хутчэй, падла! — прашаптаў хрыплым голасам.

Гэтым ходам жыхары дома хадзілі пешкі, калі не працаваў ліфт. Тут было цёмна, ані светлай кропачкі, ад смуроду займала дых.

Бандзюкі зацягнулі мёртвае цела на самы апошні паверх, кінулі на балкон. Ім здавалася, што ахвяра яшчэ жывая. Вышэйшы выхапіў з кішэні фінку і колькі разоў усадзіў яе ў схаладнелыя грудзі.

— Не абіжайся на нас, пісацель... — прахрыпеў зларадна-сутаргава. Яму перакасіла рот, і ён не мог сціснуць падковы сківаў.

— Дзелаем ногі, Каланча!

На цёмным нізкім небе не было нават месяца, які мог бы стаць сведкам гэтага дзёрзкага забойства. Адно спадзяванне на выдатныя следчыя навыкі Пятра Пятровіча.

## РАЗДЗЕЛ 66

З фольгавай усмешкаю на бязлітасна прыгожым твары жанчына Няміла, апусціўшыся з люка, самаўладна прамаршыравала па сутарэнні.

Струкападобныя істоты ў верхняй частцы так патанелі, што гарошыны выпіралі, бы скулы, у бакі.

— Аб'ект! — загадала жанчына Няміла.

Было ўражанне, што ў істот затрэсліся чорныя шчокі.

На экране сцяны з'явіўся празрысты, бясконцы ў вышыню цыліндр. У гэтым цыліндры плыў у неба чатырохканцовы чорны драўляны крыж — моцны, як са шпал. На ім была распята чалавечая душа. Па канцах крыжа яе абкручвалі бела-чырвоныя, з саламянаю ўстаўкаю паясы, вытканыя палосачкамі, крыжыкамі, грабеньчыкамі і ромбікамі, аздобленыя пухнатымі кутасамі.

Жанчына Няміла, насупіўшы бровы, памкнулася да экрана, але перад ёю вырас шлагбаум. І яна дзіўна і мякка, бы ануча, перагнулася і, плоская, абвісла на брус шлагбаума.

## РАЗДЗЕЛ 67

АПАВЯДАННЕ з архіва Кастуся Чуйкевіча:

Чалавека зняважылі — гэта ў нас умеюць лепш, чым у Японіі рабіць тэлевізары. Ён прыйшоў дахаты сумны і расхваляваны. Сонца пасля паўдня свяціла ў вокны, і ў пакоі было душна. Чалавек адчыніў фортачку і сеў на кульгавае крэсла. Глядзеў у вакно, на кароценькую шчыльную траву, па якой пранырліва бегаў чорны, аж бліскучы, шпак і торкаў белай дзюбкаю ў зямлю.

Чалавек сядзеў і думаў пра сваё бяссілле.

У адчыненую фортачку заляцела аса, цвёрда застукалася ў шыбіну. Церлася аб яе спінаю і брунжала фіялетавымі крыльцамі.

Чалавек узяў з падваконніка шпільку, якой мацавалася да кардоніны кашуля. На тупым канцы шпількі была маленькая, з канапліну, чорная бубка. Чалавек прышчаміў шпількаю асу і праткнуў ёй шыю — тонкую белую жылку, што злучала плоскую, падобную на зернетка спелай грушы галаву з точаным, порсткім тулавам.

...Аса ляжала на баку. У яе канвульсіўна паторгвалася сярэдняя нага зверху і трохі драбней — пярэдняя. Жыватом раздзімаўся і патаўшчаўся, акурат у чалавека, які зняможана дыхае. Услед заторгаліся ногі знізу — пярэдняя і сярэдняя. Дзве пярэднія былі падагнуты да грудзей — так, як у сабачкі, калі ён становіцца на заднія лапы — і паторгваліся разам.

Правае верхняе крыло было адтапыранае і прамое, як наструненае для палёту. Ніжняе падломлена пад жыватом, і відаць, як тырчыць убок маленькае, вузенькае падкрыльца. Праз жоўтае, з цёмнай абводкаю крыло прасвечваліся рудаватыя нітачкі, як жылкі на вачах у стомленага чалавека. Задняя верхняя нага выструнілася акурат уздоўж чорных кропачак на прадаўгаватым кольчатым жыватку; ніжняя была пад жыватком, і тырчаў толькі кончык — на полі падваконніка выразна выдзяляліся два кіпцюрыкі і елачка вострых шыпоў.

Галава асы была павернута ўгору зубчастымі скіўіцамі. Вусік з жоўтага лоба, сагнуўшыся, упіраўся ў падваконнік, другі тырчаў прама.

За вакном усчаўся вецер і туга ўпаў на шыбіны.

Востра засачыўся ў шчыліну пад рамаю скразнячок, скрануў асу. Яна напялася, падцяўшы да грудзей жываток, чуйна заварушыла вусікам і закратала нагамі, сілячыся дастаць імі падваконнік. Часта-часта зачыкалі сківіцы. Але шпілька з чорнай бубкаю на канцы была цяжкая, і аса ніяк не магла стаць на ногі.

Тады чалавек узяў шпільку за бубку і падняў асу — на падваконніку засталася жаўтлявая кропелька. Валаскі, што густа пакрывалі асу, былі шызыя ад пылу, які набраўся з падваконніка.

Аса імпэтна затузалася — усім тым, што магло кратацца, і нават з кончыка жыватка тыцнулася колькі разоў джала з празрыстай макулінкаю яду. І — раптам ураз сцялася, знерухомела, адно квола трэсліся канцы ног; адна, сярэдняя знізу, мёртва падціснулася да жыватка — як паралізаваная.

Чалавек зноў паклаў шпільку з асою на падваконнік — так, каб асе можна было апірацца на ногі. Аса імгненна ажывілася і пачала хапатліва штурхацца нагамі, крыльцы варушыліся, толькі адно, выпрастанае, служыла асе падпоркаю.

Аса «хадзіла» кругамі, апіраючыся на ніжні рад ног і адно крыльца. Шыпы на нагах дапамагалі адштурхоўвацца ад падваконніка. Бубка ад шпількі ляжала нерухома, і рух асы вакол яе напамінаў цяля на вяроўцы, якое трымае чалавек. Чорная бубка — чалавек, шпілька — вяроўка, аса — цяля, якое натурыцца і не хоча ў хлеў. Ад крыла і ног на падваконніку заставаліся ледзьве прыметныя пісягі — святлейшыя за падваконнік.

Аса, змучыўшыся, знерухомела, адно пярэднія ногі ўсё яшчэ торгаліся і згіналіся ў кручкі. Жываток час ад часу расцягваўся, як быццам у ім білася сэрца,— то шырэлі, то звужаліся чорныя і жоўтыя палоскі.

Потым знерухомелі і пярэднія ногі, але закратаўся кончык задняй нагі знізу — пад жыватком. І зачыкалі жоўтыя, апраўленыя чорнай рыскаю, сківіцы.

Чалавек, здаецца, пачуў, як яны паскрыпваюць зубамі, і сам сцяў зубы, аж выступілі на пашчэнках жаўлакі. Зноў глянуў у вакно. Шпака на траве не было ўжо. На небе стаялі густой чарадою цямнявыя, з бэзавым налётам хмары. Ківаліся і блішчэлі лістотаю бярозкі вакол бледна-ружовых старых баракаў на два паверхі. Каля іх гулялі дзяўчаткі ў белых

фартушках, стаяла раскладушка, і вецер бязглузда гартаў старонкі пакінутай на траве кнігі. Чуўся ўладны жаночы голас, гукаў дахаты Афрадытку. З пастаўленай на высокія слупы будачкі, да якой была прыпята лесвіца, сарваліся галубы і панесліся над горадам. Чалавек сачыў за імі, покуль іх не страцілі вочы.

Тады ён зноўку вярнуўся да асы.

Аса была нерухомая, без прымет жыцця. «Няўжо?..» — падумаў чалавек і адчуў у грудзях незразумелы халадок і трывогу: аса — не чалавек і нават не сабака ці кот і не птушка, але... Гэта жывое стварэнне, маленькае, прымітыўнае, але з Богам дадзеным правам жыць. Нягледзячы ні на што і смела прымаючы смертаносны выклік бязлітаснай чалавечай рукі.

Чалавек пільна ўгледзеўся ў асу. Здалося, быццам зыбнуўся кончык пярэдняй нагі. І толькі. Чалавек абрадаваўся, і ў вачах з'явіўся бляск. А потым ён убачыў, што бурштынавая плямка на лобе асы, між чорных пукатасцей вачэй, падобна абрысамі на чалавечае сэрца, якім яго малююць на руках зэкі і якое азначае «Гатовы за сябра пайсці на забойства». Чалавек насупіў бровы, аж схаваліся пад імі вочы, і адчуў, што вярэдлівай калючкаю заварушылася ў грудзях крыўда, якую ён сіліўся забыць і не ўспамінаць ніколі. І ўсё змяшалася ў галаве, адно лез у вушы скрып асіных зубоў, нечакана цвёрды і ядраны, і скакала перад вачыма бурштынавая плямка ў форме чалавечага сэрца...

Чалавек зразумеў, што перажывае моцнае нервовае ўзрушэнне. Ён папярхнуўся, незнарок дыхнуўшы на асу, якую палічыў ужо мёртвай. Яе адкінула да рамы. І, дзіва дзіўнае, аса з новаю сілаю, акурат адпачыўшы, задрыгала нагамі. Ды так, што кульнулася праз галаву і легла на спіну. Апіралася на крыльцы і той мясцінкаю жыватка, дзе ён прырастае да грудзей. Кончыкі ног нервова дрыжэлі. Пярэднія ногі чапляліся за вусікі, прыгінаючы іх да грудзей... І чалавек ажно адхіснуўся: кінулася ў вочы белая вострая дзюбачка шпількі, што выткнулася з шыі. Як нож у чалавечым целе.

У чалавека пабялелі вусны, і ён кусаў іх зубамі, амаль не адчуваючы болю. А за вакном было пуста. Ні неба, ні дамоў, ні людзей, адно жоўты змрок.

...Аса жвава кратала нагамі. Спружылася целам і, кульнуўшыся, зноўку стала на ногі... пасунула, пасунула бубку па гладкім падваконніку і ўперлася ў раму. І раптам нейк рэзка скурчылася, звузіліся, мала не скруціліся ў трубачку крыльцы, як бывае ў павуціне. Ногі апруцянела і мёртва абвіслі. Як завадныя, зачыкалі сківіцы, потым цвёрда сцяліся, а жыватож затрымцеў. Вольна, як у сабачкі вушы, апусціліся вусікі — яны былі белыя ад пылу.

«Усё...»

Чалавек хуценька ўзяў асу за адтапыранае крыльца і паклаў на сярэдзіну падваконніка. І — у асы заварушыліся пярэднія ногі. Упіраліся ў падваконнік, чапляючыся за сагнутыя ўніз вусікі. Заднія і сярэднія ногі нейк нежыццёва і суха, як травінкі сіўцу, тырчалі ў бакі. Ды аса зноўку напялася і кульнулася праз галаву, аж было чуваць, як стукнулася аб падваконнік ейнае цела.

Чалавек асцярожна дакрануўся пальцам да жыватка і — уга! — войкнуў: палец быццам працяло токам. На носе выступіў дробны пот, а па лагчынцы спіны прабеглі мурашкі.

«Яшчэ кусаецца!» — здзівіўся ён, наглядаючы, як з кончыка жыватка торкаецца чорны шпянёк з ядавітай макулінкаю.

Аса сутаргава стрыгла пярэднімі нагамі, і ёй, мусіць, здавалася, што яна ўджаліла — забіла — свайго ворага, і цяпер ён не будзе балюча калоць ёй у шыю, прыціскаць да падваконніка. Але сілы ў яе было зусім мала, і яна не магла скрануць з месца бубку. Толькі зацята чыкалі сківіцы, быццам хапалі, заграбалі ў рот паветра. Так задыхаецца чалавек.

Ён падняў яе і паставіў на скручаныя трубачкаю крыльцы і ад таго — пруткія. Белыя вусікі леглі на вочы, пярэднія ногі, скрыжоўваючыся, квола ўздрыгвалі... Аса — жыла.

Чалавек сядзеў перад ёю, і яму было сорамна і брыдка за сябе.

*1978* .

**РАЗДЗЕЛ 68**

На Паўночных могілках стаіць сціплы помнік — шар з белага каменю. Ні дат, ні надпісу, ні фатаграфіі на ім няма. Такая была просьба да

бацькоў у чалавека — майго сябра Міколы В., — які тут пахаваны.

Як гэты помнік сярод пампезных манументаў, так сябра вылучаўся сярод людзей. Калі гэта праўда, што Бог выбірае на зямлі асобных людзей і трымае праз іх сувязь, то ён, сябра мой, акурат і быў гэтакі чалавек — чалавек Неба, альбо, як цяпер кажуць, медыум. Яму было даравана права ўваходу ў храм Духоўнасці. Гэтую духоўнасць ён выносіў на людзі. Я бачыў, як ён слабее з кожнай хвіляю, распавядаючы пра незямныя, нячутыя мною рэчы. Яму пад канец цяжка было прамаўляць словы, гаворка блыталася, і ён замаўкаў. Толькі сінія вочы гарэлі выразлівым, гіпнатычным святлом — водбліскамі духовай чысціні. Ён казаў, што не чытаў ніякіх духоўных кніг, усё прыйшло яму як бы само сабою: і назвы, і фразы, і цытаты... Ён пасвячаў мяне ў свае адчуванні. Тое-сёе я запісваў, і мне свярбела палазіць па Бібліі, Каране, «Махабхараце», іншых гасподніх кнігах і пашукаць адпаведнікаў.

Я не верыў і са страхам глядзеў на яго. Розум незвычайны, а лад жыцця прымітыўны. І гэта мне цяжка было ўразумець, нават немагчыма. Ён мяняў працу, як цыган коней, бязбожна піў («усё, што гарыць»), хоць меў хліпкае, гарманічнае, але вельмі тонка зладаванае прыродаю здароўе. Яго не раз выратоўвалі дактары. Нейкім часам і яны не змаглі...

Я не хачу сказаць, што ў гэтым творы ўнутраны свет галоўнага героя спісаны з майго сябра (так не бывае), але тое ўражанне ад яго, якім, паводле Дастаеўскага, трэба запасціся, каб напісаць раман, засталося. І я, паламаўшы ўсе творчыя планы, яго напісаў. Калі палічыў раздзелы ў кожнай частцы, то здзівіўся: іх было пароўну ў першай і другой — па 68.

Зусім рэдка я куплю кветкі, саджуся у аутобус і еду міма Навінак на Паўночныя могілкі. Стаю перад белым, без намёку на пранікальнасць, шарам, і мне здаецца, што я жыву ў якімсьці новым, таямнічым свеце.

*1976, 1986, 1991—1992*

**Рубанаў У.**

Р82 Не аднойчы забіты: Раман у 2 ч.— Мн.: Маст. літ., 1994.— 287 с.: іл.

ISBN 5-340-01432-0.

Гэта псіхалагічны раман з элементамі такіх новых з'яў, як містыка, выхад чалавечай душы ў паралельны свет, незвычайны стан свядомасці. Галоўны герой Чуйкевіч трапляе ў выключна складаныя варункі. З аднаго боку, ім занялася па лжывым даносе пракуратура, з другога — ён трапляе ў поле зроку рэкеціраў-вымагальнікаў, якія ў рэшце рэшт, нягледзячы на меры, прынятыя міліцыяй, забіваюць галоўнага героя.

Такая фабула твора, з дапамогай якой раскрываецца наша сённяшняе жыццё, бязладнае, трагічнае, з актыўнасцю злых сіл, накіраваных на знішчэнне ўсяго духоўнага, прыгожага, нацыянальна адметнага, а таксама робяцца экскурсы ў крывавую гісторыю беларускага народа.

**Р $\frac{8820600000-073}{М\ 302(03)-94}$ 19—94** **ББК 84(Беи)6**

Літаратурна-мастацкае выданне

РУБАНАЎ
Уладзіслаў Якаўлевіч

**НЕ АДНОЙЧЫ ЗАБІТЫ**

*Раман у 2-х частках*

Рэдактар *Е. А. Пяршай.* Мастак *Э. Э. Жакевіч.* Мастацкі рэдактар *А. І. Дрозд.* Тэхнічныя рэдактары *Т. М. Сокал, Г. П. Тарасевіч.* Карэктар *К. А. Крукоўская.*

Здадзена ў набор 30.04.93. Падп. да друку 05.04.94. Фармат $84\times108^1/_{32}$. Папера друк. № 2. Гарнітура кудрашоўская. Высокі друк. Ум. друк. арк. 15,12. Ум. фарб.-адб. 15,12. Ул.-выд. арк. 15,60. Тыраж 11000 экз. Зак. 294.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

УЛАДЗІСЛАЎ РУБАНАЎ

# НЕ АДНОЙЧЫ ЗАБІТЫ